ПРАПІЛЕІ

JOANNIS
VISLICIENSIS

BELLUM PRUTENUM

MMV

ЯН ВІСЛІЦКІ

ПРУСКАЯ ВАЙНА

Прапілеі
2005

УДК 82-1(476)=124=161.3
ББК 84-5(4Бел)
V 75

Укладанне, пераклад на беларускую мову, уступны артыкул, каментарыі, кароткі слоўнік антычных і сярэднявечных намінацый Жанны Некрашэвіч-Кароткай

Навуковае рэдагаванне:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры Белдзяржуніверсітэта
Уладзімір Георгіевіч Кароткі;
кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры лацінскай мовы Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта
Андрэй Зіноўевіч Цысык

V 75 **Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum = Ян Вісліцкі. Пруская вайна**: На лацінскай і беларускай мовах / Уклад., пераклад., камент. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай. – Мн.: Прапілеі, 2005. – 233 с.

ISBN 985-6329-57-4.

Выданне ўяўляе сабой першую ў Беларусі публікацыю збору твораў беларускага лацінамоўнага паэта XVI ст. Яна Вісліцкага. Тэксты друкуюцца паралельна: на лацінскай мове і ў перакладзе на сучасную беларускую мову. Разлічана на філолагаў-класікаў, вучоных-медыявістаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, а таксама ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй літаратуры і культуры нашай Айчыны.

УДК 82-1(476)=124=161.3
ББК 84-5(4Бел)

ISBN 985-6329-57-4

© «Прапілеі», 2005
© Пераклад Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай

Ад укладальніцы

На запаветных скрыжалях нашай культурнай памяці захавалася імя першага беларускага паэта-лацініста XVI ст. Яна Вісліцкага, аўтара шэрага літаратурных твораў, сярод якіх найзнакаміцейшы – паэма “Пруская вайна”. Таленавіты майстар слова і яго творы вяртаюцца сёння да нашчадкаў, перадаючы “шчасную чутку” пра былую славу і веліч нашай дзяржавы, ураскрашаючы ратныя дзеі нашых далёкіх продкаў, выяўляючы яснавяльможных уладароў нашай дзяржавы, адраджаючы гонар і сумленне нацыі.

Падрыхтаванае поўнае выданне твораў Яна з Вісліцы – вынік Боскай і людской дапамогі, а таксама плён карпатлівай працы многіх вучоных. З захапленнем і глыбокай пашанай хачу назваць імёны тых, хто паспрыяў вяртанню імя Яна Вісліцкага ў нацыянальную і культурную свядомасць народаў, пра якія пісаў сам паэт. Гэта вучоныя і перакладчыкі, што прысвяцілі многія гады вывучэнню жыцця і творчасці Яна Вісліцкага. Прыгадаю ў першую чаргу польскіх філолагаў-класікаў кракаўскай школы XIX ст. Караля Мехежынскага, Браніслава Кручкевіча, Міхала Езяніцкага. У 1932 г. “Пруская вайна” загучала па-польску дзякуючы Яну Смярэку; у 1973 г. з’явіўся ўрывак з паэмы ў перакладзе на рускую мову Якава Парэцкага і Юліі Прэнскай; пазней (у 90-х гг.) публікаваліся фрагменты з беларускамоўнага перакладу Якава Парэцкага ў розных перыядычных выданнях Беларусі. У 1997 г. двухмоўнае (на лацінскай мове і ў перакладзе на літоўскую) выданне твораў Яна Вісліцкага было падрыхтавана прафесарам Вільнюскага універсітэта Яўгеніяй Ульчынайтэ. Неацэнны ўнёсак у справу вывучэння, нацыянальнай ідэнтыфікацыі і папулярызацыі творчасці Яна Вісліцкага зрабіў беларускі вучоны-медыявіст Віктар Дарашкевіч.

Выданне тэкстаў, што ўвайшлі ў склад зборніка “Пруская вайна” (Кракаў, 1516), ажыццяўляецца паралельна на лацінскай і ў перакладзе на беларускую мову на падставе першадруку. Прынцып паралелізму ў размяшчэнні тэкстаў замяняецца прынцыпам паслядоўнасці толькі пры публікацыі празаічнай прадмовы Яна Вісліцкага да Паўла з Кросна з прычыны значнай тэкставай несуразмернасці лацінскага арыгінала і беларускага перакладу. У дадатку (“*Appendix*”) змешчаны два вершы іншых аўтараў, уключаныя ў склад зборніка “Пруская вайна”: элегія Паўла з Кросна і верш Валянціна Экія, а таксама творы пад агульным загалоўкам “*De praesenti bello Prutenico*” (“Пра сённяшнюю Прускую вайну”), якія былі выяўлены мною ў экземпляры бібліятэкі

Асалінскіх у Вроцлаве і, на маю думку, напісаны Янам Вісліцкім. У выданні факсімільна ўзнаўляюцца першадрукі “*Bellum Prutenum*” і “*De praesenti bello Prutenico*”. Акрамя каментарыяў да лацінскага тэксту і тэксту перакладу, у канцы выдання змешчаны “Кароткі слоўнік антычных і сярэднявечных намінацый”.

Тэксты твораў Яна Вісліцкага друкуюцца паводле экземпляраў першадрукаў выдання *“Bellum Prutenum”* (*Cracoviae*, 1516) з Ягелонскай бібліятэкі ў Кракаве (сігнатура Cim.4120) і бібліятэкі Асалінскіх у Вроцлаве (сігнатура XVI.2750). Паводле гэтых выданняў выканана транслітэрацыя тэкстаў. Расстаноўка знакаў прыпынку, напісанне прапісных літар, перадача дыфтонгаў (“ae/oe/e”), а таксама варыянтаў “ph/f”, “th/t”, “rh/r”, “ch/c” і “ch/h”, “ti/ci” выканана паводле першай публікацыі Б. Кручкевіча (1887). Разам з тым у публікацыі Б. Кручкевіча ёсць выпраўленні, якія датычацца не толькі адзначаных вышэй графічных варыянтаў, але таксама граматычных форм слоў. Такія выпадкі разыходжанняў паміж першадрукам і публікацыяй Б. Кручкевіча адзначаюцца ў каментарыях пад індэксам “K” (*Kruczkiewicz*). “I” перад галоснымі ў нашай публікацыі перадаецца як “j”.

Лічу сваім абавязкам выказаць шчырую падзяку ўсім, хто падтрымаў гэты выдавецкі праект, паспрыяў падрыхтоўцы і з’яўленню выдання твораў Яна Вісліцкага: члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхасю Іосіфавічу Мушынскаму, прафесару Адаму Іосіфавічу Мальдзісу, прафесару Вячаславу Пятровічу Рагойшу, доктару Анджэю Тымоўскаму, доктару Вользе Букінай. Шчыра дзякую старшаму навуковаму супрацоўніку Інстытута гісторыі НАН Беларусі Генадзю Сагановічу, які добразычліва прадставіў неабходныя мне навуковыя матэрыялы і кансультацыі з галіны гістарыяграфіі. Дзякую навуковым рэдактарам гэтага выдання і адначасова маім неацэнным настаўнікам загадчыку кафедры лацінскай мовы Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта Андрэю Зіноўевічу Цысыку і дацэнту кафедры гісторыі беларускай літаратуры Белдзяржуніверсітэта Уладзіміру Георгіевічу Кароткаму за каштоўныя парады і заўвагі, выказаныя ў працэсе падрыхтоўкі рукапісу да друку. Выказваю падзяку Таццяне Федасеевай, Святлане Шабронавай і Паўлу Прыбытку за дапамогу ў справе тэхнічнага і інфармацыйнага забеспячэння працы. Дзякую ўсім, хто паспрыяў з’яўленню гэтай кнігі, а таксама тым, хто спагадліва і з разуменнем ставіўся да маёй працы ў перыяд яе падрыхтоўкі.

Gratiam ago ab imo pectore!

Творчасць Яна Вісліцкага і лацінамоўная пісьмовая культура эпохі Рэнесансу на Беларусі

Пашырэнне ідэй Рэнесансу ў духоўным жыцці народаў Заходняй і Цэнтральнай Еўропы спрыяла таму, што пачынаючы з канца XV ст. у культуры Вялікага княства Літоўскага набываў сілу працэс актыўнай рэцэпцыі класічнай заходнееўрапейскай культурнай спадчыны. Гэта стала вынікам таго, што з часоў караля Казіміра, сына Ягайлы (калі кароль польскі і вялікі князь літоўскі выступалі ў адной асобе), вектар палітычнага і культурнага жыцця ў дзяржаве накіроўваецца не на Візантыю, не на Маскву, а на Заходнюю Еўропу. У першую чаргу гэта датычылася эліты беларускага грамадства – магнатаў і шляхты. Менавіта ў арыстакратычным асяроддзі выспяваюць перадумовы для засваення і адаптацыі на айчыннай глебе ідэалогіі гуманізму, цесна звязанай з задачай адраджэння культурных здабыткаў Старажытнай Грэцыі і Рыма.

Прыкладна ў гэты ж час у літаратурных помніках з'яўляецца легенда пра паходжанне арыстакратаў і ўладароў Вялікага княства Літоўскага ад рымскіх патрыцыяў. Паданне пра Палямона набывае статус гістарычнага, бо становіцца канцэптуальным грунтам беларуска-літоўскага летапісання XVI ст. Вынікам такога асэнсавання свайго этнагенезу стала вельмі хуткае распаўсюджанне і папулярызацыя лацінскай адукаванасці і пісьмовасці на ўсім абшары таго гісторыка-культурнага рэгіёна, які заходнееўрапейскія аўтары пазначалі як *Sarmatia*, мясцовыя ж пісьменнікі і вучоныя ўжывалі назвы *Polonia* і *Lithuania*. Грунтоўнае вывучэнне лацінскай мовы, помнікаў літаратуры Старажытнага Рыма стала абавязковым элементам тагачаснай адукацыйнай сістэмы. Як сведчаць М. Б. Тапольска, В. Дарашкевіч і І. Саверчанка, менавіта ў гэты час на тэрыторыі Беларусі фарміруюцца багатыя бібліятэкі лацінскіх і старагрэцкіх аўтараў, набываюць выключную папулярнасць творы Цыцэрона, Вергілія, зборнікі "*Gesta Romanorum*", "*Secretum secretorum*" і іншыя лацінамоўныя помнікі [гл.: *Topolska 1984; Дорошкевич 1979, 47; Саверчанка 1998, 31*]. Гэта цалкам заканамерна: князі і шляхта Вялікага княства Літоўскага лічылі лаціну моваю сваіх продкаў, яна ўсведамлялася адукаванымі грамадзянамі

дзяржавы як больш вытанчаная, больш культурная ў параўнанні з нацыянальнымі мовамі і, галоўнае, – зразумелая кожнаму вучонаму чалавеку. Падобнае стаўленне да лацінскай мовы адзначаецца і ў польскай культуры эпохі ранняга Рэнесансу. “Лаціна, – пісаў польскі літаратуразнавец С. Віткоўскі, – панавала пры дварах манархаў і князёў, лаціна была моваю адукаваных людзей, мовай суду і ўраду, літаратурнай мовай усёй Еўропы. Любы твор, які хацеў знайсці чытачоў, павінен быў пісацца па-лацінску; нацыянальныя мовы лічыліся дзікімі і варварскімі, няздольнымі да выразу думак і пачуццяў” [*Witkowski 1891, 29*]. У такіх культурных абставінах і беларускія, і польскія аўтары паставілі перад сабой задачу стварыць айчынную літаратуру на лацінскай мове, напоўніўшы яе “нацыянальнымі пачуццямі, думкамі, успамінамі, урэшце рэшт, нацыянальнай славай” [*Maciejowski 1852, 125*].

Важна адзначыць, што гісторыя беларускай лацінамоўнай паэзіі пачынаецца менавіта ў XVI ст., у той час як у польскай літаратуры спробы лацінамоўнага вершавання назіраюцца з XIII ст. Аднак першыя ўзоры польскай лацінамоўнай паэзіі не былі працягам класічнай традыцыі антычнага вершаскладання. Паэтычныя помнікі з-пад пяра Вінцэнта Кадлубка або Мікалая з Польшчы ўяўлялі сабою так званыя леаніны (мяркуюць, што назва паходзіць ад імя лацінамоўнага французскага паэта XII ст. Ляона [гл.: *Ziomek 2002, 77*]): у гекзаметры і пентаметры ўводзілася рыфма (рыфмаваліся паміж сабою некаторыя або ўсе паўрадкоўі верша). Аднак ужо ў XV ст. у творчасці паэтаў Філіпа Буанакорсі (Калімаха) і Конрада Цэльтыса выпрацоўваецца новая гуманістычная традыцыя, звязаная з адраджэннем антычнай метрыкі. Менавіта да гэтай традыцыі далучыліся польскія паэты кракаўскай універсітэцкай супольнасці канца XV – пачатку XVI ст. Звярнуўшыся да класічнай літаратуры Старажытнага Рыма, яны пераканаліся, “што лаціна, якой карысталіся ў часы сярэднявечча, моцна сапсаваная і далёкая ад дасканалай лаціны эпохі Аўгуста; і вось яны пачалі імкнуцца размаўляць і пісаць больш правільнай лацінай. З вялізным запалам кінуліся яны да вывучэння літаратурнай спадчыны старажытных: салодкі Вяргілій, лёгкі Гарацый, вытанчаны Авідзій знайшлі натоўпы прыхільнікаў і паслядоўнікаў. Разгарнуўся надзвычай актыўны інтэлектуальны і літаратурны рух ва ўсіх цывілізаваных краінах Еўропы. Побач з вучонымі, якія пісалі па-лацінску

прозай, з'явілася вялікая плеяда паэтаў, якія пачалі выражаць свае пачуцці на мове Старажытнага Рыма" [*Witkowski 1891, 29-30*]. Творчасць Яна Вісліцкага ўжо цалкам належыць да адзначанай новай традыцыі. А значыць, беларуская лацінская паэзія амаль не судакраналася з сярэднявечнай лацінай ні на лексічным узроўні, ні на ўзроўні граматыкі. Сапраўды, у "Прускай вайне" Яна Вісліцкага ўжываюцца толькі асобныя лексемы (напрыклад, "*inhaustu*" [*Bellum II, 3*], "*hispidulis*" [*Bellum II, 55*], "*tutarier*" [*Bellum II, 121*], "*catafractus*" [*Bellum II, 182; II, 226*] і некаторыя іншыя), якія немагчыма знайсці ў старажытнарымскіх паэтаў (зразумела, за выключэннем уласных імёнаў, тапонімаў і этнонімаў). Таму ў дачыненні да творчасці ўсіх беларускіх паэтаў, што пісалі свае творы па-лацінску – ад Яна Вісліцкага да Францішка Князьніна, – тэрмін "новалацінская паэзія" можа з поўным правам быць заменены тэрмінам "лацінская паэзія" або "лацінамоўная паэзія", паколькі, так бы мовіць, "старалацінскай" паэзіі ў беларусаў (як, прыкладам, у італьянцаў) не было. Развіццё гэтай паэтычнай традыцыі на Беларусі з пачатку XVI і да канца XVIII ст. падпарадкоўвалася адной агульнай тэндэнцыі: арыентацыі на класічныя ўзоры паэзіі Старажытнага Рыма.

У беларускай лацінскай паэзіі, як і ў іншых еўрапейскіх літаратурах, генеральным кірункам у засваенні антычнасці была імітацыя. "Яна, – адзначае А. Жлутка, – пакінула глыбокі след на літаратуры і эстэтыцы эпохі, стаўшы прынцыпам, паводле якога пісьменнікі – паэты і празаікі – павінны былі з антычных матываў, тэм, стыляў і гатункаў кампанаваць уласныя творы, з дапамогай чужых думак і фармулёвак выказваць уласныя меркаванні" [*Жлутка 1989, 240*]. Вядома, што на Беларусі пачынаючы з XVI ст. надзвычайную папулярнасць атрымалі трактаты Цыцэрона [*Саверчанка 1998, 28-29*]. Гэта пэўным чынам адбілася на спецыфіцы слоўнай культуры ў цэлым і на моўных асаблівасцях беларускай лацінскай паэзіі ў прыватнасці. Беларускія мастацкія тэксты на лаціне адрозніваліся сінтаксічнай і стылёвай ускладненасцю, імкненнем да канструявання вытанчаных рытарычных фігур, што якраз і можна лічыць вынікам уплыву цыцэронаўскай традыцыі. Калі ж гаварыць пра развіццё паэзіі, то вершы і паэмы беларускіх лацінамоўных аўтараў пісаліся на мове эпохі "залатога веку" Актавіяна Аўгуста, з захаваннем метрычных і стылёвых асаблівасцяў твораў тагачас-

ных “мэтраў” паэзіі, малодшых сучаснікаў Цыцэрона, – Вергілія, Авідзія і Гарацыя.

Лацінамоўныя творы беларускіх аўтараў былі разлічаны як на замежнага, так і на айчыннага (зразумела, адукаванага) чытача, служылі мэтам рэпрэзентацыі сваёй гісторыі, культуры, побыту і звычаяў. Нездарма сярод помнікаў беларускага летапісання мы знойдзем і лацінамоўны – “*Origo regis*”, – у якім прадстаўлены ключавы эпізод старажытнай беларускай гісторыі, звязаны з дынастычнай канфрантацыяй Ягайлы, з аднаго боку, і Кейстута з Вітаўтам – з другога. Нездарма ўсе тры статуты Вялікага княства Літоўскага адразу ж пасля іх надрукавання на старабеларускай мове выдаваліся і ў перакладзе на лаціну: першы Статут – праз тры гады, другі і трэці – праз год. Месца і ролю лацінамоўнай літаратуры ў гісторыі айчыннага прыгожага пісьменства вельмі трапна вызначыў У. Кароткі. “Беларуская літаратура XV–XVI стст. на лацінскай мове, – піша ён, – калі разглядаць яе як сістэму закрытую, недаступную для плебса, адрадзіла ‘мёртвую’ мову і сімволіка-вобразны пантэон антычнасці. З другога боку, гэтая літаратура, калі разглядаць яе як сістэму адкрытую, арыентаваную на чытача-інтэлектуала, напоўніла творы на лацінскай мове і народнаснымі эстэтычнымі каштоўнасцямі ў выглядзе нацыянальна маркіраваных вобразаў, адпаведных гістарычных падзей, ментальна-ацэначных катэгорый” [*Кароткі 2004*]. Увесь шлях літаратурнага развіцця на Беларусі да пачатку XIX ст. немагчыма ўявіць сабе без лацінамоўнай літаратуры, і ў першую чаргу без лацінамоўнай паэзіі.

“Іншамоўнасць літаратуры, – адзначае У. Кароткі, – не заўсёды атаясамлівалася з нацыянальным, нацыянальнае разглядалася праз прызму бачання дэмаса. Між тым элітарная культура, элітарная літаратура – не толькі складаючыя часткі культуры нацыянальнай, яны яе рухавікі, этычна-эстэтычныя меры духоўных каштоўнасцей. Элітарная культура не ў меншай ступені, чым культура дэмаса, заўсёды вызначала і вызначае рэпрэзентатыўнасць нацыянальнай культуры, яна – найбольш мабільная ў засваенні агульначалавечых каштоўнасцей, менавіта ў яе рамках адбываюцца змены і рух жанрава-стылёвых сістэм, эпахальныя пераацэнкі каштоўнасцей” [*Кароткі 2004*]. Тое, што ў свой час з вялікімі цяжкасцямі ўдавалася даказаць і абгрунтаваць В. Дарашкевічу, сёння павінна ўяўляцца заканамерным, натуральным і нават, у пэўнай ступені,

банальным. Бо калі пагаджацца з думкаю, што Адраджэнне на Беларусі з'яўлялася "адзінствам агульнаеўрапейскага і рэгіянальнанацыянальнага" [*Падокшын 2003, 74*], то немагчыма разглядаць і літаратуру гэтага перыяду па-за межамі заходнееўрапейскай традыцыі, якая была накіравана на рэцэпцыю і нацыянальнае засваенне мастацкіх здабыткаў антычнасці.

Шматвяковае існаванне Беларусі ў сітуацыі культурнага памежжа не прывяло тым не менш да штучнага эклектычнага спалучэння чужародных элементаў у нашай нацыянальнай культуры, але стала неабходнай перадумовай узнікнення арыгінальных помнікаў айчыннага мастацтва. Найперш гэта датычыцца шматмоўнай літаратуры Беларусі. Як слушна заўважае А. Жлутка, творы, напісаныя на іншых мовах беларусамі, з'яўляюцца фактамі перш за ўсё гэтай культуры [гл.: *Жлутка 1993, 21*]. Што ж да лацінскай паэзіі, то яна арганічная частка нацыянальнай літаратурнай спадчыны, якая вызначаецца сваёй ідэйна-мастацкай спецыфікай і жанравастылёвымі адметнасцямі.

Выдатную плеяду беларускіх лацінамоўных паэтаў ачольвае Ян Вісліцкі, аўтар паэмы "Пруская вайна", надрукаванай разам з іншымі творамі паэта ў кракаўскай друкарні Яна Галера ў 1516 г. На фоне тагачаснай лацінскай паэзіі, ужо дастаткова багата прадстаўленай на той час у польскай літаратуры, паэма Яна Вісліцкага вылучалася як спецыфічны і арыгінальны ў ідэйна-мастацкіх адносінах твор. Я. Смярэка, які пераклаў "Прускую вайну" на польскую мову, слушна назваў яе аўтара "першым стваральнікам патрыятычнай паэмы (эпасу)" [*Smereka 1931*]. Сапраўды, Ян Вісліцкі паставіў перад сабой задачу стварэння агульнадзяржаўнага эпасу на лацінскай мове, у межах якога прапанаваў сваю актуальную для Усходняй Еўропы дынастычна-палітычную канцэпцыю, звязаную з манархічнымі правамі Ягелонаў.

I. Творчасць Яна Вісліцкага ў гісторыі літаратуры

Літаратуразнаўцы розных народаў слушна разглядаюць творчасць Яна Вісліцкага ў кантэксце гісторыі той ці іншай літаратуры. Характэрна ў гэтым сэнсе выказванне І. М. Галянішчава-Кутузава, які гаворыць пра аўтара "Прускай вайны" як "першага песняра Літвы", а потым адзначае, што яго паэма заключае ў сабе "па-

тэнцыяльна далейшае развіццё польскага літаратурнага эпасу да эпохі Міцкевіча" [*Голенищев-Кутузов 1965, 235*]. Да нашых дзён пытанне пра нацыянальную ідэнтыфікацыю творчасці лацінамоўных паэтаў XVI ст. выклікае шматлікія спрэчкі і гарачыя дыскусіі. Думаю, што вырашыць яго немагчыма без усведамлення тагачасных культурна-гістарычных абставін, якія непасрэдна ўплывалі на дзяржаўнае і нацыянальна-этнічнае самаўсведамленне народаў Вялікага княства Літоўскага (пазней – Рэчы Паспалітай). У любым выпадку хачу падкрэсліць прынцыповую немагчымасць вузканацыянальнай лакалізацыі творчасці таго ці іншага паэта – ад Эразма Ратэрдамскага да Адама Міцкевіча.

Гісторыя паэтычнага зборніка "Пруская вайна" Яна Вісліцкага з самага пачатку звязана з цэлым шэрагам нявысветленых пытанняў і загадак. Першая з іх – адсутнасць імя паэта і назвы яго выдання ў славутым каталогу *"Janociana"*, выдадзеным у 1776 г., дзе ўпершыню даюцца звесткі пра жыццё і творчасць не толькі польскіх (каронных) паэтаў, але і ўраджэнцаў Вялікага княства Літоўскага – Мікалая Гусоўскага, Васілія Гіяцынція, Марціна Градоўскага, Яна Ракавіча [гл.: *Janociana 1776*]. Імя Яна Вісліцкага пачало з'яўляцца на старонках літаратуразнаўчых даследаванняў па гісторыі польскай літаратуры з пачатку XIX ст. Адным з першых кароткую агульную ацэнку цэнтральнаму твору паэтычнага зборніка Яна Вісліцкага даў М. Вішнеўскі ў 1844 г.: "Стыль напышлівы, верш гладкі, лаціна, як на пачатак шаснаццатага ст., досыць правільная, паэзіі – аніякай" [*Wiszniewski 1844, 229*]. Як М. Вішнеўскі, так і М. Сабяшчанскі, аўтар артыкула "Ян з Вісліцы" ва "Усеагульнай энцыклапедыі" (*"Encyklopedji powszechnej"*), даводзяць, што Ян Вісліцкі быццам бы звяртаецца да гістарычных хронік і менавіта з іх пазычае сюжэтны матэрыял. М. Сабяшчанскі сцвярджае нават, што паэт сам "указвае крыніцы, быццам збіраўся пісаць гісторыю, а не паэму" [*F.M.S. 1867, 210*]. Незразумела толькі, дзе ж знайшоў польскі даследчык гэтыя аўтарскія "ўказанні крыніц"? Калі б яны былі, то адшукаць іх можна было б толькі ў глосах першадрука. Але там, як і ў іншых паэтычных выданнях падобнага кшталту, мы знаходзім толькі прасадычныя і тлумачальныя (у дачыненні да сюжэта паэмы) глосы, спасылачных – аніводнай!

Згадку пра Яна Вісліцкага і яго паэму змясціў у сваёй "Гісторыі польскай літаратуры" У. Сыракомля (Людвік Кандратовіч), адзначыўшы высокі паэтычны талент аўтара "Прускай вайны" [*Kondratowicz 1875, 275*]. Гэта была фактычна першая спроба аб'ектыўнай і справядлівай ацэнкі яго творчасці. Паказальна, што належала яна не менш таленавітаму паэту, а да таго ж – суайчыннiку Яна Вісліцкага.

У канцы XIX ст. у польскім літаратуразнаўстве фарміруецца цэлая школа філолагаў-класікаў, якія пачынаюць вельмі грунтоўна вывучаць творы менавіта новалацінскіх аўтараў XVI ст. У 1880 г. з'яўляецца вялікі артыкул К. Мехежынскага, у якім даследчык упершыню прадстаўляе знойдзеныя ім матэрыялы, якія маглі мець дачыненне да біяграфіі паэта, прапануе літаратуразнаўчы аналіз твораў, што ўвайшлі ў склад зборніка "Пруская вайна". "З эстэтычнага пункту гледжання, – піша вучоны, – належыць прызнаць за аўтарам пэўныя заслугі, а менавіта: жывасць і пластычнасць апісанняў, паэтычную яркасць мовы, смелую і складную пабудову верша, чыстую і свабодную мову" [*Mecherzyński 1880, 275*]. Адзначае аўтар і тыя рысы паэмы Яна Вісліцкага, якія ён лічыць недахопамі: надзвычайную беднасць сюжэта, залішнюю расцягнутасць, паўтарэнні ў апісаннях, адсутнасць дэталяў. Дакарае вучоны паэта за тое, што, апрача Ягайлы і Вітаўта, ён не ўвёў у апісанне бітвы аніводнага ваяводы, аніводнага героя. "Перад намі – толькі падзеі, а людзей мы не бачым", – скардзіцца К. Мехежынскі [*Mecherzyński 1880, 290*].

Прафесар Кракаўскага (Ягелонскага) універсітэта Б. Кручкевіч у 1885 г. у сваім артыкуле "Пра Паўла з Кросна і Яна з Вісліцы" ўпершыню апублікаваў матэрыялы рэктарскіх запісаў Ягелонскага універсітэта, на падставе якіх вылучыў меркаванне пра сувязі Яна Вісліцкага з гэтай навучальнай установай. Б. Кручкевіч праводзіць скрупулёзнае палеаграфічнае, тэксталагічнае і літаратуразнаўчае даследаванне першадрука 1516 г., які захоўваецца і цяпер у Кракаўскай бібліятэцы Ягелонскага універсітэта. Плёнам гэтай вялікай працы стала падрыхтаванае Б. Кручкевічам выданне "*Pauli Crosnensis Rutheni atque Joannis Visliciensis carmina*", якое выйшла з друку ў 1887 г. у серыі "*Editiones Academiae litterarum Cracoviensis*" ("Выданні Кракаўскай Акадэміі Навук"). Менавіта

гэтае выданне ўпершыню зрабіла даступнымі для шырокага кола адукаваных чытачоў і вучоных-лаціністаў творы Яна Вісліцкага.

М. Езяніцкі апублікаваў у 1888 г. грунтоўны артыкул са сваімі крытычнымі заўвагамі да выдання твораў Паўла з Кросна і Яна з Вісліцы, падрыхтаванага Б. Кручкевічам. Характарызуючы творчасць паэта, вучоны з суровым педантызмам дакарае аўтара "Прускай вайны" за тое, што той не імкнуўся пазнаёміцца ані з гісторыяй Длугаша, ані з так званай "Хронікай пра паразу прусаў", ані з лістамі Ягайлы. "Затое, – абураецца даследчык, – ён пажадаў пайсці на прывабны голас вусных народных паданняў… Гэтым тлумачыцца надзвычайная беднасць паэмы адносна дэталяў, а таксама неадпаведнасць гісторыі некаторых падзей, апісаных у творы. У сувязі з вышэйназванымі недахопамі паэма Яна з Вісліцы на мае амаль што ніякай гістарычнай вартасці", – выносіць М. Езяніцкі свой суровы вердыкт. Другі артыкул М. Езяніцкага (1891 г.) прысвечаны пераважна вызначэнню ўплываў класічных паэтаў на творы Яна Вісліцкага. Правёўшы сапраўды тытанічнае даследаванне, вучоны адзначыў наяўнасць станоўчых уплываў на творы паэта, найперш, з боку Вергілія, Авідзія і Стацыя [гл.: *Jezienicki 1891, 134*].

У тым жа годзе выйшаў з друку артыкул С. Віткоўскага, які прадстаўляў не толькі даволі шырокі фактаграфічны матэрыял у дачыненні да біяграфіі Яна Вісліцкага, але таксама звесткі пра сучаснае паэту культурнае асяроддзе, гісторыю выдання паэтычнага зборніка "Пруская вайна". Артыкул утрымлівае падрабязны пераказ сюжэтаў усіх твораў паэта і даволі поўны аналіз іх мастацкай спецыфікі. Найбольшую ўвагу вучонага прыцягнула, зразумела, паэма "Пруская вайна", асабліва ж – пытанне пра яе кампазіцыйную спецыфіку. Пры гэтым даволі часта ідэйна-эстэтычныя вартасці гераічнай эпапеі Яна Вісліцкага ацэньваюцца ім вельмі нізка. Адсутнасць кампазіцыйнага адзінства, прымітыўнасць пабудовы сюжэта, летапісны спосаб аповеду, адсутнасць вобразна-мастацкай дэталізацыі, цяжкасць стылю, мудрагелістая пабудова сказаў – вось той доўгі шэраг недахопаў, за якія, з пункту гледжання польскага даследчыка, варта было б папракнуць аўтара [гл.: *Witkowski 1891, 282-285*].

На пачатку XX ст., у сувязі з угодкамі Грунвальдскай бітвы, ізноў ажыўляецца цікавасць даследчыкаў да паэмы Яна Вісліцка-

га. Так, В. Хан ажыццяўляе грунтоўнае вывучэнне літаратурных і фальклорных помнікаў, прысвечаных славутай перамозе, пачынаючы з самых першых, напісаных непасрэдна пасля 1410 г. Што ж да паэмы Яна Вісліцкага, то яна заслугоўвае ў даследчыка хутчэй пераратыўнай ацэнкі, паколькі, маўляў, у сваім апісанні “аўтар не прыняў пад увагу дэталяў, якія маюць істотнае значэнне”, “не ўлічыў літаратуры, што існавала ў яго час, – ані гістарычнай, ані паэтычнай” [*Hahn 1910, 14*]. “Пруская вайна”, на думку В. Хана, “традыцыйнае апісанне бітвы, якое паэт чэрпаў пераважна з класічных узораў, дапаўняючы астатняе ўласнай фантазіяй” [*Hahn 1910, 15*].

Л. Цвіклінскі ў 1922 г. даў даволі крытычную характарыстыку паэме Яна Вісліцкага. Найвялікшай заганай твора аўтар лічыць неадпаведнасць яго назвы сюжэту. Польскага вучонага здзіўляе “чыста хранікальны спосаб апавядання”, а таксама тое, што “паэт распавядае пра ўчынкі, а не прадстаўляе ўдзельнікаў”. “Рэабілітуе” паэта, на думку даследчыка, яго гарачая любоў да Айчыны, а таксама “жывыя і пластычныя апісанні, прыгожыя параўнанні і вобразы” другой кнігі [*Ćwikliński 1922*].

Цікавасць да лацінамоўнай паэзіі адраджаецца ў Польшчы ў 30-я гг. XX ст. У 1932 г. збор паэтычных твораў Яна Вісліцкага выходзіць асобным выданнем у перакладзе на польскую мову і з уступным артыкулам Я. Смярэкі. Следам за сваімі папярэднікамі вучоны лічыць актуальнымі папрокі ў нежаданні Яна Вісліцкага карыстацца гістарычнымі крыніцамі, але адзначае высокую гісторыка-культурную вартасць паэмы “Пруская вайна”, шчыры патрыятызм паэта [гл.: *Smereka 1932*]. Даволі станоўчую ацэнку творчасці Яна Вісліцкага даў таксама Г. Барыч, адзначыўшы трапны выбар паэтам тэмы, яе сумленную апрацоўку на падставе хронік і вуснай традыцыі, а таксама імкненне творцы даць моладзі годны ўзор для наследавання [*Barycz 1935, 29*].

У 1966 г. Ю. Новак-Длужэўскі апублікаваў сваю выдатную працу “Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. Czasy Zygmuntowskie” („Прынагодная палітычная паэзія ў Польшчы. Эпоха Жыгімонта”), у якой упершыню даў даволі пазітыўную, хаця беглую, ацэнку „Прускай вайне”. Гэты выдатны вучоны, які адкрыў як для палякаў, так і для беларусаў шэраг невядомых (ці малавядомых раней) імёнаў лацінамоўных аўтараў (напрыклад, Яна

Радвана, Францішка Градоўскага, Васілія Гіяцынція), дакладна расставіў акцэнты, акрэсліваючы сутнасць творчай задумы Яна Вісліцкага. На думку Ю. Новака-Длужэўскага, паэт лічыў сваім абавязкам пакінуць належны ўспамін пра славутую перамогу пад Грунвальдам і адчуваў сябе творцам, які здольны гэта зрабіць. Даследчык не паддаўся спакусе крытыканства і надання Яну Вісліцкаму абразлівых характарыстык "няўдалага эпіка" або "недасканалага гісторыка". "Мы – у часе Рэнесансу, – мудра нагадвае вучоны, – у эпосе ўсемагутнасці паэтаў, якія пазбаўляюць смерці выпадкі і людзей" [*Nowak-Dłużewski 1966, 1959*]. Надзвычай вялікае значэнне мае заўвага Ю. Новака-Длужэўскага, што перамогу пад Грунвальдам Ян Вісліцкі імкнецца спалучыць у адзіным ідэйна-мастацкім кантэксце з сучаснымі яму "вікторыямі": над валахамі ў 1509 г., над татарамі пад Вішнёўцам у 1512 г., урэшце рэшт над маскавітамі – пад Оршай у 1514 г.

У працах польскіх вучоных XX ст., прысвечаных даследаванню новалацінскай паэзіі, не адбываецца канцэптуальнага, глабальнага пераасэнсавання ідэйна-мастацкіх вартасцяў паэмы "Пруская вайна" і яе гісторыка-культурнага значэння ў параўнанні з працамі вучоных-класікаў XIX ст. У савецкім літаратуразнаўстве, як адзначае В. Дарашкевіч, "імя Яна Вісліцкага згадвалася, але творчасць яго фактычна не вывучалася, паколькі навуковая цікавасць да новалацінскай спадчыны некаторы час была паслаблена" [*Дорошкевич 1979, 75*]. Калі ж гаварыць пра беларускую літаратуразнаўчую навуку, то нашы суайчыннікі звярнуліся да вывучэння творчасці паэта толькі ў апошняй трэці XX ст.

У 1973 г. у зборніку "Беларуская літаратура і літаратуразнаўства" з'явіўся артыкул Я. Парэцкага і Ю. Прэнскай "Паэма Яна Вісліцкага 'Пруская вайна'". Гэта быў фактычна першы акт рэпрэзентацыі шэдэўра рэнесанснай паэзіі Вялікага княства Літоўскага беларускім чытачам, бо побач з артыкулам у зборніку былі змешчаны асобныя эпізоды з паэмы ў перакладзе на рускую мову. У 1975 г. В. Дарашкевіч у сваім артыкуле "Мастацкі помнік Грунвальду" прыводзіць важныя аргументы на карысць беларускага паходжання Яна Вісліцкага: азначэнне "Ruthenus" ("русін") пры яго імені ў рэктарскіх актах Ягелонскага універсітэта, акцэнтаванне паэтам ключавой для беларускай гісторыі бітвы пад Клецкам, наўмыснае падкрэсліванне ролі "Poloniae" ("Польшчы") як

духоўнай “patriae” (“айчыны”) аўтара “Прускай вайны”. Менавіта ў гэтым артыкуле беларускі вучоны ўпершыню выказаў заўвагу пра тое, што мястэчка Вісліца існавала не толькі ў цэнтральнай Польшчы, але і на Беларусі [гл.: *Дарашкевіч 1975, 56*]. Праз чатыры гады ў сваёй фундаментальнай манаграфіі “Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI века” (1979) В. Дарашкевіч яшчэ больш аргументавана даказаў слушнасць і заканамернасць уключэння творчасці Яна Вісліцкага ў кантэкст гісторыі беларускага прыгожага пісьменства. Дзякуючы згаданай вышэй манаграфіі, а таксама кнізе Я. Парэцкага “Ян Вісліцкі” (1991) імя аўтара “Прускай вайны” паступова стала набываць у нас вядомасць. У 90-х гг. мінулага стагоддзя творчасць Яна Вісліцкага была ўключана ў курс гісторыі беларускай літаратуры гуманітарных факультэтаў ВНУ Беларусі, аднак поўны пераклад “Прускай вайны”, а таксама твораў, што адносяцца да прадмоўна-пасляслоўнага комплексу гэтай паэмы, быў надрукаваны ў часопісе “Маладосць” толькі ў 1997 г. (яшчэ раней, у сярэдзіне 90-х гг., былі надрукаваны ўрыўкі з беларускамоўнага перакладу Якава Парэцкага). Магчыма, гэтай акалічнасцю тлумачыцца тое, што артыкул, прысвечаны Яну Вісліцкаму, не быў уключаны ў другі том біябібліяграфічнага слоўніка “Беларускія пісьменнікі” (1992). Адзначым, што ў гэтым жа томе названага выдання змешчаны артыкул “Мікола Гусоўскі”, хаця “Песня пра зубра” была надрукавана на сем год пазней за “Прускую вайну”, і з храналагічнага пункта гледжання менавіта Вісліцкага варта лічыць родапачынальнікам новалацінскай паэзіі Беларусі эпохі Рэнесансу.

Падводзячы вынік сташасцідзесяцігадовай гісторыі вывучэння творчасці Яна Вісліцкага, заўважу, што асабліва вялікая заслуга ў гэтай справе належыць філолагам-класікам (К. Мехежынскаму, М. Езяніцкаму, Б. Кручкевічу, С. Віткоўскаму, Я. Смярэку, Я. Парэцкаму, В. Дарашкевічу, Я. Ульчынайтэ), якія прадставілі найбольш поўна ўсе наяўныя матэрыялы, прама ці ўскосна звязаныя з біяграфіяй паэта, дэталёва вывучылі яго паэтычныя творы, акцэнтаваўшы выключную ролю класічнай паэзіі Старажытнага Рыма ў фарміраванні мастацкай сістэмы паэта. Я. Парэцкі і В. Дарашкевіч лакалізавалі творчасць Яна Вісліцкага ў гісторыі беларускага прыгожага пісьменства, адзначылі ролю аўтара “Прускай вайны” як першаадкрывальніка той унікальнай мастацкай традыцыі, якая

сфарміравалася ў рэнесанснай літаратуры Вялікага княства Літоўскага, – новалацінскай паэзіі. Новаму канцэптуальнаму асэнсаванню ідэйна-мастацкай спецыфікі і культурна-гістарычнага значэння паэмы "Пруская вайна" прысвечаны тры артыкулы Уладзіміра Кароткага, у якіх вучоны прапануе сваю арыгінальную канцэпцыю кампазіцыйных асаблівасцяў паэмы. Даследаванні беларускіх, літоўскіх і польскіх вучоных раскрываюць многія цікавыя старонкі багатай паэтычнай спадчыны Яна Вісліцкага. Тым не менш у працах розных вучоных застаюцца і шматлікія супярэчнасці, часам яўныя памылкі, звязаныя з недакладным, няўважлівым прачытаннем пэўных твораў, што ўвайшлі ў склад зборніка "Пруская вайна". Але сам паэт, ураджэнец Беларусі, пясняр Літвы і "гадаванец Польскай айчыны", паўстае са старонак свайго выдання як неардынарная творчая асоба, як паэт-наватар, які імкнуўся знайсці ў мастацтве свой шлях і, фактычна, першы асвоіў гістарычную тэматыку ў паэзіі XVI ст. У гэтым – падстава для пашырэння даследчыцкіх абсягаў вывучэння творчасці Яна Вісліцкага.

II. Да біяграфіі Яна Вісліцкага

Задача вывучэння жыццёвага і творчага шляху Яна Вісліцкага ўскладняецца поўнай адсутнасцю дакументаў XVI ст., у якіх згадвалася б яго імя. Усе высновы наконт паходжання паэта можна рабіць толькі на падставе яго ўласных твораў, змешчаных у адзіным прыжыццёвым выданні 1516 г., якое захавалася да нашых дзён. Як і ў выпадку з Мікалаем Гусоўскім, няма ўпэўненасці нават у тым, як дакладна гучыць прозвішча аўтара "Прускай вайны". Сам паэт падпісваўся *Visliciensis*, а яго настаўнік, Павел з Кросна, называў свайго вучня *Vislicius*.

Нявызначаным застаецца і месца яго нараджэння. Шэраг польскіх даследчыкаў, звязваючы прозвішча паэта з мясцовасцю Вісліца над Нідай, прытокам Віслы, лічылі яго этнічным палякам [гл.*: Kruczkiewicz. De Joannis 1887, XXXIX*]. Сапраўды, здаецца, што падстава для такога сцвярджэння ёсць. У прадмове Паўлу з Кросна паэт заяўляе: "*Quem Sigismundo, regi Sarmatiae Europae invictissimo, tandem patriae Polonae, cujus alumnum me fore profiteor, loco encenii sinceriter dicavi*" ("Я прысвяціў яе (паэму) шчыра Жыгімонту, непераможнаму каралю сармацкай Еўропы, а таксама

Польскай айчыны, гадаванцам якой я сябе прызнаю, у якасці энкомія" [*Bellum 1516, 8 n.n.*]. Тым не менш Вісліцкі (у адрозненне ад Гусоўскага) нідзе не называе сябе "палякам" ("*Polonus*"). Таму варта пагадзіцца ў дадзеным выпадку з меркаваннем Я. Парэцкага, які сцвярджаў, што "з паняццем 'айчына' Вісліцкі звязвае не толькі дзяржаўную прыналежнасць падданства ці мясцовасць, але таксама мясціны, дзе чалавек вучыўся" [*Парэцкі 1991, 14*]. Сапраўды, Ягелонскі (Кракаўскі) універсітэт стаў для выхадца з Вялікага княства Літоўскага духоўнай Айчынай. Нездарма, апяваючы ў першай кнізе "Прускай вайны" легендарнага ўладара Польшчы Крака, ён падкрэслівае першаснае значэнне заснаванага ім Кракава як асяродка культуры і навукі:

Quae canit alta Perictionii monumenta Platonis
Thespiadum, caelique meatus illa corusci
Indicat assiduo resonanti murmure vatum,
Pulchra, velut Danaas multum famata per oras
Attica, quae doctis olim fulgebat Athenis,
Vel regio Latiis Graisque decora figuris
Itala, facundis renitens doctisque patronis
[Bellum. II.158-164].

Кракаў шануе высока славутыя творы Платона,
Блізкага да Тэспіядаў: на іх нам указвае неба,
Што адгукаецца ўздоўж галасамі руплівых паэтаў.
Горад цудоўны, як Атыка, слаўная ў цэлым сусвеце,
Тая, што ззяла калісьці вучонасцю мудрых Афінаў,
Ці як Італія, слаўная грэцкай і рымскай скульптурай,
Што зіхацела вучонасцю і красамоўствам патронаў.

У прадмове Паўлу з Кросна паэт гаворыць пра сябе: "*ego ipso paene in medio barbariae natus*" ("я, народжаны амаль што ў самым цэнтры далёкага краю") [*Bellum 1516, 7 n.n.*]. Словам "*barbaria*" ("варварскія землі" або "далёкі край") у еўрапейскай літаратуры XV–XVI стст. было прынята пазначаць якраз далёкі ад каталіцкай Заходняй Еўропы Усходнееўрапейскі рэгіён, дзе, з пункту гледжання адукаваных еўрапейцаў, жылі язычнікі. На гэта звярнуў увагу В. Дарашкевіч, які сцвярджаў, што "паняцце 'варварства' ўжывалася сучаснікамі паэта ў дачыненні да земляў, населеных язычнікамі

або некатолікамі, і ‘краін Поўначы’, якія адсталі ў культурна-гістарычным развіцці ад Італіі, краіны высокай і старажытнай культуры” [*Дорошкевич 1979, 105*]. Землі Польшчы, Беларусі і Літвы ў еўрапейскай паэзіі XV–XVI стст. звычайна называлі “Сарматыяй”. Паказальна ў гэтым плане, што і свайго настаўніка, Паўла з Кросна, паэт называе ў “Заахвочвальным вершы” “*gloria Sarmaticae barbariae*” (“слава сармацкага далёкага краю”) [гл.: *Carmen exhort. 14*].

Цікава, што нямецкі пісьменнік П. Одэрборн, дзеяч лютэранскай царквы ў Вялікім княстве Літоўскім, так пісаў у сваім славутым трактаце “Праўдзівы і дакладны аповед пра рэлігію і абрады русінаў… таксама пра рэлігію і звычаі татараў” (Ростак, 1582), гаворачы пра час свайго знаходжання на Беларусі: “*Ego itaque media in barbariae haerens…*” (“Я, такім чынам, доўга жывучы ў цэнтры далёкага краю…” [*Oderborn 1582, p.2 n.n.*]. Як бачым, пісьменнік-лютэранін ужывае тут дакладна такое ж самае азначэнне, як і Ян Віслицкі. Таму слушнай здаецца заўвага В. Дарашкевіча аб тым, што “сярэдзінай варварства” Ян Віслицкі, хутчэй за ўсё, называе пераважна праваслаўную Беларусь, якая ў геаграфічных адносінах займала сярэдзіннае становішча ў “еўрапейскай Сарматыі” [*Дорошкевич 1979, 106*] – у той вялікай дзяржаве, якая ***de jure*** была занатавана актам Люблінскай дзяржаўнай уніі 1569 г., але ***de facto*** пачала існаваць яшчэ з часоў Казіміра Ягелона. І паколькі Кракаў – сталіца Польскай Кароны – быў агульным культурным цэнтрам для жыхароў каронных і вялікакняскіх земляў, то метанімічна Рэч Паспалітая ў гістарычнай і мастацкай літаратуры (асабліва лацінамоўнай) называлася Палоніяй. Такое дваістае ўспрыняцце Айчыны паўплывала на тое, што ў творчасці беларускіх паэтаў-лацініstаў фарміруецца новы – “рэчыпаспалітаўскі” – тып патрыятызму, які ніяк не пярэчыў патрыятызму “ліцвінскаму”, а быў (у той перыяд) яго лагічным працягам. З іншага боку, небеспадстаўным здаецца тут і заўвага Я. Парэцкага, што ў словы “*in medio barbariae*” паэт укладае горкую іронію ў адрас ганарыстых каронных уладарнікаў, “якія ацэньваюць яго радзіму як невядомы глухі край” [*Парэцкі 1991, 29*].

Апісваючы склад насельніцтва дзяржавы Ягелонаў, Ян Віслицкі ўжывае выраз “*triplices Rutheni*” (“траістыя русіны”). Відавочна, паэт меў уяўленне пра так званую “траістую Русь”: Чорную, Белую і Чырвоную. Падобны этнонім наўрад ці мог бы ўжываць

этнічны паляк. В. Дарашкевіч прыгадвае назву беларускай рачулкі Вісліца, што ўпадае ў возера Пагост (раён паміж Клецкам і Пінскам). Калісьці там магло быць мястэчка або вёска Вісліца, адкуль і паходзіў паэт. Гіпотэзу В. Дарашкевіча пацвярджае беларускі мовавед М. Прыгодзіч, які сведчыць, што рэчка Вісліца працякала па тэрыторыі Піншчыны да меліярацыі 50–60-х гг. [*Прыгодзіч 2003, 35*]. Нездарма ў фінале паэмы "Пруская вайна", апяваючы вялікага князя і караля Аляксандра Ягелона, Ян Вісліцкі прыгадвае толькі адну, апошнюю перамогу ўладара – у бітве з татарамі пад Клецкам у 1506 г. У гэтай бітве маглі браць удзел блізкія, кроўныя і знаёмыя паэта. Нарэшце, у зборнік "Пруская вайна" ўключана аб'ёмістая (10 радкоў элегічнага двуверша і 86 радкоў алкеевай страфы) "Ода найяснейшаму ўладару Жыгімонту…", прысвечаная ўслаўленню перамогі аб'яднаных войскаў Польскай Кароны і Вялікага княства Літоўскага на чале з князем Канстанцінам Іванавічам Астрожскім над войскамі Івана Грознага ў 1514 г. пад Оршай. Гэтая славутая перамога была апета ў панегірычных вершах розных лацінамоўных паэтаў (Яна Дантышка, Крыштафа Сухценя, Анджэя Кшыцкага), але толькі ў Яна Вісліцкага апісанне перамогі пад Оршай напоўнена лірычным настроем, што сведчыць пра асаблівае стаўленне паэта да гэтай бітвы. Праз пачуцці радасці і трыумфальнага лікавання прарываецца і балючы вокліч паэта:

Lithuana quos (hostes. – edit.) suos per orbes
Senserat, heu! regio molesta [*Ode.28*].

Літоўскі край! О колькі болю
Вораг прынёс у твае ўладанні!

Толькі для беларуса па паходжанні маглі стаць крыніцай асабістых перажыванняў ключавыя падзеі айчыннай гісторыі, ад якіх залежыў лёс дзяржавы, народа і кожнага суайчынніка.

Гады нараджэння і смерці Яна Вісліцкага застаюцца загадкай гісторыі. Ёсць падставы меркаваць, што будучы паэт правёў свае юнацкія гады ў Кракаўскім універсітэце, дзе вучыўся ў магістра Паўла з Кросна, якога пазней называў сваім ідэйным настаўнікам. Б. Кручкевіч знайшоў у зборы дакументаў Ягелонскага універсітэта, падрыхтаваным Ю. Мучкоўскім, некалькіх Янаў з Вісліцы. У 1505 і 1506 гг. навучэнцы з такім імем атрымалі ступень бака-

лаўра, у 1510 г. Ян з Вісліцы (*Vyszlycza*) стаў магістрам. Сам польскі выдавец твораў Вісліцкага выказвае сумненне, што гэта быў аўтар "Прускай вайны", паколькі, па словах даследчыка, "ані сам Ян у сваёй кнізе не карыстаецца навуковым тытулам, ані Павел у элегіі, прысвечанай яму, не ўганароўвае яго такім чынам" [*Kruczkiewicz. De Joannis1887, XL*]. В. Дарашкевіч, аднак, атаясамлівае з аўтарам "Прускай вайны" таго Яна Вісліцкага, які згодна дакументам стаў бакалаўрам у 1506 і магістрам у 1510 г., бо менавіта ў гэтыя гады ён мог слухаць лекцыі Паўла з Кросна, які памёр у 1517 г. [*Дорошкевич 1979, 93*]. Гіпотэза В. Дарашкевіча здаецца прымальнай, у той час як аргументацыя Б. Кручкевіча даволі сумніўная: вядома, што беларускі асветнік і першадрукар Францыск Скарына ў пасляслоўях да выдадзеных ім кніг "Бібліі" пазначаў у дачыненні да сябе толькі ступень доктара медыцыны, хаця зразумела, што ён меў і ступень магістра свабодных мастацтваў.

Такім чынам, прыкладны час нараджэння Яна Вісліцкага, таксама як і Францыска Скарыны (паводле адной з гіпотэз), вылічаецца ў сувязі з тэрмінам яго навучання ў Кракаўскім універсітэце. Калі паэт атрымаў ступень бакалаўра ў 1506 г., то нарадзіўся, як прынята лічыць у сучасным гістарычным літаратуразнаўстве, хутчэй за ўсё, паміж 1485 і 1490 гг.

С. Віткоўскі, абапіраючыся на архіўныя матэрыялы, сцвярджае, што, калі лічыць аўтарам "Прускай вайны" таго самага Яна з Вісліцы, які атрымаў ступень магістра ў 1510 г., то ён жа ў 1510–1512 гг. працаваў у Кракаўскім універсітэце як "*magister-extraneus non de facultate*" ("выкладчык-іншаземец, не з асноўнага (выкладчыцкага) складу"). Пра педагагічную дзейнасць Яна Вісліцкага на працягу гэтых двух гадоў С. Віткоўскі паведамляе наступнае. У 1510 г. Ян Вісліцкі чытаў у летнім семестры "Топіку" Арыстоцеля, у зімовым – "Элементы геаметрыі" Эўкліда. У 1511 г. у летнім семестры займаўся арыфметыкай і музыкай, у зімовым чытаў курс па Цыцэрону (трактат "Пра абавязкі"). У 1512 г. у летнім семестры Ян з Вісліцы чытаў курс, прысвечаны трактату "Пра паходжанне душы" Альберта Вялікага; па невядомых прычынах гэты курс не быў дачытаны да канца [гл.: *Witkowski 1891, 36*]. Факт выкладання нашым суайчыннікам разнастайных курсаў з розных галін навукі – яскравае сведчанне таго, што Ян Вісліцкі, паэт-лацініст,

быў сапраўдным тытанам эпохі Адраджэння, чалавекам высокай еўрапейскай культуры і вялізнай эрудыцыі.

У асяроддзі Ягелонскага універсітэта на пачатку XVI ст. панавала сапраўдная інтэлектуальна-творчая атмасфера. Кракаў стаў месцам канцэнтрацыі лепшых творчых сіл і талентаў усёй Еўропы. С. Віткоўскі даводзіць, што Ян Вісліцкі, пэўна, быў знаёмы з нямецкім гуманістам Рудольфам Агрыкалам малодшым, які прыкладна ў гэты час вучыўся тут у Міхала з Вроцлава, а пазней працаваў ва універсітэце ў якасці прафесара рыторыкі і філалогіі. Больш блізкія адносіны, несумненна, звязвалі Яна Вісліцкага са швейцарскім гуманістам Валянцінам Экіем, які напісаў верш у падтрымку паэта ў цяжкім для яго 1515 г. [гл.: *Witkowski 1891, 40*].

Пытанне пра час стварэння паэмы "Пруская вайна" дастаткова грунтоўна даследавалі Б. Кручкевіч, С. Віткоўскі і М. Езяніцкі. Б. Кручкевіч вылучыў меркаванне, што "Пруская вайна" існавала ў рукапісе ўжо ў 1514 г. Гэтую выснову вучоны зрабіў на падставе пачатковых радкоў эпіграмы, напісанай у 1514 г. Паўлам з Кросна да яго "Сапфічнага верша пра зруйнаванне пекла і трыумф Хрыста":

Non ego cypriacos decanto, crede, triumphos,
Non refero veterum facta profana patrum [*Pauli 1887, 135*].

Павер, я не апяваю трыумфаў Кіпрыды,
Не распавядаю пра цёмныя дзеі старажытных продкаў…[1]

Б. Кручкевіч лічыць, што ў гэтых словах Павел з Кросна намякае на прачытаную ім на той момант "Прускую вайну" Яна Вісліцкага, паколькі ў трэцяй кнізе паэмы распавядаецца якраз пра шлюб караля Ягайлы з ласкі спагаднай Венеры (Кіпрыды), і паэт, маўляў, апявае той самы "трыумф Кіпрыды"; цэлая ж паэма датычыцца прынамсі старажытных дзеяў з гісторыі Польшчы [*Pauli 1887, 135*]. Аднак такое дапушчэнне падаецца вельмі нацягнутым, і на гэта звярнуў увагу М. Езяніцкі, зазначыўшы, што працытаваныя радкі ўтрымліваюць занадта агульную думку, каб прымаць іх за доказ напісання "Прускай вайны" ў 1514 г. [*Jezienicki 1888. Z.3, 135*]. Сапраўды, прыведзеныя радкі эпіграмы Паўла з Кросна

[1] Тут і далей падрадкоўныя пераклады нашы (*Ж. Н.-К.*)

прасякнуты іроніяй, якая наўдрад ці магла быць скіравана супраць вучня. Хутчэй за ўсё, Павел з Кросна меў тут на ўвазе сваіх папярэднікаў і сучаснікаў – паэтаў, якія звярталіся пераважна да дзвюх тэм: услаўленне кахання і апяванне подзвігаў славутых продкаў. Так, яшчэ польскія паэты XV ст. стварылі шэраг любоўных лістоў *ad amasiam* (“да каханай”), а таксама так званыя вершы-“эротыкі” [*Brьkner 1958, 558*]. Калі гаварыць канкрэтна пра апяванне “трыумфаў Кіпрыды” (шлюбных ўрачыстасцяў), то цэлы шэраг эпіталам-панегірыкаў з’явіўся ў 1512–1513 гг., з нагоды шлюбу караля Жыгімонта і Барбары Заполіі (аўтарам адной з іх, дарэчы, быў Павел з Кросна). “Цёмныя дзеі старажытных продкаў” былі прадметам паэтычнага аповеду славутага паэта XV ст. Калімаха (Філіпа Буанакорсі), які найбольшую ўвагу надаваў паэтычным жыццяпісам святых [*Ziomek 2002, 78*].

Не прымаючы гіпотэзы Б. Кручкевіча, М. Езяніцкі на падставе тэксталагічнага аналізу даказвае, што Ян Вісліцкі стварыў паэму (і ўвесь зборнік) у некалькі этапаў. Праца над “Прускай вайной”, на думку даследчыка, распачалася яшчэ ў 1513, і ў 1514 г. быў створаны яе першы варыянт. Пасля перамогі пад Оршай у 1514 г. паэт перапрацаваў свой твор да таго, як аддаў яго ў друк [*Jezienicki 1888. Z.3, 137*]. Вучоны аргументуе сваю гіпотэзу тым, што ў 221–223-м радках III кнігі “Прускай вайны” размова ідзе пра вайну з маскоўцамі як яшчэ няскончаную, аднак у II кнізе “Прускай вайны” (р. 486–492) яўна апісваюцца наступствы бітвы пад Оршай (паколькі пра ўцёкі цара Васілія паэт гаворыць і ў “Одзе Жыгімонту”). Такім чынам, на думку М. Езяніцкага, пасля перамогі пад Оршай паэт не толькі напісаў “Оду…”, але і выправіў некаторыя эпізоды паэмы “Пруская вайна”, аднак, магчыма, забыўся выправіць 221–223-і радкі з III кнігі.

С. Віткоўскі, улічваючы тое, што ў III кнізе “Прускай вайны” Ян Вісліцкі гаворыць пра вяртанне войска пераможцаў пасля Аршанскай бітвы ў Вільню (22 верасня 1514 г.), але не гаворыць пра яго трыумфальны ўваход у Кракаў (4 лютага 1515 г.), робіць выснову, што паэма была напісана пасля 22 верасня 1514 г. [гл.: *Witkowski 1891, 370*]. Пры гэтым даследчык не згаджаецца з дапушчэннем М. Езяніцкага пра існаванне дзвюх рэдакцый паэмы. Ён лічыць, што, напэўна, у канцы 1514 або ў пачатку 1515 г. (але

не ў 1516-м, як сцвярджаў М. Езяніцкі [*Jezienicki 1888. Z.3, 137*]), Ян Вісліцкі зрабіў першую спробу надрукаваць рукапіс, аднак атрымаў адмоўныя рэцэнзіі і звярнуўся па дапамогу да настаўніка, Паўла з Кросна. Паколькі апошні вярнуўся ў Кракаў з Венгрыі толькі ў сакавіку 1515 г., то, адпаведна, не магла быць напісана раней яго "Элегія Яну Вісліцкаму". Магчыма, што ў хуткім часе, вясною ці летам 1515 г., паэт ізноў перадае свой рукапіс у друкарню Яна Галера, і вынікам гэтай другой спробы стала надрукаванне ў 1516 г. паэтычнага зборніка "Пруская вайна".

Б. Кручкевіч і С. Віткоўскі на падставе аднаго з лістоў Паўла з Кросна лічаць, што аўтар "Прускай вайны" пэўны час выконваў абавязкі сакратара вэлюньскага старасты Станіслава з Куразванак. У гэтым лісце, адрасаваным менавіта вэлюньскаму старасту, Павел з Кросна распавядае, што падчас вяртання з Венгрыі ў Кракаў яго віталі навучэнцы, сярод якіх быў таксама "*Joannes Vislicius, tuae magnificentiae grammateus, vir non minore virtute, quam eruditione et disciplinae, tuique nominis ac laudis apprime studiosus, honestus inter commendandum de magnificentia tua sermo coeptus est*" ("Ян Вісліцкі, сакратар тваёй вялебнасці, муж вялікай годнасці і не меншай адукаванасці ды вучонасці, асабліва прыхільны да ўхвалення твайго імя, самы годны сярод тых, каму даручана было (вітаць), першы выступіў з прамовай ад імя тваёй вялебнасці") [*Pauli 1887, 150*]. М. Езяніцкі лічыць гэтую гіпотэзу малаверагоднай, паколькі, на думку вучонага, словам "*vir*" называлі па-лацінску мужчыну сталага ўзросту [гл.: *Jezienicki 1888. Z.2, 85*]. Сапраўды, сам паэт называе сябе ў паэме "Пруская вайна" "*juvenis*" ("юнак") і нават "*tener puellus*" ("малады хлопец") [*Bellum I. 233-236*]. Калі ж прыняць пад увагу меркаванне С. Віткоўскага пра тое, што слова "*vir*" ужыта тут "з пэўным выразам павагі і не мае дачынення да ўзросту" [*Witkowski 1891, 43*], то незразумела, чаму ў сваёй элегіі, прысвечанай Яну Вісліцкаму, Павел з Кросна не выкарыстоўвае гэтага слова "дзеля павагі" пры звароце да аўтара "Прускай вайны", а называе яго проста "*discipulus*" ("вучань"). Няма, аднак, падстаў катэгарычна не згаджацца з гіпотэзай пра сакратарства аўтара "Прускай вайны" ў Станіслава з Куразванак. У прадмове Паўлу з Кросна Ян Вісліцкі называе сваю паэму "вынікам бяссоннай працы" – магчыма, менавіта таму, што літаратурныя заняткі яму прыходзілася сумяшчаць з выкананнем службовых абавязкаў.

Большасць даследчыкаў адзначаюць, што пасля 1516 г. ніякіх звестак пра Яна Вісліцкага не захавалася. Пры гэтым звяртаецца ўвага на тое, што ў "Элегіі", напісанай у 1515 г., паэт прасіў Багародзіцу, каб яна вынішчыла мор, які ахапіў у той час Польшчу і Літву. Гэта дало падставы шэрагу даследчыкаў меркаваць, што маравая эпідэмія загубіла маладога, таленавітага паэта [*Дорошкевич 1979, 107-108*]. Тым не менш Я. Смярэка яшчэ ў 1932 г. адзначаў: "Апошнюю згадку пра Яна з Вісліцы мы знаходзім у англічаніна Леанарда Кокса: прадстаўляючы ў 1518 г. панегірык '*De laudibus celeberrimae Cracoviensis Academiae*', ён у ліку навучэнцаў і выкладчыкаў Ягелонскага універсітэта з галіны рыторыкі і паэзіі згадаў, побач з Паўлам з Кросна, Яна з Вісліцы (апроч таго, Сакрана, Кшыцкага, Дантышка і Агрыкалу)" [гл.: *Smereka 1932, 12-13*]. Знойдзены ж мною зборнік "*De praesenti bello Prutenico*" ў экземпляры бібліятэкі Асалінскіх (падрабязна пра гэта расказваецца далей) прадстаўляе грунт для іншай гіпотэзы і можа служыць сведчаннем таго, што аўтар "Прускай вайны" быў жывы і займаўся літаратурнай творчасцю яшчэ ў пачатку 20-х гг. XVI ст.

III. Архітэктоніка і творчая гісторыя зборніка "Пруская вайна"

У 1516 г. кракаўскі друкарскі двор Яна Галера выдаў паэтычны зборнік Яна Вісліцкага "*Bellum prutenum*". Адзін з экземпляраў гэтага першадруку захоўваецца сёння ў Кракаўскай бібліятэцы Ягелонскага універсітэта (сігнатура 4120). Менавіта на падставе гэтага экземпляра Б. Кручкевіч выдаў творы Яна Вісліцкага, што ўваходзілі ў склад зборніка "Пруская вайна". Беларускія даследчыкі, на жаль, не працавалі непасрэдна з першадрукам. В. Дарашкевіч цытуе творы Яна Вісліцкага паводле перавыдання Я. Смярэкі (1933 г.). Я. Парэцкі, хаця спасылаўся ў сваёй манаграфіі на выданне 1516 г., але, па ўсім відаць, карыстаўся адным з польскіх перавыданняў. Гэта зразумела з таго, што вучоны ў спасылках недакладна прыводзіць назву "Элегіі да Багародзіцы Панны Марыі" [*Парэцкі 1991, 110*]. Пры пераліку твораў, што ўвайшлі ў склад зборніка, Я. Парэцкі зусім не ўспамінае пра вершы Паўла з Кросна і Валянціна Экія, надрукаваныя разам з творамі Яна Вісліцкага [*Парэцкі 1991, 5-6*].

Згаданыя вышэй кракаўскія вучоныя, першыя даследчыкі "Прускай вайны" (М. Вішнеўскі, К. Мехежынскі, Б. Кручкевіч, М. Езяніцкі), апісвалі і даследавалі гэты выдатны паэтычны помнік паводле экземпляра, які захоўваўся ў кракаўскай Ягелонскай бібліятэцы. Прафесар Б. Кручкевіч у сваім фундаментальным даследаванні, прысвечаным творчасці Паўла з Кросна і Яна з Вісліцы, паведамляе пра зборнік "Пруская вайна" наступнае: "Унікальны, наколькі я ведаю, экземпляр гэтай кнігі знаходзіцца ў бібліятэцы Ягелонскай Кракаўскага універсітэта" [*Kruczkiewicz. De Joannis 1887, XIV*]. Далей вучоны падрабязна апісвае структуру зборніка Яна Вісліцкага – ад чатырохрадковай уступнай эпіграмы да заключнай эпіграмы на зайздросніка. Следам за Б. Кручкевічам прафесар А. Брандоўскі сцвярджае: "Адзіны наяўны, як падаецца, экземпляр гэтага выдання захаваўся ў кракаўскай універсітэцкай бібліятэцы" [*Brandowski 1886. N 611. S.5400*].

Менавіта дзякуючы Б. Кручкевічу ў польскім і беларускім гістарычным літаратуразнаўстве замацавалася думка пра унікальнасць, адзінкавасць паэтычнага выдання Яна Вісліцкага. В. Дарашкевіч адзначае: "У Ягелонскай бібліятэцы захаваўся адзіны экземпляр паэтычнага зборніка Яна Вісліцкага 'Пруская вайна', выдадзены ў Кракаве ў 1516 годзе" [*Дорошкевич 1979, 73*]. Я. Парэцкі ў пачатку кнігі "Ян Вісліцкі" прыводзіць поўны спіс твораў паэта, прадстаўленых, як піша даследчык, "у адзіным захаваным кракаўскім выданні 1516 г." [*Парэцкі 1991, 5*].

І ўсё ж зборнік "Пруская вайна" існуе па меншай меры ў двух экземплярах. Другі асобнік гэтага выдання мне ўдалося знайсці ў бібліятэцы Асалінскіх у Вроцлаве (сігнатура 2750). Аднак ён значна адрозніваецца ад кракаўскага. Перад тытульным аркушам, якім адкрываецца кракаўскі экземпляр (з выяваю арла ў спалучэнні з ініцыялам "***S***", тытулам "***Bellum Prutenum***" і чатырохрадковай эпіграмай), у вроцлаўскім экземпляры падшыты яшчэ тры аркушы. На першым – у атачэнні дзвюх віньетак тытульны надпіс **"*De presenti bello Prutenico*"** ("Пра сённяшнюю Прускую вайну", гл.: *De praesenti, p.1 n.n.)*; на адвароце –

1) празаічная прадмова да чытача пад назваю "***De bello Prussiae amicus amico***" ("Сябар – сябру пра вайну Прусіі"; гл.: *De praesenti, p.2 n.n.*);

на наступнай старонцы –

2) панегірык, напісаны элегічным двувершам, пад назваю "***Divo Sigismundo Poloniae Regi invicto***" ("Боскаму Жыгімонту, непераможнаму каралю Польшчы"; гл.: *De praesenti, p.3 n.n.*).

На адвароце гэтага аркуша пачынаецца

3) вершаваны твор таксама элегічным двувершам "***In exercitum Germanum Polonos fugientem***" ("Да войска германцаў, што ўцякаюць ад палякаў", гл.: *De praesenti, p.4–6 n.n.*).

Далей, як ужо адзначалася, ідзе тытульны аркуш і ўсе астатнія старонкі зборніка ***"Bellum Prutenum"*** – таго ж выдання, асобнік якога захоўваецца ў Ягелонскай бібліятэцы.

На трох старонках першай часткі экземпляра з бібліятэкі Асалінскіх (пад агульным загалоўкам "Пра сённяшнюю Прускую вайну") не фігуруе ні імя аўтара, ні год і месца выдання, таму з поўнай дакладнасцю аўтарства празаічнай прадмовы і двух вершаў устанавіць нельга. Аднак структура зборніка "Пруская вайна", а таксама змест трох твораў пад агульнай назвай "Пра сённяшнюю Прускую вайну" прадстаўляюць дастаткова важкія аргументы на карысць таго, што аўтарам гэтых трох твораў быў таксама Ян Вісліцкі. Галоўны з гэтых аргументаў – кампазіцыйна-мастацкія асаблівасці абодвух зборнікаў.

Зборнік "Пруская вайна", на падставе якога да сённяшняга дня вывучаецца творчасць Яна Вісліцкага, уяўляе вялікую цікавасць не толькі зместам надрукаваных у ім твораў, але і спосабам іх размяшчэння ў самім выданні. Вядома, што кніжнае выданне ў часы сярэднявечча будавалася ў адпаведнасці з пэўнымі прынцыпамі і правіламі. Архітэктоніка зборніка "Пруская вайна" мае сваю спецыфіку ў параўнанні з іншымі паэтычнымі выданнямі таго часу. Як адзначаў У. Кароткі, істотным элементам любога кніжнага выдання XVI–XVII стст. з'яўляецца яго прадмоўна-пасляслоўны комплекс [гл.: *Кароткі 1991, 8*]. Выпрацаваўшы сваю ўстойлівую форму ў сярэдзіне XVI ст., гэтая кнігавыдавецкая мадэль пачала фарміравацца пад уплывам традыцый заходнееўрапейскага кнігадруку яшчэ ў пачатку гэтага стагоддзя. На першы погляд, выданне Яна Вісліцкага 1516 г. уключае ў сябе ўсе істотныя элементы прадмоўна-пасляслоўнага комплексу: геральдычную выяву белага арла з ініцыялам "***S***" ("*Sigismundus*"), эпіграму, празаічнае прысвячэнне; у канцы зборніка знаходзім традыцыйны выдавецкі калафон "*Impressum Cracoviae impensis famati domini Joannis Haller civis*

Cracoviensis Anno Domini M.D.XVI" ("Надрукавана ў Кракаве на сродкі славутага пана Яна Галера, Кракаўскага месціча, у год Панскі 1516" [гл.: ***Bellum 1516 (K), p.58 n.n.***].

Больш дэталёвы аналіз структуры зборніка "Пруская вайна" выяўляе яго адметнасць у параўнанні з класічнай кракаўскай кнігавыдавецкай мадэллю таго часу. Частка выдання, якая папярэднічае ўласна паэме, уключае не толькі творы Яна Вісліцкага. Адкрывае прадмоўны комплекс чатырохрадковая эпіграма, напісаная элегічным двувершам. Гэта своеасаблівы паэтычны ўступ (*introductio*), змешчаны на тытульным аркушы выдання, што адпавядала тагачаснай выдавецкай традыцыі. Так, напрыклад, настаўнік Яна Вісліцкага Павел з Кросна змясціў сваю эпіграму "*Lectori studioso*" на тытульным аркушы кракаўскага выдання 1512 г. "*In Cosmographiam Claudii Ptolemaei Alexandrini introductio*", надрукаванага Янам Стобніцкім. Гэтая традыцыя захоўвалася яшчэ ў 30-я гг. XVI ст.: славуты паслядоўнік Яна Вісліцкага, Мікалай Гусоўскі, змясціў сваю чатырохрадковую эпіграму "*Oratio de passione Domini*" ("Прамова пра пакуты Пана") у кнізе Аўрэлія Ліпы (Брандаліна) у 1533 г.

На наступных пасля тытульнага аркуша старонках змешчаны:

"*Carmen exhortatorium Joannis Visliciensis ad Musam M. Pauli Rutheni…*" ("Заахвочвальны верш Яна Вісліцкага да Музы м[агістра] Паўла Русіна…"), пасля якога надрукавана слова "***Finis***" ("канец" або "мяжа") – 50 радкоў элегічнага двуверша [гл.: ***Bellum 1516, p.2-3 n.n.***];

"*Elegia magistri Pauli Crosnensis Rutheni ad Joannem Visliciensem, Pieridum cultorem, discipulum non poenitendum*" ("Элегія настаўніка Паўла Кросненскага Русіна Яну Вісліцкаму, аматару Піэрыдаў, вучню, які не павінен раскайвацца") – 86 радкоў элегічнага двуверша [гл.: ***Bellum 1516, p.4-7 n.n.***];

"*Venerabili ac egregio viro Magistro Paulo de Crosna… Joannes Visliciensis salutem ac felicitatem*" ("Шаноўнаму і славутаму мужу, магістру Паўлу з Кросна… Ян Вісліцкі [жадае] здароўя і шчасця") – празаічная прадмова [гл.: ***Bellum 1516, p.7-8 n.n.***];

"*Pro recomendatione disertissimi Phoebae lyrae moderatoris Joannis Visliciensis ad invictissimum Sigismundum Poloniae Regem carmen Valentini Eckii Philiripolitani*" ("Верш Валянціна Экія Філірыпалітанскага для рэкамендацыі непераможнаму каралю Польшчы Жыгімонту вельмі вопытнага майстра Фебавай ліры Яна

Вісліцкага") – 16 радкоў элегічнага двуверша [гл.: *Bellum 1516, p.9 n.n.*];

"*Argumenta libellorum Belli Pruteni*" ("Кароткі змест кніг 'Прускай вайны') – 16 радкоў элегічнага двуверша [гл.: *Bellum 1516, p.9–10 n.n.*];

"*Ode tricolos tetrastrophos lectori*" ("Ода чытачу [, напісаная] алкеевай страфою") – 32 радкі алкеевай страфы [гл.: *Bellum 1516, p.10–11 n.n.*].

З дванаццатай старонкі пачынаецца тэкст паэмы пад агульным загалоўкам "*Belli Pruteni tres libelli*" ("Тры кнігі 'Прускай вайны'"), прычым паэма, як вынікае з яе загалоўка, прысвечана "Найсвятлейшаму Уладару і Пану, Пану Жыгімонту, з Божай ласкі каралю Польшчы" [гл.: *Bellum 1516, p.12 n.n.*]. На стронцы 50, пасля заканчэння тэксту трэцяй кнігі паэмы "Пруская вайна", чытаецца слова "***фЭлпт***" ("канец" або "мяжа"). Заўважым, што гэта ўжо другое пазначэнне падобнага кшталту (слова "***Finis***", як адзначана вышэй, фігуруе ў зборніку пасля тэксту "Заахвочвальнага верша…").

Акрамя паэмы "Пруская вайна", у выданні змешчаны яшчэ чатыры вершаваныя творы, якія не маюць непасрэднай сюжэтнай сувязі з цэнтральным творам зборніка: "Ода каралю Жыгімонту", "Ямбічны трыметр Пятру Таміцкаму", "Элегія да Багародзіцы Панны Марыі", "Эпіграма на зайздросніка". Пасля тэксту "Оды да Жыгімонта" зноў надрукавана слова "***finis***" [*Bellum 1516, 55 n.n.*]. З якой мэтай ужываюцца гэтыя "межавыя" словы аўтарам зборніка "Пруская вайна"?

У празаічнай прадмове Паўлу з Кросна паэт намякае на нейкія "турботы цяжкай працы" і "ганьбаванні заілаў". Гэтыя словы паэта даследчыкі звязваюць з тымі цяжкасцямі, якія напаткалі маладога паэта пры першай спробе надрукаваць яго паэтычны зборнік у 1515 г., калі рукапіс атрымаў адмоўныя рэцэнзіі. Я. Парэцкі выказвае нават смелае меркаванне пра тое, што Вісліцкі мог быць у апазіцыі да сваіх сучаснікаў – прыдворных паэтаў Яна Дантышка і Анджэя Кшыцкага [*Парэцкі 1991, 24-25*]. Яны, ці іх паслядоўнікі, і маглі быць тымі самымі рэцэнзентамі-"заіламі". Ян Вісліцкі не піша (і не мог напісаць!) пра гэта адкрыта, але, магчыма, у сваім выданні пры дапамозе слова ***"Finis"*** намагаўся прадставіць выпукла, на візуальным узроўні няпростую гісторыю свайго паэтычнага опуса. Паспрабуем узнавіць логіку загадкавай архітэктонікі "Прускай вайны" і яе адпаведнасць храналогіі.

1) Ян Вісліцкі ў пачатку 1515 г. [гл.: *Witkowski 1891, 43*] падрыхтаваў да друку збор сваіх паэтычных твораў. Паэт аддаў рукапіс зборніка *"Bellum Prutenum"* рэцэнзентам, якія не далі дазволу на публікацыю яго твораў, найперш – паэмы *"Belli Pruteni tres libelli"* [гл.: *Kruczkiewicz. De Joannis 1887, XLI*].

2) Паэт пакутліва перапрацаваў свае творы (ізноў жа, у першую чаргу – паэму). Адначасова ён напісаў "Заахвочвальны верш да Музы магістра Паўла Русіна", перадаў яго настаўніку і чакаў адказу.

3) Павел з Кросна напісаў элегію, у якой ухваліў працу свайго вучня. Напрыканцы гэтага сачынення Павел з Кросна змясціў вельмі важныя для маладога паэта радкі:

Et nova Vislicii carmina pondus habent.
Accipias igitur vulti mea carmina laeto,
Carmina Sarmaticis rusticiora locis [Elegia magistri, 82–84].

Новыя песні яго[2] маюць, бясспрэчна, вагу.
Так што прымі мае песні з прыхільнай душою і сэрцам,
Песні, прасцейшыя, мо, як для Сармацкай зямлі.

Швейцарскі гуманіст Валянцін Экій, напэўна, у тым жа годзе напісаў рэкамендацыйны верш для караля з прапановаю звярнуць увагу на таленавітага "майстра Фебавай ліры". Ян Вісліцкі з новымі сіламі прымаецца за працу і фарміруе абноўлены рукапіс зборніка. Як шчыт дзеля абароны ад новых "заілаў" паэт "выстаўляе" на пачатку зборніка свой "Заахвочвальны верш…" і элегію Паўла з Кросна.

Пра час напісання празаічнай прадмовы Паўлу з Кросна сведчаць наступныя словы, звернутыя Янам Вісліцкім да настаўніка: "*suffragio tamen virtutis tuae, vir celeberrime, tutus*" ("абаронены ўхваленнем ад твайго таленту, о славуцейшы муж") [*Bellum 1516, p.8 n.n.*]. Б. Кручкевіч мяркуе, што ў гэтых словах паэт намякае на элегію Паўла з Кросна, прысвечаную Яну Вісліцкаму, у якой настаўнік ухваліў яго паэму "Пруская вайна" [гл.: *Pauli 1887, 168*]. Калі прыняць гэтае дапушчэнне, тады атрымліваецца, што празаічнае прысвячэнне было напісана пасля элегіі Паўла з Кросна,

[2] Яна Вісліцкага.

якая, у сваю чаргу, павінна была з'явіцца пасля "Заахвочвальнага верша" Яна Вісліцкага.

Заявіўшы пра тое, што прысвяціў свой твор каралю Жыгімонту, Ян Вісліцкі лагічна змяшчае перад "Аргументамі" верш Валянціна Экія, у якім ідзе гаворка пра рэкамендацыю твораў паэта каралю.

Трэба думаць, што на памяць пра пакутлівы для яго перыяд Ян Вісліцкі паставіў слова ***"finis"*** пасля "Заахвочвальнага верша…", паколькі час паміж напісаннем гэтага твора і чаканнем адказу ад Паўла з Кросна стаў сапраўднай **мяжой** у творчым жыцці пісьменніка. Верш да Паўла з Кросна стаўся своеасаблівай прэлюдыяй, якая тлумачыць кампазіцыйную і змястоўную спецыфіку ўсяго зборніка. Слова ***"finis"*** пасля гэтага верша Яна Вісліцкага можна супаставіць з традыцыйнымі скарынаўскімі формуламі "Конець Предъсловия", "Конецъ Сказания" (гл.: *Скарына 1990, 10; 124*).

Што да слова ***"фЭлпт"***, то яго з'яўленне ў канцы паэмы "Пруская вайна" адпавядае кнігавыдавецкай традыцыі XVI ст. Так, па заканчэнні тэксту паэмы "Радзівіліяда" ў паэтычным зборніку Яна Радвана чытаем *"Finis Radiviliadis"* [*Radvanus 1588, 143*]. Гэтым словам, па ўсім відаць, пазначалі заканчэнне вялікага эпічнага твора. Каб зразумець прычыну з'яўлення слова *"finis"* пасля "Оды да караля Жыгімонта", варта ўспомніць дапушчэнне М. Езяніцкага, што пасля перамогі пад Оршай у 1514 г. паэт перапрацаваў свой твор да таго, як аддаць яго ў друк [*Jezienicki 1888. Z.3, 137*]. У такім выпадку "адмежаванне" оды ад астатніх твораў зборніка таксама апраўдана з храналагічнага пункту гледжання. Такім чынам, у асаблівасцях архітэктонікі свайго зборніка паэт зрабіў спробу адлюстраваць храналогію яго стварэння.

Нягледзячы на імкненне Яна Вісліцкага прывесці ў сістэму тыя творы, што папярэднічаюць паэме "Пруская вайна", змяненне аўтарам архітэктонікі абноўленага зборніка прыводзіць да канчатковага парушэння структуры прадмоўнага комплекс, элементы якога (эпіграма, прысвячэнне, прадмова) перамяжоўваюцца з іншымітворамі. Ды й нават калі паспрабаваць "сабраць" тыя творы, якія можна аднесці да прадмоўнага комплексу, мы ўсё роўна заўважым пэўную непаслядоўнасць. Празаічны твор, звернуты да Паўла з Кросна, толькі фармальна (на падставе адпаведнага дэдыкацыйнага пасажу ў тытуле твора) можа класіфікавацца як прысвячэнне, а ў літа-

ратурных адносінах гэты твор уяўляе сабой прадмову[3], прычым адрасаваную не каралю, а настаўніку. Нават "Ода чытачу", якая паводле назвы павінна была б выконваць ролю кананічнай прадмовы да чытача, паводле зместу выяўляе сваё зусім іншае прызначэнне.

Выданню "Пруская вайна", тытульны аркуш якога ўпрыгожаны гербам Жыгімонта, яўна бракавала спецыяльнага дэдыкацыйнага твора, адрасаванага манарху, тым больш што ў паэме "Пруская вайна" аўтар прысвяціў каралю-сучаснiку нямала ўзнёслых, хвалебных радкоў. Успомнім, што адпаведны элемент прадмоўнага комплексу прадстаўлены ў паэтычным зборніку Мікалая Гусоўскага "*Carmen de statura, feritate ac venatione bisontis*" ("Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго"; Кракаў, 1523): адразу ж пасля тытульнага аркуша змяшчаецца герб Сфорцаў у атачэнні дзвюх эпіграм эмблематычна-панегірычнага зместу [гл.: *Carmen 1523, p.2 n.n.*].

Калі ж прааналізаваць структуру зборніка "Пра сённяшнюю Прускую вайну" з экземпляра бібліятэкі Асалінскіх, то фарміруецца непазбежнае ўражанне, што гэтыя тры творы дапаўняюць тое, чаго не хапае ў зборніку "Пруская вайна"! Калі "Ода да чытача", што папярэднічае паэме "Пруская вайна", – гэта асобны верш Яна Вісліцкага, які нельга атаясамлівасць з фармальным элементам прадмоўнага комплексу, то першы твор з выдання "Пра сённяшнюю Прускую вайну" – якраз тыповая празаічная прадмова ў форме звароту да чытача, якая, прынамсі, і пачынаецца са слоў "*Lector mi!*" ("Мой чытач!"). Адрасат наступнага паэтычнага твора зразумелы з яго назвы: "Боскаму Жыгімонту, непераможнаму каралю Польшчы". Кароль-пераможца апяваецца і ў другім вершы выдання – "Да войска германцаў, што ўцякаюць ад паляка": саркастычна-палемічная завостранасць гэтага твора накіравана не столькі на высмейванне варожай пыхі і самаўпэўненасці, колькі на ўслаўленне міласэрнасці і мудрай разважнасці караля. Усе адзначаныя факты выяўляюць пэўную сувязь паміж творамі двух выданняў, змешчаных у экземпляры бібліятэкі Асалінскіх. Гэтая сувязь адчувальная ў першую чаргу на структурным – кампазіцыйным – узроўні.

[3] Паказальна ў гэтым сэнсе выказванне С. Віткоўскага: "Ліст да Паўла з Кросна" ўяўляе сабою своеасаблівую прадмову да паэмы "Пруская вайна" [*Witkowski 1891, 175*].

IV. Творчая спадчына Яна Вісліцкага

1. Зборнік “ПРУСКАЯ ВАЙНА”

Эпіграма

У першых радках эпіграмы, змешчанай на тытульным аркушы выдання “Пруская вайна”, Ян Вісліцкі выразна акрэсліў тэму свайго паэтычнага аповеду: “*fata Pruteni duelli*” (“вынікі Прускай вайны”). Гэтая аўтарская ўстаноўка сведчыць пра тое, што Вісліцкі ў сваім творы не прэтэндаваў на ролю гісторыка, а значыць, крытычныя заўвагі польскіх даследчыкаў пра адсутнасць у “Прускай вайне” гістарычнай праўды не маюць аніякай падставы. “Паэт, – пісаў Я. Парэцкі, – хоча даць сваё мастацкае асэнсаванне, а не фактычнае апісанне знамянальнай падзеі” [*Парэцкі 1991, 29*]. Ён – сапраўдны “*vates*” (“вяшчун”), які з вышыні прамінулых ста год, быццам бы з вышыні птушынага палёту, задумаў разгледзець і паказаць іншым (перадусім – суайчыннікам), якой важнай і знакавай была перамога ў Грунвальдскай бітве, як узвысіла яна Радзіму паэта, яго народ, а таксама караля – праз яго дзеда-пераможцу. З годнасцю, уласцівай мастакам Рэнесансу, Вісліцкі заяўляе, што пра вынікі, гістарычныя наступствы Грунвальда найбольш поўна і дасканала напісана менавіта ў яго паэме.

Рэпрэзентуючы сябе перад чытачом, Ян Вісліцкі фармулюе сваё творчае крэда: ён называе сябе “*Sarmata notus*” (“вядомы сармат”), прычым эпітэт “*notus*” (“вядомы, знакаміты, слаўны”) лічыць найбольш важным, істотным момантам самаацэнкі. Звыш таго, творца падкрэслівае сваю адукаванасць, прыналежнасць да плеяды “*Aoniis avis*” (“аянійскіх продкаў”) – паэтаў, што яшчэ з часоў Старажытнай Грэцыі і Рыма ўславілі сябе апяваннем векапомных дзеяў сваіх суайчыннікаў.

Што ж да апазіцыі-аксюмарану “*notus*”(“слаўны”) – “*exiguo furore*” (“з кволым натхненнем”), то, магчыма, ужо ў гэтых словах закладзена зерне таго імкнення Яна Вісліцкага да іранізацыі і нават саркастычнасці, якое далей будзе праяўляцца ў іншых творах паэта. Праз многія радкі зборніка “Пруская вайна” прабіваюцца нараканні аўтара на жыццёвыя цяжкасці, неспрыяльныя абставіны і перашкоды ў яго працы. Прычынай таму, на думку Я. Парэцкага,

было непрыязнае стаўленне да Яна Вісліцкага з боку тых, хто дасягнуў вышыняў Парнаса ў літаратуры Каралеўства Польскага. “Прыдворныя паэты, – пісаў вучоны, – бачылі ў аўтары ‘Прускай вайны’ носьбіта чужых сцягоў, яго голас парушаў гармонію іх агульнага хору” [*Парэцкі 1991, 27*]. Таму ў словах “*exiguo furore*” можна бачыць толькі іранічны падтэкст, але ніяк не наследаванне сярэднявечнай літаратурнай традыцыі аўтарскага самапрыніжэння. Даводзіцца не пагадзіцца з Я. Парэцкім, які, каменціруючы словы “*exiguo furore*”, піша, што Вісліцкі “сціпла гаворыць пра свой невялікі талент” [*Парэцкі 1991, 30*].

Ян Вісліцкі, як і іншыя беларускія творцы Рэнесансу, рэалізоўваў у сваіх творах новую ў параўнанні з пісьменнікамі Старажытнай Русі эстэтычную праграму. “Гуманістычна-асветніцкае самаўсведамленне лацінамоўных паэтаў, – піша У. Кароткі, – вяло да нейтралізацыі комплексу другаснасці; ‘калектыўны аўтар’ з мастацкай устаноўкай на самапрыніжэнне саступаў месца творчай асобе, чалавеку сусвету, азначанаму арэолам чалавечай годнасці” [*Кароткі 2004*]. Паэтычны опус Яна Вісліцкага – больш грандыёзны і значны ў параўнанні з пярэстым шматквеццем сучаснай яму панегірычна-прынагоднай паэзіі. “Вісліцкага не задавальнялі ні змест, ні спосаб выкладання таго, што пры ім пісалася па-латыні. Яго творчая задума патрабавала больш глыбокіх разваг і больш паўнаважкага ўзору” [*Парэцкі 1991, 27*]. Немагчыма брацца за ажыццяўленне такога праекта са “слабым натхненнем”! Але Ян з Вісліцы ўпэўнены ў сваіх сілах: гаранты яго поспеху – “*Aonii avi*” (“Аянійскія продкі”) – тыя самыя “салодкі Вяргілій, лёгкі Гарацый, вытанчаны Авідзій” [*Witkowski 1891, 29-30*]. І Муза паэта заспявала…

Заахвочвальны верш да Музы магістра Паўла з Кросна

Магістр Кракаўскага універсітэта Павел з Кросна адыграў выключную ролю ў творчай біяграфіі Яна Вісліцкага. Менавіта ён, прыхільны і спагадны настаўнік паэта, у цяжкім для свайго вучня 1515 г. ухваліў зборнік “Пруская вайна”, што дазволіла надрукаваць яго ў наступным годзе. Звяртаючыся за падтрымкай да настаўніка, Ян Вісліцкі верыў у тое, што менавіта ў яго можна знайсці разуменне і абарону ад нападаў зайздроснікаў.

Асоба Паўла з Кросна адметная ў гісторыі ўсходнеславянскай духоўнай культуры эпохі Рэнесансу. Дата нараджэння гэтага выдатнага чалавека невядомая. Паходзіў ён з Украіны, хутчэй за ўсё, быў выхадцам з незаможнай сям'і. Б. Кручкевіч робіць дапушчэнне, што першапачатковую адукацыю ён атрымаў на радзіме, пасля чаго працягваў навучанне ў Кракаўскім універсітэце [гл.: *Kruczkiewicz. De Pauli 1887, XVIII*]. Праўда, яго імя адсутнічае ў рэктарскіх спісах навучэнцаў Ягелонскага універсітэта. Затое дакладна вядома, што Павел з Кросна вучыўся ва універсітэце Грэйфсвальда ў Германіі. У 1499 г. ён атрымаў тут ступень бакалаўра. У хуткім часе вяртаецца ў Польшчу, накіроўваецца ў Кракаўскі універсітэт; у 1500 г. быў запісаны ў лік бакалаўраў гэтага універсітэта. У 1506 г. ён атрымлівае ступень магістра, у наступным 1507 г. летам пачынае чытаць лекцыі. У 1508 г. Павел з Кросна быў уключаны ў склад "*magistrorum collegii minoris actus ordinarios visitantium*" ("магістраў малодшай калегіі, што працуюць пастаянна"), у 1513 г. прыняты "*in numerum regentium faculatatem*" ("у лік кіраўнікоў (універсітэцкай) супольнасці") [*Kruczkiewicz. De Pauli 1887, XIX*]. Напэўна, менавіта гэта дазволіла В. Дарашкевічу і Я. Парэцкаму называць Паўла з Кросна "прафесарам Кракаўскага універсітэта" [*Дорошкевич 1979, 91; Парэцкі 1991, 15*]. Такое суаднясенне навуковых званняў паводле сярэднявечнай і сучаснай традыцый, на нашу думку, дапушчальнае.

Павел з Кросна быў не толькі шматплённым таленавітым паэтам, але і перакладчыкам сатыр Персія, паэмы "Пра выкраданне Празерпіны" Клаўдзіяна, "Гераідаў" Авідзія, твораў Лукана. Ён праводзіў глыбокія філалагічныя даследаванні твораў Вергілія, ператлумачыў вершамі тры галоўныя хрысціянскія малітвы: *Pater noster*, *Ave Maria* і *Salve Regina*. Тры паэтычныя творы прысвяціў Павел з Кросна каралю Жыгімонту Старому, шматлікія вершы напісаў для розных асоб – сяброў, вучняў і сваякоў. Памёр Павел з Кросна ў 1517 г. Творчая спадчына паэта складае каля 4000 радкоў лацінскіх вершаў духоўнага і свецкага зместу [*Brandowski 1886. N 611. S.5400*]. "Ва ўсіх сваіх творах, – адзначае Б. Кручкевіч, – ён праяўляў вытанчанае майстэрства версіфікацыі, быў сапраўдным майстрам пяра, які дасканала валодаў усімі багаццямі лацінскай мовы" [*Kruczkiewicz. De Pauli 1887, XXXVII*]. Менавіта гэтыя якасці, а таксама замілаванасць паэзіяй "бліскучага Вергілія" перадаў

Павел з Кросна аднаму з сваіх лепшых вучняў – аўтару зборніка “Пруская вайна”.

Магчыма, у пэўнай сувязі з колам творчых інтарэсаў свайго настаўніка актуалізуе Ян Вісліцкі постаць Тэрпсіхоры (Музы танцаў) у 33–34-м радках “Заахвочвальнага верша”: вядома, што Павел з Кросна быў прыхільнікам тэатральнага мастацтва, якое генетычна звязана з вакальна-харэаграфічнымі імпрэзамі. Так, у венскім выданні 1513 г. дзве трагедыі Сенэкі – “Фіест” і “Траяды” – Павел з Кросна суправадзіў двума сваімі вершамі ў якасці ўступу; верагодна, што і сам ён мог быць аўтарам невядомых нам трагедый [*Kruczkiewicz. De Pauli 1887, XXX*]. Менавіта да Тэрпсіхоры, якой уласціва “*Martiaco cothurno*” (“у Марсавай трагедыі”) апяваць ваенныя дзеі, звяртаецца Ян Вісліцкі з просьбаю скласці для яго двуверш.

Структурна зварот Яна Вісліцкага да Паўла з Кросна пабудаваны на прыёме сімвалічнага паралелізму: аўтар прыгадвае вядомага героя антычных паданняў кентаўра Хірона, які нарадзіўся блізу гары Оса ў Геманійскай (Тэсалійскай) зямлі. Хірон быў выхавацелем славутых герояў антычнага свету, апетых Гамерам, – Ахіла і Патрокла. На аснове гэтага міфалагічнага топаса паэт будуе складаную паралель:

Thessalus Aeacides hunc tollat et ejus amicus
Nobilis Ossa soli lausque Pelethronii:
Dantiscusque tuus tollat te Suchteniusque
Nec non Sarmaticis Crosna Ruthena locis.
Ille duobus erat clarus: tribus ipse nitescis
Discipulis, quorum tertius esse velim
[Carmen exhort. 17-22].

Хай Эякід тэсалійскі, і сябар яго, і ўся Оса,
Пелетранійцаў хвала, славяць бясконца таго;
А вось цябе твой Дантышак і Сухцень хай славяць, а з імі –
Кросна русінаў – яна ёсць у Сармацкай зямлі.
Той праз дваіх стаў вядомы – цябе праслаўляюць аж трое
Вучняў. Між імі цяпер трэцім хацеў бы я быць.

Прызнаныя ў той час польскія паэты Ян Дантышак і Крыштаф Сухцень, якіх тут згадвае Ян Вісліцкі, былі таксама вучнямі Паўла

з Кросна. Разам з тым варта пагадзіцца з Я. Парэцкім, што пажаданне Вісліцкага “апынуцца трэцім вучнем Паўла з Кросна побач з Дантышкам і Сухценем афарбаваны тонкай і горычнай іроніяй” [гл.: *Парэцкі 1991, 24*]. Творчая ўстаноўка і эстэтычная праграма аўтара “Прускай вайны” выразна адрознівалася ад агульнай куртуазна-панегірычнай арыентацыі вершаў асобных прыдворных паэтаў. Напэўна, менавіта супраць іх і скіраваны іранічны выпад Яна Вісліцкага ў 31–32-м радках “Заахвочвальнага верша…”: “*Numina vinosis semper meliora poetis // Hic venit agnato namque cruore furor*” (“Большая веліч заўсёды – у вершах падпітых паэтаў, // Бо паэтычны запал – віннаму хмелю сваяк ”). Гэты матыў, запазычаны ў Гарацыя, служыць паэту сродкам высмейвання сучасных яму вершатворцаў – прыхільнікаў не толькі Музаў, але і Бахуса. Такіх аматараў пяра і келіха сабраў вакол сябе, як вядома, сучаснік Яна Вісліцкага, славуты польскі паэт Анджэй Кшыцкі, прычым сам шчыра называў іх таварыствам “выпівох і аб’ядалаў” [гл.: *Парэцкі 1991, 25*].

У працытаваных 17–22-м радках важна таксама звярнуць увагу на актуалізацыю аўтарам месца нараджэння Паўла з Кросна. Ян Вісліцкі паслядоўна ўвасабляе ідэю, што пэўная мясціна ўслаўляецца таленавітым чалавекам, які паходзіць з яе. Чалавек, які ўславіў свой край, у разуменні паэта – гэта “*genius loci*” (“геній месца”). Прыметнік “*nobilis*” (“славуты”) суадносны як з “*Ossa*”, так і з “*Crosna*”. Гэтая ідэйна-мастацкая знаходка Яна Вісліцкага супастаўляецца са скарынаўскімі пасажамі кшталту “[Кніга] совершена ест повелением… доктора Франциска, Скоринина сына из славнаго града Полоцка…” [*Скарына 1990, 29*]. Ідэя пра тое, што слава пэўнага месца ёсць сума “славаў” людзей, якія паходзілі з гэтага месца (фізічна, калі размова ішла пра радзіму, або духоўна, калі мелася на ўвазе *alma mater* ці месца рэалізацыі таленту творчай асобы), з’яўляецца, бясспрэчна, феноменам рэнесансавага светасузірання, вынікам адмаўлення творцы ад карпаратыўнага мыслення.

Прадмова “Шаноўнаму і славутаму мужу, магістру Кракаўскага універсітэта Паўлу Кросненскаму”

Гэтая празаічная прадмова надзвычай важная для высвятлення пэўных штрыхоў біяграфіі Яна Вісліцкага і ідэйнай задумы яго паэмы. Згадка пра “*curae aerumnarum mearum*” (“турботы маёй цяжкай працы”) [*Bellum 1516, p.7 n.n.*] у першым сказе павінна была быць зразумелай Паўлу з Кросна. Размова тут ішла, хутчэй за ўсё, менавіта пра тыя цяжкасці, якія Ян Вісліцкі сустрэў на сваім творчым шляху, прынамсі, у сувязі з напісаннем і спробай апублікавання “Прускай вайны”. Выкарыстоўваючы антычны топас “марской навалы” для характарыстыкі складанай жыццёвай сітуацыі і параўноўваючы сябе з капітанам карабля, аўтар адзначае тую “ціхую гавань”, якую ён заўсёды для сябе знаходзіў: “прытулак Геліканід” – паэтычную творчасць. Ян Вісліцкі сімвалічна акрэслівае прычыну, якая падштурхнула яго да галоўнай працы свайго жыцця: “*Heliconiadas… petii concentuque earum celebratissimae posteritatis permotus, tum famae inenarrabilis perlucidissime candore stupefactus*” (“я імкнуўся да Геліканід, уражаны сугуччам іх славутых нашчадкаў, аслеплены найяснейшым ззяннем невыразнай славы”) [*Bellum 1516, p.7 n.n.*]. Тут упершыню паэт актуалізуе вобраз-сімвал “*fama*” (“слава, слаўная чутка”), які стане ключавым у паэме “Пруская вайна”. Далей паэт канкрэтызуе, пра якую менавіта “славу” ідзе гаворка: “*illa famatissima strages, quam Poloni cum Germanis inter fines Prussiae dextro Marte gessere*” (“тая славуцейшая бітва, якую палякі вялі з германцамі ў межах Прусіі з дапамогаю Марса” [*Bellum 1516, p.7 n.n.*].

Словы “*iners rudisque*” (“нясмелы і неадукаваны” або “бяздзейны і малады”) [*Bellum 1516, p.7 n.n.*] першыя даследчыкі творчасці Яна Вісліцкага адназначна ўспрымалі як самаацэнку паэта і яго ўласнае ўказанне на свой малады ўзрост. Разам з тым з улікам багатага семантычнага поля гэтых эпітэтаў такая характарыстыка не можа быць адназначна праінтэрпрэтавана. Звернем увагу на непасрэдны кантэкст выразу “*iners rudisque*”. На першы погляд, аўтар быццам бы з выключнай павагай прыгадвае “*vates*” (“вешчуноў”) і іх “*cultores*” (“паслядоўнікаў”). Але далей ён гаворыць, што пачаў “*volutare corde insignem eventum*” (“абдумваць у сэрцы адметны вынік”) векапомнай падзеі – Грунвальдскай бітвы, прычым зрабіў гэта незалежна ад тых самых славутых “вешчуноў”,

"*quorum vestigia procul secutus*" ("крочачы зводдаль ад іх слядоў"). У гэтым пасажы Ян Вісліцкі яўна меў на ўвазе вядомы топас антычнай паэзіі – "сляды мінулага", але палемічна пераасэнсаваў яго. Так, Публій Стацый пісаў у сваёй паэме "Фіваіда": "… *Nec tu divinam Aeneida tenta: // Sed longe sequere, et vestigia semper adora*" ("Ты ж не рабі замаху на боскую 'Энеіду', але доўга ідзі следам за ёю і заўсёды ўшаноўвай яе сляды") [*Theb. XII, 816-817*]. Яну Вісліцкаму не пасуе такая пазіцыя: яму бліжэй "*Vestigia terrent*" ("Сляды палохаюць") Гарацыя [гл.: *Hor. Epist. I, 1, 73-75*]. Прызнаючы аўтарытэт мудрых паэтаў-настаўнікаў, ён "крочыць зводдаль ад іх слядоў", бо спрабуе знайсці свой шлях у літаратуры. Магчыма, менавіта ў гэтым сэнсе паэт называе сябе "нясмелым і нявопытным"! Але тады гэта – не прызнанне сваёй недасканаласці ў паэтычнай справе, а, хутчэй, – дэкларацыя мастацкай арыгінальнасці!

З іншага боку, не пазбаўлена грунту гіпотэза Я. Парэцкага адносна таго, што ў творах Яна Вісліцкага многія радкі прасякнуты іроніяй, скіраванай супраць яго сучаснікаў – прыдворных паэтаў. Даследчык адзначае, што, напрыклад, Анджэй Кшыцкі "да злосці не цярпеў сапернікаў, і асабліва выхадцаў з нізкіх саслоўяў. Менавіта ён высмейваў 'нізкае' паходжанне Эразма Цёлка" [гл.: *Парэцкі 1991, 25*]. Эпітэты "*iners rudisque*" можна ў такім выпадку разумець як адзнаку нізкага (дэмакратычнага) паходжання паэта, якое магло быць падставай для пагардлівых адносін да аўтара "Прускай вайны" з боку калег па паэтычным пяры. Цікава, што Павел з Кросна ў сваёй элегіі, прысвечанай Яну Вісліцкаму, пісаў пра паэтаў, да ліку якіх далучаў і свайго вучня:

Multijugoque tegunt speciosa poemata cultu,
Quo nunquam vulgus cernere possit iners [*Elegia, 45-46*].

Лепшым паэмам яны надаюць адмысловыя шаты,
Праўда, тупым прастакам іх не разгледзець ніяк.

Як бачым, Павел з Кросна ўжыў прыметнік "*iners*" у якасці характарыстыкі простага народа ("*vulgus*"). Ян Вісліцкі следам за настаўнікам мог паўтарыць той самы эпітэт у якасці двусэнсоўнай самахарактарыстыкі ў прадмове, адрасаванай менавіта Паўлу з Кросна.

Падобнае прачытанне слоў “*iners rudisque*” пацвярджаецца і наступным пасажам: паэт заяўляе, што векапомны вынік перамогі пад Грунвальдам, “*majori laude dignior, majoris calami notatu praestantior sit*” (“варты большай славы, мог бы быць дасканала апісаны большым пяром”) [*Bellum 1516, p.7 n.n.*]. Пад “большым пяром” маглі мецца на ўвазе сучасныя Вісліцкаму прыдворныя паэты, якія карысталіся прызнаннем і славай. Ды не яны, лаўраносныя, як Дантышак, ажыццявілі гэта, падкрэсліў мастак, – “*ego ipso paene in medio barbariae natus*” (“я, народжаны ў самым амаль што цэнтры далёкага краю”) [*Bellum 1516, p.7 n.n.*]! Гэтае рэнесанснае акцэнтаванне ўласнага творчага “*ego*” мы сустрэнем пазней і ў Мікалая Гусоўскага. У паэме “Песня пра зубра” аўтар, пераказаўшы скупыя і часта непраўдападобныя звесткі пра волата беларускіх лясоў, якія падавалі Пліній Старэйшы і Павел Дыякан, з годнасцю рэзюмаваў: “*In nemus arctoum… Polonus eo*” (“Я, паляк, іду ў паўночную пушчу”), “*Me pater instituit…*” (“Мяне навучыў бацька…”), “*Meque… sudare coëgit*” (“Мяне прымусіў ён цяжка працаваць…”) [*Carmen 1523, p.11 n.n.*]. І Вісліцкі і Гусоўскі выдатна ўсведамлялі ўласную творчую самакаштоўнасць, яны – арыгінальныя творцы, непадобныя да старажытных і сучасных ім паэтаў, але здольныя, як і яны, дасягнуць вяршыняў Парнаса, прычым сваім, адметным шляхам.

Загадкай для даследчыкаў застаюцца наступныя словы з прадмовы Яна Вісліцкага: “*insomni operae pretium ad lucem duxi fore dandum tanquam prima libamenta tirocinii Heliconiadum mearum*” (“я ясна даў зразумець, што вынік [маёй] бяссоннай працы павінен будзе з’явіцца як першыя спробы першых крокаў маіх Геліканід” [*Bellum 1516, p.7 n.n.*]. Б. Кручкевіч прапанаваў лічыць, што форма будучага часу “*fore*” ў словазлучэнні “*fore dandum*” (“павінен будзе з’явіцца”) ужываецца Янам Вісліцкім у значэнні формы цяперашняга часу “*esse*” [*Pauli 1887, 167*]. На маю думку, такое атаясамліванне даследчыкам дзвюх часовых формаў можа прывесці да скажэння сэнсу выказвання. Гэтыя словы маглі азначаць, што яшчэ да “Прускай вайны” паэт намагаўся апублікаваць іншыя свае творы, але гэтыя планы не ажыццявіліся. Таму, падкрэслівае Ян Вісліцкі, яго зборнік – гэта першая спроба публічнага выступлення, але ж не першы паэтычны вопыт наогул; на самой справе ён ужо сталы і спрактыкаваны, але афіцыйна не прызнаны паэт.

Адным з найбольш праблемных было і застаецца пытанне пра гістарычныя крыніцы, якімі карыстаўся Ян Вісліцкі ў працэсе працы над паэмай "Пруская вайна". У прадмове сам паэт гаворыць пра гэта наступным чынам: "*partim ex inventis codicum, parum ex scriptis chronicorum, partim ex famae celebris memoria, qua tota Polonia redimita tumet in unum congessi*" ("я ж сабраў усё ў адно: часткова з таго, што знайшоў у кнігах, крыху – з гістарычных запісаў, часткова з пагалоскі і ўспамінаў пра тыя славутыя падзеі, якімі наўкола ахоплена ўся Польшча") [*Bellum 1516, p.8 n.n.*]. У публікацыі Б. Кручкевіча пры ўсіх трох аднародных членах вышэйпрацытаванай канструкцыі фігуруе слова "*partim*" ("часткова"), але ў тэксце першадрука пры словазлучэнні "*ex scriptis chronicorum*" стаіць слова "*parum*" ("мала"). Даследчык не адзначыў унесенага ім змянення ў спасылачны апарат свайго выдання. На гэта ў свой час звярнуў увагу М. Езяніцкі: ён падкрэсліў неапраўданасць гэтага змянення, паколькі, на думку вучонага, менавіта ў значэнні "мала" гэтае слова ўжываецца паэтам [*Jezienicki 1888. Z.3, 140*]. Для Яна Вісліцкага важна падкрэсліць, што гістарычнымі крыніцамі, хронікамі ён карыстаўся мала. Некаторыя даследчыкі цалкам адмаўлялі аўтару "Прускай вайны" ў знаёмстве з тагачаснымі гістарычнымі працамі [гл., напр.: *Mecheżyński 1880, 289*]; іншыя называлі гістарычны трактат Энея Сільвія дэ Пікаламіні (папы Пія II) [*Brandowski 1886. N 611. S.5400*], хроніку Марціна Гала, хроніку Пазнанскага біскупа Багуфала II [*Witkowski 1891, 279-280*], асобныя рукапісныя помнікі, што датычыліся вайны з крыжакамі [*Jezienicki 1888. Z.1, 87*]. Для паэта, прыхільніка ўсіх дзевяці Музаў (ды найперш – Каліопы, а не Кліо), важна было паказаць адносіны яго народа да вайны з крыжакамі. Яна з Вісліцы цікавіла, якую памяць пакінула па сабе славутая перамога. З гэтай мэтай ён звяртаў асаблівую ўвагу на легенды, паданні, народныя песні пра Грунвальдскую бітву, якіх, паводле сведчання В. Хана, сапраўды было нямала [гл.: *Hahn 1910, 4-9*]. З ліку польскіх даследчыкаў фактычна толькі прафесар А. Брандоўскі звярнуў увагу на прафесійны падыход Яна Вісліцкага да мастацкай апрацоўкі як гістарычных, так і фальклорных крыніц [гл.: *Brandowski 1886. N 611. S.5400*]. Што ж да спосабу мастацкай апрацоўкі паэтам гістарычных крыніц, то яго выдатна акрэсліў В. Дарашкевіч. Вучоны адзначыў, што "ў сваім адлюстраванні гістарычных падзей Ян з

Вісліцы нідзе не збіваецца на павярхоўную кампіляцыю, ён заўсёды пакідае за сабою права на ўласны адбор і асэнсаванне фактаў, на чыста мастацкае, не хранікальнае іх ‘дамысліванне’ ў згодзе з цэласным эпічным замыслам” [*Дарашкевіч 1975, 57*].

У прадмове, адрасаванай Паўлу з Кросна, Ян Вісліцкі між тым паведамляе, што прысвячае свой твор каралю Жыгімонту, называючы яго найперш уладаром Сармацкай Еўропы, а потым – Польскай айчыны. У такім азначэнні “імперскай кампетэнцыі” Жыгімонта – зерне той дынастычнай канцэпцыі, якую паэт падрабязна раскрые ў трэцяй кнізе “Прускай вайны”. Цікава, што менавіта ў гэтым звароце аўтар удакладняе функцыянальнае прызначэнне свайго твора: “*loco encenii sinceriter dicavi*” (“шчыра прысвяціў у якасці энкомія”) [*Bellum 1516, p.8 n.n.*]. Энкоміем у антычнай паэзіі называлі хвалебную песню ў гонар славутых мужоў [*Лосев 2001, 28*]. Такім чынам аўтар падкрэслівае скіраванасць свайго твора “*ad personam*” – “на асобу”, героя-манарха, ад якога залежыць ход гісторыі, які робіць вялікі ўплыў на ўмацаванне дзяржавы, адыгрывае значную ролю ў жыцці яе народаў. Такім быў кароль і вялікі князь Ягайла, які апяваецца ў паэме “Пруская вайна”. Такім жа прадстаўляе паэт і яго ўнука, караля і вялікага князя Жыгімонта, які ўславіў сябе велічнымі ратнымі дзеямі, і найслявуцейшая з іх – перамога пад Оршай.

“*Sigismundo, regi Sarmatiae Europae invictissimo*” (“Жыгімонту, непераможнаму каралю Еўрапейскай Сарматыі”) [*Bellum 1516, p.8 n.n.*] – не звычайная топасная форма прысвячэння манарху, у асобе якога паэт спадзяецца знайсці для сябе падтрымку; яе нельга параўнаць з прысвячэннямі апекунам і патронам, якія выступаюць фундатарамі пэўнага выдання (напрыклад, з прысвячэннем паэмы “Радзівіліяда” Яна Радвана Мікалаю Радзівілу) [гл.: *Radvanus 1588, p.14 n.n.*]. Функцыянальна яна блізкая да прысвячэння паэмы “Песня пра зубра” Мікалая Гусоўскага каралеве Боне, у дачыненні да якога У. Кароткі адзначыў, што яно – “своеасаблівы прэвентыўны тып прадмовы-прысвячэння” [*Кароткі 2004*]. Абодва паэты імкнуліся сваімі творамі звярнуць на сябе ўвагу караля Жыгімонта, але толькі Вісліцкі праспяваў энкомій каралю ў фінале сваёй паэмы. Фактычна аўтар “Прускай вайны” не прысвячае свой твор Жыгімонту, а толькі паведамляе настаўніку пра намер зрабіць гэта.

Далей Ян Вісліцкі акрэслівае быццам бы непасрэдную мэту свайго звароту да Паўла з Кросна: маўляў, паэт жадае перадаць рукапіс настаўніку “*legendum*” (“для прачытання”) і, калі неабходна, “*corrigendum*” (“для выпраўлення”). М. Езяніцкі тым не менш выказвае сумненне ў тым, што Павел з Кросна сапраўды працаваў над рукапісам “Прускай вайны” і зрабіў свае праўкі. “Здаецца, – піша даследчык, – мяркуючы па вялікай колькасці памылак, якія засталіся ў паэме пра Прускую вайну, што Павел з Кросна ўхіліўся ад гэтага цяжкага абавязку” [гл.: *Jezienicki 1888. Z.2, 85*]. Зраблю агаворку, што пытанне пра наяўнасць ці адсутнасць у “Прускай вайне” лексіка-граматычных, сінтаксічных і прасадычных хібаў хаця і разглядалася дастаткова падрабязна як польскімі, так і беларускімі вучонымі, аднак, бясспрэчна, патрабуе асобнага скрупулёзнага вывучэння. Так, Павел з Кросна ў сваёй элегіі, прысвечанай Яну Вісліцкаму, папярэджвае вучня:

Hoc age, ne minimas contemnens sedulo mendas,
Aspergas maculis maxima scripta nigris [*Elegia Magistri, 33-34*].

Пільна сачы, каб не зганьбіў праз хібы нязначныя раптам
Чорнымі плямамі ты велічных твораў сваіх.

Складваецца ўражанне, што настаўнік якраз намякае на наяўнасць у паэтычных творах Яна Вісліцкага пэўных недахопаў, аднак, магчыма, сам аўтар зборніка “Пруская вайна” недахопамі іх не лічыў. Так, В. Дарашкевіч звярнуў увагу на тое, што прасадычныя памылкі сустракаюцца ў “Прускай вайне” пераважна ў формах герундыя [гл.: *Дорошкевич 1979, 127*], а гэта падобна ўжо да пэўнай заканамернасці. Я. Парэцкі найбольш падрабязна разгледзеў пытанне пра так званыя памылкі ў “Прускай вайне” Яна Вісліцкага [*Парэцкі 1991, 88-105*]. Тым не менш беларускі вучоны не зрабіў канчатковых высноў адносна граматычных і прасадычных асаблівасцяў паэтычных тэкстаў Яна Вісліцкага. Гэта дае падставы для вылучэння гіпотэзы пра наяўнасць асаблівай мастацкай сістэмы, выпрацаванай і рэалізаванай Янам Вісліцкім у сваёй уласнай творчасці. Я. Парэцкі слушна падкрэсліў тую акалічнасць, што паэт назіраў “культурную дыхатамію” ў сучасным яму лацінамоўным вершаскладанні: перапляценне строгіх правіл антычнай паэтыкі з уплывамі нацыянальных традыцый вытанчанай славес-

насці [гл.: *Парэцкі 1991, 103-104*]. Сам аўтар “Прускай вайны” не мог застацца ў баку ад гэтых творчых пошукаў. Магчыма, мудры Павел з Кросна разумеў гэта, хаця і не падзяляў наватарскіх поглядаў свайго вучня, таму толькі шчыра і крыху іранічна раіў яму:

Nec tibi dedecori sit syllaba mensa frequenter
In digitos decies et repetita tuos [*Elegia Magistri, 37-38*].

Гэта не ганьба зусім – размяркоўваць склады акуратна,
Хоць дзесяць пальцаў настаў, іх паўтараючы зноў.

Напрыканцы прадмовы Ян Вісліцкі ўздымае вельмі набалелую для яго тэму: ён гаворыць пра пераследы, якімі апанаваны з боку зайздроснікаў і нядобразычліўцаў. Спадзеючыся на тое, што вяльможнае імя караля паслужыць шчытом ад нападаў заілаў, паэт фармулюе вельмі важную выснову пра ролю мецэнацтва: “*quae reges et proceres laudant, tollunt, tutantur, ea etiam a plebecula tolli, tum venerari*” (“тое, што ўсхваляюць, узносяць і апякаюць каралі і магнаты, узносіцца і нават ушаноўваецца простым людам” [*Bellum 1516, p.8 n.n.*]. Амаль праз пяцьдзесят гадоў Сымон Будны ў прысвячэнні князям Радзівілам падобным чынам пісаў пра мэту выдання свайго “Катэхізіса”: “абысте ваши княжецские милости… всим иншим с себе добрый взор а приклад давать рачили, ижь бы ся много инших прикладами ваших княжацских милости будовати могли” [*Прадмовы 1991, 25-26*].

Аргументы кніг “Прускай вайны”

Уласна тэкст паэмы “Пруская вайна” Ян Вісліцкі папярэджвае “аргументамі”: кароткім зместам трох частак паэмы. Жанр “аргументаў” у антычнай і сярэднявечнай літаратуры быў запатрабаваны найперш у драме: “аргументы” змяшчаліся непасрэдна перад тэкстам п’есы. Напэўна, пры дапамозе “аргументаў” Ян Вісліцкі імкнуўся падкрэсліць найбольш важныя, істотныя для яго моманты паэтычнага аповеду; магчыма, гэта быў дадатковы сродак абароны ад нападак “заілаў”, якія ўпарта не хацелі зразумець глыбінную сутнасць задумы аўтара. Так, асноўныя этапы першай кнігі – акрэсленне тэмы, малітва да Багародзіцы, вызначэнне геаграфічнага становішча “Палоніі”, панегірычны аповед пра Крака і Ванду, прамова Апалона, якая ўтрымлівае канцэпцыю цэлага тво-

ра. Другая кніга, па словах паэта, заклікана найперш паказаць “*Lituos*” (“літоўцаў”) – той народ, з якога паходзіў кароль Ягайла. Акрамя таго, прыгадваючы прыход “братоў Марыі” з “горада Пталемаіды Сірыйскай”, другая кніга “*dicit crudelia belli*” (“гаворыць пра жахі вайны”) [*Argumenta. 10*]. Тым не менш нават гэтая аўтарская заўвага пра другаснасць уласна ваеннай тэмы ў ідэйнай задуме другой кнігі не засцерагла Яна Вісліцкага ад несправядлівых абвінавачванняў даследчыкаў у беднасці сюжэта і гістарычнай недакладнасці апісання Грунвальдскай бітвы. З кароткага зместу трэцяй кнігі вынікае, што ў ёй паэт паставіў перад сабою задачу разгарнуць сваю легендарную гісторыю дынастыі Ягелонаў, змясціўшы ў экспазіцыі традыцыйны для антычнага эпасу “Алімпійскі” план. Характар “аргументаў”, фабульныя акцэнты, расстаўленыя самім Янам Вісліцкім, даюць усе падставы не пагадзіцца з меркаваннямі адносна таго, што “часткі паэмы не складаюцца ў адно цэлае” [*Witkowski 1891, 282*], што “паэт механічна спалучыў паміж сабою вершы, якія – можна дапусціць – першапачаткова напісаў як асобныя творы” [*Ćwikliński 1922*]. Падобных поглядаў прытрымліваліся не толькі польскія, але і беларускія даследчыкі (В. Дарашкевіч і Я. Парэцкі).

Менавіта “Аргументы” паэмы “Пруская вайна” дапамагаюць зразумець адмысловую (бо падначаленую адпаведнай ідэйнай задуме) кампазіцыю твора. Паэма “Пруская вайна” грунтуецца не толькі на гераічнай тэме, але і на праблемах дынастычнага характару. С. Лэмпіцкі ў свой час адзначаў, што ў паэме “Пруская вайна” аўтарам “быў зроблены замах на свайго роду ‘Ягеланіду’, у цэнтры ўвагі якой павінны былі быць Ягайла і Грунвальд” [*Łempicki 1952, 225*]. Найбольш лагічную, на мой погляд, гіпотэзу адносна кампазіцыйнай пабудовы паэмы прапанаваў У. Кароткі. Ён пісаў: “Кіруючай дамінантай у канцэпцыі патрыятызму Яна Вісліцкага з’яўляецца федэратыўны патрыятызм паэта, звязаны з землямі, падуладнымі Ягелонам” [*Кароткі 1997, 91*]. Гэтая канцэптуальна новая ацэнка мастацкай адметнасці паэмы Яна Вісліцкага дазваляе сённяшнім чытачам і даследчыкам бачыць у аўтары “Прускай вайны” не “рамесніка пяра”, як назваў яго вядомы польскі вучоны Юльян Кжыжаноўскі, а таленавітага, арыгінальнага паэта-філосафа, які стварыў гісторыка-дынастычны эпас, разгалінаваны паводле ідэйнай задумы і сродкаў мастацкага ўвасаблення.

Ода чытачу

Фармальнае прызначэнне паэтычнага звароту да чытача, уключанага ў склад зборніка, – прыцягнуць увагу да выдання, абгрунтаваць выбар тэмы цэнтральнага твора. Аднак "Ода чытачу" Яна Вісліцкага – філалагічная загадка: яна напісана алкеевай страфою ("*Tricolos tetrastrophos*"), якая ўжывалася для стварэння пераважна лірычных вершаў. Што мог азначаць выбар паэтам гэтай страфы для напісання верша ў жанры оды?

Варта прыгадаць, што новае жыццё алкеевай страфе ў літаратуры Старажытнага Рыма надаў бліскучы Гарацый. Менавіта гэтай страфой старажытнарымскі паэт напісаў 20-ю оду другой кнігі, у якой сфармуляваў сваё творчае крэда. Супярэчнасці ў гэтым няма, бо "ў антычнасці грэцкі тэрмін 'ода' не быў звязаны абавязкова з урачыстым пафасам і ўжываўся ў значэнні 'песня', з'яўляючыся эквівалентам лацінскага слова *'carmen'"* [*Дуров 1993, 14*]. Падобным чынам прэзентацыя тэмы "Прускай вайны" – толькі знешні план "Оды чытачу" Яна Вісліцкага, на самой справе – гэта фармулёўка мастацкай праграмы паэта, злучаная з матывам супрацьпастаўлення сябе сваім папярэднікам:

Quae prisca vatum non sonuit chelys,
Quae docta patrum non retulit cohors,
Doctis camenis nec libellis
Nec titulis decoravit altis
Famae celebris tam rutilum decus, …
Haec nostra laeto carmine barbitos
Sonabit oris faustiter omnibus,
Famae decus virentis almum
Jam patrio renovabit orbi
[Ode lectori. 17-21, 25-28].

Ні ліра вершапісцаў былых часоў,
Ні шэраг найразумнейшых мудрацоў
Не ўзнеслі ў найвышэйшых словах
Кніжак сваіх і вучоных твораў
Высокі гонар славы бясконцай той, …
А наш барбіт з цудоўнаю песняю
Няхай гучыць шчасліва па ўсёй зямлі

І ў краі родным уваскрэсіць
Гонар вялікі нязгаснай славы.

Па ўсім відаць, што Ян Вісліцкі пераняў і засвоіў творчую методыку Гарацыя, якая заключалася ў выбары "асобных рыс і матываў, што ўплятаюцца далей у яго творы" [*Лосев 2001, 398*]. Аўтар "Прускай вайны", як і Гарацый, рэпрэзентуе гераічную тэму свайго твора памерам лірычнага верша, прычым у жанры оды! Тым самым абодва паэты імкнуліся падкрэсліць асаблівае, нефармальнае стаўленне да сваёй працы, непарыўную сувязь асабістага душэўнага сусвету з паэтычнай творчасцю. Сама ж гэтая творчасць успрымалася і як ганаровая магчымасць служэння Музам (а значыць, была вартая оды), і як плён глыбокай, часта пакутлівай інтэлектуальнай і духоўнай працы (а значыць, адпавядала лірычнаму настрою).

"Ода чытачу", як і празаічная прадмова, прасякнута рэнесансавым пафасам адчування самога сябе як непаўторнай мастацкай індывідуальнасці. Ян Вісліцкі падрабязна спыняецца на пераліку таго, што ёсць у "Прускай вайне" і чаго не знойдзе чытач у творах іншых паэтаў: "*candida nomina famae perennis*" ("бліскучыя імёны старажытнай славы"), "*carmina gloriae vetustae*" ("песні славутай даўніны"), "*decora stemmata fortis Poloni*" ("годныя вянкі магутнага паляка") [*Ode lectori. 9-12*]. Гэта, на думку мастака, і ёсць той неацэнны духоўны скарб, які пакінула ў народнай памяці Грунвальдская бітва.

ПАЭМА “ПРУСКАЯ ВАЙНА”

Кніга першая

З 1354 радкоў зборніка “Пруская вайна” 1057 займае аднайменная паэма, напісаная дактылічным гекзаметрам. Гэта – гераічны эпас, які, як і належыла твору падобнага жанру, павінен пачынацца прэзентацыяй цэнтральнай тэмы, прычым літаральна ў першых словах. Першыя словы “Іліяды” – “*M□nin □eide qe¦*” (“Гнеў услаў, о багіня”), бо цэнтральная тэма твора – гнеў Ахіла; першыя словы “Адысеі” – “*Andra moi □nnepe, Mo□sa*” (“Мужа мне ўслаў, о Муза”), і паэма, адпаведна, прысвечана гісторыі вандраванняў гэтага “мужа” – Адысея. У гамераўскіх паэмах, як бачым, абвяшчэнне тэмы аповеду трывала спалучаецца з інвакацыяй да Музы. Першыя словы “Энеіды” – “*Arma virumque cano*” (“Бітвы і мужа спяваю”): Вергілій распавядае пра войны, якія вёў Эней у барацьбе за новаздабытую Айчыну. Творчая ўстаноўка, як бачым, змянілася: старажытнарымскі паэт не просіць Музу праспяваць пра слаўныя дзеі, а сам адчувае ў сабе здольнасці зрабіць гэта. Ян Вісліцкі не адступаецца ад літаратурнай традыцыі “заяўкі” тэмы ў пачатку твора: першыя словы паэмы “*felix fama*” (“слаўная чутка”) – гэта тое, пра што збіраецца пісаць ён.

Грунвальдская бітва 1410 г. нават праз сто гадоў заставалася “слаўнай чуткай” у памяці нашчадкаў, абуджала (ці, лепш сказаць, павінна была абуджаць) высакародныя думкі і пачуцці суайчыннікаў паэта. І дзеля таго, каб падкрэсліць выключнасць гэтай падзеі, Ян Вісліцкі прымяняе выдатнае паэтычнае вынаходніцтва: замест дзеяслова ў загадным ладзе, як у Гамера, замест дзеяслова ў форме першай асобы, як у Вергілія, аўтар “Прускай вайны” спалучае “слаўную чутку” з дзеясловам у форме трэцяй асобы. “*Fama felix*” (“слаўная чутка”), такім чынам, перастае быць аб’ектам паэтычнага аповеду, як у антычных эпікаў, але здольная расказаць сама пра сябе. Яна сама “*reboat sanguineo triumpho fortis avi*” (“адгукаецца крывавым трыумфам магутнага продка”) [*Bellum I, 4-5*] караля Жыгімонта, да якога і звяртаецца паэт.

Вайна з тэўтонцамі (Пруская вайна) – ідэйны стрыжань паэмы. Магчыма, менавіта таму В. Дарашкевіч вызначыў жанр гэтага твора як “гісторыка-гераічная эпапея” [*Дорошкевич 1979, 108*]. Але, як вынікае з першых радкоў экспазіцыі, тэма вайны непарыўна

звязваецца аўтарам з тэмай дынастычнай – з услаўленнем Ягелонаў. Ідэйна і вобразна насычаная, кампазіцыйна адмысловая, паэма "Пруская вайна" далёка не абмяжоўваецца вузкімі рамкамі ваеннай, "батальнай" тэматыкі. Храналагічная паслядоўнасць падзей, гістарычная канкрэтыка не з'яўляюцца дамінантнымі прынцыпамі сюжэтнай пабудовы паэмы Яна Вісліцкага. Яго турбуе, што пра гэтую слаўную чутку, якая пачалася ад дзеда караля Жыгімонта, Ягайлы, і якая абляцела ўсе далёкія і блізкія краіны, "*vates per tot labentia lustra obticuere libris*" ("паэты маўчалі ў кнігах на працягу доўгіх перыядаў забыцця") [*Bellum I, 33-34*]. У працытаваным радку аўтар яўна стварае каламбур, гуляючы амонімамі "*lustrum*" 'лужына, балота' і "*lustrum*" 'доўгі прамежак часу', так што "доўгія перыяды забыцця" можна зразумець і як "балота забыцця". Такім чынам, паэт вылучае дзве прыярытэтныя для сябе задачы: па-першае, уваскрэсіць, адрадзіць напаўзабытую славу перамогі пад Грунвальдам і, па-другое, прадставіць гэтую перамогу як той шчаслівы "*omen*" ("знак"), які надзяляе Ягелонаў выключнымі правамі ўладарання на землях Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Паэт адчувае ў сабе творчыя здольнасці для рэалізацыі гэтай задумы; яго не палохае нават тое, што пра славутую перамогу "*agmina prisca dearum… fessa silent*" ("стомленыя, маўчаць… старажытныя сонмы багінь") [*Bellum I, 41-43*]. Менавіта ён, а не хтосьці іншы пачуў водгук той велічнай славы. Гэта зручная магчымасць для паэта зрабіць спробу ўзняць баявы дух народаў Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны – той дух, які марнеў ад шматлікіх няўдач і тэрытарыяльных страт у пачатку XVI ст. "Прысвяціўшы свой твор Жыгімонту, у асобе якога Ян Вісліцкі бачыў 'непераможнага караля Сармацкай Еўропы', – адзначае У. Кароткі, – паэт спадзяваўся звярнуць увагу на сваё мінулае менавіта інтэлектуальнай эліты, магнатаў, праз якіх ушанаванне гісторыі павінна было перадацца і прастакам" [*Кароткі 1997, 90*]. Вось чаму лексема "*fama*" не толькі пазначае цэнтральную тэму твора ў першых радках, але і наогул адыгрывае выключную ролю ў фарміраванні вобразна-мастацкага сусвету "Прускай вайны".

Семантыка гэтага лацінскага назоўніка даволі складаная. Так, лацінска-рускі слоўнік І. Дварэцкага прапануе пяць значэнняў слова "*fama*", асноўныя з іх – "погалас, чутка", а таксама "слава". Увесь гэты спектр значэнняў у спалучэнні з разнастайнымі варыянтамі

канатацый выкарыстоўвае Вісліцкі ў сваіх творах, тэматычна або ідэйна прывязаных да паэмы "Пруская вайна", а таксама ў самой паэме. Даволі часта паэтычная гульня значэннямі слова "*fama*" прыводзіць аўтара да арыгінальных мастацкіх вынаходніцтваў.

"Чутка" ў Вісліцкага – неабходная перадумова патрыятычнага пачуцця, якое ўзняло на "свяшчэнную вайну" шматлікія народы Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны. Гэта ў першую чаргу памяць продкаў, пераемнасць гераічных традыцый. У асаблівых выпадках, калі Ян Вісліцкі хоча падкрэсліць выключную значнасць якой-небудзь падзеі, ён характарызуе яе ўстойлівым (у межах уласнага паэтычнага лексікона) выразам "*nuntia fama*" – "звястоўная чутка" ("чутка-вяшчунка"). Менавіта ў такой форме гэты вобраз ужыты паэтам яшчэ ў "Заахвочвальным вершы" [гл.: *Carmen exhort. 10*]: сведчанне славы выдатнага настаўніка Хірона – "*Nuntia fama*" Траянскай вайны, у якой гераічна праявілі сябе абодва вучні кентаўра, Ахіл і Патрокл. Гэтаксама і перамога ў Грунвальдскай бітве з'яўляецца найлепшым аргументам для ўсіх цяперашніх і будучых ворагаў на карысць ваеннай моцы Жыгімонта: раз яго дзед Ягайла здабыў гэтую слаўную перамогу, то і ўнук, без сумненняў, будзе вартым прадаўжальнікам яго ратнай справы. Вось чаму "*felix fama*" ("слаўная чутка") у экспазіцыі паэмы спалучаецца са зваротам да Жыгімонта і служыць мастацкім сродкам сімвалічнага паяднання караля-сучасніка з яго "мужным продкам" – Ягайлам:

Felix astrigeri veniens de cardine mundi
Fama trucis nimium, Rex invictissime, belli
Sanguineo reboat multum madefacta triumpho
Fortis avi tollendo tui ad fastigia caeli
Gesta [Bellum I. 1-5].

Слаўная чутка, прыйшоўшы ад зорнага полюса свету,
Аб надзвычайна суровай вайне, о, кароль неадольны,
Гучна з крывавым трыумфам азвалася, каб узвялічыць
Подзвігі мужнага продка твайго аж да самых нябёсаў.

Аказіянальныя ідыёмы ("*Fama felix*", "*Nuntia fama*") персаніфікуюцца і становяцца істотным элементам ідэйнай задумы аўтара. Гіпербалізацыя вобраза-сімвала "слаўная чутка" адбыва-

ецца як у часе, так і ў прасторы. Слава Грунвальдскай бітвы не здрабнела за даўніной стагоддзя, не згубілася і на шырокіх зямных абсягах. Паэтычная тапаграфія Яна Вісліцкага, рэпрэзентацыя якой адбываецца на пачатку першай кнігі, як слушна заўважыў А. Цысык, адпавядае звыклай для паэзіі Старажытнага Рыма традыцыі выяўлення *orbis terrarum* – зямнога сусвету. "У апісанні геаграфічных межаў свету, – піша вучоны, – аўтар 'Прускай вайны' спалучае назвы рэальных мясцовасцяў, вядомых антычнасці, з традыцыйнымі міфалагічнымі ўяўленнямі: на крайнім усходзе гэта берагі акіяна… на крайнім захадзе – гэта Гесперыя… дзе ў водах заходняга акіяна знікае сонечны Феб. На поўначы – Рыфейскія горы, назва якіх упершыню была ўведзена ў антычную геаграфію Гекатэем Мілецкім… на поўдні – спаленыя каляскіцай Фаэтона даліны Ніла" [гл.: *Цысык 1995, 188*]. Як мы ўбачым далей, такое пашырэнне паэтычнага космасу спрыяе агульнай ідэйнай задуме – услаўленню дынастыі Ягелонаў як уладароў самых вялікіх абсягаў на землях Еўропы.

Цікава, што гераічная гісторыя Старажытных Грэцыі і Рыма прыцягваецца паэтам не для супастаўлення, а для супрацьпастаўлення славе яго суайчыннікаў, якія перамаглі на палях Грунвальда. Подзвіг Ягайлы, на думку Яна Вісліцкага, пераўзыходзіць справы славутых рымскіх і фіванскіх герояў. Тым больш кантрастна гучаць словы *"Tanta tui jacuit caligine mersa nigranti // Fama celebris avi"* ("Гэткая слава твайго продка праляжала, схаваная ў цёмным змроку") [*Bellum I, 21*]. Але як каштоўны камень не страчвае сваёй прывабнасці, так і гэты подзвіг, на думку паэта, не марнее, не забываецца, а захоўваецца ў памяці нашчадкаў як прыклад і ўзор наследавання для ўсіх, і найперш – для ўнука Ягайлы, Жыгімонта.

Уводзячы паступова тэму вайны з крыжакамі, паэт у якасці пазітыўнага супастаўлення прыцягвае гісторыю рымска-карфагенскіх войнаў: маўляў, калісьці сіла рымскага войска адолела карфагенянаў, спыніўшы іх агрэсію на многія стагоддзі. Гэта – напамін і папярэджанне рыцарам-тэўтонцам, якія на пачатку XVI ст., пад кіраўніцтвам герцага Альбрэхта Гогенцолерна, абранага ў 1511 г. вялікім магістрам Ордэна, ізноў актывізавалі сваю агрэсіўную палітыку супраць федэратыўнай дзяржавы Жыгімонта Першага. З гэтай мэтай паэт стварае рэтраспектыўны мастацкі

план: воды Віслы, афарбаваныя крывёй ахвяр бітвы пад Грунвальдам, ён параўноўвае з крывавымі водамі Ксанта падчас Траянскай вайны. Пры гэтым Ян Вісліцкі падкрэслівае, што сама пракаветная баталія пад сценамі Іліёна, якая забрала жыцці тысячаў ахейцаў і траянцаў, – вынік усяго толькі аднаго ганебнага ўчынку, здрады Алены, дачкі Леды. У духу гуманістычнага светаадчування Ян Вісліцкі робіць бліскучае падсумаванне экспазіцыі свайго твора: "*Hoc scelus antiquum; belli causas sed iniquas // Ipse stupesco*" ("Гэта старажытнае злачынства; але я і сам здзіўляюся, якімі марнымі бываюць прычыны вайны") [*Bellum I, 78-79*]. Паэт з горыччу адзначае: падобна таму як нашмат стагоддзяў раней войскі многіх грэцкіх плямёнаў сабраліся ў Аўлідзе, каб на чале з Агамемнанам выправіцца ў мора да берагоў Іліёна, так і ў часы Ягайлы пад сцягі "братоў Марыі" сышліся войскі германскіх і скандынаўскіх народаў, жадаючы "*signa Polonorum delere nitentia regum*" ("знішчыць бліскучыя кляйноты польскіх каралёў") [*Bellum I, 87*].

Традыцыйная для антычнай паэзіі апеляцыя да Музаў лагічна замяняецца ў паэта-хрысціяніна малітвай да Панны Марыі. Пераносячы на Багародзіцу функцыю апякункі мастакоў, Ян Вісліцкі просіць дапамагчы яго "опусу", прынесці спрыяльныя вятры і накіраваць рострум яго паэтычнага карабля ў добрае рэчышча.

Важнай задачай для аўтара "Прускай вайны" было ажыццявіць рэпрэзентацыю малавядомай для заходнееўрапейскага чытача Сармацкай дзяржавы, як з часоў Геродота называлі вялікую Радзіму паэта. На фоне дзяржаўнасна-дынастычнай тэматыкі Ян Вісліцкі "вылучыў у сваім творы праблемы ўзаемаадносін еўрапейскіх народаў і пераемнасці лепшых гістарычных і культурных традыцый" [*Дорошкевич 1979, 108*], разважаў пра пошукі шляхоў умацавання магутнасці роднай краіны. Таму істотным элементам мастацкай тканіны паэмы "Пруская вайна" з'яўляюцца разнастайныя звесткі геаграфічнага і этнаграфічнага характару, якія перадаюць уяўленні вучонага-паэта XVI ст. пра рассяленне розных народаў, іх звычаі і норавы.

Так, пасля інвакацыі да Багародзіцы апяваецца "*terra sub arctoa famata Lycaonis ursa*" ("слаўная зямля пад паўночнай Лікаонскай мядзведзіцай (пад сузор'ем Вялікай Мядзведзіцы)" [*Bellum I, 110*]. Паэт адзначае, што "*accola rudis*" ("недасведчаны сусед") называў гэтую краіну "*Sarmatia*", хаця правільная, спрадвечная назва

краіны – "*Polonia*": "*Nam sua sic dicti patrio sermone Poloni // Rura tenent agrosque colunt*" ("Бо палякі, якія назвалі так сябе на сваёй уласнай мове, валодалі [тут] землямі і апрацоўвалі палі") [*Bellum I, 115-116*]. Паходжанне назвы краіны, такім чынам, аўтар узводзіць да саманазову народа, які складаў значную частку насельніцтва гэтага краю; этымалогія тапоніма прывязваецца да семантыкі этноніма.

Упамінанне народаў, якія жывуць побач з палякамі, спалучаецца з чарговым зваротам да караля: усе яны, гаворыць аўтар, аб'яднаныя ўладарствам Жыгімонта Першага. Адразу ж пасля палякаў згадваюцца "*triplices Rutheni*" ("траістыя русіны"), якія, па словах паэта, "*ad Euxini Nomades pelagi Mysosque // Ac Tanaim protensa et ad aequora lata Livonum*" ("прасціраюцца аж да намадаў і мызаў на Понце Эўксінскім (Чорным моры), а таксама да шырокіх прастораў лівонцаў" [*Bellum I, 121-122*]. Лакалізацыя траістай (Чорнай, Белай і Чырвонай) Русі Янам Віслицкім адпавядае карце рассялення часткі ўсходніх славян у XVI ст., якія на поўдні і паўднёвым усходзе межавалі з крымскімі татарамі і валахамі (малдаванамі і румынамі), а на поўначы – з сучаснымі жыхарамі Паўночнай Латвіі (былымі лівонцамі). Паэт не вызначае ўсходняй і заходняй межаў "траістай Русі", што звязана, магчыма, з яго палітычным крэда, якое знайшло найбольш яскравае выражэнне ў трэцяй кнізе паэмы.

Іншыя народы, якія, па словах паэта, "*perdomitant diademate*" ("падпарадкоўваюцца ўладзе") Жыгімонта, – гэта жыхары Прыкарпацця, Багеміі і ўсходняй часткі Панноніі (сучасныя чэхі і венгры). Іх землі былі пад уладаю Ягелонаў з 1440 да 1526 г. (да ўсталявання дынастыі Габсбургаў на большасці гэтых тэрыторый). На ўскрайках "Палоніі", адзначае Ян Віслицкі, "*Scythicis nivibus gelidisque pruinis*" ("паміж скіфскіх снежных і лядовых прастораў") [*Bellum I, 131*], жыве невядомае паўночнае племя. Апошнім згадваецца "*effera gens… Masoviae, Prussis contermina quaeque superbis*" ("дзікае племя… Мазовіі, суседзі ганарыстых прусаў") [*Bellum I, 132-133*] – насельніцтва таго рэгіёна, адкуль і выбухнула Пруская вайна на пачатку XV ст.

Усе гэтыя народы, падкрэслівае паэт, падпарадкоўваліся польскім уладарам. Вось чаму пасля своеасаблівага геаграфічна-этнаграфічнага экскурсу Ян Віслицкі распавядае пра легендарных

заснавальнікаў польскай дзяржавы: Леха, Крака і Ванду. Калі Лех толькі ўпамінаецца як “*moderator primus*” (“першы валадар”) [*Bellum I, 137*], то Крак заслугоўвае ўзнёслай характарыстыкі. Імя “Крак” трансфармуецца паэтам у форму старажытнарымскага радавога імя (“*cognomen*”) “*Gracchus*”. Да гэтага роду належалі два славутыя дзяржаўныя і палітычныя дзеячы Старажытнага Рыма: Тыберый (162–133 да Р.Х.) і Гай (153–121 да Р.Х.) Гракхі. Б. Кручкевіч адзначае, што паэт называе Крака Гракхам адпаведна традыцыі таго часу [*Pauli 1887, 170*]. Цікава пракаменціраваў сумяшчэнне імёнаў “Крак” і “Гракх” У. Кароткі. “Відаць, нават гэтым, – піша даследчык, – паэт-новалацініст хацеў указаць на аддаленыя сувязі… паміж старажытнарымскім патрыцыянскім родам Гракхаў і родам патрыцыя Палямона, міфічнага заснавальніка дынастыі Вялікіх Князёў Літоўскіх” [*Кароткі 2001, 262*].

Крак услаўляецца найперш як заснавальнік Кракава – горада, асабліва дарагога Яну Вісліцкаму: тут знаходзіцца яго *alma mater*, Ягелонскі універсітэт. Менавіта на гэтай падставе паэт прыпадабняе кракаў да Афінаў і да Рыма, якія ў антычныя часы былі цэнтрамі навук і мастацтваў.

Узнёслы паэтычны аповед, прасякнуты лірызмам, прысвечаны дачцэ Крака Вандзе. Постаць польскай каралевы-панны прывабіла Яна Вісліцкага найперш трагічнай гісторыяй яе жыцця. Ванда ў свой час адмовіла германскаму (і гэта было істотна для аўтара “Прускай вайны”!) князю ў яго шлюбнай прапанове і смела выйшла на вайну супраць яго. Безумоўна, для паэта гэта своеасаблівы сімвал таго, што ўладары Сармацкіх земляў спрадвеку не жадалі падпарадкоўвацца германцам, нават у шлюбным звязе, і здаўна атрымлівалі ваенныя перамогі над імі, як зрабіла гэта і Ванда. Народ уганараваў дачку Крака асабліва адметна: дзеля вечнага ўшанавання памяці пра яе паблізу муроў Кракава быў насыпаны высокі курган.

Адзначыўшы, што з Вандаю перарваўся род Крака на ўладаранні, Ян Вісліцкі звяртаецца па дапамогу, каб прадоўжыць аповед пра ўладароў “Палоніі”. Ён просіць падтрымкі ў “старажытнай Славы” (“*Fama vetus*”) і ў Музы Каліопы [*Bellum I, 217-220*]. Фактычна паэт робіць сваю “Фаму” дзесятай Музай, чарговы раз падкрэсліваючы яе сімвалічнае значэнне ў ідэйнай задуме цэлага твора.

Нечакана з'яўляецца Апалон-Цынтыец і раіць паэту перапыніць аповед, спасылаючыся на яго малады ўзрост ("*quoniam tenerum non ista puellum // Vena decet*") ("бо гэткая глыбіня не пасуе пяшчотнаму юнаку") [*Bellum I, 234-235*]. Гэтую справу Апалон наважыўся пераадрасаваць іншым паэтам, прычым сфармуляваў свой намер даволі адмыслова:

… sunt et erunt vates qui postea reges
Deprоment, coluit quos durus Sarmatha, sed tu
Sideream stirpem regis modulare Poloni,
Nec non fortis avi praestantia facta sui… [Bellum I, 252-255].

Ёсць жа і будуць паэты – яны нам пазней і пакажуць
Тых каралёў, што суровы сармат услаўляе. Ты ж лепей
Продка славутага польскага валадара апявай нам,
Слаўныя дзеі яго знакамітага дзеда…

Заўважым, што ў гэтых радках Ян Вісліцкі выразна супрацьпастаўляе назовы "*Sarmata*" – "*Polonus*". Тым самым паэт імкнецца аддзяліць Ягелонаў, валадароў сучаснай дзяржавы ("Палоніі"), ад іх папярэднікаў на стальцы – прадстаўнікоў дынастыі Пястаў, валадароў напаўлегендарнай "Сарматыі". На думку Вісліцкага, вызначальныя вехі гісторыі "Палоніі" звязаны з эпохай праўлення Ягелонаў, бо менавіта яны пераўтварылі першапачаткова монаэтнічную краіну з цэнтрам у невялікай гістарычнай вобласці Мазовіі ў магутную федэратыўную дзяржаву, якая ў XVI ст. займала вядучыя пазіцыі на еўрапейскай арэне. "Сарматыя" была толькі далёкім, "варварскім" краем ва ўяўленні жыхароў Заходняй Еўропы (вось чаму сармат заслугоўвае ў паэта эпітэта "*durus*" – "суровы, грубы"); "Палонія" – цывілізаваная еўрапейская краіна. Заходнееўрапейскія манархі – Габсбургі, Гогенцолерны, Вазы – лічылі за гонар паяднаць сваіх нашчадкаў дынастычнымі шлюбамі з Ягелонамі.

Глыбінная сутнасць ідэйнай задумы паэта, якой і было прадыктавана заканчэнне першай кнігі, была канцэптуальна пераасэнсавана У. Кароткім. "Як некалі адзінства Русі, – адзначае даследчык, – успрымалася як адзінства княжацкага рода Рурыкавічаў, так цяпер адзінства дзяржавы народаў Польскай Кароны і Вялікага Княства Літоўскага ўспрымалася як спадчыннае права Ягелонаў на валоданне і абавязак абароны і захавання гэтых земляў. …Гістарычная аналогія напрошваецца сама па сабе: як Рурыкавічы не-

калі сталі валадарыць дзяржавай Кія, Шчэка і Харыва з цэнтрам у Кіеве, так і Ягелоны – на землях Леха, Крака і Ванды са стальцом у Кракаве" [*Кароткі 1997, 91-92*]. Пазней вучоны дадаў, што, "згадваючы дынастычную гісторыю Польскай Кароны, Ян Вісліцкі… свядома абмінае гісторыю панавання Пястаў, якая не ўвязваецца з яго дынастычна-дзяржаўнай канцэпцыяй" [*Кароткі 2001, 262*]. Сапраўды, Апалон параіў паэту апусціць у яго аповедзе гісторыі панавання ўсіх каронных уладароў пасля Ванды, а іх было не менш за трыццаць. Такім чынам, кампазіцыйная пабудова паэмы на макраструктурным узроўні стала мастацкай ілюстрацыяй федэратыўнага мыслення паэта.

Кніга другая

У адпаведнасці з задачай, пастаўленай "натхняльнікам паэтаў" Апалонам, Ян Вісліцкі ў экспазіцыі другой кнігі рэпрэзентуе тую краіну, з якой паходзіў пераможца ў Прускай вайне 1410 г., дзед караля Жыгімонта – Ягайла. Гэты край – Вялікае княства Літоўскае. Ды не толькі імкненнем уславіць родны край прадыктаваны пачатак другой кнігі "Прускай вайны". Ян Вісліцкі, ураджэнец беларускай зямлі, але гадаванец "польскай Айчыны", паставіў перад сабою задачу "даказаць права Ягайлы і Ягелонаў на вялікакняжацкія землі, паколькі менавіта ў часы Жыгімонта I былі вельмі моцныя сепаратысцкія настроі ў Вялікім Княстве Літоўскім" [*Кароткі 2001, 263*]. Вось чаму паэту важна падкрэсліць: Ягайла, як і Вітаўт, паходзіць з Літвы, а значыць, Ягелоны – гэткія ж правамоцныя спадкаемцы вялікага княжання, як і Кейстутавічы.

Менавіта ў паэзіі Яна Вісліцкага ўпершыню з'яўляецца той славуты "беларуска-літоўскі набор" прыродных багацця, які пазней будзе ўслаўляцца і, фактычна, стане новым мастацкім топасам у творах Мікалая Гусоўскага, Яна Радвана, Францішка Князьніна. Айчынны край паэта надзвычай багаты цяністымі лясамі, квяцістымі лугамі, меданоснымі крыніцамі, ён слаўны мужнымі, ваяўнічымі народамі. Як і ў выпадку з найменнем "*Polonia*", паэт імкнецца пранікнуць у этымалогію назвы "*terra Lithuana*" ("Літоўская зямля"). Вісліцкі піша пра гэта так: "*Quem dixere rudi Lithuanam nomine terram // Indigenae veteres…*" ("Простым найменнем – зямлёю Літоўскай – яе (краіну) назвалі // Продкі мясцовага люду…") [*Bellum II, 5-6*].

В. Дарашкевіч выраз “*rude nomen*” трактуе як “грубае імя”, таму каменціруе гэтыя радкі наступным чынам: “‘Грубае імя’ ў дачыненні да Літвы – палемічна-іранічнае, вынік уздзеяння на Яна з Вісліцы той еўрапейскай (запазычанай ад грэкаў і рымлянаў) літаратурнай традыцыі, паводле якой, па-першае, землі ад Віслы да Дона называліся Еўрапейскай Сарматыяй… а па-другое, усе яны лічыліся малакультурнымі, ‘грубымі’ (у супрацьлегласць Італіі) ‘краінамі Поўначы’” [*Дарашкевіч 1975, 56*]. Я. Парэцкі аспрэчвае такі пераклад і лічыць, што паэт меў на ўвазе іншую думку: “… мясцовы просты народ называў Літвою зямлю…” [гл.: *Парэцкі 1991, 28*]. Тым не менш ніякай памылкі ў перакладзе В. Дарашкевіча няма, ды і сама граматыка лацінскай мовы не дазваляе спалучыць форму прыметніка трэцяга скланення “*rudi*” з формай назоўніка “*indigenae*”; мяркуючы па склонавай форме (*Ablativus singularis*), гэты прыметнік сапраўды адносіцца да назоўніка “*nomine*”. Іншая справа, што для “*rudis*” у дадзеным выпадку трэба выбраць іншы лексічны адпаведнік у беларускай мове: не “грубы”, а “прастанародны, просты”. Азначэнне “простае найменне” (*nomen rude*) у дачыненні да назвы “Літва” адсылае нас да “Хронікі Быхаўца”, дзе даецца наступнае тлумачэнне гэтага тапоніма: “Y prozwał tot Kiernus bereh jazykom swoim włoskim, po łatine Litus, hde sia ludy mnożat, a truby, szto na nich ihraiut, tuba, y dał imia tym ludem swoim po łatine, złożywszy bereh s truboiu, Listubania. Y prostyi lude ne umeli zwaty po łatine y poczali zwaty prosto Litwoiu” [*Хроника 1975, 129*]. Тое, што Ян Вісліцкі лічыць назву “Літва” “*rudi nomine*”, дазваляе меркаваць, што паэт быў знаёмы з беларуска-літоўскім летапісаннем і пададзенай у ім рымскай канцэпцыяй паходжання вялікіх князёў літоўскіх, хаця ў сваёй паэме ні разу не згадаў легендарнага Палямона.

Словы Яна Вісліцкага “*dixere nomine rudi terram Lithuanam*” (“назвалі простым імем Літоўскую зямлю”) В. Дарашкевіч лічыць вынікам своеасаблівага пераасэнсавання паэтам “сармацкай тэорыі” ў рэчышчы сваіх патрыятычных пачуццяў. І калі гэтая гіпотэза падаецца даволі суб’ектыўнай, то цалкам слушнай варта прызнаць выснову вучонага адносна таго, што ў гэтым эпізодзе “Прускай вайны” “ідзе размова не толькі пра этнаграфічную Літву, але і пра землі цэнтральнай і заходняй Беларусі, а таксама паўднёва-ўсходняй часткі Літвы, якія складалі гістарычнае ядро Вялікага

Княства Літоўскага" [*Дорошкевич 1979, 107*]. Гэта вынікае ў першую чаргу з таго, што Ян Вісліцкі наўмысна падкрэслівае беларускае паходжанне Ягайлы, які стаў заснавальнікам новай каралеўскай дынастыі [гл.: *Bellum II, 8-10*]. Сапраўды, "дзядзіна" Ягайлы – гэта тыя землі, якія ён атрымаў у спадчыну ад бацькі Альгерда. А гэта, па звестках "Летапісца Вялікіх князёў Літоўскіх", – беларускія землі. Так, у летапісе паведамляецца, што вялікі князь Гедымін "Олгирду, королеву оцу, [дал] Крево; да к тому князь витебскыи сынов не держаль, приняль его к дотьце, Витебъскь в зяти" [*Летописец 1980, 61*]. Не мог Ян Вісліцкі не ведаць і пра тое, што маці Ягайлы была цвярская княгіня Ульяна, а значыць, Ягелоны ў пэўным сэнсе мелі дачыненне і да ўладарання ў суседніх усходнеславянскіх княствах. Гэта – папярэдняя падстава для матывацыі тых імперскіх апеляцый, з якімі звяртаецца паэт да Жыгімонта Першага ў фінале твора.

Гаворачы пра ўладу Ягайлы, паэт адзначае, што ён "*juga Lithuani rexit Mavortia sceptri*" ("усталяваў Марсава ярмо літоўскай улады") [*Bellum II, 16*]. Такое разуменне спецыфікі дзяржаўнага будаўніцтва ў дачыненні да Вялікага княства Літоўскага пацвярджаецца канцэпцыямі сучасных беларускіх гісторыкаў, якія не аспрэчваюць факта першапачатковага ваеннага захопу літоўскімі князямі беларускіх земляў. Так, Г. Сагановіч канстатуе, што "палітычная экспансія Літвы на ўсход прывяла да канструктыўнага ўтварэння фактычна літоўска-беларускай дзяржавы, у якой пры палітычнай дамінацыі літоўцаў значэнне тэрытарыяльнага, дэмаграфічнага і грамадска-культурнага патэнцыялу Беларусі яшчэ некалькі стагоддзяў узрастала" [*Сагановіч 2001, 72*]. Гэты эпізод айчыннай гісторыі можна супаставіць з гісторыяй заняпаду Старажытнай Грэцыі і ўзвышэння Старажытнага Рыма. Пра гэта сведчаць вядомыя радкі вялікага Гарацыя:

Graecia capta ferum victorem cepit et artes
Intulit agresti Latio [*Hor. Epist. II.1, 156-157*].

Грэцыя, захопленая ў палон, паланіла дзікага пераможцу, і мастацтвы
Прынесла некультурнаму Лацыю…

Менавіта на аснове асацыятыўнай паралелі з выразам Гарацыя “*agreste Latium*” (“некультурны Лацый”) магло ўзнікнуць азначэнне Яна Вісліцкага “*rude nomen*” (“простае імя”) у дачыненні да назвы “Літва”.

Сярод народаў, над якімі Ягайла ўсталяваў сваю ўладу, паэт называе “*nomine Tartarico Nomades quos nuncupat aetas*” (“тых, з імем ‘татары’, якіх старажытнасць мянуе намадамі”), “*Massagetas truces*” (“суровых масагетаў”), а таксама “*albos belli celebres virtute Ruthenos*” (“і белых русінаў, славутых ваеннай мужнасцю”) [*Bellum II, 18, 20, 22*]. Спыняючыся больш падрабязна на аналізе славутага ў беларускім літаратуразнаўстве радка, адзначым, што “*albi Rutheni*” – даволі праблематычны ў гістарычным аспекце тэрмін дзяржаўна-этнічнай ідэнтыфікацыі (гл., напр.: *Энцыклапедыя. Т.1. 1993, 492). “Albi Rutheni*” Яна Вісліцкага – гэта, відавочна, не тое ж самае, што сённяшнія беларусы: гэты тэрмін ужыты Янам Вісліцкім для пазначэння пэўнай часткі насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, прычым ужыты аднаразова. Пад “белымі русінамі” Ян Вісліцкі меў на ўвазе насельнікаў таго самага рэгіёна, які акрэсліў назваю “*Alba Russia*” П. Одэрборн: “*Polocia… Soccolia, Czussa, Turobla et aliis Albae Russiae oppidis… Germani omnes… dimissi sunt*” (“З Полацка… Сакольні[4], Чавусаў, Туроўлі[5] і іншых гарадоў Белай Русі… усе германцы… былі выпраўлены”) [*Oderborn 1582, p.2 n.n.*]. Трэба думаць, што прыкладна праз гэтыя гарады, згаданыя нямецкім святаром, праходзіла заходняя мяжа Белай Русі. Адпаведна, “белых русінаў” Яна Вісліцкага можна атаясамліваць толькі з жыхарамі асобных раёнаў Віцебшчыны і Магілёўшчыны.

Чаму ж Ян Вісліцкі абмежаваў этнічны склад шматнаселенай дзяржавы Ягелонаў трыма народамі? Адказ на гэтае пытанне можна даць толькі зважаючы на цэласную ідэйна-мастацкую задуму аўтара. Як памятаем, у экспазіцыі першай кнігі аўтар прадставіў паэтычную выяву “*orbis terrarum*” (“зямнога сусвету”), ніжэй – “*orbis Poloniae*” (“сусвету Палоніі”), падуладнай Ягелонам дзяржавы. У экспазіцыі ж другой кнігі Ян Вісліцкі рэпрэзентуе “*orbem*

[4] Сакольня – горад у Беларусі XVI ст.; на карце Мікалая Крыштафа Радзівіла “Сіроткі” пазначаны на поўнач ад Талочына.

[5] Туроўля – горад у Беларусі XVI ст.; на карце М. К. Радзівіла пазначаны ля вусця ракі Обаль.

Lithuaniae" ("сусвет Літвы") – той край, адкуль паходзіць заснавальнік новай каралеўскай дынастыі – Ягайла. Сапраўды, "намады" (татары) – насельнікі паўднёвых межаў гэтай дзяржавы, "масагеты" (жамойты) насяляюць яе паўночна-заходнія межы, а "белыя русіны" – землі на ўсходніх межах Вялікага княства Літоўскага. Вось чаму пры першай рэпрэзентацыі "этнічнага звязу" Ян Вісліцкі выбірае менавіта тыя народы, якія жывуць на межах дзяржавы; вось чаму ён робіць акцэнт не на літоўцах, не на чорных або чырвоных, а менавіта на белых русінах.

Пра атрыманне Ягайлам каралеўскай улады паэт распавядае так:

Ad sua quem fortes revocarunt arva Poloni
Legitimum diadema duci tribuendo sagaci [*Bellum II, 23-24*].

Мудрага князя палякі паклікалі ў край свой айчынны,
Каб па законе яму перадаць каралеўскую ўладу.

Тэкст другой кнігі, пачынаючы з 25-га радка, М. Езяніцкі прапанаваў разбіць сінтаксічна інакш, чым Б. Кручкевіч, які ў выданні 1887 г. пачаў абзац з 28-га радка, г. зн. са слоў *"Dux Conradus erat…"* ("Быў князь Конрад…"). М. Езяніцкі лічыць правільным далучыць гэты і наступныя радкі да папярэдніх і пачаць сказ з 25-га радка, са слоў *"Felix Jagello…"* ("Шчасны Ягайла"). Гэтыя адрозненні ў сінтаксічнай разбіўцы маюць прынцыповае значэнне для разумення не толькі гэтых канкрэтных радкоў, але і ўсёй паэмы ў цэлым. Паводле разбіўкі Б. Кручкевіча і ў адпаведнасці з яго кан'ектурамі падрадковы пераклад 25–30-га радкоў гучыць наступным чынам: "Слаўны Ягайла правіў слаўным каралеўствам і трымаў уладу, абараніўшы яе покрывам міру, пакуль не быў устрывожаны народам, які забыўся на дабро. Жыў князь Конрад, які тады валодаў Куяўскай зямлёю сярод суровых бітваў бязлітаснага Марса. У іх (бітвах) ён меў для сябе абарону ад лютых ворагаў". Паводле ж разбіўкі М. Езяніцкага гэты пасаж набывае зусім іншы сэнс. "Слаўны Ягайла правіў слаўным каралеўствам і трымаў уладу, абараніўшы яе покрывам міру, пакуль князь Конрад, які тады валодаў Куяўскай зямлёю, не быў пакліканы на суровую бітву бязлітаснага Марса народам, які забыўся на дабро і які быў яму абаронаю ад суровых ворагаў". Б. Кручкевіч, спасылаючыся на гістарычныя крыніцы, даводзіць, што гаворка тут ідзе пра князя Конрада Мазавецкага [гл.:

Pauli 1887, 187]. М. Езяніцкі згаджаецца з гэтым, аднак вучонага бянтэжыць яўны анахранізм, паколькі, на яго думку, Ян Вісліцкі згадвае побач караля Ягайлу, які жыў у канцы XIV – першай палове XV ст., і князя Конрада Мазавецкага, які жыў у XIII ст. М. Езяніцкі ўказвае на падобнае ўпамінанне гэтых гістарычных асоб у адным часе і ў 95–97-м радках другой кнігі "Прускай вайны":

Immemor adversus conatu proelia turpi
Commovet, atque ducem bello deperdere gestit.
Limitibus, populis et agris, rex dive, Polonis…

Пра дапамогу забыўшы, ў ганебным імкненні да звады
Гэты народ у вайне пагубіць таго князя імкнецца.
Боскі кароль! Паглядзі, як, рабуючы польскія землі…

На падставе прааналізаваных эпізодаў М. Езяніцкі робіць выснову, што гэты анахранізм тлумачыцца недасведчанасцю Яна Вісліцкага [*Jezienicki 1888. Z.4, 199*]. Цяжка паверыць, аднак, што аўтар "Прускай вайны", "*magister-extraneus*" Ягелонскага універсітэта мог не ведаць, калі жыў Конрад Мазавецкі.

Ці не было якога-небудзь іншага Конрада, сучасніка караля Ягайлы? Адказ на гэтае пытанне нам дае "Гісторыя Польшчы", дзе сярод імёнаў князёў, што далучыліся ў вайне 1410 г. да крыжакоў, фігуруе імя Конрада Аляснiцкага [*Dzieje 1978, 193*]. Хутчэй за ўсё менавіта гэты Конрад ("*dux Conradus*") і згадваецца ў 28-м радку другой кнігі "Прускай вайны". Значыць, у 25–30-м і ў 95–97-м радках ідзе гаворка пра караля (Ягайлу) і князя (Конрада Аляснiцкага), якія жылі ў адзін час. Гістарычная рэтраспекцыя ў другой кнізе "Прускай вайны" датычыцца толькі 33–44-га радкоў, дзе ідзе размова пра часы імператара Фрыдрыха II Гогенштаўфена, а таксама 48–90-га радкоў, дзе паэт распавядае пра выгнанне братоў-хрысціян з земляў Пталемаіды, пра іх перасяленне ў прырэйнскі край і дамову з Конрадам Мазавецкім. Апошні ў тэксце (у 65-м радку) пазначаны проста як "*dux*" ("князь"). Так што выснова пра недасведчанасць Яна Вісліцкага адносна часу жыцця Конрада Мазавецкага, відавочна, не мае падставы!

Апісваючы падзеі, якія папярэднічалі Грунвальдскай бітве, паэт распавядае пра тое, як тэўтонцы звярнуліся да Лівонскага ордэна, "*quos domitare volens… // viros et flagrantem fera proelia pubem*" ("жа-

даючы ўтаймаваць тых мужоў і народ, што настойліва імкнуўся да суровай бітвы") [*Bellum II, 44-45*]. Хутчэй за ўсё тут маецца на ўвазе антыкрыжацкае паўстанне на Жамойці, якое ўзнялося па ініцыятыве вялікага князя Вітаўта ў 1409 г. і якое, уласна кажучы, паслужыла нагодаю да вайны польскай кароны і Вялікага княства Літоўскага з Тэўтонскім ордэнам.

Пасля гістарычнага экскурсу ў гісторыю міграцыі тэўтонцаў паэт вяртаецца да ранейшага аповеду, у прыватнасці да асобы князя Конрада Аляснiцкага, якога, маўляў, ганебнае племя крыжакоў "*bello deperdere gestit*" ("захацела пагубіць у вайне") [*Bellum II, 96*]. У гэтым выпадку лагічна ўплятаецца ў кантэкст аповеду інвакацыя да караля Ягайлы, якая пачынаецца з 97-га радка:

Limitibus, populis et agris, rex dive, Polonis
Damna ferendo profana tuis gens saevit in arvis [*Bellum I, 97-98*].

Боскі кароль! Паглядзі, як, рабуючы польскія землі,
Дзікае племя народы краіны тваёй вынішчае…

Ян Вісліцкі вельмі падрабязна апісвае склад варожага войска. Прыгадаўшы жыхароў прырэйнскага краю, "народы Габрыты і Густалістай Луны", гельветаў і фрызаў, свебаў і брытанцаў, паэт падсумоўвае:

Tota fuit Germania, tota potentia plebis,
Quae fert esse suum Germano sanguine [*Bellum II, 112-113*].

Гэта была ўся Германія, сіла сукупная люду,
Меў ён на мэце адно: каб германскую кроў узвялічыць.

Вось чым найбольш занепакоены паэт! Вось чаму такую пільную ўвагу ён надае дынастычным пытанням, заклікаючы адзінакроўных жыхароў Рэчы Паспалітай аб'яднацца пад эгідаю дзяржаўнай улады Ягелонаў, каб адолець і падначаліць сабе чужынцаў. Пазней і Мікалай Гусоўскі ў "Песні пра зубра" будзе звяртацца да еўрапейцаў з заклікам аб'яднацца супраць агульнага ворага – іншавернага і іншароднага. У "Прускай вайне", такім чынам, адлюстравана традыцыйнае народнае стаўленне да крыжакоў як да ворагаў, чужакоў, успрынятае паэтам з вуснапаэтычных твораў, прысвечаных Грунвальдскай бітве.

У апісанні падрыхтоўкі да вайны з тэўтонцамі ў другой кнізе паэмы з'яўляецца вобраз вялікага князя Вітаўта, славутага пераможцы на палях Грунвальда. Паэт распавядае, што кароль Ягайла паклікаў на вайну з тэўтонцамі тыя народы, якія былі пад уладаю Вітаўта: *"letifero Russos pugnare paratos arcu"* ("русаў, гатовых пацэліць з напятага лука"), *"Nomades diros"* ("дзікіх намадаў"), *"Massagetas ad arma nimis crudelia promptos"* ("масагетаў, гатовых да самых крывавых бітваў") [*Bellum II, 136-142*]. Як бачым, пры апісанні бітвы Ян Вісліцкі больш не ўспамінае "*albos Ruthenos*" ("белых русінаў"). Цяпер побач з намадамі і масагетамі ў яго выступаюць усе "*Russi*" ("русіны"), якія прынялі ўдзел у Грунвальдскай бітве.

Пры апісанні першай атакі войска вялікага князя Вітаўта паэт ізноў звяртае ўвагу на этнічны склад ратнікаў. Цяпер у яго фігуруюць чатыры этнонімы: да вышэйпералічаных дадаюцца "*Lithuani*" ("літоўцы") [*Bellum II, 202*]. Калі ж паэт распавядае пра паражэнне першай атакі войска Вітаўта, то "этнічны звяз" у гэтай сцэне ізноў змяняецца: згадваюцца толькі русы, намады і літоўцы [*Bellum II, 216, 219-221*]. Напэўна, немагчыма адразу адназначна вытлумачыць для сучаснага чытача гэтую варыятыўнасць ва ўжыванні этнонімаў і дакладна вызначыць, *who is who*. Адказ на гэтае пытанне патрабуе скрупулёзных даследаванняў у галіне этнаніміі Вялікага княства Літоўскага. Цяжка паверыць, аднак, быццам гэтая аўтарская варыятыўнасць звязана з той акалічнасцю, што "Ян Вісліцкі, як і ягоныя сучаснікі, меў даволі цмянае ўяўленне пра этнічны склад Вялікага княства Літоўскага" [*Кавалёў 2003, 3*]. Вылучэнне "русаў (русінаў)", "літоўцаў", "масагетаў", а таксама "намадаў" як тых народаў, што насялялі дзяржаву Вітаўта, адпавядала ўяўленню пра гэтую дзяржаву як "Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае".

Фактычна тэрміны нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтыфікацыі выступаюць у "Прускай вайне" не як этнонімы, а як палітонімы. Доказ таму – радок, у якім Ян Вісліцкі аб'ядноўвае і "літоўцаў", і "русаў", і "намадаў" у адно: "*multa agmina tuae gentis*" ("шматлікія харугвы твайго народа") [*Bellum II, 221*]. "Народ Вітаўта" – гэта не прадстаўнікі пэўнай этнічнай супольнасці, а ўсе падданыя вялікага князя. Цікава, што ў сваёй прамове, звернутай да Ягайлы, Вітаўт супрацьпастаўляе "*suos*" ("сваіх") і "*tuos Polonos*" ("тваіх палякаў").

Тым самым яшчэ раз падкрэсліваецца наяўнасць двух правадыроў у лёсавызначальнай бітве з крыжакамі.

Менавіта другая кніга "Прускай вайны" найбольш дэталёва раскрывае сутнасць аўтарскай задумы: расказаць пра "*fata duelli*" – "вынікі вайны". "*Fata*" – гэта не тое, што занеслі ў свае манускрыпты старанныя складальнікі сярэднявечных хронік, гэта не падрабязныя даследаванні гісторыкаў – з імёнамі, лічбамі, фактамі, рэальнымі выказваннямі рэальных удзельнікаў падзей. Гэта – народная памяць пра велічную перамогу; гэта тое, што перадаецца з пакалення ў пакаленне тады, калі ўжо сціраецца ўсё неістотнае, калі застаецца "*fama felix*" ("слаўная чутка"), ачышчаная ў плыні часу, быццам золата ў агні.

Вось чаму ў другой кнізе "Прускай вайны" мы не знойдзем летапіснай канкрэтыкі: тут няшмат імёнаў, адсутнічае фактаграфія (яна кампенсуецца паэтычнымі рэтардацыямі ў стылі антычнага гераічнага эпасу), няма выразнай мяжы паміж гісторыяй і легендай пры апісанні бітвы. У гэтым польскія вучоныя мелі рацыю. Толькі, канешне ж, Ян Вісліцкі свядома адштурхоўваецца ад гістарычных апісанняў. У аснове яго мастацкай палітры – суквецце літаратурных і вуснапаэтычных паданняў пра Грунвальдскую бітву.

В. Дарашкевіч прыгадвае тыя творы, прысвечаныя бітве пад Грунвальдам, што папярэднічалі "Прускай вайне". Гэта вершаваныя надпісы на сцяне Кракаўскага замка, рэлігійна-дыдактычныя песні Мікалая з Блоні, а таксама Яна, манаха з Андрэева (XV ст.), ананімная старасвецкая "Песня пра Прускую вайну" (створана каля 1510 г.) [*Дарашкевіч 1975, 57*]. Большая частка названых помнікаў, а таксама фальклорныя тэксты на тэму Грунвальдскай бітвы былі грунтоўна прааналізаваныя ў 1910 г. В. Ханам.

Храналагічна першы літаратурны помнік перамогі пад Грунвальдам – паэма, напісаная прафесарамі Кракаўскай акадэміі яшчэ ў 1411 г. пад назваю "*Triumphi Regii de Cruciferis relati*" ("Перамогі каралеўства, атрыманыя над крыжакамі"), – не захаваўся. У штогодніку "Rocznik świętokrzyski" за 1410 г. былі змешчаны 26 вершаў пра перамогу пад Грунвальдам. Вершы адпаведнай тэматыкі сустракаюцца таксама, паводле сведчанняў В. Хана, у розных пісьмовых крыніцах XV ст. Сярод усіх гэтых паэтычных помнікаў, прысвечаных Грунвальдскай бітве, найбольшую цікавасць уяўляе згаданы В. Дарашкевічам верш, змешчаны ў рукапісе казанняў

Мікалая з Блоні. Пасля дакладнага пазначэння часу бітвы паэт распавядае пра накіраванне паслоў ад крыжакоў да Ягайлы з двума мячамі і пра іх прыняцце каралём. У наступным эпізодзе кароль заклікае войскі на бітву і просіць сваіх ратнікаў быць мужнымі. Успомніўшы пра шматлікія страты варожага войска, перамогу над крыжакамі паэт прыпісвае ласцы Божай. Паражэнне магістра расцэньваецца як вынік яго празмернай пыхі і ганарыстасці:

Sic homo, qui tumuit, primus ad ima ruit,
Sic homo, qui tumuit, cum sua turba ruit [цыт. па: *Hahn 1910, 8*].

Так чалавек, які ўзганарыўся, першы ў рэшце рэшт загінуў,
Так чалавек, які ўзганарыўся, са сваім войскам загінуў.

Кара Божая сышла на крыжакоў і за парушэнне дамоўленасцяў, адзначае паэт. В. Хан, які прааналізаваў некалькі дзесяткаў польскіх і лацінскіх вершаў, прысвечаных Грунвальдскай бітве, падкрэсліваў наяўнасць аднолькавых матываў амаль ва ўсіх разгледжаных ім творах. “Агульнасць гэтых рыс, – падсумоўвае вучоны, – дазваляе дапусціць, што згаданыя творы – выразны адбітак народных поглядаў на Грунвальдскую перамогу; менавіта так спяваў народ пра Грунвальдскую бітву, і сляды гэтых песень перайшлі нават у лацінскія вершы” [*Hahn 1910, 7*].

Імкненнем наследаваць айчынным “аэдам” тлумачыцца і своеасаблівае мастацкае бачанне паэтам легендарнай постаці – князя Вітаўта. У аснову фабулы другой кнігі “Прускай вайны” закладзены тыя ж эпізоды і матывы, якія адзначыў В. Хан у прааналізаваных ім літаратурных і вуснапаэтычных творах: дасыланне крыжакамі двух скрываўленых мячоў, зварот караля да войска і яго заклік да рашучай бітвы, Боская наканаванасць перамогі пад Грунвальдам, паражэнне магістра і, наогул, усіх тэўтонцаў як пакаранне за іх празмерную пыху і ганарыстасць, а таксама за парушэнне імі дамоваў.

У адпаведнасці з гэтымі ўяўленнямі Ян Вісліцкі функцыянальна разводзіць двух валадароў, якія ўзначальвалі саюзныя войскі, – Ягайлу і Вітаўта. Ягайла – *rex divus* (“Боскі кароль”), найперш духоўны натхняльнік войска. Эпітэт “*divus*” (“Боскі”) сюжэтна апраўданы тым, што менавіта Ягайла атрымаў прарочы прывід: святы біскуп Станіслаў прадказаў яму перамогу. Пад пяром паэта

Ягайла набывае арэол святасці. Спробу караля вырашыць канфлікт бяскроўна, яго мірныя прапановы крыжакам матывуюцца тым, што

… regis in egregio pulcherrima corde
Virtus, tum probitas et fervor pacis honestae,
Et pietas super audaces gratissima Prussos
Canduit… [*Bellum II, 145-148*].

Шчырасці гожай святло і бязмежнае высакародства,
Палкая прага да міру, яшчэ і спагада да прусаў,
Дзёрзкіх і жорсткіх, у сэрцы таго караля зіхацела…

Непасрэдны ж правадыр войскаў, які першы ўступае ў бітву, у "Прускай вайне" – не Ягайла, а Вітаўт. В. Дарашкевіч адзначаў: "Калі моцна ідэалізаваны Ягайла 'ўзяў' на сябе паэтаў 'пацыфізм', яго актыўнае непрыняцце вайны, то ў вобразе Вітаўта ўвасобілася такая не менш важная рыса гуманізму Яна з Вісліцы, як дзейсны патрыятычны пафас, вернасць паэта традыцыям народнага свабодалюбства і воінскай доблесці" [*Дарашкевіч 1975, 58*]. Беларускі даследчык фактычна першы трапна акрэсліў прадстаўленую ў ідэйнай задуме Вісліцкага апазіцыю: Ягайла – *dux pacis* (правадыр міру) – Вітаўт – *dux belli* (правадыр вайны). Нездарма паэт адзначыў, што за незлічоныя ваенныя подзвігі князя Вітаўта празвалі *"fulmen belli"* – "маланка вайны". На гэты мастацкі феномен пазней звярнула ўвагу прафесар Я. Ульчынайтэ [*Ulčinaite 1995, 30*]. Праўда, пра "пацыфізм" Яна Вісліцкага, які ў фінале трэцяй кнігі заклікае Жыгімонта "выйсці з суровай вайною да земляў далёкіх і блізкіх", гаварыць, канешне, не прыходзіцца. Важна падкрэсліць іншае: у народнай свядомасці ў сувязі з Прускай вайной 1410 г. сфарміравалася ўяўленне пра Ягайлу як караля, які імкнуўся да міру. Вось чаму Ян Вісліцкі свядома пайшоў на парушэнне гістарычнай праўды: ён паведаміў, што, адчуўшы рэальнасць пагрозы германскай агрэсіі, Ягайла сабраў войскі для бітвы. Пасля гэтага, паводле "Прускай вайны", ён выправіў паслоў у варожы стан, каб прадпрыняць апошнюю спробу мірнага вырашэння канфлікту. Насамрэч, паводле гістарычных крыніц, выпраўленне Ягайлам паслоў папярэднічала збору войска, на што ў свой час звярнуў увагу В. Дарашкевіч [гл.: *Дорошкевич 1979, 119*].

Дакладна ўзнаўляючы ход падзей на пачатку Грунвальдскай бітвы, паэт паведамляе, што першым у атаку рушылася татарскае войска:

Tunc Nomades arcus Vitoldo praeside primi [*Bellum II, 191*].

Вось на чале з князем Вітаўтам першымі выйшлі намады.

У гэтым і ва ўсіх іншых эпізодах вялікі князь паказаны менавіта як смелы ваенны правадыр, апанаваны гарачым імкненнем змагацца супраць ворагаў. Такая падача аўтарам вобраза Вітаўта адпавядае беларускай літаратурнай традыцыі XV–XVI стст., паводле якой вялікі князь выяўляўся як легендарны народны герой, волат-ваяр (успомнім хаця б славутую "Пахвалу Вітаўту"). Вось чаму яго рэпрэзентацыя ў паэме "Пруская вайна" заўсёды звязана з асэнсаваннем і ацэнкай пераломных момантаў у ходзе вайны з крыжакамі: збор войска і падрыхтоўка да вайны, першы наступ, першае паражэнне, пераможнае контрнаступленне. Постаць вялікага князя літоўскага паслядоўна ўключаецца ў гераічны план паэмы.

Цікава, што з мноства народных песень, прысвечаных вайне з крыжакамі, В. Хан згадвае адну, у якой ёсць наступныя словы:

Witold idzie po ulicy,
Za nim niesą dwie szablicy [цыт. па: *Hahn 1910, 8*].

Тут адлюстравана народнае ўяўленне пра тое, што два крыжацкія мячы былі дасланыя не аднаму Ягайлу, а і Вітаўту таксама. Гэта – сімвал абвяшчэння тэўтонцамі вайны як Польскай Кароне, так і Вялікаму княству Літоўскаму. Тым не менш паэт гаворыць пра дасыланне мячоў толькі Ягайлу. Чаму? Таму што, як адзначае У. Кароткі, "Ян Вісліцкі рэльефна акрэслівае ўзаемаадносіны Ягайлы і Вітаўта як сюзерэна і васала" [*Кароткі 2001, 263*]. Паэт наўмысна падкрэсліў у пачатку другой кнігі, што Ягайла паходзіць з Вялікага княства Літоўскага. Значыць, ён – законны ўладар абедзвюх дзяржаў, ён – спадкаемец як велікакняжаскай, так і каралеўскай улады. Ягайла ў "Прускай вайне" – галоўная дзейная асоба, і цэнтральны (батальны) сюжэт другой кнігі паэмы разгортваецца менавіта вакол караля.

У сувязі з асаблівай пазіцыяй аўтара адносна Ягайлы і Вітаўта ў паэме "Пруская вайна" падрабязна прадстаўлены фактычна толькі

адзін эпізод Грунвальдскай бітвы, прычым не той, які ўзнаўляе рэальны ход падзей (што так абурала польскіх даследчыкаў!), а той, які адлюстраваны ў беларуска-літоўскім летапісанні, прынамсі, у "Хроніцы Быхаўца" [гл.: *Bellum II, 235 – 257*]. Нагадаю, што размова ідзе пра своеасаблівы канфлікт паміж двума ўладарнымі братамі. Пасля першага паражэння свайго войска Вітаўт прыходзіць у стан Ягайлы па дапамогу. Кароль у гэты час моліцца. Вітаўт дакарае брата за нежаданне ваяваць, адзначаючы несвоечасовасць гэтага набажэнства. Ягайла ж рашуча адмаўляецца ўступіць у бітву да заканчэння літургіі і загадвае Вітаўту стрымліваць наступ тэўтонцаў. Гэты эпізод найбольш выпукла перадае спецыфіку народнага ўспрыняцця двух герояў-валадароў. Калі Вітаўт – збіральнік войскаў, народны правадыр і рашучы ваяр, то Ягайла – кароль і пераможца з ласкі Божай, абраннік нябёсаў. Вось чаму менавіта ён атрымлівае шчаслівае прадказанне перамогі ад святога біскупа Станіслава і заслугоўвае панегірык-"славу" ў канцы другой кнігі "Прускай вайны".

Мастацкая форма ўвасаблення "славы" Ягайлу – творчая знаходка Яна Вісліцкага: яна пабудавана паводле прынцыпу "ад супраціўнага". Нагадаю, што паэты часоў Рэнесансу ўганароўвалі сваіх герояў шлейфамі ўзнёслых параўнанняў з героямі Старажытнай Грэцыі і Рыма. Да каго ж прыпадабняе Ягайлу Ян Вісліцкі? Ні да каго! Ён звяртаецца да старажытных гарадоў, услаўленых імёнамі вялікіх герояў, з дзіўнай просьбаю:

Cui, tu Roma, tuos noli annumerare Camillos,
Marcellum, Fabios et Caesaris optima gesta,
Hectora, Troja, tuum, fortem, Larissa, et Achillem,
Hannibalemque tuum, Carthago superba, ferocem
[*Bellum II, 505-508*].

Не прыраўноўвай яго ты, о, Рым, да Камілаў, Марцэла,
Фабіяў слаўных тваіх і да Цэзара велічных дзеяў,
Гектара мужнага, Троя, твайго і Ахіла, Ларыса,
Да Ганібала твайго, Карфаген непакорны і храбры!

Успомнім, што ў "Заахвочвальным вершы" Ян Вісліцкі паэтычна абыграў матыў "*genius loci*" ("геній месца"), ухваляючы свайго настаўніка. Цяпер жа, ухваляючы караля Ягайлу, дзеда караля

Жыгімонта, ён імкнецца сфарміраваць уяўленне, што гэты герой – “*genius civitatis*” (“геній дзяржавы”), яе апякун, абраны Усемагутным. Менавіта пад яго кіраўніцтвам на палях Грунвальда быў дадзены рашучы адпор самаму небяспечнаму ворагу, які пагражаў не аднаму якому-небудзь народу, а ўсім шматлікім народам Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны. Арыгінальным мастацкім прыёмам “не-прыпадабнення” Ягайлы да герояў антычнасці “паэт падкрэслівае дзяржаўнаснае, а не мясцова-патрыятычнае значэнне подзвігу караля – валадара непераможнай еўрапейскай дзяржавы. <…> Ён не толькі абаронца, ён – заснавальнік новай каралеўскай дынастыі, новай федэратыўнай дзяржавы, якая пры яго праўнуку Жыгімонце II Аўгусце праз Люблінскую унію 1569 г. набудзе назву Рэч Паспалітая” [*Кароткі 2001, 263-264*].

“Развядзенне” легендарных гісторый Польшчы і Літвы па розных частках паэмы тлумачыцца ідэйнай задумай аўтара, яго імкненнем стварыць не толькі паэтычны помнік Грунвальду, але таксама мастацкае апраўданне імперскіх прэтэнзій Ягелонаў і канкрэтна – Жыгімонта Першага, “валадара Сармацкай Еўропы”. Ян Вісліцкі хоча данесці да чытачоў сваё разуменне айчыннай дзяржаўнасці. На яго думку, народы Польскай Кароны і Вялікага княства Літоўскага, аб’яднаныя ўладай Ягелонаў, павінны жыць у палітычным саюзе, гістарычную неабходнасць і мэтазгоднасць якога даказала перамога ў Грунвальдскай бітве.

Кніга трэцяя

Кніга трэцяя адкрываецца “Алімпійскім планам”: багі збіраюцца разам на загад Юпітэра. У антычным гераічным эпасе сцэна нарады на Алімпе давала штуршок для дынамічнага разгортвання сюжэта (як у “Адысеі”, якая непасрэдна адкрываецца гэтай сцэнай) або дапамагала аўтару вырашыць складаную калізію (як, напрыклад, зыход вайны рутулаў з траянцамі ў дзесятай кнізе “Энеіды”). Падобную складаную сітуацыю вырашаюць алімпійцы і ў паэме Яна Вісліцкага: Юпітэр раіцца з багамі пра тое, каго аддаць за жонку сівавалосаму каралю Ягайлу.

У “алімпійскі план”, такім чынам, уводзіцца дынастычная праблема. Кампазіцыйная спецыфіка твора дапамагае аўтару раскрыць сваю ідэйную задуму. Па ўсіх зямных прасторах нясецца “слаўная

чутка" пра велічную перамогу пад Грунвальдам, і галоўны пераможца – той, хто пераняў "*sceptra*" ("скіпетры") у легендарных Леха, Крака і Ванды. Ён, Ягайла, – вечная слава і гонар свайго народа, лепш сказаць, многіх народаў Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны, якія здабылі векапомную перамогу над крыжакамі і ўсе разам падпарадкоўваюцца каралю. Тое, што пытаннем пра спадкаемца заклапочаны самі алімпійцы, служыць адзнакай неардынарнасці героя і неардынарнасці сітуацыі. Кампазіцыя паэмы адпавядае творчай устаноўцы Яна Вісліцкага і, як слушна адзначыў А. Брандоўскі, выяўляе яго "вялікую прыхільнасць да дынастыі Ягелонаў" [*Brandowski 1886. N 611. S.5401*]. Прыхільнасць гэтая тлумачыцца, на нашую думку, некалькімі важнымі акалічнасцямі.

Паэма "Пруская вайна" была падрыхтавана да друку ў 1515 г. Чаму ўсё ж такі перамога стогадовай даўніны магла зацікавіць чытачоў-сучаснікаў Яна Вісліцкага? Чаму паэт спадзяваўся, што яго кніга зверне на сябе ўвагу караля Жыгімонта? Адказ на гэтае пытанне даў Ю. Новак-Длужэўскі, адзначыўшы, што паэму, фармальна прысвечаную перамозе пад Грунвальдам, Вісліцкі напісаў пасля перамогі пад Оршай, а да таго ж у час вельмі напружаных адносін Польшчы з крыжацкім ордэнам [гл.: *Nowak-Dłużewski 1966, 59*]. Палітычныя ўмовы таго часу вельмі абагульнена можна прадставіць наступным чынам. Пасля заключэння торуньскага пагаднення ў 1466 г. Тэўтонскі ордэн прызнаў сябе леннікам Каралеўства Польскага, а тэрыторыя Прусіі стала часткай дзяржавы Ягелонаў. Аднак на пачатку XVI ст. сітуацыя ў гэтым рэгіёне ізноў абвастрылася, як адзначае польскі гісторык Мар'ян Біскуп, з прычыны ўмяшальніцтва ў прускія справы, з аднаго боку, папскай курыі, з другога – імператара Максіміліяна Габсбурга. Апошні вырашэнне пытанняў наконт прускіх уладанняў Ордэна "разумеў, галоўным чынам, як інструмент у вялікай гульні з польска-чэшскімі Ягелонамі адносна першынства ў Цэнтральнай Еўропе, не толькі над Віслай і Прэголай, але таксама над Влтавай і Дунаем, у барацьбе за Чэхію і Венгрыю" [*Biskup 1991, 21*].

Менавіта ў 1515 г. магістр Ордэна Альбрэхт фон Гогенцолерн-Ансбах перайшоў да палітыкі шукання саюзнікаў у запланаваным ужо збройным канфлікце з Жыгімонтам. Асноўныя спадзяванні магістр ускладаў на ўладара Вялікага княства Маскоўскага

Васілія III. У гэтай сітуацыі Ян Вісліцкі, шчыры патрыёт сваёй Айчыны, па-першае, імкнецца паказаць, што толькі пры ўмове усенароднага аб'яднання, як гэта было пры Ягайлу і Вітаўту, можна перамагчы нават самага грознага ворага. Па-другое, ён хоча папярэдзіць крыжакоў, нагадаць ім, да чаго прывяла тэўтонцаў сто гадоў таму празмерная пыха магістра Ульрыка фон Юнгінгена, які ганебна скончыў сваё жыццё на полі Грунвальда. Па-трэцяе, ён выразна, з выключнай скрупулёзнасцю, якая пераходзіць у педантызм, дае ў трэцяй кнізе "Прускай вайны" адказ на пытанне, "хто ў дзяржаве гаспадар".

Каралеўства Польскае і Вялікае княства Літоўскае, даводзіць Ян Вісліцкі, зрабіліся *de facto* адзінай магутнай дзяржавай у выніку заключэння дынастычнага шлюбу. Сімвалам палітычнага аб'яднання дзвюх дзяржаў у паэме "Пруская вайна" становіцца шлюб сівавалосага караля Ягайлы і беларускай князёўны Соф'і Гальшанскай. Менавіта Соф'я, "німфа з краіны русінаў", па задуме жыхароў Алімпа працягне род Ягелонаў. Яшчэ ў словах Юпітэра, якія перадаў Ягайлу Меркурый, сфармуляваны годны адказ на імперскія амбіцыі Альбрэхта Гогенцолерна:

Qui patriam rector succedet prosper ad aulam,
Is Casimirus erit, longus victurus in amnos. <…>
At qui Pannonicas gentes reget atque Polonas,
Ladislaus erit, belli fragor horridus acri
[*Bellum III, 105-106, 112-113*].

Успадкаеміць адзін – Казімір – каралеўскую ўладу
Ў роднай краіне, і многа гадоў пражыве ён у шчасці. <…>
Іншы ўладарыць пачне ў Панонскай і Польскай краіне,
Уладзіслаў, непахісны ваяр у спаборніцтвах ратных.

Такім чынам, даказвае аўтар, аніякіх іншых валадароў у Цэнтральнай Еўропе, акрамя нашчадкаў Казіміра Ягайлавіча (паколькі Уладзіслаў загінуў маладым у бітве пад Варнай), няма і быць не можа.

Вельмі непразрыста намякае Ян Вісліцкі і на спробы тэўтонцаў знайсці падтрымку ў Маскоўскага валадара. Ці надзейны ваенны партнёр князь Васілій III, можна меркаваць з наступных радкоў, звернутых да Жыгімонта Першага:

Illo septembri, quo victricem retulisti
Fronte tua laurum, pessumdans agmina magni
Multa ducis Scythici, dives spoliis et opimis
Cum tot mancipiis belli vexilla ferendo
Ad tua Lithuanae praestantia moenia Vilnae [*Bellum III, 251-255*].

Потым той верасень быў, што табе пераможныя лаўры
Шчодрай рукою прынёс: ты адолеў шматлікае войска
Скіфскага князя вялікага, многа ваеннай здабычы,
Многа варожых харугваў з палоннымі хутка даставіў
Ты да высокіх муроў тваёй велічнай Вільні Літоўскай.

У фінале паэмы кароль-пераможца ўслаўляецца аднаасобна, найперш – як "*victor celebris patriae pater atque Polonae*" ("славуты пераможца і айцец Польскай айчыны") [*Bellum III, 256*]. Трэцяя кніга і ўся паэма "Пруская вайна" завяршаюцца велічным панегірыкам манарху-сучасніку, які надзяляецца эпітэтамі вышэйшай і найвышэйшай ступені, як і Ягайла ў фінале другой кнігі. Такім чынам, увядзенне ў паэму постаці Жыгімонта Першага на фармальна-мастацкім узроўні спрыяе фарміраванню кальцавой кампазіцыі паэмы. Сярод пажаданняў доўгіх гадоў жыцця і падзяк за апеку аўтар змяшчае і своеасаблівы заклік:

Egredere, ac diris vicina remotaque bellis
Arva situ vasto circumflua gurgitis alti<…>
Threiciusque sinu applaudet tibi Bosporus arcto,
Per facilem tribuens Byzantia jugera Martem
Vincere, Turcaicis longum possessa ministris
[*Bellum III, 261-262, 268-270*].

Выйдзі з суровай вайною да земляў далёкіх і блізкіх,
Што амываюцца водным бязмежжам глыбокага мора…
Плешча няхай у твой гонар фракійскі Басфор невычэрпны,
Каб авалодаць ты мог зямлёй візантыйскай, якую
Вельмі даўно святары захапілі з турэцкай дзяржавы.

Што гэта – апраўданне імперскай палітыкі? Не. "Гэта міфалагічна-гістарычнае апраўданне права Ягелонаў не толькі на землі ўсходніх славян, але і на візантыйскае валадарства", паколькі Соф'я Гальшанская "была праваслаўнай і паходзіла з роду кіеўскіх князёў,

якія вялі свой радавод не толькі ад легендарнага Рурыка, але праз жонку Уладзіміра Ганну – і ад візантыйскіх імператараў" [*Кароткі 1997, 92*]. У падобнай расстаноўцы акцэнтаў адчуваецца імкненне паэта ўзвялічыць караля і тую дынастыю, да якой ён належыць. Умацаванне гэтай дынастыі на еўрапейскай арэне паэт звязвае з палітычнай стабільнасцю ў "многаселеным каралеўстве".

Толькі з улікам гэтага ідэалагічна-дынастычнага падтэксту можа быць растлумачана мастацкая загадка Яна Вісліцкага пад назваю "Пруская вайна". Гэтая паэма, быццам велічная егіпецкая піраміда, угрунтаваная першапачаткова на шырокім фундаменце гістарычнай рэтраспекцыі, у рэшце рэшт сыходзіцца ў адной вяршыні – постаці Жыгімонта Першага. Кароль-сучаснік паэта – альфа і амега яго ідэйнай задумы. У гучным панегірыку Жыгімонту ёсць усё: ад выказу касмапалітычна-манархічных прапаноў ("*Egredere, ac diris vicina remotaque bellis arva…*" ("Выйдзі, прычым з суровымі войнамі, у блізкія і далёкія землі…")) да традыцыйнага славаслоўя ("*Vivas ergo, precor, vivas habiturus honores*" ("Дык жыві, малю, жыві, імкнучыся памнажаць славу")) [*Bellum III, 282*]. Пры гэтым панегірык каралю не з'яўляецца ў паэме самадастатковым: ён – вельмі важны элемент творчай задумы аўтара, важны фактар рэпрэзентацыі яго паэтычнага твора.

Няцяжка заўважыць, што постаць караля Жыгімонта фактычна не ўводзіцца ў вобразны план паэмы, застаецца статычнай у панегірычным апляценні аўтарскай вытанчанай славеснаці. Тым не менш шматлікія інвакацыі паэта да караля, згадкі пра яго ў розных кнігах паэмы паступова і непрыкметна для чытача выяўляюць ідэйную дамінанту "Прускай вайны" – узвышэнне і апалогію Ягелонаў як спадкаемных валадароў "Сармацкай дзяржавы". Жыгімонт, як і Ягайла, здольны праявіць сябе лепшым чынам у ваенных справах. Доказ таму – перамога пад Оршай. Аднак, як і Ягайла, Жыгімонт – «*dux pacis*» ("правадыр міру"). Прапануючы каралю аб'яднаць пад сваёю ўладаю далёкія і блізкія народы, аўтар рэзюмуе:

Et sic Augusto feliciter omnia rege
Vivent, armorum tonitru procul orbe recluso
Sarmatico, gladios tribuendo vomeri acutos
Thoracas simul et galeas, rubini aduncas [*Bellum III, 273-276*].

Хай жа шчасліва жывуць яны пры каралі найвышэйшым,
Хай не разносіцца болей у межах сармацкай краіны
Рэха суровай вайны, хай пакрытыя чорнаю ржою
Перакуюць на аралы мячы, і даспехі, і шлемы.

Я. Парэцкі слушна адзначае: "Разгалінаванасць задумы Вісліцкага і шляхоў, абраных ім для ўвасаблення сваіх ідэй, не пакідаюць чытача раўнадушным, захопліваюць яго нават праз дзесяцігоддзі" [*Парэцкі 1991, 106*]. Адзначаючы выключнае гістарычнае значэнне перамогі пад Грунвальдам, аўтар разгортвае своеасаблівую паэтычную карту, на якой прадстаўлены ўсе народы і краіны, што мелі дачыненне да гэтай падзеі, або тыя, якіх закраналі палітычныя інтарэсы Ягелонаў. Пры гэтым аўтар не абмяжоўвае сябе вузканацыянальнымі поглядамі. "Паэт-гуманіст далёкі ад думкі ўзвелічэння якога-небудзь народа дзяржавы Ягелонаў – кожны з іх слаўны сваёй гісторыяй, сваім умельствам: для характарыстыкі кожнага з іх Ян Вісліцкі знаходзіць адпаведныя трапныя эпітэты" [*Кароткі 1997, 92*]. Перамога на полі Грунвальда стала іх агульнай перамогай, а паэма "Пруская вайна" – паэтычным помнікам іх ратным дзеям і духоўнай велічнасці.

Ідэйная дамінанта паэмы цесна звязана з патрыятычным пачуццём паэта. Менавіта яго першапачатковая ўстаноўка на аднаўленне старадаўняй славы Грунвальдскай бітвы і подзвігу суайчыннікаў паўплывала на кампазіцыйныя асаблівасці твора. Вобразматыў "*fama*" становіцца арганізуючым пачаткам твора на фабульным узроўні. "Пруская вайна", паводле задумы яе аўтара, павінна ўспрымацца як паэтычнае рэха "невыразнай славы" Грунвальдскай бітвы. Дзеі Жыгімонта Першага адгукаюцца рэхам подзвігаў Ягайлы, а "*fama felix*" ("шчасная чутка"), як і раней, абуджае ваяўнічы дух народа і служыць суровым напамінам для ганарыстых тэўтонцаў.

"Пруская вайна" Яна Вісліцкага стала першай у гісторыі беларускай паэзіі спробай стварэння агульнанацыянальнага гераічнага эпасу, таму невыпадкова першаснымі мастацкімі арыенцірамі для паэта былі "Энеіда" Вергілія і "Фіваіда" Стацыя. Ад "Прускай вайны" ("Ягеланіды") Яна Вісліцкага было ўжо зусім недалёка да "Радзівіліяды" Яна Радвана. Бясспрэчна, Яна Вісліцкага трэба прызнаць заснавальнікам жанру гераіка-патрыятычнай эпапеі не

толькі ў беларускай, але і ў польскай паэзіі. Пад паэтычным пяром аўтара “Прускай вайны” ўпершыню з’явіліся імёны Леха, Крака і Ванды. У 1563 г., амаль праз паўстагоддзе пасля Яна Вісліцкага, гэтых легендарных валадароў уславіць у сваім творы “*Vitae Regum Polonorum*” (“Жыццяпісы польскіх каралёў”) польскі паэт-“*laureatus*” Клеменс Яніцкі.

В. Дарашкевіч звярнуў увагу на немагчымасць разгляду творчасці Яна Вісліцкага ў кантэксце сярэднявечнай традыцыі. Вучоны пісаў: “Сярэднявечнай паэзіі не хапае выразнай аўтарскай пазіцыі. Чалавек як гістарычная асоба, як індывідуум быў ‘адкрыты’ Адраджэннем. Вісліцкі разумеў гістарычную дыстанцыю паміж мінулым і цяперашнім. Ён пісаў, што з пераможцамі крыжакоў, якія лічылі сябе непераможнымі рыцарамі, не могуць параўнацца ‘ані Ахілы, ані Гераклы, ані Перыклы’. Асваенне і распрацоўка мясцовай тэматыкі патрабавалі ад стваральніка ‘Прускай вайны’ перш за ўсё свайго, самастойнага падыходу да яе рэалізацыі, і гэта было фундаментам будучага поспеху паэмы” [*Дорошкевич 1979, 117*]. Сапраўды, толькі паэт эпохі Рэнесансу мог прыйсці да такіх глабальных абагульненняў, якія зрабіў Ян Вісліцкі ў “Прускай вайне”. Толькі творца гэтай непаўторнай эпохі мог узняцца над традыцыйным для лацінскай паэзіі мастацкім прыпадабненнем пэўных адметных падзей або асоб да падобных падзей або асоб антычнай гісторыі. Аўтар даводзіць, што гісторыя яго народа і яго дзяржавы – унікальная, непаўторная, як і сам родны край, як і мужнасць, гераізм суайчыннікаў.

Ода да караля Жыгімонта

Перамога, атрыманая войскам Вялікага княства Літоўскага пад Оршай 8 верасня 1514 г., мела значныя палітычныя наступствы і карэнным чыннам змяніла становішча дзяржавы Ягелонаў на еўрапейскай арэне. Менавіта ў пачатку XVI ст. Ягелоны прадпрымалі актыўныя спробы схіліць папу Льва X да стварэння кааліцыі еўрапейскіх дзяржаў супраць турак і татараў. З гэтай мэтай з Вялікага княства Літоўскага ў Ватыкан накіроўвалася некалькі дыпламатычных місій на чале з Эразмам Вітэліусам. Папа, аднак, не спяшаўся распачаць справу аб’яднання, перасследуючы свае палітычныя мэты.

Вынік Аршанскай бітвы павінен быў стаць самым пераканаўчым доказам таго, што Вялікае княства Літоўскае і Польская Карона – менавіта тыя дзяржавы, якія здольныя даць належны адпор нашэсцю іншаверцаў. Гэтая акалічнасць выклікала да жыцця цэлы шэраг паэтычных твораў на лацінскай мове, у якіх апявалася славутая перамога. Непасрэдна пасля Аршанскай бітвы ў 1514 г. у Кракаве выйшаў з друку паэтычны зборнік, змест якога склалі вершаваныя панегірыкі розных паэтаў у гонар вялікага трыумфу. Сярод аўтараў – амаль усе вядомыя ў той час польскія паэты: Анджэй Кшыцкі, Ян Дантышак, Крыштаф Сухцень. У наступным, 1515, годзе зборнік вершаў падобнага зместу пад назвай "*Carmina de memorabili caede scismaticorum Moscoviorum…*" ("Вершы пра векапомны разгром маскавітаў-схізматыкаў") з'явіўся ў Рыме. Яго выхаду ў свет паспрыяў прымас Ян Ласкі, які выправіўся ў Рым яшчэ ў 1512 г.

Вершы польскіх паэтаў, прысвечаныя вялікай перамозе на беларускай зямлі, дэталёва прааналізаваў Ю. Новак-Длужэўскі [гл.: *Nowak-Dłużewski 1966, 52-55*]. З даследавання польскага вучонага вынікае, што ўсе гэтыя творы адрозніваюцца ўзнёсласцю, пафаснасцю, палітычнай заангажаванасцю. У вершы Анджэя Кшыцкага, напісаным ад імя каралевы Барбары і адрасаваным каралю Жыгімонту, пад назваю "*Ad serenissimum dominum Sigismundum Primum… post partam de Moscis victoriam epistula*" ("Ліст да найяснейшага пана Жыгімонта Першага… пасля атрымання перамогі над маскоўцамі"), перад чытачом разгортваецца панарама Аршанскай бітвы, услаўляюцца яе героі, падсумоўваюцца палітычныя вынікі перамогі. Ян Дантышак у сваім творы "*Carmen extemporarium de victoria… Sigismundi*" ("Верш-экспромт пра перамогу… Жыгімонта")[6] абрушвае гнеўныя тырады на маскоўскага цара Васілія, які імкнуўся падняволіць народы, падуладныя Ягелонам. Крыштаф Сухцень у вершы "*De nobili et gloriosa victoria per… Sigismundum a Moscis reportata*" ("Пра вялікую і славутую перамогу… Жыгімонта над маскоўцамі") асэнсоўвае палітычныя наступствы бітвы і тыя перспектывы пашырэння дзяржавы, якія перамога прадстаўляла каралю. Аднак, нягледзячы на тое што вершы прызнаных у той час польскіх паэтаў напісаны паводле

[6] У рымскім зборніку 1515 г. змешчаны пад назваю "Silva".

класічных узораў старажытнай рымскай паэзіі – з поўным арсеналам адмысловых вобразаў і выяўленчых сродкаў, перанятых у Вергілія і Гарацыя, – няма ў гэтых метрычна дасканалых строфах лірычнага, асабістага настрою. "Паэзія марнее – пачынаецца вульгарная прапаганда" – гэтую характарыстыку польскага даследчыка Ю. Новака-Длужэўскага, дадзеную вершу Яна Дантышка [гл.: *Nowak-Dłużewski 1966, 54*], можна аднесці і да іншых твораў з рымскага зборніка 1515 г.

На маю думку, верагодна, што Ян Вісліцкі таксама прапанаваў свой паэтычны опус, прысвечаны перамозе пад Оршай, у гэты зборнік. Яго "Ода да караля Жыгімонта", арыгінальнае мастацкае вынаходніцтва, заслугоўвала таго. Невыпадкова С. Віткоўскі лічыў, што яна "належыць да лепшых твораў Яна з Вісліцы" [*Witkowski 1891, 366*]. Аднак "тытаны" польскай лацінскай паэзіі маглі пагардліва паставіцца да маладога творцы з далёкага краю. Магчыма, менавіта гэта сталася прычынаю душэўнай траўмы паэта, пра што ён і напісаў Паўлу з Кросна ў пачатку празаічнай прадмовы да паэмы.

Калі прыняць такое дапушчэнне, становіцца відавочна, што ода была напісана неўзабаве пасля перамогі, а значыць, яшчэ да "Прускай вайны". У трэцяй кнізе паэмы, як вядома, Вісліцкі ўспамінае пра слаўную падзею, прычым адзначае, што ваенныя трафеі былі прывезены Жыгімонтам у Вільню. Адпаведных звестак у самой "Одзе да караля Жыгімонта" мы не знаходзім. Значыць, гэты твор, хутчэй за ўсё, пісаўся яшчэ да трыумфальнага ўваходу войска Жыгімонта ў Вільню 22 верасня 1514 г.

Сама "Ода да караля Жыгімонта" (якую ў беларускім літаратуразнаўстве часам называюць таксама "Аршанскай одай" або "Одай на Аршанскую бітву") напісана алкеевай страфою. Аднак яе ўласнаму тэксту папярэднічае дзесяцірадкоўе, якое мае вельмі важнае значэнне для высвятлення паэтычнага крэда аўтара. Гэты верш-прэамбула мае падтытул "Дзесяцірадкоўе для чытача, чаму ода напісана лірычным памерам". Паэту трэба было апраўдацца: алкеева страфа лічылася лірычным памерам, таму, на першы погляд, была непрыдатнай для напісання оды ў гонар перамогі. Ян Вісліцкі пераасэнсоўвае прыроду гэтага жанру. Успомнім, што і паэме "Пруская вайна" папярэднічае "Ода да чытача", таксама напісаная алкеевай страфою. Няцяжка заўважыць, што паэт на са-

мых розных узроўнях – ад метрычнага да вобразна-мастацкага – нітуе дзве вялікія падзеі ў айчыннай гісторыі: перамогу пад Грунвальдам і перамогу пад Оршай.

Найперш паэму "Пруская вайна" і "Оду да караля Жыгімонта" аб'ядноўвае матыў Боскай дапамогі ў вайне. Так, перамога на Грунвальдскім полі была прадказана Ягайлу святым біскупам Станіславам, нябесная здань якога з'явілася каралю падчас імшы. Перамога пад Оршай – вынік дапамогі Маці Божай, якая менавіта "ў свой дзень" – 8 верасня – "*triumphum obtulit e Scythico duello*" ("прынесла гэты трыумф у вайне са скіфам") [*Ode, 63-64*]. Перамога, здабытая далёкімі продкамі паэта пад Грунвальдам, і перамога пад Оршай – вынік спалучэння многіх шчаслівых абставін: Боскага спрыяння, мудрасці ўладароў і ваяводаў, народнага гераізму. Абедзве перамогі сталі трыумфам не аднаго якога-небудзь народа, а многіх народаў дзяржавы Ягелонаў: беларусаў, літоўцаў, украінцаў, палякаў, татараў… Абедзве перамогі далі гэтым народам магчымасць мірна жыць і працаваць на сваёй зямлі.

Паэт даводзіць, што як сто гадоў таму, так і ў яго час пераможцы былі напоўнены найперш пачуццём радасці, свабоды, абнаўлення. Нягледзячы на восеньскую пару, душы ратнікаў пад Оршай напаўняліся веснавым спевам. Вось чаму для ўслаўлення перамогі пад Грунвальдам (у "Одзе да чытача", якая папярэднічае паэме "Пруская вайна") і перамогі пад Оршай (у "Одзе да караля Жыгімонта"), на думку паэта, варта ўжываць менавіта алкееву страфу, найбольш прыдатную для перадачы лірычных пачуццяў радасці і шчасця.

Ян Вісліцкі наўмысна адыходзіць ад "паэтычнага афіцыёзу", які прарываецца з кожнага верша рымскага зборніка 1515 г. Цікава, што наш суайчыннік застаецца ў межах традыцыйнага вобразна-паэтычнага сусвету лацінскай паэзіі (як і Ян Дантышак, ён згадвае далёкі востраў Тулу, а таксама выкарыстоўвае матыў уцёкаў пераможанага цара Васілія), аднак карэнным чынам змяняе ідэйную ўстаноўку. Перамога пад Оршай, асветленая лікам Маці Божай, напаўняе паэта гонарам за сваіх суайчыннікаў, а таксама пачуццём надзеі на шчаслівую будучыню, шчаслівы лёс таго народа, які заслужыў сваім ратным подзвігам векапомную славу.

Верш да Пятра Таміцкага

З Пятром Таміцкім Ян Вісліцкі пазнаёміўся, хутчэй за ўсё, у Кракаве. Гэта быў не проста высокаадукаваны чалавек знатнага паходжання, які займаў высокія пасады ў духоўным і грамадскім жыцці дзяржавы, але і гуманіст надзвычай прагрэсіўных поглядаў. Ён меў ступень магістра свабодных навук і доктара права; як і Ян Вісліцкі, быў «*magister-extraneus*» Ягелонскага універсітэта, дзе чытаў у 1493 г. курс па Арыстоцелю (яго трактату "Першая філасофія"). У 1501 г. Пётр Таміцкі атрымлівае пасаду канцлера пры кардыналу Фрэдэрыку ў Польшчы. Пры Жыгімонту Старым ён выконваў абавязкі каралеўскага сакратара кароннай канцылярыі. У 1513 г. П.Таміцкі становіцца біскупам Перамышльскім, а з 1515 г. – падканцлерам каронным. Гэты выдатны і знакаміты чалавек быў славутым мецэнатам: вядома, што ён апекаваў нават Эразма Ратэрдамскага [гл.: *Witkowski 1891, 449*].

Лагічна, што менавіта да яго, свайго старэйшага калегі па Кракаўскай *alma mater*, а да таго ж вядомага бібліёграфа і прыхільніка паэзіі, звярнуўся Ян Вісліцкі "*pro commendatione libellorum suorum Regiae majestati*" ("дзеля рэкамендацыі яго кніг Каралеўскай Вялікасці"). Гэта быў самы надзейны шлях маладога невядомага паэта ў пошуках мецэнацкай падтрымкі каранаванай асобы (нездарма і Мікалай Гусоўскі звяртаўся да каралевы Боны праз пасрэдніцтва каралеўскага сакратара Людовіка Альфія). І ўсё ж верш, адрасаваны Пятру Таміцкаму, – не проста пакорлівая просьба аб падтрымцы і спрыянні.

Яшчэ Я. Парэцкі звярнуў увагу на вельмі дзіўную акалічнасць: верш да Пятра Таміцкага, які фармальна падпадае пад тып вершапрысвячэння, верша-звароту, згодна з правіламі класічнай прасодыі павінен пісацца элегічным двувершам. На самой жа справе гэты твор напісаны ямбічным (архілохавым) трыметрам! Гэта, як пісаў Міхаіл Гаспараў, "размоўны верш, які ў лірыцы быў прыдатны для выкрывальніцкіх і насмешлівых жанраў" [*Гаспаров 1986, 292*]. Я. Парэцкі лічыць, што з дапамогаю гэтага памеру Ян Вісліцкі "выліў у вершаванай форме горыч і з'едлівы папрок свайму акружэнню і грамадству, якія яго прынізілі, пакрыўдзілі" [*Парэцкі 1991, 22*].

Сапраўды, толькі з іранічным падтэкстам могуць успрымацца радкі верша, дзе Ян Вісліцкі, як і ў экспазіцыі "Прускай вайны",

разважае пра несправядлівае замоўчванне папярэднімі паэтамі славы перамогі пад Грунвальдам.

Sic post amoeni hujus duelli tempora
Vates oloribus cantu licet pares,
Quos vasta nutrit et fovet Polonia,
Siluere nec prompsere candens hoc decus
Belli, quod ego labore Castalis meae
Prompsi, Polonis vatibus dispar licet,
Si non ad unguem rectam et ad amussim, tamen
Ut barbarum vatem decuit et Sarmatam
[*Ad Tomiczki, 9-16*].

Вось так, праз доўгі час пасля ліхой вайны
Паэты, што да лебедзяў падобныя, –
Іх песціць шчыра Польшча неаглядная, –
Маўчалі пра бліскучы ратны подзвіг той,
Што я апеў, натхнёны Касталійкаю,
Няхай ад польскіх вешчуноў адрозны я,
Недэталёва, недакладна, мо, спяваю тут, –
А так, як варварскі вяшчун і як сармат.

Цікава супаставіць 14-ы радок гэтага верша са 119–120-м радкамі «Песні пра зубра» Мікалая Гусоўскага, дзе паэт заяўляе:

In nemus arctoum, quamvis scriptoribus impar
Romanis, certe hac arte, Polonus eo [*Carmen 1523, p.11 n.n.*].

У паўночную пушчу, хаця і няроўны пісьменнікам
Рымскім, я, паляк, уваходжу з гэтым надзейным рамяством.

Выразы "*Scriptoribus Romanis impar*" ("няроўны рымскім пісьменнікам") Гусоўскага і "*Polonis vatibus dispar*" ("адрозны ад польскіх вешчуноў") Вісліцкага павінны, бясспрэчна, выражаць адзіную ідэю. Пра што ж гаварыў у працытаваных радках Мікалай з Гусава? Ён з паблажлівай усмешкай пераказваў тыя недарэчнасці і байкі, якія распавядалі пра зубра папярэднія пісьменнікі. Відавочна, што ў дадзеным кантэксце аўтар "Песні пра зубра" напаўняе прыметнік "*impar*" ("няроўны") меліяратыўнай канатацыяй; "няроўны" – значыць "лепшы", "дасканалейшы"! Падобным чынам

Ян з Вісліцы хоча падкрэсліць, што і ён “*dispar*” – “адрозны” ад прыдворных польскіх паэтаў, якія рэдка выходзілі за межы панегірычных жанраў у вершах, прысвечаных яснавяльможным асобам. Адпаведна, і наступныя, 15–16-ы, радкі “Верша да Пятра Таміцкага” таксама трэба разглядаць у іранічным кантэксце. Напэўна, не толькі даследчыкі XIX–XX стст., але і сучаснікі Яна Вісліцкага абвінавачвалі яго ў тым, што Грунвальдскую бітву ён апісаў “*non ad unguem rectam et ad amussim*” (“не да роўнага пазнокця і пад лінейку”): у гэтым выразе паэт выкарыстоўвае дзве лацінскія ідыёмы, і абедзве – са значэннем “абсалютна дакладна, скрупулёзна”. І гэтая горкая іронія скіравана супраць тых, хто не зразумеў велічнай задумы паэта: узнавіць у памяці нашчадкаў славу векапомнай перамогі і нагадаць пра легендарнага каралеўскага продка, які здабыў гэтую славу.

Загадкавым у 26-м радку з’яўляецца слова “*matertera*” (“цётка, матчына сястра”): яна, па словах паэта, павінна прывітаць “шчырага патрона” Пятра Таміцкага. Свае інтэрпрэтацыі гэтага вобраза прапаноўвалі Б. Кручкевіч і М. Езяніцкі (гл. каментарыі). Аднак найбольш пераканаўчай падаецца нам інтэрпрэтацыя Я. Парэцкага, які дасціпна заўважыў, што выраз “*nisi det stamina prolixa niveo fuso*” дзякуючы наяўнасці амаформаў “*fusus, i m*” ‘верацяно’ і “*fusus, a, um*” ‘распасцёрты, раскінуты, шырокі’, а таксама дзякуючы метафарызацыі назоўніка “*stamen, inis n*” ‘нітка –> нітка жыцця –> жыццё’ можна перакладаць двума спосабамі: “калі не спрадзе (дасл.: не дасць) белым верацяном доўгай ніткі” і “калі не дасць доўгага жыцця на распасцёртым снезе (= у снежным краі)” (гл.: *Парэцкі 1991, 23*). Такім чынам, працягвае Я. Парэцкі, “маці” – гэта Польшча, “сястра маці” – Вялікае княства Літоўскае. “Паэт даў зразумець Таміцкаму, – смела дапускае Я. Парэцкі, – што ён дамагаецца прадаўжэння палітыкі дзеда Ягайлы, накіраванай супраць нямецкіх захопнікаў, якая абапіраецца на саюз і дружбу ўсіх народаў, аб’яднаных пад яго жазлом. Ён прасіў віцэ-канцлера заступіцца перад каралём Жыгімонтам за сачыненне, напісанае ў такім духу” [*Парэцкі 1991, 23*].

Такая інтэрпрэтацыя “Верша да Пятра Таміцкага” сапраўды магчымая, нават калі зыходзіць з вобразнага і вербальнага кантэксту другой часткі твора. Але гіпотэза Я. Парэцкага яшчэ больш пацвярджаецца наяўнасцю працягу “Прускай вайны” – творамі са

зборніка “Пра сённяшнюю Прускую вайну”, змешчанага ў экземпляры бібліятэкі Асалінскіх.

Элегія да Багародзіцы Панны Марыі

Багародзічная паэзія мае даўнюю традыцыю ў літаратуры хрысціянскіх народаў. Першапачаткова яна існавала ў межах кананічных жанраў рэлігійнай паэзіі. Агульнапрынятыя малітвы, літаніі, акафісты, каноны паслужылі крыніцай творчага натхнення для многіх усходнеславянскіх пісьменнікаў. Да вобраза Маці Божай звярталіся ў сваёй творчасці Кірыл Тураўскі, манах Яфрэм (аўтар «Жыція Аўраамія Смаленскага»), Грыгорый Цамблак.

Асаблівае месца займалі малітоўныя звароты да Панны Марыі ў творчасці паэтаў-новалаціністаў Вялікага княства Літоўскага XVI ст. Настаўнік Яна Вісліцкага Павел з Кросна быў аўтарам двух паэтычных твораў у гонар Багародзіцы [гл.: *Pauli 1887, 59-60; 152-154*]. Абодва марыялагічныя творы Паўла з Кросна былі прасякнуты малітоўнай просьбаю адвесці жахлівую навалу чумы ад мілай Айчыны. Тая ж прычына выклікала паэтычную малітву да Багародзіцы з-пад пяра Яна Вісліцкага, пра што сведчыць поўная назва верша: “*Elegia ad deiparam Virginem Mariam pro sedanda peste*” (“Элегія да Багародзіцы Панны Марыі з просьбай пра ўтаймаванне чумы”).

Пачатак элегіі адзначаны арыгінальнасцю, замаскіраванай пад традыцыйнасць. Рэдкая для хрысціянскай рэлігійнай паэзіі заўвага пра тое, што Багародзіца – нашчадак роду Ісаі (бацькі цара Давіда), цалкам апраўдана тым, што паэт адразу ж канкрэтызуе тэму свайго малітоўнага звароту: ён просіць заступніцтва ад чумы менавіта для сваіх суайчыннікаў – “*miseris Polonis*” (“няшчасных палякаў”). Згадка пра род Панны Марыі пэўным чынам павінна была тлумачыць патрыятычныя пачуцці аўтара, узмацняць уздзеянне малітвы. Падобным чынам расповед Францыска Скарыны пра патрыятычны подзвіг Юдзіфі (у прадмове да кнігі “Юдзіф”) павінен быў выхоўваць любоў да сваёй Радзімы ў суайчыннікаў першадрукара.

Паэт удала кампануе лексічныя сродкі для стварэння эмацыянальнай паэтычнай выявы смяротнай эпідэміі як сапраўднага народнага бедства. Разбуральную, згубную сутнасць чумы пад-

крэсліваюць дзеясловы з адпаведнай семантыкай: “*premit*” (“прыгнятае”), “*rumpit*” (“руйнуе”), “*pessumdat*” (“знішчае”), “*necat*” (“забівае”). Звяртаючыся да вобраза бязлітаснай паркі Атропы як увасаблення ліхога наканавання лёсу, Ян Вісліцкі ўжывае гульню слоў: “не шкадуе… Парка” ў арыгінале гучыць “*nec parcit… Parca*”.

Пасля жудаснага апісання страшэннай навалы Ян Вісліцкі звяртаецца да Багародзіцы з адной толькі балючай просьбаю: памаліцца за суайчыннікаў Пану Богу нашаму, каб Ён злітаваўся над спакутаванымі людзьмі і даў ім выратаванне, спыніўшы крывавае шэсце чумы, “*Sarmaticum qua riget ecce solum*” (“ад якой, вось, дранцвее Сармацкая зямля” [*Elegia, 48*].

Пра час стварэння “Элегіі” С. Віткоўскі, вывучыўшы храналогію эпідэмічных захворванняў у гэты перыяд, выказаў наступнае меркаванне: “Сваю элегію Ян мог напісаць найраней – у канцы красавіка, найпазней – у канцы мая, а зборнік свой аддаў у друк Галеру не раней, як летам 1515 г.” [*Witkowski 1891, 442*]. Такім чынам, “Элегія да Багародзіцы”, напэўна, была адным з апошніх твораў, напісаных Янам Вісліцкім перад тым, як ён перадаў цэлы зборнік у друкарню Галера. Пацверджанне таму – спіс заўважаных памылак “*Errores in imprimendo commissi sic ut infra patet castigati*” (“Памылкі, дапушчаныя пры надрукаванні, выпраўленыя так, як відаць ніжэй”) змешчаны ў першадруку непасрэдна пасля элегіі. Цікава, аднак, што пасля гэтага спісу надрукаваны яшчэ адзін твор Яна Вісліцкага.

Эпіграма на зайздросніка

У канцы празаічнай прадмовы, звернутай да Паўла з Кросна, Ян Вісліцкі папярэджваў нядобразычліўцаў: калі зайздроснікі-заілы не супакояцца, то яны “ў хуткім часе пакаштуюць ад нас палінодыю, роднасную гукам Архілоха”. Напэўна, напады на паэта не спыняліся, паколькі абяцанне сваё яму давялося выканаць. Тым не менш уключэнне “Эпіграмы на зайздросніка” ў склад зборніка “Пруская вайна” было загадзя запланавана аўтарам. Гэта вынікае з наступных радкоў твора:

Perlege correctas signato ex ordine mendas:
Sic tutum fiet carmen ubique meum [*Epigramma, 7-8*].

Хочаш, сядзі й вывучай вунь памылак заўважаных шэраг –
Песня ж мая й надалей будзе ў бяспецы заўжды.

Апошнія словы гучаць запаветам мудрым нашчадкам, якія, спадзяецца аўтар, не будуць засяроджваць сваёй увагі на вышукванні прасадычных або стылёвых памылак у яго творах, а здолеюць зразумець веліч паэтычнай задумы і ацэняць мастацкае майстэрства яе выканання.

2. “Пра сённяшнюю Прускую вайну”

Паэма “Пруская вайна” невыпадкова была напісана ў 1515 г. Менавіта ў гэты час Тэўтонскі ордэн ізноў уздымаў сваю галаву, рыхтуючыся да рашучай бітвы з дзяржавай Ягелонаў. Вялікі магістр Альбрэхт Гогенцолерн імкнуўся наладзіць палітычныя адносіны з ваяўнічымі суседзямі як на ўсходзе, так і на захадзе з намерам вызваліцца з-пад цяжару васальных абавязкаў, зафіксаваных актам Торуньскага мірнага пагаднення 1466 г. Ян Вісліцкі сваёй паэмай, прысвечанай перамозе і пераможцам пад Грунвальдам, імкнуўся абудзіць гістарычную памяць не толькі сваіх суайчыннікаў, але і ворагаў – тэўтонцаў. Таму ніяк нельга прызнаць слушнымі меркаванні пра неактуальнасць паэмы Яна Вісліцкага ў сувязі з тым, што “ў тагачасным палітычным жыцці былі іншыя арыентацыі, а таму падзеі стогадовай даўнасці проста замоўчваліся як непатрэбныя і непажаданыя з пункту гледжання стасункаў з прускім дваром” [*Яновіч 2002*]. Наадварот, тэма перамогі пад Грунвальдам была надзвычай актуальнай ва ўмовах наспяваўшай ваеннай пагрозы з боку тэўтонцаў.

З лета 1519 г. пачаліся, у саюзе з Масковіяй, пры падтрымцы Нямецкага Рэйха і Данii, прыгатаванні Альбрэхта да ўзброенай барацьбы ў раёне ніжняга цячэння Вісты. У сваю чаргу, Жыгімонт Першы з верасня таго ж года пачынае збіраць войска. Як паведамляе М. Біскуп, 11 лістапада 1519 г. каронны сейм і Рада Каралеўскай Прусіі прынялі рашэнне пра неадкладны пачатак вайны з вялікім магістрам Альбрэхтам. “Яна павінна была весціся не дзеля знішчэння Ордэна ў Прусіі, але з мэтаю прымушэння яго кіраўніка да складання прысягі, прадпісанай торуньскім пагадненнем і дзеля раз-

рыву дамоўленасці, дасягнутай Альбрэхтам з Масквою" [*Biskup 1991, 22*].

У творах са зборніка "Пра сённяшнюю Прускую вайну", несумненна, ідзе размова менавіта пра гэтую вайну, якая доўжылася два гады: з 1519-га па 1521-ы. У прадмове да чытача аўтар прапануе паглядзець на "*copias Germanas redactas*" ("разбітыя германскія войскі") [*De praesenti, p.2 n.n.*], а значыць, апявае ўжо атрыманую перамогу. Праўда, паколькі ні ў гэтым, ні ў наступных паэтычных творах не згадваюцца аніякія геаграфічныя назвы, то надзвычай цяжка меркаваць, з якой менавіта перамогай і з якім часам трэба звязваць гэтыя словы. Справа ў тым, што вайна з прусамі 1519–1521 гг. мела некалькі кульмінацыйных пунктаў і адпаведна – некалькі пераможных момантаў. Так, яшчэ на пачатку вайны, 1 студзеня 1520 г., войскі Жыгімонта занялі горад Ілаву, 13 студзеня капітулявала Дуброўна [*Biskup 1991, 92-93*], лістапад 1520 г. прынёс новую перамогу – у сутычцы пад Гданьскам; у сакавіку ж 1521 г. войскі Жыгімонта сарвалі прускі план вялікага нападу (*der grosse Anlauf*) на Эльблонг. Так што час узнікнення ўсіх твораў, што ўваходзяць у збор "Пра сённяшнюю Прускую вайну", можа прыпадаць на прамежак часу паміж 1520 і 1521 (а, магчыма, і 1522) гадамі.

Адзначаючы перамогу Жыгімонта, аўтар раіць чытачу звярнуць асаблівую ўвагу на "*pietatem Regiam*" ("каралеўскую справядлівасць") у адносінах да ворагаў: "*recuperatis vi oppidis, quae ad hostes ut Germani ad Germanos defecerant, et parcitum est oppidanis omnibus, et praesidiis hostilibus viaticum et conductores, quo tuto abire possent, sunt dati, ad eumque modum toto isto bello nihil non actum est tractim, et clementer in hostem necessarium, quem reduci ad cor, non perdi Regi benignitas semper voluit*" ("калі ён адваяваў гарады, якія перайшлі да ворагаў як германскія – да германцаў, то была аказана літасць усім месцічам, а варожаму войску былі дадзены сродкі на ўтрыманне і праваднікі, каб яны маглі бяспечна сысці і, такім чынам, у цэлай гэтай вайне ўсё было зроблена прадумана і памяркоўна ў адносінах да непазбежнага ворага, якога каралеўская літасць заўсёды жадала зноў зрабіць прыхільным да [свайго] сэрца, а не знішчыць") [*De praesenti, p.2 n.n.*]. У "Прускай вайне", як памятаем, паэт таксама асобна падкрэслівае той факт, што напярэдадні Грунвальдскай бітвы кароль Ягайла ўсё яшчэ спрабаваў вы-

рашыць канфлікт мірным шляхам, “*quia regis in egregio pulcherrima corde virtus… canduit*” (“паколькі ў велічным сэрцы караля ззяла найцудоўнейшае высакародства”) [*Bellum II, 145-148*].

Вышэйпрацытаваныя словы “*parcitum est oppidanis omnibus*” (“была аказана літасць усім месцічам”) адлюстроўваюць рэальны ход падзей. М. Біскуп адзначыў, што пасля заняцця войскам Жыгімонта Дуброўна, жыхары якога добраахвотна прызналі ўладу караля, ім былі пацверджаны ўсе маёмасныя правы і прывілеі [*Biskup 1991, 93*].

Пасля празаічнай прадмовы да чытача ў зборніку “Пра сённяшнюю Прускую вайну” змешчаны верш “Боскаму Жыгімонту, непераможнаму каралю Польшчы”. Матывацыю ваеннага плана караля Ян Вісліцкі фармулюе так:

Mitius insanumque volens tractare Nepotem
Et belli auctores ense ferire suo [*Divo, 5-6*].

Ты не імкнуўся зусім да напышлівых песняў Непота,
Проста хацеў пакараць тых, што вайну пачалі.

Тое, што тут згадваецца імя славутага старажытнарымскага гісторыка Карнэлія Непота, можна ўспрымаць як сведчанне злёгку паблажлівага стаўлення паэта да прыхільнікаў Кліо. Успомнім, што падобныя настроі прабіваліся і ў радках прадмовы-звароту да Паўла з Кросна, “Оды да чытача” ды і самой паэмы ў зборніку “Пруская вайна”.

У творах зборніка “Пруская вайна” Ян з Вісліцы паказаў сябе сапраўдным майстрам слоўнай эквілібрыстыкі і паэтычнага каламбура (успомнім хаця б выраз “*lustra labentia*” (“доўгі час забыцця” або “балота забыцця”) у першай кнізе паэмы “Пруская вайна”). Бліскучы каламбур мы сустракаем і ў вершы “Боскаму Жыгімонту”. Паэт, саркастычна звяртаючыся да ворага, пытаецца:

Hem tibi, magnificis tua verba minantia coeptis
Quo redeunt, montes quid peperere tui? [*Divo, 19-20*].

Ганьба! Ці ж плён атрымаў ты ад словаў сваіх ганарыстых?
Што спарадзілі, скажы, горы-харугвы твае?

Перад намі – своеасаблівая філалагічная гульня лексічнымі значэннямі слова “*mons*”. Гэты назоўнік са значэннем “грамада,

войска” пазначае ў тэксце крыжацкія харугвы, аднак першаснае значэнне слова – “гара” – у спалучэнні з дзеясловам “*pario*” – “нараджаць” павінна выклікаць у чытача алюзію з байкамі Эзопа і Федра “Гара, якая нарадзіла мыш”.

Верш “На войска германцаў…” са зборніка “Пра сённяшнюю Прускую вайну” мае падзагаловак “*alterius incudis*”, што даслоўна перакладаецца “з другога кавадла”. Вядома, што ідыёмай “*incudi reddere versus*” (дасл. “аддаць вершы кавадлу”) карыстаўся Гарацый у значэнні “перапрацаваць вершы” [гл.: *Дворецкий 1976, 512*]. Таму падзагаловак “*alterius incudis*” лепш перакладаць як “перапрацаваны”. Тут, як і ў выпадку выбару паэтычнага памеру “Оды да чытача”, назіраецца ўплыў гарацыянскай традыцыі менавіта ў тэарэтыка-паэтычным аспекце.

Пэўныя рыторыка-стылёвыя асаблівасці яднаюць верш “На войска германцаў” з паэмай “Пруская вайна”. У названым вершы і ў фінале другой кнігі паэмы выкарыстаны рытарычныя, палемічна завостраныя звароты да варожага войска. Гэта шэраг рытарычных пытанняў у фінале другой кнігі “Прускай вайны”:

O peritura cohors, ubi erat tunc nominis heres
Illa tui scelerata superbia? Tunc ubi et enses
Sanguinei, quibus ausa es subsannare potentem
Regem? etc. [Bellum II, 405-408].

Войска асуджаных смерцю! Дзе ж сёння злачынная пыха
Племя ліхога твайго? Дзе крывавая зброя, якою
Вы з караля наймацнейшага гэтак пакпіць рызыкнулі?

На ўзроўні 405-га радка гэтай кнігі паэмы прысутнічае глоса “*Sarcasmus*” [*Bellum 1516 , p.36 n.n.*].

У вершы “На войска германцаў” многія тырады таксама поўныя з’едлівага сарказму і пабудаваныя ў форме рытарычных пытанняў:

Et quod aequo celeri Germana per oppida ferri
Sperabas? Macer hinc vix pedes ire potes. <…>
Quae te Sarmaticas fugientem turpiter oras
Gloria? Quod sequitur te, fugitive, decus?
[*In exercitum, 33-34, 49-50*].

Ты па германскіх мястэчках хацела пранесціся конна?
Хоць бы цяпер ты, жабрак, здолеў пайсці пехатой! <…>
Дзе ж твая слава, калі ты ўцякаеш ад межаў сармацкіх?
Што там за гонар цяпер суправаджае цябе?

У гэтым жа вершы згадваюцца "*viri, qui nascuntur ad gelidam Arcton*" ("мужы, якія нарадзіліся паблізу ледзяной Мядзведзіцы") [*De praesenti, p.5 n.n.*]; тыпалагічна падобны вобраз двойчы сустракаем і ў "Прускай вайне": "*Terra sub arctoa famata Lycaonis ursa*" ("слаўная зямля пад Лікаонскай Мядзведзіцай") [*Bellum I,110*] і "*Parrhasis Oceano nunquam demersa profundo Ursa*" ("Парасійская (Вялікая) Мядзведзіца, якая ніколі не паглынаецца бездань Акіяна") [*Bellum III, 23-24*]. Далей у вершы "На войска германцаў…" аўтар паведамляе пра шматлікія перамогі гэтых "*virorum*" ("мужоў"):

Hi toties Moscos stravere, Scytasque Getasque,
Cum quibus assidue Martia bella gerunt [*In exercitum, 53-54*].

Столькі разоў яны білі маскоўцаў, і скіфаў, і гетаў,
З імі і сёння яшчэ Марсавы войны вядуць.

Да працытаваных радкоў напрошваецца паралель – цяпер ужо з "Одай да караля Жыгімонта", дзе Ян Вісліцкі называе ўладара "*decorus tribus triumphis*" ("уганараваны трыма перамогамі") [*Ode, 35*]. Пры гэтым маюцца на ўвазе перамога ў 1509 г. над валахамі (малдаванамі, якіх у антычнай і сярэднявечнай літаратуры называлі *Getae*), у 1512 г. – над татарамі і ў 1514 г. – над маскавітамі (па-лацінску – *Moschi*) пад Оршай.

Што датычыцца словазлучэння "*Martia bella*" ("Марсавы войны") у вершы "На войска германцаў…", то яно супастаўляецца з падобнымі да яго надзвычай частотнымі ў паэме "Пруская вайна" выразамі кшталту "*Martia proelia*" ("Марсавы бітвы") [*Bellum II, 328*], "*bella severi Martis*" ("войны суровага Марса") [*Bellum II, 100*]", "*proelia Martis*" ("бітвы Марса") [*Bellum II, 29*], "*strepitus Martis*" ("ляскат Марса") [*Bellum III, 230*].

У "Заахвочвальным вершы…" Ян Вісліцкі згадвае горы Пеліён і Осу, дзе паводле антычнага падання нарадзіўся кентаўр Хірон [гл.: *Carmen exhort., 1, 18*]. Гэты ж дастаткова рэдкі паэтычны то-

пас прысутнічае і ў вершы “На войска германцаў…”: тут Пеліён і Оса становяцца сімвалам напышлівых агрэсіўных задумаў тэўтонцаў [гл.: *In exercitum, 40-41*].

Тэксталагічнае супастаўленне твораў двух паэтычных зборнікаў, змешчаных у экземпляры бібліятэкі Асалінскіх, сведчыць пра прыналежнасць аўтара дзесяці твораў зборніка “Пруская вайна” і трох твораў зборніка “Пра сённяшнюю Прускую вайну” да адной літаратурнай школы. Сувязь паміж абодвума зборнікамі прасочваецца як на тэарэтыка-паэтычным, так і на вобразна-мастацкім (стылёвым і лексічным) узроўнях. Яна назіраецца ў агульнасці тэматыкі, ідэйнай скіраванасці твораў, у агульнасці сродкаў мастацкай выразнасці. Усё гэта дазваляе сцвярджаць з высокай ступенню верагоднасці, што Ян Вісліцкі з’яўляецца аўтарам не толькі дзевяці паэтычных і аднаго празаічнага твора, якія ўвайшлі ў склад зборніка “Пруская вайна”, надрукаванага ў 1516 г., але таксама аўтарам аднаго празаічнага і двух паэтычных твораў зборніка “Пра сённяшнюю Прускую вайну”, час апублікавання якога можа быць абмежаваны пачаткам 20-х гг. XVI ст.

У 1932 г. Я. Смярэка пісаў: “Памёр <Ян з Вісліцы> у маладым узросце, напэўна, неўзабаве пасля 1518 года і перад 1520-м – паколькі ён, пясняр трох перамог Жыгімонта I, несумненна, стварыў бы песню пра чацвёртую яго перамогу над прускім магістрам Альбертам[7] Брандэнбургскім у 1520 г.” [*Smereka 1932, 13*]. Гэтыя словы аказаліся геніяльным прадбачаннем польскага вучонага і перакладчыка. Зборнік “Пра сённяшнюю Прускую вайну” якраз і з’яўляецца ўслаўленнем згаданай перамогі Жыгімонта Старога. Гэта – лагічны працяг песняў Яна Вісліцкага пра Грунвальдскую бітву, пра перамогу пад Оршай. Гэтаксама і новая перамога Жыгімонта над войскам крыжакоў у 1520–1521 гг. выглядала чарговым звяном у ланцугу трыумфаў Ягелонаў. Найбольш верагодны аўтар усіх паэтычных энкоміяў у гонар “вікторый” Жыгімонта – пясняр “Марсавых подзвігаў ратных”, якімі ўслаўлены як учарашні, так і сённяшні дзень Айчыны, – Ян Вісліцкі.

---

[7] Герцаг Брандэнбургскі з роду Гогенцолернаў (1490–1568) у розных крыніцах называецца то Альбертам, то Альбрэхтам. Часам указваюцца абодва імя (гл., напр.: Францыск Скарына: Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мн., 1988. С. 98).

V. Традыцыя і наватарства ў творчай спадчыне Яна Вісліцкага

Паэма Яна Вісліцкага, напісаная дактылічным гекзаметрам, твор, у якім знайшла адлюстраванне ідэйная і эстэтычная праграма аўтара, – бясспрэчна, арыгінальная мастацкая з'ява эпохі Рэнесансу. Разам з тым, як справядліва адзначае А. Цысык, "з'яўленне 'Прускай вайны' – перш за ўсё вынік засваення яе аўтарам шматвекавой духоўнай спадчыны антычнасці і яе літаратурных традыцый" [*Цысык 1995, 186*]. Мастацкая тканіна "Прускай вайны" расквечана шматлікімі цытатамі і алюзіямі з паэзіі Старажытнага Рыма, пра што вельмі падрабязна і дэталёва пісалі польскія літаратуразнаўцы канца XIX ст.

Калі разважаць пра ступень мастацкай арыгінальнасці твораў Яна Вісліцкага, варта ўспомніць артыкул М. Езяніцкага, які, вывучаючы ўплывы класічных аўтараў на яго паэзію, спрабаваў высветліць: свядомым ці мімавольным было гэтае наследаванне. Польскі вучоны робіць выснову, што ў сачыненнях Яна Вісліцкага прадстаўлены тры тыпы наследавання старажытнарымскім паэтам: свядомае, мімавольнае і выпадковае. Свядомымі наследаваннямі М. Езяніцкі лічыць тыя, што датычацца кампазіцыйна-сюжэтных элементаў (апісанні бітвы, дыялогі, пейзажы, заняткі жыхароў Польшчы і Літвы). Імкненне аўтара "Прускай вайны" да наследавання ў гэтым выпадку трэба разглядаць як "арыентацыю на лепшыя ўзоры, агульнапрызнаныя паэтычныя аўтарытэты" [гл.: *Jezienicki 1891, 161*]. Уплывы піэрыяў-рымлян адзначае вучоны і ў характарыстыках асоб, спосабах ужывання прыёму персаніфікацыі. Што да мімавольнага і выпадковага наследаванняў, то М. Езяніцкі адносіць іх да разраду рэмінісцэнцый [*Jezienicki 1891, 160*].

Няма патрэбы тут падрабязна спыняцца на разборы канкрэтных прыкладаў уплываў паэтычных узораў літаратуры Старажытнага Рыма на "Прускую вайну" і іншыя творы Яна Вісліцкага. Плён гэтай працы – скрупулёзнай і, я б сказала, філіграннай – у працах польскіх філолагаў-класікаў: К. Мехежынскага, Б. Кручкевіча, М. Езяніцкага, Ф. Бянькоўскага [гл.: *Mecherzyński 1880; Pauli 1887; Jezienicki 1891; Bieńkowski 1891; Kruczkiewicz 1892*]. Безумоўна,

неаспрэчным літаратурным аўтарытэтам для Яна Вісліцкага быў "мантуанскі прарок" Вергілій, які яшчэ з часоў Старажытнага Рыма лічыўся геніяльным і непараўнальным майстрам мастацкай эпапеі. Менавіта паэзія Вергілія лічылася ўзорам для новалацінскіх аўтараў Вялікага княства Літоўскага. Імя вялікага старажытнарымскага паэта, як сведчыць І. В. Саверчанка, – у ліку тых, што найчасцей згадваюцца беларускімі пісьменнікамі XVI–XVII стст. [*Саверчанка 1998, 32*].

Уплыў Вергілія назіраецца галоўным чынам на ўзроўні рэплантацыі з "Энеіды" асобных алюзій у форме параўнанняў або метафар. Больш за ўсё пераспеваў або непасрэдных цытаванняў са знакамітага старажытнарымскага эпасу – у другой кнізе "Прускай вайны", дзе аўтар выкладае гісторыю Грунвальдскай бітвы. Так, з мэтаю гіпербалізацыі Ян Вісліцкі апісвае водблескі жалезнай зброі, што з'яўляецца на небе*: "et liquidus micat ensibus aether*" ("і яснае неба адсвечвае жалезнай зброяй") [*Bellum II, 344*]. Гэты вобраз сустракаецца ў Вергілія пры апісанні марскога шторму: "*Et crebris micat ignibus aether*" ("І неба адсвечвае рознакаляровымі агнямі") [*Aen. I, 90*]. Безліч такіх прыкладаў прыводзяць Б. Кручкевіч, М. Езяніцкі, К. Мехежынскі. Наогул, уся марыністычная сімволіка і метафорыка ў Вісліцкага (напрыклад, параўнанне сябе са стырнавым на караблі, што нясецца па хвалях бурлівага мора, у прадмове-звароце да настаўніка Паўла з Кросна), несумненна, узнікла ў паэме пад уплывам Вергілія.

Паэт выкарыстоўвае таксама найбольш вядомыя, "хрэстаматыйныя" Вергіліевы выслоўі, якія сталі паэтычнымі топасамі. Так, славутае спалучэнне "*arma virumque*" ("зброю і мужа"), з якога пачынаецца "Энеіда" і якое сустракаецца ў паэме Вергілія яшчэ двойчы [*Aen. I.119; IX.747*], столькі ж разоў ужываецца Янам Вісліцкім у крыху зменены адпаведна зместу паэмы форме ("*arma virosque*" ("зброю і мужоў")) [*Bellum. II, 45; II. 294; II. 335*]. Пачатак другой кнігі "Прускай вайны" – рэмінісцэнцыя з "Энеіды" (параўн.: "*Tempus erat calidum, quo…*" ("Час быў спякотны, калі…") [*Bellum II.169*] і "*Tempus erat, quo…*" ("Час быў, калі…")) [*Aen. II.268*].

Многія эпізоды «Прускай вайны» ў большай ці меншай ступені супастаўляюцца з пэўнымі творамі Вергілія, Гарацыя, Авідзія, Стацыя, а таксама Катула, Тыбула, Праперцыя, Лукана, Марцыяла і нават Сенэкі. Б. Кручкевіч лічыў нават, што да ліку старажытных

аўтараў, якія паўплывалі на Вісліцкага, трэба далучыць яшчэ Сілія Італіка, а таксама Клаўдыяна. Акрамя таго, вучоны звярнуў увагу і на агульнасць вобразна-мастацкіх топасаў у Яна Вісліцкага і яго настаўніка Паўла з Кросна [*Kruczkiewicz 1892, 367*]. Разважаючы пра апошнія наследаванні, Б. Кручкевіч заўважыў, што часам цяжка ўстанавіць, каму з паэтаў – Паўлу з Кросна ці камусьці з рымскіх класікаў – абавязаны Ян Вісліцкі выкарыстаннем пэўнага вобраза ці звароту ў кожным канкрэтным выпадку. Так, вучоны адзначае, што пажаданне дасягнення гадоў Сібілы, Нестара і Прыама часта паўтараецца ў Паўла з Кросна, але сустракаецца таксама ў Стацыя і ў Авідзія. "З гэтага вынікае, – піша Б. Кручкевіч, – што мноства падобных думак і зваротаў зрабіліся ўжо агульнай фразеалагічнай уласнасцю тагачасных гуманістаў" [*Kruczkiewicz 1892, 367*]. Так, суровыя і грандыёзныя апісанні лютай сечы былі засвоены Янам Вісліцкім (а пазней – і ўсімі іншымі лацінамоўнымі паэтамі) яшчэ ад Гамера праз пасрэдніцтва старажытнарымскіх "настаўнікаў". Самае яскравае апісанне бітвы ў паэме [*Bellum II.205-210*] вобразна-стылёвай тканінай нагадвае адпаведныя эпізоды "Іліяды". Параўнаем:

Vulnera vulneribus geminant sternuntque vicissim
Corpora multa virum crudeli morte necata.
Undique concurrunt acies, fluit undique sanguis;
Hi pereunt jaculis, illi stridentibus hastis
Succumbunt, animasque suas sub Tartara mittunt.
Saxa volant et tela pluunt per nubila mundi
Ferrea… [*Bellum II, 205-211*].

Там ударам на ўдар і ўдарамі вобзем кідаюць
Многія целы загінуўшых нашых і ворагаў вояў.
Войскі сыходзяцца ў сечы, і кроў паўсюдна бруіцца:
Гэтыя гінуць ад дзіды, а тыя стралою працяты,
Разам усе яны душы свае адпраўляюць у Тартар.
Свішча каменне, і сыплюцца стрэлы, што лівень…

O‰ d' □te d» r ™j c□ron ›na xuni□ntej †konto,
s□n r □balon rino□j, s□n d' □gcea ka□ m□ne' □ndr□n
calkeoqwr»kwnr □t¦r □sp„dej □mfal□essai

□plhnt’ □ll»lVsi, pol□j d’ □rumagd□j □r□rei.
□nqa d’ ¤m’ o„mwg» te ka□ e□cwl□ p□len □ndr□n
□ll□ntwn te ka□ □llum□nwn, r□e d’ a†mati ga‹a
[*Ilias. IV.446-451*].

Калі ворагі сышліся разам на адным месцы,
Яны адначасна ўдарылі ў шчыты, адначасна кінулі дзіды
І сілы меднадаспешных мужоў кінуліся наперад.
Шчыты з выпуклінамі ў цэнтры наблізіліся
Адзін да аднаго, узняўся страшэнны галас. Там
Раздаваліся крыкі і малітоўныя воклічы людзей:
Тых, якія забівалі, і тых, каго забівалі, а зямля струмянілася крывёю.

Здаецца, што часта, асабліва ў батальных сцэнах паэмы, Ян Вісліцкі даволі небяспечна балансуе на мяжы паэтычнай традыцыі і эпігонства, але да апошняга справа ніколі не даходзіць. В. Дарашкевіч справядліва адзначаў: “Старонкі, якія непасрэдна малююць Грунвальдскую бітву, – лепшыя ў паэме: экспрэсіўныя, маляўнічыя і прыкметна суаднесеныя з узорамі класічнага гамераўскага эпасу” [*Дарашкевіч 1975, 58*]. І ўсё ж з большым захапленнем азіраецца Ян Вісліцкі на свайго рымскага настаўніка. Менавіта ў Вергілія запазычаны бліскучы вобраз аленя, што ўцякае ад паляўнічых сабак [*Aen. XII, 749-755*]; гэты вобраз выкарыстоўваецца ў другой кнізе “Прускай вайны” для апісання імклівых уцёкаў германскага войска [гл.: *Bellum II, 398-402*].

Ключавы для ўсёй паэмы вобраз-сімвал “*fama*” (“чутка”) – таксама вынік “творчага супрацоўніцтва” Яна Вісліцкага з Вергіліем. Так, у чацвёртай кнізе “Энеіды” змяшчаецца апісанне Чуткі, прычым гэты вобраз у “мантуанскага прарока” набывае рысы алегарызму і персаніфікуецца:

Extemplo Libyae magnas it Fama per urbes,
Fama, malum qua non aliud velocius ullum:
mobilitate viget virisque adquirit eundo,
parva metu primo, mox sese attollit in auras
ingrediturque solo et caput inter nubila condit
[*Verg. Aen. IV. 173-177*].

Адразу ж Чутка панеслася па вялікіх гарадах Лівіі,
Чутка – няма аніякага ліха, хутчэйшага за яе:
Яна дужэе ў руху і набірае сілы, ідучы,
Спачатку малая ў страху, ды хутка ўзносіцца да неба
І крочыць па зямлі, а галаву хавае ў хмарах.

Гэты фрагмент "Энеіды" можна супаставіць з апеляцыяй да караля Жыгімонта ў першых радках "Прускай вайны", з апісаннем падрыхтоўкі да вайны з крыжакамі ў другой кнізе [*Bellum II, 114 etc.*], асабліва ж – з паведамленнем пра шлюб караля Ягайлы ў трэцяй кнізе [*Bellum III, 127 etc.*]: у апошнім выпадку, як і ў Вергілія, Чутка паведамляе ўсім падданым пра вяселле, што мае адбыцца. Зварот да "старажытнай Чуткі (Славы)" у 217-м радку першай кнігі "Прускай вайны" ("*At nunc Fama vetus…*" ("А цяпер, старажытная Слава, …")) нагадвае адпаведны пасаж з "Фіваіды" Стацыя ("*Nunc mihi Fama prior…*" ("Цяпер мне ранейшая Слава…")) [*Theb. V.32*]. Але гэта наследаванне назіраецца выключна на фармальным узроўні. У Вергілія і Стацыя персаніфікаваная постаць Чуткі (Славы) – стандартны, трафарэтны вобраз. У аўтара ж "Прускай вайны" ён нясе значную ідэйную нагрузку ў рэчышчы мастацкай задумы твора, мэта якога – "уваскрэсіць гонар вялікі нязгаснай славы" продкаў караля. Ян Вісліцкі пераасэнсоўвае глыбінную сутнасць гэтага алегарычнага вобраза. Калі ў "Энеідзе" Чутка выклікае насцярожаныя да сябе адносіны, выглядае злоснай і непрадказальнай, то ў "Прускай вайне" Чутка – вяшчунка ўсяго добрага: перамогі, вяселля. Яна здольная абудзіць народ да вызваленчай барацьбы і ўзрушыць у людзях лепшыя пачуцці.

П. Бянькоўскі меў рацыю, калі пісаў, што залежнасць Яна Вісліцкага ад рымскіх класікаў выяўляецца найбольш (дадамо: амаль выключна!) на фармальным узроўні: у рытарычных фігурах, параўнаннях, эпітэтах і ў пераходных канструкцыях [*Bieńkowski 1891, 130*]. Зразумела, Ян Вісліцкі не мог – ды і не хацеў! – цалкам пайсці шляхам наследавання антычным літаратурным аўтарытэтам. Ён "звярнуўся да рэальных гістарычных асоб, у той час як яго настаўнік Вергілій апяваў герояў легендарных, з іх выдуманымі прыгодамі, шматлікімі авантурнымі і інтымнымі алюзіямі" [*Кавалёў 1990, 4*]. Выкарыстанне Янам Вісліцкім вобразна-мастацкага арсенала вялікіх папярэднікаў ні ў якім разе нельга

лічыць заганай або ганьбай для самога паэта. П. Бянькоўскі слушна бачыў прычыну ўплываў у тым, што і Вісліцкі, і іншыя паэты той эпохі "настолькі грунтоўна ведалі класікаў, што цэлыя вершы, думкі, выразы, звароты падсвядома імкнуліся на яго пяро, і на ўсе справы, падзеі, а таксама на сучасных яму людзей паэт глядзеў праз прызму сваіх недасягальных класічных узораў" [*Bieńkowski 1891, 131*]. Гэты шматколерны паэтычны сусвет паслужыў палітраю для мастака слова, які быў цалкам арыгінальным у ідэйнай задуме свайго твора, у распрацоўцы новых тэм, праблем і стварэнні цэласнага паэтычнага палатна.

Антычны матэрыял, які паэт у зручны момант умела і прафесійна прыстасоўвае да сваіх ідэйных і мастацкіх запатрабаванняў, толькі дапамагае чытачу "пазнаць" пэўную сітуацыю, успрыняць яе эмацыянальна, з адпаведным настроем. Так, алімпійскі план у трэцяй кнізе "Прускай вайны" ўзнікае толькі як апраўданне дынастычнага шлюбу караля Ягайлы з Соф'яй Гальшанскай: паэту вельмі важна падкрэсліць вялізнае значэнне гэтай падзеі, бо менавіта Соф'я-"русінка" нарадзіла сыноў для Ягайлы, а значыць – каралёў для дзяржавы. Прыгадаю таксама, што на пачатку "Прускай вайны" Ян Вісліцкі звярнуўся да звыклай для рымскай паэзіі традыцыі выяўлення *orbis terrarum* ("зямнога кола"). Але, як слушна заўважыў А. З. Цысык, у гэтым эпізодзе паэт "спалучае назвы рэальных мясцовасцей, вядомых антычнасці, з традыцыйнымі міфалагічнымі ўяўленнямі" [*Цисык 1995, 188*].

Антычная міфалогія і гісторыя для аўтара "Прускай вайны" – гэта перадусім агульнакультурная мастацкая топіка, якая ўспрымаецца толькі эстэтычна. Таму месца традыцыйнай антычнай Музы ў паэтычным звароце Яна Вісліцкага замяшчае Багародзіца Панна Марыя. "У вачах еўрапейскага чытача, – пісаў У. Кароткі, – паэт узвялічвае сваю дзяржаву, ідэалізуе яе лепшых прадстаўнікоў, чые імёны з цягам часу сталі вобразамі-сімваламі айчыны. Крака ён параўноўвае з Аляксандрам Македонскім, Ванду з Камілай і Сафо, а вось Ягайлу ён лічыць вышэй за Сцыпіядаў і Дэцыяў. Як летапісцы ці складальнікі хронік імкнуліся айчынную гісторыю і яе герояў упісаць у кантэкст часцей за ўсё біблейскай гісторыі, так паэты-новалаціністы дапасоўвалі вобразна-сімвалічную сістэму Антычнасці да сваёй творчай лабараторыі" [*Кароткі 1997, 92*]. Антычная вобразнасць, з аднаго боку, прадстаўляла аўтару універсальны

мастацкі матэрыял, з іншага – служыла зыходным пунктам фарміравання яго эстэтычнай праграмы, далучала яго творчасць да заходнееўрапейскага кантэксту, нарэшце, найбольш поўна і адмыслова выконвала ролю дэкора.

Генеральнай методыкай рэцэпцыі паэтычнай спадчыны старажытных Грэцыі і Рыма для беларускіх лацінамоўных паэтаў была ***імітацыя***. Аднак, на маю думку, у многіх эпізодах "Прускай вайны" яна набліжаецца да ***эмуляцыі***, якая, як адзначаў А. Жлутка, з'яўляецца вышэйшым узроўнем імітацыі. Эмуляцыя – гэта своеасаблівае паэтычнае спаборніцтва, якое "грунтавалася на выкарыстанні пісьменнікам толькі некаторых элементаў антычнага паходжання, абагульняючых арыгінальныя думкі і знаходкі аўтара. Эмулятыўныя творы павінны былі па ўзроўні не толькі зраўняцца з антычнымі, але і пераўзысці іх" [*Жлутка 1993, 20*]. Ідэйная навізна, нацыянальна арыентаваная тэматыка дазволіла Яну Вісліцкаму, гаворачы словамі Л. Баткіна, "шляхам пераймання выйсці за межы пераймальнасці" [*Баткин 1984, 74*] і дасягнуць высокага ўзроўню мастацкасці. Ян Вісліцкі ў межах вобразна-выяўленчай топікі старажытнарымскай паэзіі стварыў тым не менш арыгінальны паводле задумы, кампазіцыі, сюжэта і ідэйна-мастацкага выканання паэтычны твор, які знаходзіцца ля вытокаў жанру гераічнага эпасу ў беларускай літаратуры.

С. Віткоўскі назваў Яна Вісліцкага паэтам "на досвітку лацінскай паэзіі ў Польшчы". "Мала вядомы, мала ацэнены, – працягвае вучоны, – ён займае сціплае становішча аднаго з піянераў таго магутнага гуманістычнага руху, які так жыва ўскалыхнуў Польшчу эпохі Жыгімонта" [*Witkowski 1891, 449*]. Трэба дадаць, што Ян з Вісліцы як творчая асоба быў адначасова і спараджэннем гэтага руху: у яго літаратурнай творчасці надзвычай выразна адбілася тое своеасаблівае светаадчуванне "творцы-стваральніка", якое ўласціва самым лепшым майстрам эпохі Рэнесансу. Ён годна і прафесійна адстойвае ў еўрапейскай літаратуры сваё права быць "*dispar*" – "непадобным" да пісьменнікаў іншых дзяржаў і народаў, фармулюе сваё арыгінальнае мастацкае крэда: уваскрашаць памяць пра былую славу, абуджаць думку народа, вызначаць для яго духоўныя арыенціры, паказваць былых і сучасных правадыроў.

Павел з Кросна, звяртаючыся ў элегіі да аўтара "Прускай вайны", пісаў:

Sic tua laurigeris cingentur tempora sertis,
Dicerisque tui splendor honorque soli [*Elegia Magistri, 61-62*].

Час твой аздоблены будзе лаўровым вянком неўвядальным,
Горда цябе назавуць славаю роднай зямлі.

Гэтыя словы настаўніка сталі прарочымі. Ян Вісліцкі ў сваіх творах выканаў глыбока прадуманую ім творчую праграму, якая дазволіла яму заняць адметнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры. Ён не толькі паэтычна асэнсаваў ключавую для беларускай гісторыі падзею – перамогу пад Грунвальдам, – але прапанаваў і сваё разуменне пытанняў дзяржаўнай ідэалогіі, даў узор патрыятычнага служэння Радзіме – вялікай еўрапейскай дзяржаве *ab mari usque ad mare*.

Факсімільныя першарадкі
Яна Віслицкага

BELLUM PRUTENUM

Noscere si quis amas Pruteni fata duelli,
Huc ades et vulto[1] perlege scripta pio,
Quae canit exiguo madefactus corda furore
Attamen Aoniis Sarmata notus avis[2].

Carmen exhortatorium Joannis Visliciensis
ad Musam M. Pauli Rutheni laudibus ejusdem refertum
ad condendum epigramma in libellos de Pruteno bello conscriptos.

Pelion Aemoniis[1] multum celebratus in oris
Antro Philiriden nutriit ipse cavo,
Quem fert prisca fides Epidauria in arte peritum
Pollice et incurvae plectra ferire chelis[2].
Unctae Peliden docuit praecepta palestrae
Atque Menoetiaden martia jura trucem.
Dogmate semihominis juvenes nituere magistri,
Pergama Dulichio dum cecidere dolo,
Quod Rhoeteus ager testatur et unda Scamandri,
Insuper omnigenis Nuntia[3] fama plagis.
Fulserunt juvenes gemino Chirone celebres,
Clarus discipulis atque magister erat.
Sic tu Paule, Ruthenorum celebranda virorum
Gloria Sarmaticae famaque barbariae,
Clarus est[4], ingenii clari virtute coruscans,
Quod saevit celebro Castalis alma tuo.
Thessalus Aeacides hunc tollat et ejus amicus
Nobilis Ossa soli lausque Pelethronii:
Dantiscusque tuus tollat te Suchteniusque
Nec non Sarmaticis Crosna Ruthena locis.
Ille duobus erat clarus: tribus ipse nitescis

ПРУСКАЯ ВАЙНА

Хочаш дазнацца пра вынікі Прускай вайны? Паспяшайся,
Каб са спагаднай душой твор гэты тут прачытаць –
Песню сармата, які, аянійскімі продкамі слаўны,
Сэрца сваё напаіў кволым натхненнем пакуль.

ЗААХВОЧВАЛЬНЫ ВЕРШ

Яна Вісліцкага да Музы магістра Паўла Русіна,
поўны яго ўсхваленняў, да складання эпіграмы ў кнігі,
напісаныя пра Прускую вайну

У Геманійскай зямлі стаіць Пеліён знакаміты,
Там, у пячоры пустой, ён Філірыда ўзрасціў;
Той жа быў спрытны не толькі ў эпідаўрыйскай навуцы –
Пальцам ці плектрам граць на кіфары любіў.
Там навучаў ён Пеліда ўсім правілам розных мастацтваў;
Менетыяд ад яго звычаі Марса спазнаў.
Помнілі догмы настаўніка-паўчалавека падлеткі,
Ды Дуліхійца падман іх ля Пергама згубіў.
Сведкі таму – і Рэтэйскае поле, і воды Скамандра,
Дый пагалоска яшчэ – Чутка-вяшчунка зямлі.
Праз юнакоў тых узвышаны быў і Хірон двухаблічны:
Кожны настаўнік заўжды славіцца вучнем сваім.
Гэтак праславіўся ты ў далёкай Сармацкай краіне,
Павел! Вядомасць набыў сам між сармацкіх мужоў.
Слава табе! Гэтак годнасцю ззяе твой розум і талент,
Што й Касталійка сама зайздрасць не можа стрымаць.
Хай Эякід фесалійскі, і сябар яго, і ўся Оса,
Пелетранійцаў хвала, славяць бясконца таго[1];
Твой жа Дантышак і Сухцень цябе хай уславяць, а з імі –
Кросна русінаў – яна ёсць у Сармацкай зямлі.
Той праз дваіх стаў вядомы – цябе праслаўляюць аж трое

Discipulis, quorum tertius esse velim.
Et multis aliis Helicona volentibus altum
Scandere, quos actas montis apexque vetat,
Iam tibi Pegasides divae Aonidesque, sacrate,
Praedulce increpitant ore rubente melos,
Perstrepit et plectro Phoebus tibi comis eburneo,
Et Bromius doctis dat bona vina labris.
Ergo bibas felix, precor, enthea pocula Bacchi,
Et condas nostris carmina pulchra libris.
Numina vinosis semper meliora poetis[5]
Hic venit agnato namque cruore furor[6].
Jam jam Terpsichore Pauli famata poetae
Fulgurat occiduo, Vesper ut ipse, polo,
Sicut[7] ad extremos pelagi migravit Iberos, –
Atque per eoas candicat aucta plagas.
Sit nutrita Polonorum licet orbe sub amplo,
Hic ubi praerapidis Vistula spumat aquis,
Nil tamen in nostris modulata est ipsa libellis,
Stemmata nec Prussis contulit ulla meis,
Convenit in patrio quamvis resonare triumpho
Et decus Aoniis condecorare favis.
Patria Martiaco promuntur bella cothurno:
Ascribat[8] patriae carmina et ipsa suae.
Si numerosa suam fastidit cura Minervam,
Scribere non pigeat distichon, oro, mihi,
Aeternum nostris revirebat[9] quodque libellis
Te faciens oculis semper adesse meis,
Hocque fovebo modo tali, quali solet ipsa
Manus amatoris dulcis amica sui.

FINIS[10]

Вучняў. Між імі цяпер трэцім хацеў бы я быць.
Шмат хто імкнуўся ўзысці на гару Геліконскую – толькі
Ім перашкодай была старасць ці гор вышыня;
Вось для цябе чарадзейнымі вуснамі ўсе Пегасіды
І Аяніды пяюць боскія песні свае;
Радасна Феб для цябе б'е плектрам бліскучым па струнах;
Вопытны ў справе сваёй Бромій прыносіць віно.
Бакха натхняльны напой цяпер пі, калі ласка, на шчасце,
Песню ж маю ўганаруй вершам цудоўным сваім.
Большая веліч заўсёды – у вершах падпітых паэтаў,
Бо паэтычны запал – віннаму хмелю сваяк.
Ззяе сама Тэрпсіхора цяпер перад Паўлам-паэтам,
Нібыта Веспер, які ў небе вячэрным гарыць,
Потым схіляецца да іберыйскага ўзмежжа марскога
І зіхаціць яшчэ больш паміж усходніх краін, –
Хай жа яна акрыяе ў багатай краіне палякаў –
Там, дзе імклівасцю хваль велічна Вісла шуміць,
Бо ў нашых кнігах яшчэ не спявала яна аніколі
І не прынесла вянкоў гэтым вось "Прусам"[2] маім,
Хоць і гатова яна загучаць на радзіме з трыумфам,
Каб аянійскі нектар стаўся аздобай для ўсіх.
Толькі ў трагедыях Марса спяваюць пра войны народа,
Хай для Радзімы й сябе песні дапіша яна [3].
Нават калі й пагарджае ў бясконцай апецы Мінервай,
Хай не адмовіць, малю, скласці двуверш для мяне.
Пышна квітнеў ён заўжды ў нашых кнігах і там заставаўся –
Так, каб заўсёды я мог бачыць, настаўнік, цябе:
Як падарункі каханка ласкава пільнуе сяброўка,
Я гэтаксама твой верш буду заўжды зберагаць.

КАНЕЦ [4]

Venerabili ac egregio viro magistro Paulo de Crosna
studii Cracoviensis, collegiato poëtae praeceptorique dignissimo
Joannes Visliciensis salutem ac felicitatem

Nondum tot curis aerumnarum mearum exanclatis, ac si nauclerus per tumidum pelagus euro furente variis animi meditationibus gravatus inter adversae fortunae discrimina fluctuans, Heliconiadas, altrices suavisissimas, quibus adhuc tener oblectatus sum, loco refrigerii tanquam tutissimum asylum, vir o humanissime, petii concentuque earum celebratissimae posteritatis permotus, tum famae inenarrabilis perlucidissime candore stupefactus paululum ingemui talibus meditando immoratus, vatesque earum cultores ultra summa rerum fastigia praestantiores animo locavi[1], quorum vestigia iners rudisque procul secutus. Illa famatissima strage dictante, quam Poloni cum Germanis inter fines Prussiae dextro Marte gessere, cepi volutare corde ejus insignem eventum, qui quamvis majori laude dignior, majoris calami notatu praestantior sit, ego ipso paene in medio barbariae natus, nec adeo bene Aonidum fluentis potus, mea, qua potui, cura insomni operae pretium ad lucem duxi fore dandum[2] tanquam prima libamenta tirocinii Heliconiadum mearum, ut ejus scriptis exstaret aliqua notata memoria, qua pubes succensa post esset hostibus saevior ac horridior, intumescens amore laudis patriae. Qui eventus licet non ad amussim depromptus erit, quoniam illum aetas jam fere oblitteraverat obruta vetustate saeculi, attamen ne tam celebre facinus caliginosa taciturnitate, tum desidia vatum ac Pieriis tonis impolitum et non deglabratum aboleret[3], partim ex inventis codicum, parum[4] ex scriptis chronicorum, partim ex famae celebris memoria, qua tota Polonia redimita tumet in unum congessi[5], faustiter, quippe sub tanto principe, cujus numine tot insignes triumphos de hostibus partos oculata fideomnes attigimus, tum ex speciali Dei opificis summi maximi providentia, qui dignatus est me inter tot curas aerumnarum mearum hujus insignis victoriae libellique auctorem reddere. Quem Sigismundo, regi Sarmaciae Europae invictissimo, tandem patriae Polonae (cujus alumnum me fore profiteor) loco encenii[6] sinceriter dicavi. Et merito, quoniam id a summis eruditissimisque viris compertum habeo, opera et opuscula, e rivis Musarum perpeti lepore scatentibus comiter et affabre decorata, cuipiam regis, ducis vel senatus honori attribui. Sectatus et ego talia, licet exilis ingenioli vena fultus,

suffragio tamen virtutis tuae, vir celeberrime, tutus, cui imprimis libellum nostrum legendum vel, si quibus fuerit mendis infectus, corrigendum tradidi tanquam illi, cui labra totius encyclopaediae abundanti rivo perluta sunt, qui jam vulgatiori fama virtute, ingenio apud omnes conspicuus haberis ac omnigeno oris boatu multiscius censeris. Quod[7] talia opera, titulis regum ducumque insignita, sunt ubique eorum potentatu et gratia munita, ac auctoritatem adversus invidos subsannatores prae se ferentia, acsi parmam loco tutelae versus spicula. Decenter quidem, quam id omni in re probatum est: quae reges et proceres laudant, tollunt, tutantur, ea etiam a plebecula tolli, tum venerari; quamvis me haud latet obtrectatorum latrantes rictus vix evadere posse, quin operi laboris nostri non detrahant, dum hoc jam satis vulgatum et certum sit, quaecunque mortali cura aguntur, illa vel publicae vel privatae calumniae subjecta fore. Attamen hic labor, quamvis Zoilorum, ut ita dicam, reprehensionibus sedulo premetur et discruciabitur, hanc molestiam una ratione superare potuisset, si nunquam fabricatus vel in lucem datus esset. Ego vero non invitis nec malevolis ista conscripsi, sed his, quibus amor patriae laudis cordi est, identidem mecum reputans subsannatorum oblatrationes nil esse, nec eorum infrenam linguam cuipiam voto subici posse, et si egis[8] loco scuti adversus foret, approbante illo satirico[9]: velle suum cuique est, nec voto vivitur uno[10]. Sed sunto: qui id agent, palinodiam a nobis Archilochi sono fetam properiter experientur[11].

Шаноўнаму і славутаму мужу, магістру Кракаўскага універсітэта ПАЎЛУ КРОСНЕНСКАМУ,

сябру паэтычнай суполкі і паважанаму настаўніку,
Ян Вісліцкі [жадае] здароўя і шчасця

Яшчэ не вычарпаўшы да дна ўсе шматлікія турботы маёй цяжкай працы, нібы капітан карабля, што нясецца па хвалях вірлівага мора воляю звар'яцелага Эўра, пакутуючы ў цяжкіх душэўных разважаннях аб няшчаснай пераменлівасці Фартуны, – я імкнуўся за спачынкам да Геліканід, найпрывабнейшых кармініц, нібыта да найбольш надзейнага сховішча. О высокаадукаваны муж! Я радаваўся ім, пакуль яшчэ быў малады, і, уражаны сугуччам іх славутых нашчадкаў, аслеплены найяснейшым ззяннем невыразнай славы, крыху перавёў дух, затрыманы іх вывучэннем, ды захаваў у душы вешчуноў і іх паслядоўнікаў, якія дасягнулі вышэйшых ступеняў майстэрства. Нясмелы і нявопытны, трымаючы шлях зводдаль ад іх слядоў, разважаючы пра тую славуцейшую перамогу, якую палякі атрымалі над германцамі ў межах Прусіі з дапамогаю Марса, я ўзяўся падрабязна абдумваць у сэрцы адметны вынік яе. Ён, варты большай славы, магчыма, мог бы быць дасканала апісаны большым пяром, – [але ж] я, народжаны ў самым амаль што цэнтры далёкага краю, не настолькі добра напоены з крыніцы Аянід, з усіх маіх пільных намаганняў ясна даў зразумець, што вынік [маёй] бяссоннай працы павінен будзе з'явіцца як першыя спробы першых крокаў маіх Геліканід, – каб з апісаннем яе[1] з'явілася якая-небудзь занатаваная памяць, якая б нават па прашэсці часу палымнела для ворагаў яшчэ больш сурова і жорстка, мацуючыся імкненнем да славы Радзімы.

Гэтая падзея, магчыма, будзе асветлена не дэталёва, бо час ужо амаль сцёр яе, засыпаўшы даўніною стагоддзя. Аднак жа, каб гэткі славуты подзвіг, не ўпрыгожаны піэрыйскімі гукамі і зусім не выяўлены, не загінуў з прычыны змрочнага маўчання, дый проста з прычыны бяздзейнасці паэтаў, – я сабраў усё ў адно: часткова з таго, што знайшоў у кнігах, крыху з твораў храністаў, часткова з пагалоскі і ўспамінаў пра тыя славутыя падзеі, якімі наўкола ахоплена ўся Польшча, прычым сабраў даволі шчасліва, зразумела, пры такім натхняльніку, па волі якога мы ўсе дакранаемся з відавочным даверам да той бліскучай перамогі над ворагамі, якая была дасягнута тады з асо-

бага найвышэйшага наканавання Бога-Стваральніка, які ўганараваў мяне за мае клопаты ў такой цяжкай працы стаць аўтарам кнігі пра гэтую бліскучую перамогу.

Я прысвяціў яе[2] шчыра Жыгімонту, непераможнаму каралю Еўрапейскай Сарматыі, а таксама Польскай айчыны, гадаванцам якой я сябе прызнаю, у якасці энкомія[3]. Бо так прынята (і пра гэты звычай я даведаўся ад лепшых і адукаванейшых людзей), што вялікія і маленькія творы, прыхільна і вытанчана ўпрыгожаныя багатымі на бесперапыннае харство крыніцамі Муз, так ці інакш ахвяруюцца ў гонар караля, уладара або сената. І я таксама імкнуся да гэтага, няхай нават умацаваны нязначнай жылкай даравання, аднак жа абаронены ўхваленнем ад твайго таленту, о, славуцейшы муж. Перадаю найперш табе нашу кнігу для прачытання або, калі былі зроблены нейкія памылкі, для выпраўлення, – табе, чые вусны абмытыя паўнаводным ручаём цэлай энцыклапедыі, хто паўсюдна высока ўслаўляецца за свой талент і здольнасці і адзінагалосна лічыцца вельмі дасведчаным чалавекам.

Паколькі падобныя творы, адзначаныя слаўным імем каралёў або князёў, абаронены ўсюды іх вышэйшай уладай і літасцю, іх аўтарытэт супрацьстаіць зайздроснікам і насмешнікам, падобна таму, як парма служыць абаронаю ад стрэл. Звыш таго, гэта настолькі прыстойна, што так прынята ў любой справе: тое, што ўсхваляюць, узносяць і апякаюць каралі і магнаты, узносіцца і нават ушаноўваецца простым людам. Аднак, як бы гэта мяне ні ахоўвала, мне ледзь удаецца выратавацца ад брахлівых пашчаў зайздроснікаў, што ганяць твор нашай працы; да таго часу, пакуль ён яшчэ дастаткова будзе распаўсюджаны і вядомы, хто-небудзь са смяротных будзе апантаны імкненнем да таго, каб узвесці на яго публічны або прыватны паклёп.

Усё ж такі гэты твор, колькі б ён, так сказаць, наўмысна ні прыніжаўся, колькі б ні цярпеў ад ганьбаванняў заілаў, змог бы пераадолець гэты цяжар толькі адным чынам: калі б ніколі не быў створаны і апублікаваны. Я ж, безумоўна, напісаў гэта не для непрыхільных і варожых, а для тых, хто мае ў сэрцы любоў да славы Айчыны, і я ўвесь час разважаю сам-насам, што лаянка насмешнікаў – нішто, што іх неўтаймаваны язык так ці інакш можа атрымаць адпор пры жаданні, калі эгіда будзе выстаўлена замест шчыта, пацвярджаючы вядомыя словы сатырыка: хацець чагосьці ўласціва кожнаму, ды аднаго жадання мала. Але няхай будзе так: тыя, хто гэта чыняць, у хуткім часе пакаштуюць ад нас палінодыю, роднасную гукам Архілоха[4].

Argumenta libellorum Belli Pruteni

ARGUMENTUM

primi:

Primus subsidium narrat post thema vocatum
Christiparae, tandem[1] terrae vicina polonae
Jugera et armigeri praeconia candida Gracchi[2],
Formosae crudelia detestandaque Vandae
Funera, Thymbraei monitus, suadentia necnon
Dicta super regum meditanti stirpe Polonum[3].

secundi:

Alter habet Lituos[4] silvoso limite saeptos;
Hic genus infreni Jagellonis edocet altum,
Ac Mariae fratrum Syriae Ptolemaidis urbe
Adventum memorans dicit crudelia bella.

tertii:

Tertius altitonanta[5] refert super aethere celso
Consultasse deos de cani conjuge regis
Ac Jagellonis nitida de stirpe sequaci[6].
Eligitur divum concordi voce Ruthena,
Nupta viro fatis reges paritura beatis.
Dente secans aequor rapuit tandem ancora fundum.

Ode Tricolos tetrastrophos

LECTORI

Terterna praesunt cui pia numina[1]
Nec non canori dexter Apollinis
Furor diserto pectus oestro et
Cantibus altiloquis adornat,
Aut Martis acri[2] quos juvat horridus
Cruor[3], relucens vel patriae decus,
Insignia aut clari triumphi,
Aut veteris monumenta belli:
Famae perennis nomina candida

АРГУМЕНТЫ[1] КНІГ “ПРУСКАЙ ВАЙНЫ”
АРГУМЕНТ

першай кнігі:

Першая кніга за тэмаю следам малітву змяшчае
Панне Марыі, пасля блізкія польскай зямлі
Землі апісвае, Крака[2] ўслаўляе, прыгожую Ванду,
Кажа пра гібель яе, вартую скрушлівых слёз,
Потым прамову Тымбрэйца змяшчае, нарэшце – развагі,
Як радавод каралёў польскіх ярчэй паказаць.

(Аргумент) другой кнігі:

Кніга другая пакажа літоўцаў з лясістага краю –
Слаўны народ той, адкуль мужны Ягайла пайшоў;
З горада Пталемаіды Сірыйскай згадаўшы нашэсце
Браццяў Марыі, яна кажа пра войны далей.

(Аргумент) трэцяй кнігі:

Трэцяя кніга – пра тое, як грозны Юпітэр з багамі
Раіўся ў небе, каго ў жонкі аддаць каралю
(Раіўся шчэ й пра нашчадка Ягайлы, славутага вельмі) –
Панну-русінку багі дружна абралі яму.
Лёсам прызначана ёй каралёў нарадзіць для дзяржавы.
...Якар, рассёкшы ваду, дно вастрыём зачапіў.

ОДА ЧЫТАЧУ[1]

Каго вядуць багіні свяшчэнныя[2],
Каму цудоўны спеў Апалонавы
Душу ўпрыгожвае натхненнем
І красамоўным сваім запалам,
Каго так вабіць Марса крывавы бой,
Айчыннай славы ззянне бясконцае
Ці веліч дзіўнай перамогі,
Памяць яшчэ аб вайне мінулай, –
Хай знойдзе тут імёнаў бліскучых шмат,

Legat vetustae ac carmina gloriae,
Fortis Poloni tum decora
Stemmata militiae cruentae,
Virtute pessum quae data Prussiae
Tulit superbae signa potentiae,
Vincens cohortes atque turmas
Martis et insidias severi.
Quae prisca vatum non sonuit chelys,
Quae docta patrum non retulit cohors,
Doctis camenis nec libellis
Nec titulis decoravit altis
Famae celebris tam rutilum decus,
Quo tota candet bella Polonia
Inter feroces et potentes
Oceani dominos solique.
Haec nostra laeto carmine barbitos
Sonabit oris faustiter omnibus,
Famae decus virentis almum
Jam patrio renovabit orbi.
Quae nostra fundet gutture Musula
Donando laudi carmina patriae,
Precor benigna mente parvi
Lector opus legito

Высокай даўняй славы магутны спеў,
Вянкі магутнага паляка
За перамогу ў крывавай бітве,
Якія ён прыдбаў, а знамёны ўсе
Пыхлівых прусаў кінуў пад ногі ім,
Атрады іх, харугвы знішчыў
Дый шчэ засады ліхога Марса.
Ні ліра вершапісцаў былых часоў,
Ні шэраг вельмі мудрых сівых айцоў
Не ўзнеслі ў найвышэйшых словах
Кніжак сваіх і вучоных твораў
Высокі гонар славы бясконцай той,
Якой заззяла мілая Польшча ўся
Сярод магутных, ваяўнічых
Уладароў акіяна й сушы.
А наш барбіт з цудоўнаю песняю
Няхай гучыць шчасліва па ўсёй зямлі
І ў краі родным уваскрэсіць
Гонар вялікі нязгаснай славы.
І Муза наша будзе цяпер спяваць,
Уславіць гучнай песняй айчынны край.
Прымі ж, чытач, з прыхільным сэрцам
Твор гэтай кніжкі маёй маленькай.

Ad Serenissimum Principem ac Dominum
Dominum Sigismundum Dei gratia Regem Poloniae,
Magnum ducem Lithuaniae,
Russiae Prussiaeque dominum et heredem etc.

BELLI PRUTENI TRES LIBELLI

per Joannem Visliciensem editi
anno virginei partus 1515

<Libellus primus>

Felix astrigeri veniens de cardine mundi
Fama trucis nimium, Rex invictissime, belli
Sanguineo reboat multum madefacta triumpho
Fortis avi tollendo tui ad fastigia caeli
Gesta, quibus renitens extremas candet ad oras
Oceani, unde jubar rutilum sol aureus ortu
Elicit atque suis primum exsplendicat[1] Indis,
Aut Phaëtontis ubi marcescunt usta caballis
Jugera harenosi plangentia funera[2] Nili,
Aut ubi Riphaeis cerealia culta pruinis
Laesa jacent incurvis nec sunt falcibus apta,
Vel pedibus gestans ubi dura repagula lassis
Gramina detondet spatiosi litoris Aethon,
Hesperii rapidis latitat dum Phoebus in undis.
Ille Stentoreo recinuntur facta boatu
Et decus immortalis avi famatur ad astra,
Quo superat fortes heroas, numina prisci
Orbis, et athletas, saevissima fulmina Martis,
Scipiades, Decios Eteoclis et arma protervi,
Quos quondam Romana tulit Thebanaque tellus.
Tanta tui jacuit caligine mersa nigranti
Fama celebris avi, quam saecula cana ferebant,
Sicut erythraeis carchedoniisque lapillis
Pectora comiter in fulvo redimita metallo
Aedibus et fanis radiabant clara priorum,
Bellica quis fuerat vel Pallados aurea virtus,
Turba senescentum coluit quam valde et ephebum
Plura relinquendo virtutibus acta refertis[3]

Найсвятлейшаму Уладару і Пану,
Пану Жыгімонту, з Божай ласкі каралю Польшчы,
Вялікаму князю Літоўскаму, гаспадару
і спадкаемцу Русі і Прусіі і г. д.

ПРУСКАЯ ВАЙНА

ў трох кнігах, якія складзены
Янам Вісліцкім у год I5I5 ад нараджэння Хрыстовага[1]

<Кніга першая>

Слаўная чутка, прыйшоўшы ад зорнага полюса свету,
О, неадольны кароль, пра надзвычай суровую бітву
Гучна з крывавым трыумфам азвалася, каб узвялічыць
Подзвігі мужнага продка[2] твайго аж да самых нябёсаў.
Ззяючы імі паўсюдна, ляціць тая шчасная чутка
Да акіянскіх ускрайкаў – туды, дзе румянае сонца
Промні вымае з вады і найперш асвятляе індусаў;
Потым туды, дзе каней Фаэтона агністыя вёрсты
Нікнуць ля Ніла пясчанага – там, дзе аплакваюць мёртвых;
Потым туды, дзе раскінуўся ўзрошчаны хлеб, сапсаваны
Снегам рыфейскім і ўжо для крывога сярпа непрыдатны;
Можа, й туды, дзе, стамлёны ад цяжкіх шляхоў, перашкодаў,
Пасвіцца на берагах травяністых Этон хутканогі,
Покуль на захадзе ў хвалі імклівыя Феб не знікае.
Воклічам Стэнтара подзвігі тыя ў вяках адгукнуцца,
Слава бяссмертнага продка твайго даляціць аж да зораў:
Сам ён вышэй за герояў і волатаў даўняга часу,
Спрытных атлетаў і Марсавых вояў жахлівых, вышэй ён
За Сцыпіёнаў і Дэцыяў, за Этэоклава войска –
Тых, каго некалі Рым або Фівы на свет спарадзілі.
Чутка пра слаўнага продка знікаць пачала паступова,
Нібы ў тумане, аднак яе неслі сівыя стагоддзі,
Быццам даспехі герояў, што, жоўта-чырвоным металам
Аблямаваныя, перламі з Індыі і з Карфагена,
Ззяюць у храмах святых, палымнеюць стракатым убраннем.
Многа людзей састарэлых і юных надзвычай высока
Тых ушаноўваюць, з кім была доблесць адважнай Палады,
Каб захаваць гэты ўзор непахіснасці ў справах ваенных,

Hoc virtutis opus, summum hoc exemplar honorum,
Claram post letum famam dare posteritati,
Stirps tua quam tribuit, regum fortissime, sacra
Candida[4] per pelagi vates per tot labentia lustra
Obticuere libris, vitreis nec Phocidos undis
Pieriave chely decorarunt Delio et oestro
Egregium facinus reticendo propaginis altae,
Martia quo possit laetari Roma, superbis
Regibus et ducibus totum famata per orbem,
Pulchraque Sidoniae Carthago potentis Elissae
Atque Aegyptiacis Memphis populosa sub oris.
Quem renovare velim, licet agmina prisca dearum
Per duo Parnasi deducta cacumina collis
Fessa silent, nervis Thymbraeus et ipse diserto
Non favet ore, et Pegasides ad carmina pigrae
Prosiliunt, oblitae ingentia facta potentis
Regis dicere et augustum renovare triumphum,
Quem tulit auspiciis hostes superando secundis,
Hostes Sarmatico Prutenos nomini acerbos
Auxilia et Germanorum validissima regum,
Proh inimica tuis, rex, quae generosis Polonis[5]
Exstiterant, sed bellaci jam lassa quiescunt
Dextera et aetherei tutamine victa Tonantis
Praesidioque tuo, Praesul dignissime, sacro[6],
Quorum nunc suspensa tholis vexilla beatis
Ipse tenes putri nutantia sanguine tincta.
Eripuit saevo quae de certamine saevis
Hostibus armigero Prutenis Marte subactis
Bellica fortis avi virtus, Sismunde, tuique
Praevalida patris generosi dextera clade,
Quae longos duravit non defessa per annos.
Haud secus adversus Romana potentia Poenos,
Dum[7] viguit bello per saecula longa cruento,
Insignes donec pulchrae Carthaginis arces
Erueret, victis et leges sola pararet:[8]
Sic fera Sarmatica pessumdata Prussia dextra
Viribus extenuata suis tua jussa capessit,
Sub juga colla ferendo Polonis sedulo paret

Вартыя памяці подзвігі, годнасці прыклад дастойны,
Каб пасля смерці іх неслі нашчадкі далей тую чутку,
Што пачалася ад слаўнага продка твайго, валадару,
І паляцела праз землі і хвалі бясконцага мора.
Доўга пра тыя падзеі маўчалі старыя паэты
Ў кнігах сваіх, не хацелі празрыстай крыніцай Фацыды
Ці паэтычнаю лірай уславіць з дэлоскім натхненнем
Подзвіг дастойны з прычыны маўчання іх продкаў далёкіх.
Подзвігам гэткім між тым ганарыўся б і Рым ваяўнічы,
Што ўвекавечаны славай цароў і князёў гераічных,
І Карфаген непахісны сідонскі магутнай Элізы,
Мемфіс таксама шматлюдны, што ў межах зямлі егіпцянаў.
Славу хачу аднавіць – хай маўчаць старажытныя сонмы
Вечных багінь, што жывуць між вяршыняў сівога Парнаса,
Нават Тымбрэец не мкнецца да струнаў з лагодным напевам,
Дый Пегасіды бяруцца за песні нядбайна, забыўшы
Скласці аповед пра дзеі таго караля і ўваскрэсіць
Гучны трыумф, што прынёс ён, калі атрымаў прадказанне
Пра перамогу над прусамі – жорсткім, бязлітасным войскам,
Войскам надзвычай варожым да цэлага роду сарматаў,
З імі – харугвы германскіх князёў, што таксама ўзняліся
Супраць палякаў тваіх, о кароль, радавітых і годных,
Толькі спачылі цяпер, ваяўнічыя, іх перамог ты
Моцнай дзясніцай сваёй пры падтрымцы Найвышняга Бога
І пры святой дапамозе тваёй, о, патрон найяснейшы[3]:
У браславёным касцёле вісяць у твой гонар штандары[4]
Войска варожага, мутнай крывёю залітыя ў бітве.
Тыя штандары ў суровым баі ратавала ад прусаў,
Ворагаў дзікіх і лютых, прыведзеных Марсам крывавым,
І ад навалы, што доўжылася шмат гадоў несупынна,
Доблесць ваенная продка твайго, Жыгімонце, а з ёю
Моцная ў бітве дзясніца твайго санавітага бацькі[5].
Некалі Рым наймагутнейшы гэтак жа знішчыў пунійцаў,
Вечную славу прыдбаўшы сабе на вайне той крывавай,
У Карфагене прыгожым збурыўшы высокія вежы,
Для пераможаных тут жа свае ўсталяваўшы законы.
Так вось і Прусія знішчана моцнай сармацкай дзясніцай
І, абнясілеўшы, прагна тваіх пастановаў чакае;
Шыі свае пад ярмо падстаўляючы, польскім законам

Legibus et regem proprium vocat illa patronum,
Cujus legitimo moderaris jugera sceptro.
Sanguine diffuso per multos parta decembres
Istula quo rubuit vitreo pulcherrimus amne
Scuta ducum geleasque virum sub Doridos[9] alvum
Volvendo putri foedabat et aequora tabo[10]:
Haud secus Iliacis discurrens Xanthus in arvis
Totius Europae atque Asiae fortissima regum
Helles vicino mergebat corpora Ponto
Ledaeae ob noxam tam turpi caede necata.
Hoc scelus antiquum; belli causas sed iniquas
Ipse stupesco, feri nec non certamina Martis
Funditus atque tuam populos evertere gentem
Juratos, quibus unanimo praestantia Rheni
Auxilia affuerant, borealia, cymbrica necnon
Conscia crudelis sceleris, Phrygiam velut omnem
Cum debellatura ibat fera turba Pelasgum
Aulide jurando Priameia perdere regna.
Perfida sic voluit germanae contio plebis
Signa Polonorum delere nitentia regum
Et genus exstirpare sacrum, tum legibus artis
Culta tenere soli, belli moderamine parta.
Immensum cujus pelagus mea cymba secare
Gestit et aeoliis audet se credere ventis
Expers remigii, Neptune, tuis mea lymphis
Vela dabo laetus, conscendens Tiphys in aequor;
Auxiliumque tuum supplex orabo benignum:
O Virgo, nitidi clarissima janua caeli[11]
Ac vatum manans indeficiensque fluentum,
Propitia[12] adesto, precor, candenti fronte coruscans,
Omnibus inceptis radians, velut Hesperus atra
Nocte solet, tumidum nautis resecantibus aequor.
Nam tua praesidio semper sunt numina magno;
Seu pelago seu crudeli sint marte vocata,
Perpetuo miseris larga pietate nitescunt
Auxilium tribuendo pium mortalibus actis.
Subvenias operi, mater castissima, nostro,

Стала пакорнай цяпер, караля называе патронам –
Сёння ў дзяржаве яго ты кіруеш законнай уладай.
Вісла цудоўная, ў водах глыбокіх схаваўшы навечна
Княжацкіх мноства шчытоў і воінскіх шлемаў, крывёю
Поўніла воды свае, бегучы ва ўлонне Дарыды,
Хвалі празрыстага мора фарбуючы гнойнаю жыжай.
Так, не іначай, і Ксанф, што цячэ па палях іліёнскіх,
Мноства магутнейшых вояў з Еўропы і Азіі цэлай,
Тых, што загінулі ў бітве, у водах тапіў Гелеспонта, –
Леды дачка бессаромная гэтаму стала прычынай.
Гэта злачынства мінуўшчыны; я ж разважаю, што часта
Войны грымяць бессэнсоўна, дзіўлюся, чаму так упарта
Сталі да Марсавай звады імкнуцца народы, у змову
Супраць дзяржавы тваёй уступіўшы, між імі – дружына
Рэйнцаў адборных, а з імі – саюзнікі ў страшным злачынстве:
Раці паўночнага племя, таксама – цымбрыйцы, нібыта
Фрыгія ўся, у Аўлідзе ў змову ўступіўшы з суровым
Войскам пеласгаў, пайшла, зруйнаваць каб Прыамава царства.
Так спадзяваўся той сход вераломны германскага люду
Знішчыць кляйноты славутыя польскіх усіх самадзержцаў,
Род іх святы скасаваць, насадзіўшы ліхія законы,
І авалодаць стырном той вайны, каб сабе падначаліць.
Цымба мая выпраўляецца сёння ў бясконцае мора,
Вёслаў не маючы, і эалійскім вятрам хуткакрылым
Хоча даверыцца; я аддаю свае ветразі водам
Бурным тваім, о, Няптун, і, як Тыфіс, кіруюся ў мора;
Шчыра ўскладаю малітву сваю аб прыхільнай падтрымцы:
Панна Марыя, ты чыстага неба цудоўны пачатак,
А для паэтаў убогіх натхнення струмень невычэрпны!
Будзь літасцівай, прашу, да мяне, сваім светлым абліччам
Ззяючы, нібыта Геспер у цемры начной, для нясталых
Тых маракоў, што імкнуцца стрымаць бурапеннае мора.
Воля святая твая становіцца моцнай падтрымкай:
Кліча ў марскую прастору ці ў бітву крывавага Марса –
Шчодра квітнее яна міласэрнасцю вечнай і дорыць
Шчыра сваю дапамогу смяротным слабым у іх дзеях.
Дапамажы ж ты і нашаму твору, Найчыстая Маці,

Te precor, insuetis protendas jam mea ventis
Carbasa et undivagae tuteris rostra carinae,
Incolumis donec placidis superaverit austris
Omnia Tyrrheni Siculique pericula ponti,
Et superans tandem optata consistat arena.
Terra sub arctoa famata Lycaonis ursa[13]
Immensum complexa orbis spatium imperiumque
Nomine multijugas renitenti terminat oras.
Sarmatiam titulo veteri rudis accola dixit,
Quae proprium merito sortita Polonia nomen[14].
Nam sua sic dicti patrio sermone Poloni
Rura tenent, agrosque colunt, ac legibus urbes
Perdomitant, Sigismunde, tuo diademate clari.
Qui jam corruerant, sacri sed numine regis
Clarescunt tot victis hostibus atque fugatis.
Cujus habent triplices vastissima culta Rutheni[15]
Donec ad Euxini Nomadas pelagi Mysosque
Ac Tanaiam protensa et ad aequora lata Livonum.
At qui prata secant Garamantum versus ad austrum,
Ardua Carpathiae speculantes culmina rupis,
Pannonios retinent vicino limite campos;
Hesperias Gades et Atlantis jugera collis
Qui spectant Zephyri necnon mitissima venti
Flamina contingunt, revirentes limine sulcos,
Odera quos renovas spatiosi gurgitis amne;
Qui vero degunt Riphaeo murmure saepti,
Tunduntur[16] Scythicis nivibus gelidisque pruinis.
Effera gens, nimium trucibus repleta colonis,
Masoviae, Prussis contermina quaeque superbis
Adjacet, utraque Marte sato est subjecto Polono,
Qui gentes varias valida ditione coërcet
Jam linguis habitu discretas Martis et armis.
Quorum Lech fuerat moderator primus et auctor[17],
Insignis tandem Gracchus celeberrimus alter,
Vir sermone potens ac miles maximus acri
Martis, et eximii ingenii virtute decorus,
Tum populi fidus sceptrique solique patronus.

І правядзі мае ветразі праз нечаканыя штормы,
Ростру майго карабля, што па хвалях імклівых нясецца,
Абарані, каб прайшоў ён шчасліва праз бурныя воды
Мора Тырэнскага і Сіцылійскага з лёгкім павевам
Аўстра лагоднага і напаткаў свой жаданы прыстанак.
Слаўная тая зямля пад мядзведзіцаю Лікаонскай,
Што ахапіла прастору бязмежную і валадарства,
Многія землі ў сабе замыкае з адрозным найменнем.
Тытул даўнейшы – Сарматыя – даў ёй сусед, бо не ведаў:
Лёсам прызначана ёй па заслугах Палоніяй звацца.
Люд, што сябе на мове спрадвечнай палякамі кліча,
Тут свае нівы абходзіць, і шмат гарадоў знакамітых
Служаць кароне тваёй і законам тваім, Жыгімонце!
Тыя, каго ўжо няма, каралеўскаю воляй святою
Славу сабе здабылі, перамогшы варожыя раці.
Тут распасцерліся землі траякіх русінаў[6], якія
Аж да намадаў і мызаў на Понце Эўксінскім сягаюць,
Да Танаіса, яшчэ да шырокіх прастораў лівонцаў;
Тут жа і тыя, што косяць лугі ў паўднёвым напрамку
Ад гарамантаў і бачаць крутыя вяршыні Карпатаў,
Ну, а ў заходнім напрамку з Панонскай краінай мяжуюць;
Тыя, што бачаць на захадзе Гадэс і горы Атланта
І адчуваюць павевы пяшчотныя ветра Зефіра:
Там валадараць яны на квітнеючых нівах, якія
Ты адраджаеш штогод паўнаводдзем ракі шумнацечнай;
Тыя яшчэ, што гамоняць сапраўднай рыфейскай гаворкай
Там, дзе лютуе мароз паміж скіфскіх снягоў неаглядных.
Дзікае племя Мазовіі, людзі суровыя вельмі,
Побач жылі з ганарыстымі прусамі. Тыя й другія
Марсавай сілай былі падначалены польскаму роду –
Ён жа магутнай уладай народамі правіў, што мелі
Розныя мовы і норавы, розныя войскі і зброю.
Лех быў стваральнікам і ўладаром самым першым краіны,
Следам за ім – найславуцейшы Крак, знакаміты і годны,
Быў красамоўцам сапраўдным дый воінам мужным таксама
Грознага Марса, ўпрыгожаны талентам непараўнальным,
Шчыра адданы патрон свайго краю, народа і ўлады.

Regni jam diadema sui protendit in altum,
Oppida confinum domitando superba colonum
Armigeri tonitru Martis bellique tumultu:
Ille velut Macedo, totum qui vicerat orbem,
Aut veterum fama illustris Tirynthius ipse,
Ob sua praestanti rutilantia nomine facta
Qui divi nomen meruit post fata sacrati.
Urbibus et populis tot victis atque subactis
Condidit aeterna vernantia stemmata laude,
Omnibus indigenis patrios tutantibus agros
Urbem praeclaram statuens regumque futuram
Sedem, Graccoviam Gracci de nomine dictam[18],
Hic, ubi spumosis perlustrat fluctibus arva
Hercynii nemoris, cerealia cultaque vasto
Amfractu lambit, patriis adiutus ab undis
Multijugis celebris reboanti Vistula tractu.
Quae canit alta Perictonii[19] monumenta Platonis
Thespiadum, caelique meatus illa corusci
Indicat assiduo resonanti murmure vatum,
Pulchra, velut Danaas multum famata per oras
Attica, quae doctis olim fulgebat Athenis,
Vel regio Latiis Graisque decora figuris
Itala, facundis renitens doctisque patronis.
Cujus servat humus cineres sub colle sepultos[20],
Vertice sublimi Libycum qui prospicit austrum
Sub tectis, Casimire, tuis ac moenibus altis.
Clarus in omnigeno mundi qui climate nata
Exstitit, egregius post effera fata superstes,
Haec quia virgineo moderamine patria rexit
Jugera, centenos celebris regina per annos,
Finitimos domitans populos crudelibus armis
Et juga celsa vagoque errantia flumina cursu,
Optima Vanda virago, maris virtute decora,
Marcia Volscorum virgo velut ipsa Camilla,
Quae Latiis Anchisiaden certamine in arvis
Pugnantem bello turbabat saepe cruento,
Aut Tomyris Scythici moderatrix bellica mundi,
Milia quae Cyri prostravit multa tyranni.

Вельмі высока узнёс ён сваю каралеўскую годнасць,
Бо захапіў гарады непадступныя блізкіх народаў
З грукатам Марсавай зброі, сярод навальніцы ваеннай:
Як Македонец, які ўсе краіны сабе падначаліў,
Ці Тырынфіец магутны, славутасць часоў старажытных,
Што ўшанаванне святое сабе заслужыў пасля смерці,
Ззяючы славай высокай за дзейнасць сваю для дзяржавы.
Ён гарады штурмаваў і народы сабе падначальваў –
Гэтым навечна здабыў ганаровы вянок неўвядальны,
Для суайчыннікаў мужных – Радзімы сваёй абаронцаў –
Горад цудоўны стварыўшы, што стане сталіцай дзяржавы,
Кракавам горад назваў ад імя свайго Крак, збудаваўшы
Там, дзе разлёгся шырокі прастор Герцынійскага лесу[7],
Што дакранаецца выгібам доўгім да плодных палеткаў;
Выгіб жа той утварыўся адно з дапамогай цячэння
Віслы шырокай, якая шуміць мнагаводнаю плынню.
Кракаў высока шануе адвечныя творы Платона[8],
Блізкага да Тэспіядаў: на іх нам указвае неба,
Што адгукаецца ўздоўж галасамі руплівых паэтаў.
Горад цудоўны, як Атыка, слаўная ў цэлым сусвеце,
Тая, што ззяла калісьці вучонасцю мудрых Афінаў,
Ці як Італія, слаўная грэцкай і рымскай скульптурай,
Што зіхацела вучонасцю і красамоўствам патронаў.
Краку магілаю служыць зямля пад высокім курганам,
Што верхавінай сваёй пазірае на поўдзень Лівійскі.
За гарадскою сцяною ў тваіх, Казімір, уладаннях
Крак узвялічаны быў у шматлікіх краінах дачкою,
Хай ён узвысіцца славай яе пасля смерці жахлівай,
Бо валадарыла спраўна дзявочай рукою ў Айчыне
Тая, што стала славутай на сотні гадоў каралевай.
Землі суседніх народаў сабе здабывала ў крывавых
Войнах, таксама і горы, і рэкі з імклівым цячэннем
Годная, слаўная Ванда з мужчынскаю доблесцю ў сэрцы,
Ты да адважнай Камілы падобная з племені вольскаў,
Што турбавала нярэдка сваім ваяўнічым нападам
Анхізіяда, які ваяваў тады ў землях лацінаў;
Ці да царыцы Таміры, ваяркі са Скіфскага краю,
Той, што пазнішчыла многія тысячы Кіравай раці.

Jam populis et agris tot victis atque subactis
Occubuit tandem misero ipsa miserrima leto.
Cujus non meminisse juvat crudelia fata
Atque hilarem maesto patratum fine triumphum.
Virginis ardor erat vestalem ducere vitam
Ac steriles sine prole dies, nec solvere ceston[21]
Virgineum, sacro redimitum flore pudoris.
Hujus (sic perhibent) thalamos hymenaeaque jura
Martis ad horrendi stimulos et fulmina belli
Dum voluit princeps germano sanguine cretus,
Aspernata virum taedasque perosa jugales
Indicat arma proco, pro taedis illa sagittas
Dirigit, indignata viro movet horrida bella;
Praepetibus fatis Germanum virgo maritum
Vincit et egregiam potitur de strage corollam,
De veterum ritu daphnea fronde decoram.
Sed nimium infelix virgo, e certamine tanto
Dementata truci quoniam vel religione
Numine vel seducta dei, velut impia Sappho,
Leucadio cujus recubant submersa profundo
Pectora. Taenarium secum passura calorem
Nam sua flucticolis simili praecordia nymphis
Morte dedit saliens animosa mente sub undas,
Istula flave, tuas, ubi gurgite moenia rauco
Dividis urbis ab urbe ducis regisque superbi.
Sic misero occubuit regina miserrima leto.
Cujus funereos artus et tristia membra
Indigenae populi tollunt de fluctibus atris;
Immortale decus dominae titulumque perennem
Constituunt, tumulum facientes vertice celsum,
Qui fovet usque modo aeternumque sepulta fovebit
Gracchigenae celebris praecordia casta puellae[22],
Hic ubi splendescunt clarae pulcherrima Tumbae
Moenia, frondiferis multum revirentia silvis
Necnon perspicuis laticum decorata fluentis.
Luctifero interitu stirpem sic terminat altam,
Gracche, tuam, Gracchorum tum genus omne tuorum.
Ac[23] nunc, Fama vetus, cujus meminisse potestas

Ты авалодала многімі землямі розных народаў,
Ды, нешчаслівая, раптам жахлівую смерць напаткала.
Мусім успомніць і мы пра яе недарэчную гібель,
Пра найвышэйшы таксама трыумф пры журботным зыходзе.
Марыла Ванда правесці жыццё, як вясталка, цнатліва,
Каб у дзявоцтве ніякага плоду не мець, не развязваць
Пояс Венеры, спавіты святой чысціні прыгажосцю.
Кажуць, што нейкі ўладар, спадкаемец германскага роду[9],
Сам загадаў выбіраць ёй: ці шлюб і вянкі Гіменея,
Ці недарэчнасці Марса, пакуты ваеннай навалы.
Ванда з нянавісцю шлюбны саюз адвяргае і ў бітву
Войска кіруе сваё; не паходні вясельныя – стрэлы
Шле жаніху, выклікае яго на крывавую сечу.
Воляй шчаслівага лёсу адолела дзева германца
І атрымала за бітву вянок ганаровы, што лісцем
Лаўравым быў упрыгожаны згодна з традыцыяй продкаў.
Ды нешчаслівы быў лёс той дзяўчыны: з-за бітвы крывавай
Страціла розум яна, адступіла ад Боскае волі
І ад яго бласлаўлення, падобна Сафо ліхадзейнай,
Цела якой, патануўшы, у водах ляжыць леўкадзійскіх,
Апанаваная, як і яна, тэнарыйскай гарачкай,
Ванда падобную смерць прыняла, аддала сваё цела
Німфам марскім, калі скочыла з мужнасцю ў сэрцы,
Істула, ў хвалі твае, дзе бурлівым магутным патокам
Князевы ты аддзяляеш муры ад муроў каралеўскіх[10].
Так каралева няшчасная жудаснай смерцю сканала.
Мёртвае цела гаротнае з жалем вялікім, з тугою
Людзі дасталі тутэйшыя з цёмных пагібельных хваляў.
Вечную славу ўладарцы прызначылі ды неўміручую памяць
Дзеяў яе ўшанавалі, курган учыніўшы высокі:
Ён і дагэтуль стаіць і навечна магілаю будзе
Чыстай, бязвіннай душы спадкаеміцы мужнага Крака.
Ён узвышаецца там, дзе красуюцца моцныя сцены
Тумбы[11] славутай, якая штогод зелянее лістотай
Пушчаў сваіх і бруіцца празрыстай крынічнай вадою.
Там, пад курганам, о Крак, і дачку тваю смерць пахавала,
З ёю паклаўшы канец усяму твайму слаўнаму роду.
Ну, а цяпер, старажытная Слава, што можа магутнасць

Atque referre duces regesque est, inclita necnon
Pandere facta virum reboanti gutture, – tuque,
Calliope, vatum nutrix, heroica scripta
Quae sinis eloquio dulci depromere, prisca
Commemorans, ac si[24] praesentibus omnia factis
Notificas, mihi pande viros, qui sceptra Poloni
Direxere soli, reticet quos cana vetustas.
Haec ego dum meditor, vatum dux Cynthius ipse
Visus adesse mihi comitatu saeptus amoeno
Pegasidum, insigni plectro redimitus et arcu,
Qualem clara colit Lycias Pataraea per oras
Aut Delos media Aegaei inter Cycladas alti.
Talis erat, talem mihi sese ultro ipse ferebat[25]
Multa super ducibus meditanti regibus atque[26].
Qui tales fudit placido de pectore voces[27]:
Desine Sarmaticos ab origine promere reges,
O juvenis, quoniam tenerum non ista puellum
Vena decet; forsan medio defessus in alto
Succumbes, genio multum confisus acuto,
Ille velut fugiens Minoia sceptra sub arcton,
Cursu qui volucri nimium praecelso[28] secabat
Aetherea Aeolii sublimia flamina cauri,
Optatas felix meruit nec visere colles
Chalcidis, aligeri mandata patris quia demens
Aspernatus erat, vestigia callida rite
Nec comitabatur juvenis nimium miser ipse, –
Sic etiam ne celsa petens tu stemmata laudis
Deficeres[29] renovando vetustae stirpis honores.
Sed sileas reges, quos cana obliterat aetas,
Fama quia illorum et probitas et bellica virtus
Nota satis nituit pelago tellureque vasta,
Haud secus illorum, genuit quos Ilia mater
Aut Priami tellus aut nobilis ora Choaspis.
Ipse tuam, moneo, quare lassare Minervam
Noli; sunt et erunt vates qui postea reges
Deprom ent, coluit quos durus Sarmatha, sed tu
Sideream stirpem regis modulare Poloni,

Даўніх часоў прыгадаць, успомніць князёў з каралямі
І абвясціць гучным голасам слаўныя подзвігі вояў;
Ты, Каліопа, паэтаў карміцелька, што дазваляеш
Мовай складаць мілагучнай эпічныя творы і можаш
Так расказаць пра былое, нібы пра сучасныя дзеі, –
Слаўных мужоў пакажы, што трымалі вышэйшую ўладу
У польскай дзяржаве – пра іх жа маўчаць вунь сівыя стагоддзі.
Так разважаў я, калі сам натхняльнік паэтаў Цынтыец,
Той, што ў Ліцыйскай зямлі ўсхваляецца, у слаўных Патарах
І на Дэлосе, што ў цэнтры Цыкладаў Эгейскага мора,
У атачэнні сваіх Пегасідаў, з чароўнай кіфарай,
З лукам таксама ў руках, мне падаць захацеў дапамогу.
Так, у цудоўным абліччы, ён выступіў перада мною
У час, калі я разважаў пра князёў з каралямі, і сам жа
Выпусціў словы наступныя з вуснаў сваіх ціхамірных:
“Годзе, юнача, ужо радавод каралеўскі сармацкі
Тут выяўляць: не пасуе бо ўзросту твайму маладому
Справа такая, і ты не адолееш гэткіх вышыняў;
Спадзеючыся на розум дасціпны, ты стомішся хутка,
Нібы Ікар, што, ўцякаючы з царства Міноса на поўнач,
Шляхам птушыным узняўся ў высокае неба, на волю
Лёгкіх імклівых павеваў нябесных Эолава каўра.
Ды не прызначана лёсам было яму ўбачыць Халцыду[12],
Горад жаданы: бяздумна не слухаў бацькоўскай парады,
Саманадзейны, хаця добра ведаў юнак той няшчасны,
Што ён не мае надзейнай апоры на спрытныя ногі; –
Ты ж, хоць у неба не рвешся, аднак пахвалы і ўслаўленні
Трохі спыні, аднаўляючы продкаў далёкіх заслугі.
Не гавары пра цароў, даўніною ссівелай забытых,
Слава і годнасць якіх і ваенная доблесць вядомы
Добра, і ззяюць яны над зямной і марскою прасторай,
Як і ўсе тыя, каго нарадзіла траянская маці,
Ці знакаміты Хааспавы[13] бераг, ці землі Прыама.
Не дакучай ты цяпер, я прашу, сваёй песняй Мінерве:
Ёсць жа і будуць паэты – яны нам пазней і пакажуць
Тых каралёў, што суровы сармат услаўляе. Ты ж лепей
Продка славутага польскага валадара апявай нам,

Nec non fortis avi praestantia facta sui, quae
Prussia sanguineis sensit tenuata duellis.
Talibus attonitus, Rex invictissime, dictis
Horrida cum causis belli primordia saevi[30]
Stemmata tum generis candentia fabor honesti.

Слаўныя дзеі яго знакамітага дзеда, якія
Прусія ў бітвах крывавых адчула сваім паражэннем.
Гэтымі словамі ўзрушаны моцна, кароль неадольны,
Я напішу пра прычыны суровай вайны, пра пачатак
Гэтай навалы, пра продкаў славутых дастойных нашчадкаў.

INCIPIT LIBELLUS SECUNDUS

Est locus umbrosis celeberrimus undique silvis[1]
Imperio Scythicos late protensus ad agros
Frugiferis revirens pratis et abundus inhaustu
Mellifico, dives populis ac milite forti,
Quem dixere rudi Lithuanam nomine terram
Indigenae veteres, qui duro vomere duram
Excoluere loci glebam regione sub illa.
In qua dux et avus claro cognomine magnus
Ille tuus fertur genitus Jagello, severi
Martis et horrentis faustissima gloria belli.
Quod sensit vastae Europae pars maxima, quando
Germanae bello victae cecidere phalanges
Atque acies inter Prutenae viscera terrae,
Quum putri undantes rubuerunt sanguine rivi
Sub pelagus volvendo mares a Marte necatos.
Hic juga Lithuani rexit Mavortia sceptri,
Tum populos[2]: ultra vada lata Borysthenis alti,
Nomine Tartarico Nomades quos nuncupat aetas,
Incurvis validos frameis validosque sagittis,
Massagetasque truces, quos terminat ora profundi
Baltiaci, spumosis irrequieta procellis,
Ac albos belli celebres virtute Ruthenos.
Ad sua quem fortes revocarunt arva Poloni
Legitimum diadema duci tribuendo sagaci.
Felix Jagello felicia regna gubernat
Et tenet imperium pacis velamine septum[3],
Donec ab oblita[4] bonitatis gente citatus
Dux Conradus erat, qui tunc Cujava tenebat[5],
Arva, super[6] crudelis atrocia proelia Martis,
Quae[7] sibi praesidio adversus saevos fuit hostes[8].
Quos antiqua propago Getas ex more vocabat
At modo Prutenos mutato nomine dicit;
Temporibus Frederici, hac dicti voce secundi
Induperatoris, qui prata feracia terrae
Prutenae coluere, freti quoque littora magni
Sablosi, (veniens quae lambit vasta Britanno

ПАЧЫНАЕЦЦА КНІГА ДРУГАЯ

Ёсць нязведаны край, славуты сваімі лясамі,
Ён уладанні шырока раскінуў да скіфскіх прастораў;
Плодны, квітнее лугамі, цячэ ў ім струмень меданосны:
Край на народы багаты, таксама й на вояў адважных.
Простым найменнем – зямлёю Літоўскай – краіну назвалі
Продкі мясцовага люду. Яны лемяшом зацвярдзелым
Цвёрдую глебу рыхлілі ў багатай сваёй гаспадарцы.
З гэтага краю паходзіць і той валадар знакаміты –
Продак твой велічны з імем вядомым Ягайла –
Слава суровага Марса і лютых спаборніцтваў ратных.
Зведала іх найбуйнейшая частка вялізнай Еўропы
Ў час, калі падалі ў бітве шматлікія войскі германцаў –
Армія іх палягла ў самым цэнтры зямлі сваёй Прускай,
Там забурлілі крывёй каламутныя ўсе ручаіны:
Воінаў, Марсам забітых, шпурляючы, ў мора панеслі.
Сілаю Марса свайго ўсталяваў ён уладу літоўцаў
Там, дзе народы за сіняй прастораю вод Барысфена
Побач жылі: вось тартбрыкі, ці, па-другому, намады,
Спрытна валодаюць хуткімі стрэламі, выгнутай шабляй;
Іншы народ – масагеты [1] суровыя, іх аддзяляюць
Хвалі Балтыйскага мора, што водамі пеніцца бурна;
Беларусіны яшчэ, вельмі слаўныя мужнасцю ў войнах.
Мудрага князя[2] палякі паклікалі ў край свой айчынны,
Каб па законе яму перадаць каралеўскую ўладу.
Шчасны Ягайла тады кіраваў той магутнай краінай,
Ён мацаваў сваю ўладу пад покрывам міру – аж раптам
Конрада, што валадарыў у землях куяваў [3], на сечу
Кліча ганебны народ, пра даброты былыя забыўшы,
Кліча на лютую бітву крывавага Марса, хоць сам ён
Меў абавязак той край бараніць ад нападнікаў лютых.
Нашыя продкі звычайна тых ворагаў гетамі звалі,
Ды неўзабаве змянілі імя і назвалі іх – прусы[4].
Гэты народ у часы Фрэдэрыка Другога (бо гэтак
Звалі таго імператара) плодныя прускія нівы
Сам засяліў, а таксама ўзбярэжжа навокал Саблоза
(Ён у цячэнні сваім дасягае водаў бясконцых

Unda mari, diffusa orientem versus adustum,
Quod juxta rapidus famatum Vistula Gdanum,
Sarmaticis veniens de montibus usque per arva
Lata Polonorum, Prussis sub littore utroque
Commoda plura ferens, sinuoso flumine pulsat),
Quique suis tribuebant plurima damna colonis
Et clandestino certamina Marte cruenta.
Quos domitare volens petiit vicina Livonum
Arma viros et flagrantem fera proelia pubem.
Sed sibi subsidium nullum tulit illa suisque,
Imbellis Mavorte fuit quia segnis inersque.
Interea viguit feritas et dextra tyranni
Maumethis nimium, Libycis qui praefuit arvis
Ac Syriis, Solimae candent ubi regna sacratae
Cultores fidei, nec non pia numina sacri
Regis Olympiaci coluisse per ipsius oras.
Tempore quo, niveo sub religionis amictu[9]
Et nigrae crucis, hispidulis mentisque decori,
Fratres in Syriis Ptolemaidis incluta regnis
Moenia sacra dei rituque sacro coluerunt.
Impatiens celebris fidei illis resque domosque
Abstulit, e propriis depellens sedibus omnes.
Maxima spumiferi tandem qui ad flumina Rheni
Adveniunt fratres spoliati dulcibus arvis,
Quae gens Phoenicum quondam Verpumque colebat.
Hac regione moram nimium duxere molestam
Tempus et incerta[10] triverunt sede carentes.
Usque duci praepes resonavit fama sub aures
Advenisse pios, Mavortia pectora, fratres
Partibus ex Syriis sub Rheni jugera rauci.
Quos petit auxilio super effera gentis atrocis
Agmina. Non renuentibus incipit arma movere
Dux populis; tutas in limite dat quibus arces
Belli praesidio, pactumque fidemque locando:
Quicquid Gradivi stimulis virtute forentve
Belligera nacti: gazas et singula gentis
Prata, viros et agros, ac praedia, rura, colonos

Мора Брытанскага, цягнецца аж да зарніцы усходняй;
Тут недалёка імклівая Істула звілістай стужкай
Хутка да Гдана бяжыць, а цячэ ад узвышшаў сармацкіх
Праз неабсяжныя нівы палякаў, між тым і для прусаў
З двух берагоў сваіх многа карысці прыносіць);
Мірным сваім земляробам чыніў ён вялікія страты,
Тайна спаборніцтвы ладзіў у гонар крывавага Марса.
Вось, каб суняць той народ, што да рокашаў лютых імкнуўся[5],
Ён папрасіў дапамогі ў суседняга войска лівонцаў.
Праўда, ніякай карысці не меў для сябе і для справы:
Тыя лівонцы няздатнымі сталіся ў Марсавых дзеях.
Дзікасць квітнела даўней – тыранія цара Магамета,
Што кіраваў, як хацеў, у Лівійскай зямлі і ў Сірыйскай, –
Дзе раскашуюць палацы славутага Ерусаліма;
Варагаваў ён з усімі, але называўся ў народзе
Веры святой патрыярхам, і так ушаноўваўся славай
Ён у дзяржаве сваёй, як правіцель святы Алімпійскі.
Пад абаронаю святасці чыстай, пад крыжам жалобным
Тыя браты, што ўпрыгожаны шорсткай былі барадою,
Пталемаіду Сірыйскага царства тады засялялі,
Богу маліліся згодна сакральнаму звычаю продкаў.
Ды зненавідзеўшы тую славутую веру, пазбавіў
Іх Магамет і дамоў, і маёмасці, выгнаў з сядзібаў.
Шляхам сваім дасягнулі тады бурапеннага Рэйна
Тыя браты-хрысціяне, выгнаннікі з мілай Айчыны –
Там пражывалі ў той час фінікійцаў і верпаў плямёны.
Цяжкі прыпынак зрабілі яны і пакрочылі далей
Цмянай дарогай сваёю, не маючы ў свеце прытулку.
Чутка крылатая тут даляцела да князя [6] пра тое,
Што дасягнулі святыя браты з той сірыйскай краіны,
З Марсавай смеласцю, межаў шумлівага Рэйна.
Князь папрасіў у братоў дапамогі ў вайне з апантаным
Войскам раз'ятраных варвараў. Тыя згадзіліся. Ён іх
Сам накіроўвае ў бітву, дае на мяжы для падтрымкі
Ім абарону надзейную, узяўшы свяшчэнную клятву:
Колькі б пакут ні цярпела іх мужнасць у Марсавым шэсці,
Толькі багацці, ўладанні ўсе і паланёныя людзі,
Нівы, пакосы, сядзібы і вёскі, таксама й сяляне

Aequa partirentur lance sub ordine justo
Consensere viri. Geticis crudelia terris
Bella gerunt; populos trucidant, praedantur et agros,
Finibus et propriis spoliant Mavorte secundo.
Auxilio dextraque ducis loca cuncta ferocis
Obtinuere soli, patrias sedesque popelli.
Postea christigenum ritum per climata terrae
Instituunt, validas arces et moenia cindunt
Urbium, et effrenae statuunt arctissima pubi
Jura, ut nulla forent scelerum contagia foeda,
Aut facinus vigeat turpe et succumbat honesta
Virtus, quae in pulchro florescit dulcius ore.
Candet religio, reviret sua fama, decusque
Et virtus, probitas et magna potentia gentis
Fulgurat, irradians extremas laudibus oras
Eoi pelagi et Riphaei limina venti,
Donec sacra fames[11] ad habendi crevit amorem.
Impatiens pacis furor, insatiabilis atque
Imperii luxus, damnosa superbia necnon
Arma duci tulit, et pacti et fidei auxiliique
Immemor adversus conatu proelia turpi
Commovet, atque ducem bello deperdere gestit.
Limitibus, populis et agris, rex dive, Polonis
Damna ferendo profana tuis gens saevit in arvis,
Te dominum heredemque suum proprium, atque patronum
Evocat ad Martis truculentia bella severi.
Milia multa ducum adversus regumque potentum[12]
Nec non ardentem super effera proelia pubem,
Quae serit Albis in undosis flaventia ripis
Semina, tum Viadi resecat quae prata rapacis,
Concitat et vasti bello praestantia Rheni
Pectora, Gabritae populos, Lunaeque Comosae,
Helvetios etiam, Frisios, Suevosque severos,
Extremo nec non infrenos orbe Britannos,
Et quos fama vetus meminit de gente profana
Advenisse viros ad proelia, reticeo. Longum[13]
Ne mea Musa sonans fastidia praestet ad aures:
Tota fuit Germania, tota potentia plebis,

Мусяць падзелены быць справядліва ў належным парадку.
Воі згадзіліся з тым. Пачалася крывавая сеча
Ў гецкай зямлі: там рабуюць людзей і знішчаюць палеткі,
Там пазбаўляюць маёмасці, селішчаў, з Марсам у згодзе.
Воіны ўсе пры падтрымцы дзясніцы ўладарнага пана
Цалкам зямлю зваявалі – айчыну дзікунскіх плямёнаў.
Потым яны ўсталявалі сваю хрысціянскую веру,
Моцныя крэпасці і гарадскія муры збудавалі,
Склалі законы суровыя для апантанага люду,
Каб не было і памкнення да страшных і гнюсных злачынстваў,
Не памнажаліся дрэнныя ўчынкі, каб годная доблесць
Непераможнай была і квітнела ў цудоўным абліччы.
Ззяе набожнасць, квітнее і слава былая і гонар,
Шчырасць і годнасць людская, вялікая сіла народа,
Славай сваёй асвятляючы ўскрайкі ўсходняга мора,
Межы рыфейскага ветру… Ды раптам пачварная схільнасць
Пераўтварылася ў моцную прагу ўладання, у сквапнасць.
Вось ненажэрная лютасць, варожая міру, і з ёю
Ўлады празмерная прага, і пыха, і збройная сіла
Тут прывяла іх да князя[7] і, здрадзіўшы клятве, дамове,
Пра дапамогу забыўшы, ў ганебным імкненні да звады
Гэты народ у вайне пагубіць таго князя імкнецца.
Боскі кароль! Паглядзі, як, рабуючы польскія землі,
Дзікае племя народы краіны тваёй вынішчае,
Кліча цябе, ўладара і патрона, на грозную сечу
Ў межах тваёй жа айчыны на радасць драпежнаму Марсу,
Многія тысячы вояў вядзе супраць моцнага пана,
Зноў на крывавыя бітвы кіруецца люд апантаны
З тых, што абходзяць палеткі ля водаў парывістай Альбы,
З тых, што пакосамі мецяць лугі гаваркога Віяда;
Я ўжо не буду казаць пра другіх жыхароў ваяўнічых
Земляў бязмежнага Рэйна, яшчэ пра народы Габрыты[8]
І Густалістай Луны[9], пра плямёны гельветаў і фрызаў,
Свебаў суровых, нястрымных брытанцаў з ускрайкаў сусвету.
Погалас даўні пра гэтых мужоў: гэта племя ліхое
Прагне крывавай вайны. Дык няхай мая Муза так доўга
Больш не трывожыць вушэй чытача, і скажу карацей я пра тое:
Гэта была ўся Германія, сіла сукупная люду,

Quae fert esse suum Germano sanguine cretum.
Nuntia Sarmaticas surgebat fama per oras
Per proceres urbes, per compita plura virosque,
Horrida luctifico reboans e gutture bella,
Quam sequebatur atrox Martis furor iraque demens,
Impietas, rixae, discordiae et arma minaeque.
Regia Pruteno exagitando corda furore,
Et procerum viros[14], animos populique Poloni,
Bella subire jubet, necnon tutarier agros[15]
Cogit et injustae strepitus compescere gentis.
Postquam haec innotuere ferae praeconia famae,
Et gentis facinus magis excandebat atrocis,
Rex pius atque potens, quo non praestantior armis
Alter erat virtuteque[16] in orbe Lycaonis ursae,
Intrepidus fatis belli Martisque furentis,
Concitat audaces gentes adversus in arma[17],
Quas ditione sua tenuit rexitque per omnem
Sarmatiam, vario Mavortis milite plenam, –
Atque truces populos, belli fulmen quibus horrens
Praetulit, innumeris famatus[18] stragibus ante,
Frater Vitoldus tali cognomine dictus,
Qui juga Lithuaniae resecabant bellica terrae,
Undique feta paludibus atque rigentia silvis, –
Necnon letifero Russos pugnare paratos
Arcu, – tum frameis et equis velocibus ausos
Hostiles saevo convincere Marte phalanges,
Numini Nomades ardentes sedulo diros
Sanguinis et belli et praedae crudelis amore, –
Squalidulos etiam quamvis per singula membra
Massagetas sed ad arma nimis crudelia promptos.
Duxerat has bello valido cum fratre cohortes
Atque alias, numero labor est quas promere certo.
Sed quia regis in egregio pulcherrima corde
Virtus, tum probitas et fervor pacis honestae,
Et pietas super audaces gratissima Prussos
Canduit, ut Phoebus radiis solet ipse sub ortu,
Dum pluvias nubes aquilonis et alta protervi

Меў ён на мэце адно: каб германскую кроў узвялічыць.
Чутка звястоўная ўздоўж сармацкіх прастораў ляцела
Мноствам вялікіх шляхоў гарады і людзей аблятала.
Голасам смутным нясла яна рэха вайны той страшэннай,
З ёю – бязлітасны гнеў, звар'яцелая Марсава лютасць,
Здрада і звада, нязгода, крывавая бітва, пагрозы.
Гэткаю лютасцю прусаў душу караля ўсхваляваўшы,
Чутка загадвае ўзняцца на бітву магнатам, народу
Польскаму дух уздымае, збірае ўсіх на абарону
Мілай айчыны, каб толькі суняць гэты люд беззаконны.
Славу дурную набыў сабе люты народ неўзабаве,
Толькі злачынствы і жорсткасць яго распаляліся болей.
Вось міласэрны й магутны кароль, што ў зямлі Лікаонскай
Роўных не меў сабе ў мужнасці духу і ў сіле вайсковай,
Быў перад лёсамі Марсавых войнаў суровых бясстрашны,
Супраць нахабнага дзёрзкага люду збірае на бітву
Тых, каго ён падначаліў сабе і над кім валадарыў
Сам у Сарматыі, поўнай шматлікага Марсава войска;
Разам – і тыя народы, якія так часта на бітвы
Брат яго Вітаўт вадзіў і, праслаўлены ў сечах шматлікіх,
Зваўся "маланкай вайны"; непахісны і вельмі рашучы,
Ратныя лейцы ў Літоўскай зямлі ён утрымліваў моцна –
Там, дзе багата балотаў, дзе высяцца цёмныя пушчы:
Русаў нястрымных, гатовых пацэліць з напятага лука,
З імі суровых і лютых намадаў, узброеных дзідай,
Што паспрачацца рашылі на конях сваіх хуткакрылых
З грознай варожай фалангай у гонар суровага Марса,
Прагнучы моцна пачварнай спажывы й крыві чалавечай;
З імі яшчэ масагетаў – няхай невялікую частку –
Вояў рашучых і мужных не меней у бітве суровай.
З братам магутным ён вывеў на сечу ўсе тыя атрады,
З імі й другія, якія злічыць немагчыма дакладна.
Шчырасці гожай святло і бязмежнае высакародства,
Палкая прага да міру, яшчэ і спагада да прусаў,
Дзёрзкіх і жорсткіх, у сэрцы таго караля зіхацела, –
Так, быццам раніцай Феб на сваёй залатой калясніцы
Фарбамі дзень аздабляе, пакуль ад шумлівага ветру,

Flabra nitore fugat, curru lucemque colorat,
Sic animus regis nituit pietate decorus
Magnanimi super arma virum dementia et altos
Instabilis flatus fortunae fataque saeva, –
Atque dolore gravi commotus sanguinis ipse[19]
Humani mittit legatos, bella furentes
Ut cohibere velint, bellique capessere foedus
Cum populis et amico aeternum vivere voto.
Qui renuunt pacem regique insignia mittunt
Sanguineos enses martis pro fulmine binos[20]
Et mandata superba, truci sermone minarum
Plena. Quibus rex non perterritus annuit atque
Arma super cupidos Martis citat: undique vulgus
Cum strepitu arma sonat[21], cupit arma subire paratus.
Haud secus ebria turba mero sub collibus Haemi,
Dum furit, instaurans animos, vexata calore,
In rixas, caedes, in commoda pessima, prona:
Sic super arma furebat atrocia bellica pubes
Quae ducibus belli fuerat subjecta cruenti.
Tempus erat calidum, quo Julius annua mensis[22]
Maturat per agros cerealia dona feraces,
Pulchrum opus incurvis messoribus agricolisque,
Quo Mars in campis Prutenis constitit acer
Arma movens, jamque hos clipeum jam volvit ad illos
Atque, boans Prussis nec non crudele Polonis
Bellum, sanguineas mortes et multa profatur
Saeva nimis dictu populis poscentibus arma.
Interea ira furebat et a Phlegethonte resurgens,
Aere Mors potiebatur, campoque volando
Angue cruentato signabat funera multa
Sub Stygios ruitura lacus noctemque profundam.
Jamque per omnigenos lucebat Prussia campos
Gentibus innumeris, catafractis militibusque
Undique feta fuit, nec non Mavortis acerbi
Horridulo tonitru furor arma nefanda sonabat,
Praedulces abolens natos et vincula sacra
Conubii: patrias sedes, tum dulcia prata
Omnia pallidulo veniens vultu ira fugabat,

Хмар дажджавых Аквілона цудоўнага ззяння не скрые, –
Так і святая душа караля зіхацела любоўю,
Большай за гэтае войска людзей неразумных і хцівых,
Большай за ўсе павароты фартуны і жорсткага лёсу.
Вось міласэрны кароль, не жадаючы крывапраліцця,
Смела кіруе паслоў, каб стрымаць тую прагу да войнаў:
Можа б, з народамі ўсімі ў ваенны саюз уступілі,
Можа б, згадзіліся жыць з імі вечна ў сяброўскіх стасунках?
Ды адхіляюць яны караля прапановы аб міры,
Шлюць у адказ грозны знак: два мячы, што абмыты крывёю,
З імі загады пыхлівыя, словы ганебных пагрозаў.
Толькі кароль гэтых слоў не пужаецца: выклік прыняўшы,
Кліча на бітву прыхільных да Марса. І вораг тым часам
Войска склікае, з гатоўнасцю ў лютую сечу імкнецца.
Вось ап'янёны натоўп, як калісьці пад схіламі Гема,
Зноў палымнее ў душы і, ахоплены згубным жаданнем,
Прагна кідаецца ён у забойствы, да горшай спажывы.
Гэтак імкнуўся да бітвы народ ваяўнічы, хоць, зрэшты,
Быў ён адно для князёў выканаўцам вайны той крывавай.
Час быў спякотны, калі па палях урадлівых разносіць
Ліпень штогод падарункі Цэрэры і шчодрую працу
Для земляробаў з касцамі. Тым часам і Марс размясціўся
Ў Прускай зямлі: патрасаючы зброяй, то ў наступ кіруе
Войска магутнае, то прымушае заняць абарону.
Войны бязлітасныя для палякаў і прусаў ён кліча,
Смерці крывавыя ім прадракае, вялікае мноства
Жорсткіх спаборніцтваў ратных, збірае на бітву народы.
Лютасць кіпела між тым, і ўваскрэслая зноў з Флегетонта
Смерць завалодала зброяй, над полем ляціць, адзначае,
Быццам змяя, што наносіць крывавыя раны, забітых,
Каб у бязмежную ноч, у стыгійскія воды іх зрынуць.
Так вось палала для многіх народаў бясконцаю бітвай
Прусія ўся, напаўнялася чэргамі панцырных вояў.
Гнеў бессардэчнага Марса тады прымушаў адгукнуцца
Зброю злачынную грукатам дзікім і неўтаймаваным,
Нішчыў маленькіх дзяцей, разбураючы шлюбы святыя.
Лютасць ваенная звычкі дзядоў праганяла, ляцела
Ўздоўж па зялёных лугах са смяротнаю бледнасцю ў твары.

Atque animus belli populos super arma citabat.
Agmina jamque virum veniebant in simul[23] ipsa
Ardor utrimque ducum stimulabat, utrimque tribunum.
Tunc Nomades arcus Vitoldo praeside primi[24]
Eripiunt pharetris, celeres cursuque fatigant
Cornipedes, super hostes letiferasque sagittas
Emittunt horrenti murmure: grandinis instar,
Dum pater omnipotens nimbis dissolvit habenas,
Affligens nimium pluvioso turbine mundum,
Tunc Aquilonis hiems per prata virentia saevit,
Et ferit agros ac segetes et iugera valles:
Persimili fuerant radiantes more cohortes
Prutenae Nomadum iaculis per corpora caesae.
Agmine quos alio Russi comitantur atroces,
Lithuani frameis incurvis atque potentes,
More suo pugnare parati Massagetaeque
Irrumpunt acies germanas pectore forti.
Vulnera vulneribus geminant sternuntque vicissim
Corpora multa virum crudeli morte necata.
Undique concurrunt acies, fluit undique sanguis;
Hi pereunt jaculis, illi stridentibus hastis
Succumbunt, animasque suas sub Tartara mittunt.
Saxa volant et tela pluunt per nubila mundi
Ferrea, letiferis jaculis nigrescit et aer
Nec locus est telis in terra; vulnera ferrum
Omne fovent, tonat horrisono Mars gutture saevus,
Ac si cum tonitru per nubila Juppiter atra
Aut per frondosas, tenebrosa cacumina, silvas[25].
Sed fortuna ferox, casus quae fertur iniquos
Sola rotare manu necnon variare caduca
Saecula, cincta regens nutu arbitrioque creata,
Deserit audaces Russos Nomadasque ferosque
Lithuanos, Vitolde, tuos, tum cetera gentis
Agmina multa tuae et te deserit illa tuosque[26].
Germanas acies vultu solatur amico
Et juvat, alternis inconstans saevaque fatis.
Vincunt Pruteni, vincunt vexilla magistri[27],

Дух апантанай вайны ўсе народы да зброі паклікаў.
Шмат ваяроў адусюль кіраваліся ў бітву – кагосьці
З іх заахвочваў запал камандзіраў, другіх – ваяводаў.
Вось на чале з князем Вітаўтам першымі выйшлі намады,
Лукі дасталі з калчанаў і коней сваіх хуткакрылых
Гоняць у наступ, са свістам страшэнным пускаюць
Стрэлы смяротныя ў ворагаў: бы ўсемагутны наш Ойча
Лейцы на хмарах сваіх дажджавых паслабляе і градам,
Ліўневай моцнай лавінай руйнуе сусвет навакольны, –
Так Аквілонава бура сваволіць на гожых палетках,
Страты прыносіць палям, хлебным нівам і долам шырокім, –
Гэтак ляжалі разбітымі прусаў кагорты; іх целы
Бы прамянелі, прабітыя стрэламі дзікіх намадаў.
Разам з намадамі ў наступ пайшлі і суровыя русы,
З імі – літоўцы з сагнутымі шаблямі і масагеты –
Воі магутныя, здольныя ў справе ваеннай спрадвеку, –
З мужнасцю ў сэрцы руйнуюць варожыя войскі германцаў.
Там – ударам на ўдар – і ўдарамі вобзем кідаюць
Многія целы загінуўшых – нашых і ворагаў – вояў.
Войскі сыходзяцца ў сечы, і кроў паўсюдна бруіцца:
Гэтыя гінуць ад дзіды, а тыя – стралою працяты, –
Разам усе яны душы свае адпраўляюць у Тартар.
Свішча каменне, і сыплюцца стрэлы, што лівень, як быццам
З хмары жалезнай на небе; паветра чарнее ад дзідаў,
Вось на зямлі няма месца ад стрэл; застаецца ўся зброя
Ў ранах крывавых. А Марс ненажэрны раве аглушальна, –
Так з навальнічнае хмары Юпітэр грыміць перунамі
Ці завывае ў лясах густалістых, у кронах цяністых.
Злая фартуна, якая, як кажуць, адною рукою
Робіць ліхі паварот і нясе ў марным часе змяненні,
Воляй сваёй накіроўвае ўсё і выносіць прысуды, –
Раптам пакінула русаў адважных і дзікіх намадаў,
З імі – літоўцаў тваіх, княжа Вітаўце, іншага люду
Шмат з ліку вояў тваіх, дый самога цябе, – а спрыяе
З поглядам ветлым, спагадным варожаму войску германцаў,
Дапамагае яму, вераломная ў зменлівым лёсе.
Прусы наперад ідуць, наступаюць харугвы магістра.

Et crucis alta triumphat gloria, Teuton et omnis
Exsultat superans, catafractus equoque manuque.
Terror in ore virum resonat, Vitolde, tuorum
Et metus, et belli eventus turpissimus ipse
Inquinat atque tuos equites peditesque molestat
Inque fuga turpi cogit sperare salutem;
Terga virum invertit, faciesque recondit et ora
In cursu celeri. Quos sic dum novit iniqua
Sorte fatigatos et defecisse nefando
Marte suos populos, belli dux, ocior euro
Castra petit regis, necnon examina gentis
Clamitat auxilio, ac regem increpat atque ita fatur:
"Nonne vides bello, frater, succumbere nostros[28],
Quadrupedumque sonum ingentem strepitumque fugamque
Cernis et hostiles nostras superare phalanges?
Et tu aras ac religionem nunc struis altam:
Desine jam sacris rituque incumbere sacro!
Non haec ludicra sunt hac religione tuenda,
Nec precibus locus est, sed fare age, surge jubeque
Jam pugnare tuos cum dira gente Polonos".
Rex quibus auditis flagrantia religione
Non movet ora, nec a precibus desistere gestit:
Sic fratri verbis nimium indignantibus inquit:
"Pone feros animi, frater carissime, motus[29],
Et me pace frui permitte modo, precor, alma,
Atque Dei cultus turbare altaria circum
Noli, donec sacra Dei peragentur honore
Nunc celebrata suo, finem imponetque sacerdos:
Tunc nostros tecum faciam pugnare Polonos,
Moxque parabo tibi auxilio, solusque juvabo.
At nunc collige reliquias tutareque castra,
Tum facias prohibere instantes Teutonas ipsos".
Jussa facessit atrox, et saevit pronus in hostes.
Interea duplices lacrimans ad sidera palmas
Rex pius et justus protendit, talibus orsus:
"O opifex hominum divumque, polique creator[30],
Qui regis imperio viventia cuncta sereno,
Qui pelagus, populos, montes et flumina, silvas

Вось трыумфуе Тэўтон і крыжа старажытнага слава,
Цешацца воіны ў панцырах – хто на кані, а хто пешы.
Роспач і сполах у тварах тваіх ваяроў, княжа Вітаўт,
Лёс сарамотны ў вайне засмучае, гняце і няславіць
Коннікаў ды пехацінцаў тваіх, што ва ўцёках ганебных
Мусяць шукаць паратунку ад гэтай суровай навалы.
Хутка бягуць ратаборцы, галовы панурыўшы, моўчкі…
Так правадыр наш ваенны пазведаў, што лёсы раптоўна
Могуць прынесці бяду. І калі ён убачыў, што гінуць
Людзі яго на пацеху злачыннаму Марсу, на золку
Хутка кіруецца ў стан караля і людзей заклікае
На дапамогу сабе, караля дакарае, гаворыць:
“Хіба ж не бачыш ты, браце: разгромлены нашыя войскі;
Хіба не чуеш ты конскага ржання і гоману ўцёкаў,
Не заўважаеш, што ворагі перамагаюць у бітве?
Ты ж тут тым часам узводзіш алтар і рыхтуеш малебен.
Досыць ужо пакланяцца святым у сакральным абрадзе!
Што за відовішча тут – недарэчы ўрачыстая служба,
Месца малітвам няма! Уставай і загадвай нарэшце,
Каб і палякі твае супраць ворага рушылі ў бітву”.
Ды знерухомеў у шчырым маленні кароль, хоць пачуў ён
Брата прамову, але не спяшаецца скончыць малебен.
Вось што сказаў у адказ на суровыя Вітаўта словы:
“Браце шаноўны! Стрымай ты шалёны парыў свой душэўны,
Мірам дазволь жыватворным цяпер суцяшацца ў спакоі.
Не замінай жа, малю, мне каля алтара служыць Богу,
Ты пачакай заканчэння ўрачыстай імшы ў яго гонар.
Толькі тады, – не раней, – калі скончыцца богаслужэнне,
Я загадаю, каб разам з табою і нашы палякі
Ў бітву ўступілі, аддам я загад і прышлю дапамогу.
Зараз жа рэшту збяры сваіх вояў і лагер ахоўвай,
Ды пастарайся стрымаць наступленне імклівых тэўтонцаў”.
Вітаўт у гневе загады прыняў, зноўку рынуўся ў сечу.
Тут справядлівы й набожны кароль у слязах, да нябёсаў
Рукі ўздымае свае, вымаўляючы гэткія словы:
“Божа, Стваральнік людзей, міласэрны Айцец наш нябесны!
Ты над усімі жывымі пануеш дзівоснай уладай;
Моры, і рэкі, і горы, лясы, а таксама народы

Arbitrio servas per saecula cuncta sacrato,
Vulgi qui cohibes strepitus et bella cruenta
Mitifics, maribus necnon ad proelia vires
Suggeris egrefias, animum victisque ministras,
Tum Praenestinae cohibes truculentia divae
Flamina, cuncta tuo pro nutu dirigis atque:
Te precor, aspicias clementi lumine regem
Et populi miserere tui, miserere meique,
Audaces praestans animos et fortia pubi
Corda meae super hostiles in Marte cohortes[31].
Vincere posse doce, fragiles aciesque guberna
Et solus teneas aquilas vexillaque nostra
Adversus turmas Germanas atque catervas".
Ecce inter caeli fastigia candida regi[32]
Praesulis effigies apparuit undique clara,
Luce poli circumsaepta et radiantibus astris,
Maestum dulcisono solando gutture regem
Talibus et verbis est amplexata benignis:
"Jam pater omnipotens lacrimas miseratus amaras
Atque preces hilari respexit lumine tristes,
Teque tuosque hodie solabitur omine fausto
Et forti tribuet victos succumbere dextra
Victores, qui fraternas vicere phalanges.
Quorum vi rapies forti vexilla, tholoque
Suspendens[33] templi praeclara insignia nostri,
Scuta ducum regumque etiam vexilla potentum
Ad monumenta mei figes renitentia busti.
Laurigera necnon renitebis fronde revinctus
Tempora, longaevae candescens posteritati
Egregio celebris per climata cuncta triumpho.
Eia age, rumpe moras lacrimas cohibeque fluentes[34],
Arma virosque cita, tum saevas instrue pugnas,
Fac subeant vexilla, tuique ad bella tribuni.
Ipse tuum agmen agam, et fiam tibi fidus Achates,
In bello et te semper concomitabor euntem".
Dixerat et roseo verbis finem dedit ore[35].
Ilico rex sacra solatus voce Polonos

Воляй святою захоўваеш, Божа, на вечныя векі;
Ты ўціхамірваеш бунты людскія і войны спыняеш,
Ратнікам мужным у бітве ты вечную славу прыносіш,
А пераможаным воям падтрымку даеш і надзею;
Ты супакойваеш нораў ліхой Прэнестынскай багіні,
Мудра кіруеш усім адпаведна свайму разуменню.
На караля ж паглядзі сваім позіркам, поўным спагады.
Злітуйся, Божа, над людам тваім, нада мною, няшчасным,
Абарані мой народ, непахісныя душы і сэрцы
Мужныя ў бітве з варожаю сілай, з кагортамі Марса.
Перамагаць навучы іх, камандуй слабым гэтым войскам,
Арміі нашай харугвы, штандары цяпер накіроўвай
Супраць шматлікіх германскіх палкоў, незлічоных атрадаў".
Раптам з'явілася ў недасягальных нябесных вышынях
Светлая біскупа[10] здань – адусюль яе бачыў ён добра,
Постаць яго ахіналася ззяннем нябесным і зорным.
Голас чароўны гучаў каралю суцяшэннем у жальбе –
Гэткія словы патолі яму дасылаў ён прыхільна:
"Моцны Айцец спачувае слязам тваім горкім і скрушным,
Смутным маленням – цяпер павярнуўся да вас Ён спагадна.
Узнагародзіць Ён лёсам шчаслівым цябе, тваё войска.
Будзе па волі Яго: пераможаным вам пераможцы,
Братава войска разбіўшы, саступяць усё ж такі ўрэшце.
Сілай магутнай сваёй захапі іх харугвы – хай потым
Купал касцёла майго дарагія кляйноты ўпрыгожаць;
Ты ж да магілы маёй прынясі і ўмацуй там надзейна
На мануменце шчыты і харугвы князёў з каралямі.
Сам, упрыгожаны лаўрам, шчаслівы свой час напаткаеш,
Прыкладам годнасці будзеш для высакародных нашчадкаў,
Ззяючы славай сваёю бясконцай далёка-далёка.
Рухайся ж, хопіць чакаць! Прыпыні свае слёзныя рэкі,
Зброю і вояў збірай, выстаўляй шэраг ратнікаў грозны.
Хай уздымаюць харугвы на бітву твае ваяводы.
Сам павяду тваё войска, зраблю цябе верным Ахатам,
Пойдзеш ты следам за мной па суровых шляхах ратаборчых".
Так ён сказаў – і святлом пурпуровым заззяла аблічча.
Голас святога пачуўшы, кароль загадаў, каб палякі

Legibus instructos jubet instaurare severis
Proelia conclamans, et equum poscit gladiumque
Accingit lateri, campo volat, agmina cogit
Ad pugnas, animans sic verbis fatur amicis:
"Si quibus incuteret turpis praecordia terror[36],
Aut animos pessum bello daret altaque vestri
Stemmata sanguinis, egregium genus et decus ingens
Inficeret, memores famae, patriae, vel honoris
Este Poloni, oro, quoniam turpis metus aures
Inficit, at bello praestans audacia prodest,
Magnificos decorans animos praestantibus actis.
Quare vos precor et moneo, nam pugna propinquat,
Teuton et insultat, qui fratris vicerat alas,
Jam vestras aptate manus, et pectore forti,
Vos oro, si quando fuistis, nunc decet esse;
Et pugnate, precor: favet haec victoria nobis,
Agmina quae Nomadum dejecit Massagetumque.
Qualis quisquis erit, tali post laude nitebit".
Mox sufflare tubas facit, et vexilla moveri
Imperat, atque acies instantes cogit in hostes.
Jamque ruunt primusque virum rex, incipit ipse[37]
Ante alios valida disrumpere strage cohortes
Innumerosque necare manu, tum sternere passim
Corpora plura virum, velut Oenides ferus ille
Sphingos ad horrentes scopulos, aut bellicus Hector,
Dum stravit Danaum validissima pectora regum
Ad celsae nimium praestantia moenia Trojae.
Haud aliter Germanas rex ferus ipse catervas
Sternebat felix, per martia proelia felix.
Hunc equitum comitantur milia multa Polonum
Inflammata feri Martis certamine, bellum
Jam subeunt, aptant hastas sub brachia acutas,
Pectora tutantur clipeis cataphracta coruscis,
Ingeminant vires et findunt corpora ferro,
Verbera verberibus duplicant, et vulnera figunt.
Arma virosque secant, et plures ense remittunt
Sub Phlegethontiacos numeroso turbine lucos
Germanas animas, tum fortia corda virorum

Бітву ўзнавілі хутчэй па суровых ваенных законах,
Кліча збірацца на бой і, мячом апяразаны, тут жа
Сам на кані хутка скача на ратнае поле, да бітвы
Войска ўздымае, сяброў падбадзёрвае – так ім гаворыць:
“Кім у душы авалодае страх недарэчны – няхай той
Згіне адразу ў вайне. Напамінам для вас хай паслужаць
Высакародныя родзічы вашыя, слаўныя продкі –
Вечная памяць для іх ад людзей і айчыны! – дык будзьце ж
Годнымі ў бітве, палякі, бо ўсім баязліўцам – няслава.
Тут, на вайне, патрабуецца толькі адвага, якая
Высакародныя душы ўпрыгожвае подзвігам ратным.
Помніце гэта, прашу вас – ужо набліжаецца бітва;
Злосна смяецца тэўтонец: адолеў ён братава войска.
Дык падрыхтуйце ж сваю цяпер зброю, малю вас. Калі вы
Моцнымі духам калісьці былі – то й цяпер імі будзьце.
Толькі ж ваюйце, прашу, бо прызначана нам перамога
Тая, што войскі намадаў пакінула і масагетаў.
Хто якім будзе – пазней атрымае такую й пашану”.
Потым сігналіць трубой і загадвае рушыць харугвам;
Войска, што рвецца на бой, супраць ворагаў сам ён склікае.
Рушылі разам, кароль – на чале свайго войска, ён першы
Націскам моцным кагорты крушыць пачынае і многіх
Моцнай рукою сцінае, кідае паўсюдна навокал
Целы шматлікія вояў, нібыта на сфінксавых скалах
Мужны, суровы Айнід або як ваяўнічы той Гектар,
Што ратаборцаў найлепшых данайскіх забіў апантана
Перад сцяной небасяжнай высока узнесенай Троі.
Гэтак жа грозны кароль наш вялізнае войска германцаў
Нішчыць і губіць, шчаслівы на Марсавым полі крывавым.
Многія тысячы конных палякаў з ім поруч імчацца,
Прагаю Марсавай звады палаючы ў сэрцы, нарэшце
Ў наступ ідуць, уздымаюць рукою спічастыя дзіды,
Грудзі, убраныя ў панцыр, бліскучым шчытом прыкрываюць,
Самі ж мячом напалам рассякаюць варожыя целы,
Множаць ударамі ўдары, наносяць крывавыя раны,
Зброю і вояў сцінаюць; і многія душы германцаў
У калаўроце шматлюдным да змрочных далін флегетонскіх
Хутка мячом накіроўваюць; ратнікаў мужныя сэрцы

Morti tradunt, Eumenidum thalamisque reponunt.
Gentibus acrior insurgit Mars atque cupido
Bellandi, renitent enses clipeique resultant,
Clamor adest equitum horridus atque hinnitus equorum,
Comminus ense agitur res, sanguine campus abundat,
Caede natant fossae, tellus maculata cadentum[38]
Corporibus tremit, et liquidus micat ensibus aether[39].
Tantus sidereos effertur clamor ad orbes
Et belli strepitus, qualem vix Aetna cavernis
Per Steropen Brontenque solet lassata referre.
Talia Vitoldus cernens animosius hostes[40]
Infestat, cum reliquiis et milite pauco
Solus agens agmen Nomadum de parte sinistra
Germanas acies rumpit, quem cetera pubes
Vociferans sequitur, frameis pharetrisque decora,
Vulnera vulneribus geminans trans pectora vibrat
Multa virum duro certamine strageque in illa[41].
Ut cum saevus Orion aquoso turbine rura
Aut juga celsa ferit, resonat notus auster et ipse,
Icta sonant vasto sub verbere moenia cuncta
Ingens et per agros et compita grandinis albet
Copia, fluctisonas causans in vallibus undas:
Sic per agros omnes et dulce virentia prata
Strage necata ducum jacuere miserrima membra,
Semiputata virum fluitabunt altera tabo,
Altera sanguineum regemebant ore dolorem.
Vulnificata nimis fugere per antra[42], per altas
Valles, in densas frondosaque culmina silvas.
Parte alia turmas equitum rex ordine lento
Serpere et hostiles jubet incursare phalanges,
Altera agit solus radianti luce coruscum
Agmen et aggreditur volucris vexilla magistri.
Quem sequitur Nomadum cum principe frater honorus,
Sorte cruentati belli furiosius hostes
Marte fatigatos celer a tergo petit, atque
Crudelem exercet stragem et letalia figit
Vulnera barbigeris Prussis, tum fratribus ipsis.

Смерці ў ахвяру нясуць, Эўменідам жахлівым кідаюць.
Вось над народам лунае раз'ятраны Марс і жаданне
Бітвы, бразгочуць мячы, а шчыты іх удар адбіваюць,
Чуецца коннікаў лямант і коней пужлівых іржанне,
Бой рукапашны ідзе, заліваецца поле крывёю,
Поўныя трупаў канавы, трасецца зямля ад падзення
Целаў забітых, ад ганьбы… Адсвечвае яснае неба
Водбліскам зброі жалезнай. Ляціць да вышыняў нябесных
Лямант ды ляскат вайны, – і наўрад ці даносіўся гэткі
З нетраў знясіленай Этны з-пад молатаў Бронта й Стэропа.
Вітаўт, пачуўшы пра гэта, душой акрыяў, схамянуўся,
З рэштаю войска свайго невялікай памчаўся ў атаку,
Сам узначаліў атрады намадаў і з левага флангу
Крышыць калоны германцаў; ідуць за ім з воклічам мужным
Іншыя воі ў даспехах, з мячом абасечным, з калчанам.
Ранамі множачы раны, яны паражаюць у грудзі
Многіх байцоў у жахлівым спаборніцтве крывапраліцця.
Як Арыён апантаны палі ці высокія горы
Воднай віхураю б'е ды шуміць разам з ветрам паўднёвым, –
Самыя моцныя сцены трашчаць ад такой навальніцы,
А на палях і дарогах бялеюць высокія гурбы
Граду, якія папоўняць шматлікія рэкі ў далінах, –
Так па шырокіх палях, на зялёным пяшчотным мурозе
Целы забітых ляжаць ваяводаў варожых няшчасных,
З іншых разрубленых целаў байцоў расцякаецца гнойная жыжа.
Чутны аднекуль пакутлівы енк са скрываўленых вуснаў.
Цяжкапараненых кінуўшы, вораг да сховаў імкнецца:
Хто да высокіх валоў, хто пад покрыва цёмнага лесу.
Конным атрадам кароль загадаў падбірацца паволі,
Каб нечакана напасці на ворагаў лютых фалангі, –
Іншых жа ратнікаў годных вядзе ў наступленне на золку,
Сам накіроўвае смела харугвы святога патрона.
Брат яго слаўны – за ім, узначальвае войска намадаў,
Ён, яшчэ больш апантаны крываваю Марсавай доляй,
Хутка да стомленых ворагаў ён падбіраецца з тылу;
Тут пачынае страшэнную сечу, смяротныя раны
Сам барадатым тым прусам наносіць, вядома ж – крыжакам.

At nunc, Aoniae divae celebresque puellae,
Facta novate vetusta, precor, cantusque movete[43],
Strages qualis erat, qualis victoria restat
Jam resonanda mihi, saevus quo more Polonus
Vicerat hostiles Prussos Germanaque signa
Innumerosque duces, proceres, populosque potentes:
Cantibus haec renovate, deae, renovate puellae
Hoc belli decus et laudem super addite summam
Limina qua[44] pelagi superet liquidissima vasti
Atque soli revirentia jugera multa feracis.
Postquam circumsaeptus erat miser undique Teuton,
Sensit et agmina debilitata in viribus, atque
Belligeros novit jam vincere posse Polonos,
Extemplo terror percussit corda magistri
Atque ducum Germanorum per maesta cucurrit
Pectora, frigidulos artus et pallida fecit
Ora viris, turpem resonans spem in cordibus ipsis.
Arte fugae celeris vitae reparare salutem
Quisque suos hortatur equos Germanus et optat.
Currere sed vallatus ab omni parte Polonum
Agminibus necnon Nomadum nequit ille ferorum;
Hinc atque hinc divertit sese et volvit ad omnes
Partes tum meditatur opem conferre saluti
Posse suae. Velut umbrosa de valle Molossis
Cervus et ipsa sequens canibus perterrita turba
Currere in acrios colles nemorumque latebras
Gestit, per dumos sentes et opaca viarum,
Casus mortiferi metuens discrimina nulla:
Sic etiam Germana phalanx perterrita strage
Currere tentabat, sed fata nefanda vetabant.
O peritura cohors, ubi erat tunc nominis heres[45]
Illa tui, scelerata superbia? Tunc ubi et enses
Sanguinei, quibus ausa es subsannare potentem
Regem? Nec servata fides promissave pacta
Conrado, cujus fueras tu jugera nacta
Auxilio orbis Pruteni diademata necnon?
Sustulit ista tibi inclementia saeva Poloni

Ну а цяпер, Аянійкі, нябесныя слаўныя панны[11],
Дзеі сівой даўніны ўваскрашайце і песню спявайце.
Трэба пачуць мне, якою была тая бітва, якою
Стала пасля перамога і як жа паляк апантаны
Перамагаў і германцаў, і прусаў варожых – між імі
Правадыроў, палкаводцаў і многа магутнага люду.
Дык узнавіце ж у песнях, багіні, ўзнавіце, о панны,
Подзвіг вялікі, хвалу да нябёсаў дадайце, якая
Перасягне і бясконцыя межы пустыннага мора
Дый неабсяжныя ўсе далягляды зямлі пладаноснай.
Толькі калі быў нікчэмны тэўтонец акружаны ўрэшце
З розных бакоў, зразумеў ён: знясілела войска – і ўведаў,
Што ваяўнічых палякаў атрады цяпер перамогуць.
Страх працінае магістрава сэрца, па душах панурых
Ўсіх палкаводцаў германскіх віхураю змрочнай нясецца…
Вусны бляднеюць, дранцвеюць ад страху і рукі, і ногі
Так прадчуванне ганебнага выніку ў сэрцы ўзрастае.
Кожны германец каня панукае свайго дый імкнецца
Выратаванне жыццю адшукаць ва ўцёках імклівых,
Толькі дарэмна бяжыць: адусюль ён акружаны войскам
Мужных палякаў і дзікіх магутных намадаў.
Вось разбягаецца войска германцаў куды толькі можа,
Бо спадзяецца ратунак здабыць для сябе такім чынам.
Нібы ад псоў маласійскіх імклівы алень уцякае,
Следам за ім – і ўся зграя наперад ляціць апантана
Прэч ад цяністай даліны да горных вышынь паднябесных,
Сховішчаў лесу, праз церні, кустарнік, па скалах, цяснінах –
Перад смяротнай пагрозай яна ні на што не зважае, –
Гэтак жа страх перад смерцю пагнаў і германцаў на ўцёкі.
Толькі жахлівы іх лёс не прыносіў ім больш паратунку.
Войска асуджаных смерцю! Дзе ж сёння злачынная пыха
Племя ліхога твайго? Дзе крывавая зброя, якою
Вы з караля наймацнейшага гэтак пакпіць рызыкнулі?
З Конрадам хіба не вы заключалі каліськ дамову?
Вы ж прысягалі яму! Ці не ён дапамог атрымаць вам
Так незаслужана многія югеры прускіх надзелаў?
Вы пакараны сурова няўмольнасцю гэткай паляка,

Ultaque jam dominabatur[46] Prussis ipsa superbis,
Sub ditione sua tenet aeternumque tenebit
Oppida, rura, viros, arces, et praedia, portus.
Fata propinquabant et sidera fausta favebant
Posse truces Germanorum superare catervas,
Atque alacris nimium volitabat milia circum
Laeta Polonorum crepitans victoria laude,
Stemmata, tum titulos, necnon de strage triumphos
Egregios ducibus, victricia dona, corollas
Daphnaeas plectebat et acri caede juvabat.
Ast alia Eumenidum circum fera cincta corona
Tisiphone, Prussorum inter se milia miscens,
Taenario terrore gravi praecordia pulsat
Maesta virum, nimium crudelis imagine mortis,
Spemque fuga minitans reboabat vulnera saeva.
Omnia multivago interea clamore gemebant,
Aethera tum belli fragor, arva replebat et antra,
Nam patria virtute virum superando Poloni
Agmina rumpebant, vexillaque gentis honora
Victores hosti rapiebant strage secundi.
Ardebat saevo in bello et discrimina gessit
Ulla[47] ducum procerumque haec effera turba Polonum.
Ecce miser casu sese obtulit ipse Magister,
Pallidus ore nimis membrisque trementibus inter
Reliquias maesti, infelicia milia, belli,
Insigni virtute viro titulisque decoro
Belligeris, sibi qui maestum caput amputat atque[48]
Ejus honoratis spoliis indutus et armis
Inter Martiacos praestanti laude Polonos
Canduit, externis necnon veneratus in oris.
Turbula maesta virum duce sic spoliata superbo,
Vulneribusque gravata et viribus extenuata,
Currere tentabat, sed cursus clausus ab omni
Parte fuit radianti milite Marte feroque.
Sub juga pars sua loca[49] dabat, pars cetera tetris
Intermixta cadaveribus sua membra tegebat.
Pars duplices erecta manus flectebat atroces[50]

Запанавала яна ў сваёй помсце над прускаю пыхай ганебнай;
Сёння ж уладна пануе і ўтрымліваць будзе навечна
Крэпасці, вёскі, людзей, гарады, і маёнткі, і порты.
Лёс і нябёсы прыхільна цяпер уплывалі на тое,
Каб канчаткова палякі разбілі атрады германцаў.
Хутка лятала над войскам палякаў сама перамога,
Славай шматгучнай звінела, дафнійскіх вянкоў і гірляндаў
Мноства сплятала яна ў падарунак усім пераможцам;
Для ваяводаў яна трыумфальныя песні складала
Ды суцяшала тугу па загінуўшых воях адважных.
З іншага ж боку змяіным вянком Эўменідаў спавіта,
Прускае войска бянтэжачы, злая ляціць Тызіфона,
Стукае страхам ліхім тэнарыйскім у смутныя душы
Вояў у вобразе жудаснай смерці, надзею на ўцёкі
Ім падае, а сама сваёй зброяй жахлівай грукоча.
Воклічам жудасным гучна стагнала тады наваколле,
Грукат вайны напаўняе нябёсы, палі і пячоры…
Што ж – перавагу ад продкаў у доблесці маюць палякі,
Бо пабіваюць шматлікую раць і сабе забіраюць
Мноства варожых сцягоў пераможцы шчаслівыя ў бітве.
Польскія ўсе ваяводы, князі аж дагэтуль ніколі
Так не палалі ў вайне, не змагаліся так апантана.
Вось і няшчасны магістр спаткаў сваю смерць нечакана.
З бледнасцю ў змучаным твары і з целам дрыжачым, у цэнтры
Сечы крывавай, між трупаў, акружаны войскам гаротным
Гэты дастойны ваяр незвычайнай адвагі і славы
Страціў жыццё, калі нехта адцяў галаву яму раптам,
Потым даспехі яго ганаровыя ўздзеў і забраў яго зброю,
Славай вялікай заззяўшы сярод ваяўнічых палякаў,
Славай, якая дайшла і да межаў чужынскіх народаў[12].
Рэшткі германцаў, якія згубілі цяпер ваяводу,
Абнемагліся ад ран і, знясілеўшы ў бітве крывавай,
Бегчы хацелі – аднак адусюль ім шляхі перакрыты
Доблесным войскам суровага Марса. Вось з тых, хто застаўся,
Частка падставіла шыі свае пад ярмо, а другія,
Перамяшаўшыся з мёртвымі, імі сябе прыкрываюць.
Іншыя, сумна узняўшы абедзве рукі, да суровых

Maesta viros, sed inania pectore verba refudit.
Nulla fuit pietas precibus lacrimisque rogantum[51],
Germanus quoniam perflabat corpora fastus
Saeva Polonorum, gladii missique cruenti.
Omnia gentis erant tunc agmina caesa superbae[52];
Scuta ducum, arma virum, vexillaque cuncta recepta,
Quae super insigni nutant modo fixa sepulcro
Atque tholo venerande tui Stanislae fani[53],
Victor ab horrenti rediens quae Sarmata bello
Foeda cruore nimis taboque rigentia fixit,
Atque tuae laudi haec insignia clara dicavit.
Quae vix ferre potest paries, asarotaque miris
Condecorata modis variisque cavata figuris.
Ista tui bellacis avi, invictissime regum[54],
Dextera sustulerat, tanto redimita triumpho,
Quo nitet aeternumque nitebit, amoena corusci
Limina transgrediens Phoebi, pulchrumque decorem
Et famam patriae titulis renovando vetustis.
Perfida quos conata fuit Germania saepe
Suppetiis aquilae validis pessumdare nigrae,
Urbes Prutenas et prata virentia, gentes
Libertare tributis et ditione Polona;
Sed quia sub tantis defecerat ante duellis,
Quae per avum atque tuum patrem lacerata tot annis
Pertulit: – ut venator iners, qui tigridis ungue
Saucius et fulvi vel acuto dente leonis,
Caede madens necnon letali vulneris ictu,
Hinc atque hinc graditur luci tenebrosa pererrans
Culmina, scabrosis circumpendentia tophis,
Pallidus ipse feram timet occursare rapacem:
Sic etiam non immemor actae caedis amarae,
Quamvis mille modis ausus subducere contra
Jam molita fuit, sed sic perterrita mussat
Stragibus horrendis regni sub limite gestis,
Quas Valachi sensere truces, vicina colentes
Arva Ruthenorum, Nomades etiamque severi,
Qui terram praedabantur clam saepe Polonam,
Tum Vasil, Scythicae moderator perfidus orae,

Вояў брыдуць, надарэмна рыхтуючы скрушныя словы.
Не, не было тут спагады да слёз і малітваў чуллівых:
Пыха германская ўзрушыла моцна суровых палякаў,
Іх абурыла дасланне мячоў тых скрываўленых вельмі.
Так было знішчана войска таго ганарыстага люду;
Ратнікаў зброя, шчыты палкаводцаў з харугвамі разам,
Што здабываліся ў бітве, над слаўнай магілай прыбіты,
Ззяюць пад купалам храма ў твой гонар, святы Станіславе!
Мужны сармат-пераможца прынёс іх з вайны той жахлівай,
Гноем прасмердлыя, кроўю залітыя, ўзняў іх угору
І заявіў, што прынёс гэты велічны скарб у твой гонар.
Ледзьве трымаюць там сцены мазаікі[13] гэткай аздобу
З тонкім арнаментам і адмысловай мастацкай чаканкай.
Гэтыя скарбы дзясніца твайго ваяўнічага продка,
Непераможны кароль, узняла з найвялікшым трыумфам,
Што зіхаціць на вякі і сягае за межы ўладанняў
Яснага Феба, каб зноў аднавіць непахісную годнасць,
Ратную велічнасць і старажытную славу Радзімы.
Часта Германія знішчыць хацела яе вераломна
Пры наймацнейшай падтрымцы злачынных сваіх легіёнаў,
Каб пладаносныя прускія нівы й мястэчкі пазбавіць
Ад ненавіснай даніны і ўладніцтва Польскай дзяржавы;
Толькі прыйшла ў заняпад ад такога праціўніка тая,
Што паражэнні цярпела ад дзеда твайго і ад бацькі, –
Як паляўнічы няўдалы, паранены моцна зубамі
Дзікага рыжага льва або кіпцямі лютага тыгра,
Кроўю сцякае, бляднее, слабее ад раны смяротнай,
Ды прадзіраецца ўсё ж праз гушчар, хоць не бачыць напрамку;
Туфы шурпатыя[14] зверху над ім навісаюць, а сам ён
Думае з жахам адно: не сустрэцца б з імклівым звяругай, –
Гэтак Германія, помнячы тыя суровыя бітвы,
Хоць намагалася тысячай спосабаў тайна нашкодзіць,
Толькі, застрашаная, нібы той паляўнічы, маўчала,
Зведаўшы некалі жорсткі разгром каля межаў дзяржавы, –
Так, як і дзікае племя валахаў, што ўзворваюць землі
Блізу русінаў, або як суровыя вельмі намады
Тыя, што польскія землі таемна рабуюць няшчадна;
Як і Васіль, уладар вераломны са скіфскага краю,

Qui cum tot turmis equitum peditumque catervis
Inter Lithuanae vastissima jugera terrae
Corruit, et victus latitat Riphaea pererrans
Culmina Caucaseosque situs, circumflua necnon
Littora, Cimmerius quae lambit Bosporus ipse
Undaque vel Maeotidos aut septemplicis Histri.
Tales fama parit celebres tibi semper honores
Et nec deficiens crescet paritura futuros
Cum tonitru belli, Rex o justissime, tanti,
Quo jam nunc aequas et avi praestantia magni
Facta, quibus tremuit bellax Europa tot annis,
Dum Jagello velut fulmen de nube nigranti
Ense coruscabat cataphractis atque sub armis
Inter Prutenas acies cuneosque potentes.
Felix hic tanti Jagello gloria belli[55],
Qui modo praecellit clarorum gesta parentum,
Ingenio celebres priscos fortes et in armis
Vincens martiacis cum tot feliciter actis.
Cui, tu Roma, tuos noli annumerare Camillos,
Marcellum, Fabios et Caesaris optima gesta,
Hectora, Troja, tuum, fortem, Larissa, et Achillem,
Hannibalemque tuum, Carthago superba, ferocem;
Et quos Persae, Arabes, Parthi Graique loquaces
Commemorant, retro huic cedant virtutis honore
Egregii et gestis proceres regesque potentes.

Што ваяваў на бязмежных прасторах Літоўскай дзяржавы
З мноствам вялікім і конных, і пешых ваенных атрадаў…
Ён, пераможаны ў бітве, уцёк за Рыфейскія горы,
Потым дайшоў да Каўказа і земляў сумежных, якія
Сам цымярыйскі Басфор абмывае вадою, таксама
Шчэ й мэатыйскія хвалі, і хвалі шматводнага Істра[15].
Гонар вялікі прыносіць табе, о кароль справядлівы,
Вечная слава твая, што з вякамі ўзрасце для нашчадкаў
З рэхам магутным вайны той суровай, дзе ты параўнаўся
З ратным геройствам твайго знакамітага продка – пры ім жа
Столькі гадоў ваяўнічая ў страху трымцела Еўропа;
Сам той Ягайла між тым, як маланка з пахмурнага неба,
Мечам сваім бліскацеў пад аховаю вояў і зброі
Ў гушчы магутных кліноў вельмі моцнага прускага войска.
Шчасны цяпер той Ягайла, бо з гэткаю славай ваеннай
Подзвігі продкаў далёкіх намнога цяпер перавысіў,
Талентам перасягнуў сваіх мужных дзядоў знакамітых,
Перамагаючы ў дзеях ваенных на Марсавым полі.
Не прыраўноўвай яго ты, о, Рым, да Камілаў, Марцэла,
Фабіяў слаўных тваіх і да Цэзара велічных дзеяў,
Гектара мужнага, Троя, твайго і Ахіла, Ларыса,
Да Ганібала твайго, Карфаген непакорны і храбры!
Тыя цары і вяльможы, якіх праслаўляюць арабы,
Персы, парфяне і грэкі шматмоўныя, не дасягаюць
Славы яго, надзвычайнай адвагі і подзвігаў ратных.

Incipit libellus tertius

Iuppiter, aethereae dominatur maximus aulae,
Qui res humanas mundique negotia vasti
Ac pelagus terras pro nutu et sidera torquet,
Videret e solio grandaevum aetate superno
Hunc regem et sterilem triplici de coniuge patrem.
Qui ne deficeret gnatis aut stirpe sequaci,
Omnes caelicolas nitidi super atria caeli
Convocat et iubet arbitrio inservire sacrato.
Mox Jovis imperio mixti divique deaeque
Interiora poli replent pulcherrima clari
Et circum solium divi glomerantur amoenum,
Mutua sub tacitis referentes murmura verbis:
Quae nova causa deum cogit compellere nostrum
Huc omnes super arctoi convexa nivosi?
Quos sic altitonans circum sese undique septos
Dum vidit, veniam cunctis dedit ipse sedendi,
Optima per placidum faciendo silentia nutum.
Postquam jussa quies tacito sub corde resedit,
Atria cuncta poli cohibens a murmure celsi,
Intonuit placidis clemens deus ipse susurris,
Quem pia multivago mox sunt comitata volatu
Fata nec infesso non eminus effera gressu:
"Parrhasis Oceano nunquam demersa profundo[1]
Ursa, gelu nivibusque rigens albisque pruinis,
Orbis in amfractu praelata sui fovet alta
Canitie maturum regem et prole carentem,
Expertum trinos thalamos, Hymenaee, jugales
Et fescenninas, Conjunx dilecta, palaestras.
Aurea quem steriles Venus indignata tot annos,
Inficiens nuptas, aptum canescere fecit,
Gradivusque pater similem traducere vitam
Cogit in horrendo belli crudelis amore:
Sanguine adhuc crudo manat Prutenica tellus,
Ossibus humanis at agri rivique referti.
Cujus amor nobis decorare propagine famam
Et decus immortale nepote parare toroso[2],

Пачынаецца кніга трэцяя

Вышні ўладар паднябесных палацаў магутны Юпітэр,
Што чалавечыя ўчынкі і справы вялізнага свету,
Мора, нябёсы, зямлю накіроўвае ўладай сваёю,
Ўбачыў з вышыняў сваіх караля ў шаноўным узросце,
Бацьку, не меўшага плоду, хоць тройчы ўжо быў ён у шлюбе.
Той жа, хто меў дастаткова дзяцей, сваякоў паслухмяных,
Склікаў багоў найвышэйшых да ясных пакояў нябесных,
Даўшы наказ, каб усе прынялі яго волю святую:
Так па загаду яго ўсе багі і багіні сышліся,
Хутка яны напаўняюць пакоі прасторнага неба,
Боскі чароўны сталец абступаючы разам наўкола,
Словамі ціхімі перамаўляюцца паміж сабою:
“Што за прычына таемная змусіла нашага Бога
Ўсіх нас сабраць тут над купалам поўначы снежнай?”
Тут Грамавержац убачыў, што з розных бакоў абступілі
Хутка яго ўсе багі. Ён дазволіў ім сесці сукупна
Ды загадаў супакоіцца ўзмахам рукі непрыкметным.
Тут цішыня ўсталявалася і супакоіла душы,
Разам пазбавіўшы гому шаты высокага неба;
Бог міласэрны, з якім разам крочылі спрытнай хадою
Добрыя лёсы – у хуткай часіне, ліхія – здалёку[1]
Голас падаў грамавы сярод ціхай гамонкі, сказаўшы:
“Тая Мядзведзіца[2], што ў акіян не сягае ніколі,
Змёрзшы ў халодных снягах, між ільдоў, у інеі белым,
Стаўшы высока на ўскрайку краіны сваёй, апякае
Сівавалосага там караля, які плоду не мае,
Хоць паспытаў ужо тройчы ў жыцці ён твой шлюб, Гіменею[3]
Дый фесцэнінскія[4] ўцехі таксама, каханая жонка.
Вось і Венера яго састарэлым зрабіла у гневе,
Што столькі год ён у шлюбах пражыў, не аплодніўшы жонак.
Бог[5] з непахіснай хадою яму прапануе на свеце
Жыць, як і ён – у суровым імкненні да войнаў жахлівых:
Цёплай крывёю бруяцца й цяпер яшчэ прускія землі,
Косці забітых людзей напаўняюць там нівы і рэкі…
Наша ж любоў да яго прынясе яму гонар з нашчадкам,
Бо бессмяротныя лаўры здабудзе унук яго моцны,

Cui nomen Sismundus erit, quem Martis honore
Felicem toto faciam renitescere mundo.
Qui Tanaim bibet atque Borysthenis amne natabit,
Tartarus et sua jussa capesset compede vinctus
Patria regifico renovando moenia juxu.
Sed ne tantus honor pueri regisque futuri
Succumbat, quod cuique placet, nunc afferat ipse".
Inter quos candens niveo pulcerrima vultu[3]
Regia Juno suum sic est affata Tonantem:
"O dilecte mihi conjunx venerandeque frater,
Audivi tua dicta libens meditataque multum
Desuper[4] ingemui hac in laude nepotis honora,
De quo sacratis retulisti multa labellis.
Huic puero fasces et ego promitto serenos,
Et faciam reges fulvi praestare metalli
Divitiis. Conversa ad Pallada sic ait: "O tu
Diva potens, scro nostri cerebro orta mariti,
Huic etiam capitis sapientes instrue vires
Ac facias pulchro ingenio praecellere cunctos".
Astans immani truculens cum cuspide Mavors[5],
Circum quem Furiae atque truces ex ordine Mortes
Pallebant belli et caedis fragor ense coruscans,
Cum tonitru vocem referebat pectoris echo:
"Hunc juvenem, – ait, – de quo nunc res est omine fausto,
Praecelebrem validis victorem semper in armis
Infrenas bello faciam pessumdare turmas,
Optima sanguineae tribuens sibi dogmata pugnae".
At Cypris, alta trahens imo suspiria corde,
– Quis caput, os roseum, vel eburnea colla, capillum[6]
Auro persimilem ac redolentem opobalsama dicet? –
Ora rigans lacrimis gemituque serena modesto:
"Indignata fui jam tot labentibus annis
Ipsa viro, sed acerbi nunc me parnitet acti,
Nec referam caecae meritas irae modo causas.
Ex quo, Juno, Jovi fatisque est tanta cupido
Sublimare virum, qui stirpe attinget Olympi
Culmina, et omnigenis fama renitebit in oris,
Insequar alma dei praeconia fataque nostris

Што Жыгімонтам пазней назавецца, і з гонарам Марса
Слава яго з маёй волі па ўсім белым свеце заззяе.
Ён з Танаіса нап'ецца, ракой паплыве Барысфенам,
Тартар, кайданамі скуты, чакаць яго будзе загадаў;
Ён з каралеўскай аздобай адновіць і родны свой горад[6].
Каб жа той гонар дзіцяці, пазней – караля – не зглуміўся,
Хай цяпер кожны дадасць, што здаецца яму неабходным".
Ззяючы тут між усіх сваім светлым абліччам, Юнона
Велічная да свайго Грамавержца звярнулася гэтак:
"Муж мой каханы і браце шаноўны, усе твае словы
Слухала я з захапленнем і, ў сэрцы разважыўшы ўдумна,
Стала прыхільнай і я да гонару слаўнага ўнука –
Вусны святыя твае ўжо шмат гаварылі пра тое.
Гэтаму хлопчыку я абяцаю шчаслівую ўладу,
Перасягне ён багаццем і золатам іншых манархаў. –
Тут да Палады звярнуўшыся, так ёй сказала: – Багіня,
З чэрапа мужа майго ты, магутная, выйшла калісьці.
Дык паспрабуй з галавы яго мудрасць пазычыць, каб хлопчык
Талентам велічным мог перавысіць астатніх, – зрабі так!"
Марс ваяўнічы падняўся з вялізнаю дзідай – навокал
Бледныя Фурыі з лютаю Смерцю стаяць у шарэнгу,
З імі й ваенная слава мячом патрасае крывавым,–
Рэха з грудзей грамавы яго голас панесла паўсюдна:
"Хлопца таго, пра якога прадвесці шчаслівыя чую,
Я пераможцам славутым у войнах зраблю назаўсёды,
Будзе у бітвах заўжды разбіваць ён імклівыя турмы,
Я навучу яго ратным законам крывавае сечы".
Тут і Кіпрыда, з высокіх грудзей выпускаючы стогны, –
Хто б апісаў яе вусны румяныя, белую шыю,
З водарам тонкім бальзаму яе валасы залатыя! –
Светлы свой твар залівае слязьмі і ўздыхае глыбока:
"Гэтулькі часу я злобу трымала на слаўнага мужа –
Сёння ж я каюся ў гэтым гаротным учынку – і нават
Не растлумачу прычыны дастойныя гневу сляпога.
Словы, Юнона, твае і Юпітэра мне падказалі,
Каб я узвысіла мужа, які дасягае Алімпа
Родам высокім сваім і славай грыміць па ўсім свеце.
Прыкладам Бога і я прынясу яму добрыя весткі,

Auxiliis propere cogam revirere secundis".
Aiens haec oculos detersit et ora rigata:
"Est mihi nympha Ruthenorum speciosa sub orbe[7],
Nympha puellarum pulcherrima, nympha dearum,
Terricolae Zophiam proprio quam nomine dicunt,
Omnes quae priscas heroidas atque puellas
Praestat in oris honore sui et sermonis amati.
Hanc sibi conubio jungam Thalamoque dicabo
Et faciam vastum felicem prole per orbem".
Dixerat haec Amathusiaca, annuit omnipotensque
Juppiter et Tegees sic est affatus alumnum[8]:
"Perge sub algentis mavortia regna Bootis
Sarmaticasque domos celer, ad penetralia regis,
Hic ubi formosae splendescunt moenia Crocae,
Vistula quae repido circumfluit undifer alveo.
Illic invenies senio ac aetate gravatum
Regem, qui rigidis fert optima jura Polonis,
Quem Jagello vocant patrio sermone coloni.
Huic mandata feres, dicens: Venerande senescens,
Altitonans rutili regnator summus Olympi,
Maesta senectutis incommoda, quae modo perfers[9],
Tum steriles sine stirpe dies miseratus amaros,
Indoluit, stabili firmans haec foedere divum,
Ut peteres Zophiam, praestanti corde puellam,
Aptam conjugii aptam prolis honore sequacis,
Quae modo lata Ruthenorum colit arva potentum.
Illa duos pariet formoso corpore reges[10],
Qui tibi, dum tellus, amnes ac astra manebunt,
Perpetuam facient vivaci nomine famam
Ac Jagellonidam per saecula posteritatem.
Qui patriam rector succedet prosper ad aulam,
Is Casimirus erit, longus victurus in amnos[11].
Nam lustris quassabit humum sub sole novenis,
Parturiens natos celebres natumque nepotes,
Qui per multijugas candescent nomine terras
Et tollent ultra nitidi caput ardua caeli
Sidera, magnificis crescentes semper in actis.
At qui Pannonicas gentes reget atque Polonas,

Зноўку зраблю маладым пры нашай спрыяльнай падтрымцы. –
Выцерла слёзы з вачэй і далей прадаўжае прамову: –
Ёсць у мяне чароўная німфа ў краіне русінаў,
Боская німфа – яна прыгажэйшая ў свеце дзяўчына.
Імем адметным – Соф'яй [7] – яе суайчыннікі клічуць,
Перавышае яна гераіняў часоў старажытных
Славай сваёй прыгажосці, выключным яшчэ красамоўствам.
Дам яе ў жонкі яму, сама абвяшчу іх вяселле
Ды ашчасліўлю яго на ўвесь свет я жаданым нашчадкам", –
Так Аматунтка сказала. Кіўнуўшы, магутны Юпітэр
Кліча свайго выхаванца Тэгейца і гэтак гаворыць:
"Хутка ідзі ў каралеўства паўночнае пад Валапасам [8]
Ты да Сармацкай зямлі, да саміх каралеўскіх пакояў;
Там узвышаецца горад цудоўны славутага Крака,
Вістула бурным патокам навокал яго абцякае.
Знойдзеш старога ты там караля; абцяжараны векам,
Ён закон справядлівы прынёс для суровых палякаў –
Імем Ягайла завуць яго людзі на мове айчыннай,
Ты перадай яму наша рашэнне у словах наступных:
"Старац шаноўны! Найвышні ўладар залатога Алімпа
Бачыць у скрусе нягоды, якія ты ў старасці церпіш,
Горкія дні ў бясплоддзі ліхім, без жаданых нашчадкаў.
Ён ад нарады багоў дасылае падтрымку прыхільна:
Соф'ю ад нас атрымаеш, цудоўнага сэрца дзяўчыну,
Здатную вельмі да шлюбу, да роду твайго прадаўжэння,
Што пражывае ў прасторнай краіне магутных русінаў,
Двух каралёў народзіць яна з цудоўным абліччам,
Памятным імем сваім прынясуць яны славу навечна,
Род абяссмерцяць Ягайлавы годны на многа стагоддзяў,
Колькі яшчэ існаваць будуць землі, і воды, і зоры.
Успадкаеміць адзін – Казімір – каралеўскую ўладу
Ў роднай краіне, і многа гадоў пражыве ён у шчасці.
Дзевяць ён будзе таптаць пяцігоддзяў зямлю пад нагамі [9].
Будзе ён мець знакамітых сыноў і сыноўніх нашчадкаў,
Тых, што ў шматлікіх краінах праславяцца велічным імем,
Галавы ўздымуць высока свае, вышэй за сузор'і
Яснага неба, ўзрастаючы ў велічных дзеях.
Іншы ўладарыць пачне ў Панонскай і Польскай краіне,

Ladislaus erit, belli fragor horridus acri[12].
Qualiter infandis nato succedet in armis
Huic, quia nent Parcae, sileo, sua fata severae".
Talibus auditis petiit Tegeaticus ales
Moenia celsa senis. Coram quae rite peregit;
Expletis tandem aerias remeavit ad auras.
Majugenam stupefactus avus monituque beato
Concitus ingemuit, prolis gavisus amore
Ac fati celebris; mox coepit volvere corde
Conubium pulchrae specimen nuptaeque decorum.
Advocat aurigeros proceres arcanaque mentis[13]
Judicat, et coram nuptam sociare poposcit.
Omnes unanimo consensu haec atque fremebant,
Languidus ut sponsae se jungeret ipse modestae.
Nuntia multivago volitans per compita motu
Fama, senis taedas regis reboabat amoenas;
Undique vulgus iners thalamos canit, undique nupta
Per plateas, vicos, per publica strata refertur[14],
Quam regi fatis promissam sponte vehebat
Taedifer arctoas Hymenaeus prosper ad aedes.
Tympana tacta sonant, multi reboant et agyrtes,
Pulsatae referunt voces cytharaeque fidesque.
Innumerae veniunt turbae veniuntque catervae,
Auro conspicuae nitidis gemmisque decorae
Portantes nuptam praestanti tronte Ruthenam.
Ingreditur virgo fatalem candida sedem
Aulaeis Tyrioque rubentem comiter ostro.
Suscipit amplexu teneram Jagello puellam,
Hancque tenens dextra regalem duxit in aulam
Discubuit toro, pariter cum conjuge, strato,
Et cum purpureis ducibus, chlamydataque turba.
Jamque dapes coram redolebant, vinaque fulvis[15]
Massica spumabant cyathis, quae compta juventus
Portabat mensas omnis[16] onerando decoras.
Sed jam tempus erat, quo rex frueretur amanda[17]
Virgine, et hoc etiam suadebat roscida Phoeba,
Adveniens noctis caecae praecincta tenebris.

Уладзіслаў, непахісны ваяр у спаборніцтвах ратных.
Ён і закончыць нібыта жыццё сваё ў войнах жахлівых, –
Толькі маўчу, бо суровыя Паркі снуюць свае кросны".
Гэта пачуўшы, Тэгеец крылаты адправіўся хутка
Ў горад да старца і там перадаў яму ўсе як належыць;
Скончыўшы справу, вярнуўся назад да нябесных вышыняў.
Усхваляваны цудоўным прадвесцем ад Маі нашчадка,
Старац заплакаў у радасці, верачы ў лёс свой шчаслівы,
Роду свайго прадаўжэнне; пасля ён падумаў разважна
Пра найдастойнейшы шлюб і нявесту – узор прыгажосці.
Залатаносную раду ён склікаў і выказаў тайну
Сэрца свайго, папрасіўшы ад іх бласлаўлення да шлюбу.
Аднагалосна ўсе пагадзіліся радасна з гэтым,
Каб, ужо стомлены, ён ажаніўся са сціплай нявестай.
Хутка па розных шляхах паляцела звястоўная чутка,
Каб караля састарэлага шлюб абвясціць, і паўсюдна
Бедны народ распявае вясельныя песні, у вёсках
І па гасцінцах шматлюдных нявесту ўсхваляюць, якую
Наканаваннем шчаслівым прынёс каралю з Божай ласкі
Факеланосны Гімен да ягоных паўночных палацаў.
Б'юць у тымпаны наўкол, жабракі навіну абвяшчаюць,
Гукі кіфары і ліры разносяцца звонка навокал.
Людзі збіраюцца гуртам бясконцым, вялізным натоўпам.
Дзіўна ўпрыгожана золатам, ззяе каштоўным каменнем
Світа, што едзе з надзвычай прыгожай нявестай-русінкай.
Дзева цудоўная да залатога стальца падыходзіць,
Што чырванее квяцістым радном з пурпуровай тканіны.
Вось маладую дзяўчыну пяшчотна абняўшы, Ягайла
Моцнай дзясніцай уводзіць яе у палац каралеўскі,
Разам з пяшчотнаю жонкай і з мноствам князёў знакамітых,
Світа у строях прывабных за стол урачысты сядае.
Водар ад страў уздымаецца, пеняцца ў кубках каштоўных
Віны масійскія – іх юнакі ў цудоўным адзенні
Хутка нясуць, наліваючы ўсім да сталоў разубраных.
Час наступае, аднак, каралю атрымаць асалоду
З любай дзяўчынай – да гэтага вабіць і месяц вільготны,
Што узыходзіць, акружаны покрывам цёмнае ночы.

Post epulas, cenaeque sales, post gaudia, luxus
Membra soporiferae laetus dedit ipse quieti,
Usus et nuptae[18] placido fervore tenellae
Nocte sub ancipiti, majori digna cothurno
Quae foret. Andini vel carmine digna poetae
Haec nox, quae fausto duplicatam sidere noctem
Amphitryoniadis domitoris vicerat orbis,
Qua rex cum nupta recubans est nactus honorem
Prolis et egregiam per saecula posteritatem.
Edidit hac geminos praestanti virgine reges
Claros Martiacis per mundi climata gestis.
Quod patuit celsi gelidis sub collibus Haemi[19]
(Thraces adhuc memorant), rubuit dum sanguine Strymon
Varnaque Bulgariis residens famata sub arvis,
Saevus Hamurates puero dum proelia regi
Moverat et victor malefida fraude potitus
Occidit tenerum juvenem cum gente Polonum.
Cui diadema suum regali sede coruscum
Pannonici dederant proceres, dum rege carebant:
Quem Maumethacis devictum turpiter oris
Liquerunt. Hoc sed facimus meminisse nefandum
Heu dolor acer adest, animus gemituque refugit.
Post hunc insignes patrias direxit habenas[20]
Successor Casimirus atrox, qui strage rebelles
Prutenos domuit post grandia bella parentis;
Optimus ille senex tantaeque propaginis auctor,
Qui celebres ex Austriaca tot virgine natos
Prodidit et pulchras retinente nepote puellas,
Quas meminisse decet modulisque referre sonoris.
Diva mares numero memora gracilesque puellas[21]
Et memorans claro tollas super aethera cantu:
Sex genuit fratres teneras septemque sorores[22],
Quarum laus vireat Germanis condita Musis
Nam Veledae regione toros novere ducales,
Ducere quas modo non voluit cum nomine famam
Pallida mors, servans gravidae telluris in alvo.
At qui candidulis caeli nituere sub astris

Вось шчаслівы кароль па сканчэнні вясельнага піру
Цела сваё аддае ціхмянаму сну і спачынку,
З легкім душэўным уздымам мілуе пяшчотную жонку
Ноччу таемнай, якая дастойна была б больш узнёслых
Твораў; была б яна вартая вершаў паэта-андыйца[10],
Гэтая ноч, што пад зоркай шчаслівай цягнулася долей
Ночы падоўжанай волата, Амфітрыёнава сына[11].
Гэтаю ноччу кароль спарадзіў разам з любаю жонкай
Гонар навечна для роду свайго і дастойных нашчадкаў.
З дзевай цудоўнай стварыў ён дваіх каралёў знакамітых,
Подзвігам Марса па ўсім белым свеце праслаўленых гучна.
Іх гераізм праявіўся ля снежных Балканскіх вяршыняў
(Помняць пра тое фракійцы), калі чырванелі крывёю
Слаўная Варна й магутны Стрымон у балгарскай краіне,
Люты тады Гамурат[12], караля асадзіўшы падлетка,
Пры дапамозе падману злачыннага стаў пераможцам,
Знішчыў бяздушна таго юнака [13] разам з войскам палякаў.
Ён атрымаў ад панонскіх князёў, што жылі без манарха,
Знак каралеўскай улады – карону бліскучую, толькі
Быў ён пакінуты імі, калі атрымаў паражэнне
Ад Магаметава войска. Успомнім злачынства ліхое –
Ах! – не мінае туга, хоць цураецца сэрца самоты.
Потым утрымліваў лейцы вышэйшай улады ў краіне
Грозны кароль Казімір, што ўтаймоўваў у бітве суровай
Прусаў мяцежных[14], як некалі бацька ў вайне векапомнай.
Гэты выдатны ўладар, што велічных меў спадкаемцаў,
З жонкай аўстрыйскай сваёй нарадзіў сыноў знакамітых[15],
З імі й прыгожых дачок, што народзяць магутных унукаў,
Іх нам успомніць належыць і ў песні апець мілагучнай.
Дык прыгадай жа сыноў і цудоўных дачок, о Багіня[16]
І, прыгадаўшы, ўзляці з урачыстаю песняй да неба:
Ён нарадзіў шэсць братоў і сямёра сясцёр найпрывабных,
Слава якіх квітнее, апетая Музай германскай:
Княжацкі шлюб спазналі яны ў краіне Вяледы;
Не захацела, аднак, некаторым з іх славу падоўжыць
Бледная смерць і ва ўлонне зямлі абцяжаранай скрыла[17].
Вось жа і тыя, што славаю ззялі пад купалам зорным

Longo fulvicomum speculantes tempore Phoebum,
Patria felici rexerunt omine sceptra:
Primus Joannes Albertus cepit honorem[23]
In solio regni post patria fata Poloni,
Qui fuit heroum regumque athleta potentum
Maximus et belli (sed iniquo sidere) fulmen.
Alter Alexander fratris successerat aulae,
Vir sermone potens, vir et virtute nitescens[24],
Optimus Astreae cultor fotorque puellae,
Quem sors non voluit fieri sine nomine regem,
Sed super astrigerum victorem misit Olympum
Jam fera squaliduli calcantem limina leti
Insigni faciens florere ex hoste triumpho.
Audax Lithuanis quem sensit Tartarus agris[25]–
Res vulgata satis – testis quoque Clecia moles.
His sine prole truces ruperunt stamina Parcae
Et mors indignata polum sic trusit ad altum[26].
Tertius Hunnorum Ladislaus sceptra potentum
Atque Bohemorum praeclara insignia regum[27]
Gestat honoratus, Lodovicus cui optima proles
Ardua Pannonici regni spes atque Bohemi[28].
Tandem Cristicolae fidus gregis ille patronus,
Pontificum Fredericus honor, tutelaque cleri
Nobilis, ecclesiae duplices qui gessit habenas[29],
Sacrata renitens tereti cervice tiara.
Post hunc et juvenis nec praetereundus adest, qui
Clarus erat cumulis virtutum semper honestis,
Ille tuus frater Casimirus, quem Venus ulla[30]
Per foedum nunquam potuit deprendere luxum,
Femina nec placidis nec pulchra puellula verbis,
Sed sic pertaesus taedas thalamosque procaces
Culmina siderei castus possedit Olympi;
Condita cujus opem miseris mortalibus ossa
Sacra ferunt, multis etiam solamina maestis.
At nunc o juvenis fer opem sacrate Polonis[31]
Et patrium tutate[32] solum fratremque modestum
Qui modo cum diris gerit effeta[33] proelia Moscis.
Te nunc aggredior, patriae Sismunde Polonae

Ды пазіралі ў нябёсы на залатакудрага Феба,
Тыя, што скіпетр моцны шчасліва трымалі ў дзяржаве:
Першым з іх Ян быў Альберт, што прыняў ганаровую ўладу
На каралеўскім стальцы пасля смерці шаноўнага бацькі:
Быў ён магутны атлет між усіх каралёў і герояў,
Волатам быў на вайне (хаця пад нядобраю зоркай)[18].
Брат Аляксандр прыняў ад яго каралеўскую ўладу,
Муж красамоўны, сваёй дабрачыннасцю слаўны таксама,
Велічнай дзевы Астрэі надзейны і верны прыхільнік;
Лёс караля не хацеў, каб застаўся навечна бясслаўным
Ён, пераможца, – і вось, калі межаў жахлівае смерці
Ўжо дасягаў той кароль, то з трыумфам над ворагам лютым
Накіраваў яго лёс да нябесных вышыняў Алімпа.
Дзёрзкі татарын адчуў яго сілу ў межах літоўскіх –
Гэта вядома для ўсіх, таму доказ — цвярдыня пад Клецкам[19].
Паркі жахлівыя ім абарвалі жыццё без нашчадкаў,
Лютая смерць падштурхнула іх душы ў высокае неба.
Трэці магутны ўладар у краіне багемцаў і гунаў, –
Уладзіслаў найшаноўнейшы[20], што каралеўскія знакі
Нёс з найвялікшай пашанай; а сын яго слаўны, Людовік[21],
Быў спадкаемцам улады ў панонскай краіне й багемскай.
Моцным заступнікам, верным патронам Хрыстовага статка
Быў Фрэдэрык[22], між епіскапаў слаўны, высокага кліру
Цвёрды аплот; за дзве лейцы трымаў ён царкоўную ўладу,
На галаве яго гладкай зіхцела святая тыяра.
Трэба яшчэ прыгадаць аднаго юнака, што быў слаўны
Высакародствам выключным сваім і годнасцю вартай,
Гэта твой брат Казімір, якога Венера ніколі
Гнюснай раскошай сваёй не прывабіла, не спакусілі
Ні маладзіцы, ні нават дзяўчыны панадлівым словам,
Бо ён цураўся з агідай вяселляў, пажадлівых шлюбаў
І ў чысціні дасягнуў паднябесных вышыняў Алімпа;
Пахкія мошчы святыя яго нікчэмным смяротным
Сілу прыносяць, а многім пакутуючым – суцяшэнне[23].
Так і цяпер, о юнача святы, дай жа сілы палякам,
Край барані свой айчынны, таксама й шаноўнага брата,
Што з маскавітамі грознымі ў бітвах змагаецца лютых[24].
Вось да цябе падыходжу цяпер, Жыгімонце, айчыны

O decus et Casimiriadae pars ardua famae[34],
Qui tibi cum titulis nomen paris inter Hiberos
Atque vagos inter Garamantas et ultra[35]
Aurorae Phoebique cubile ac Doridos amnes,
Tu quia turbatam tanro discrimine rerum
Per Martis strepitus et per crudelia caeli
Sidera, fatigero versantia cuncta rotatu,
Hanc patriam in medio errantem sine remige ponto,
Ut puppim Maleae subituram dente profundum,
Providus incolumem statuisti litore Tiphys.
Cujus et augusta moderaris limina dextra
Atque tuos populos placida sub pace Polonos,
Pro quibus haud aspernaris tolerare labores
Ac grandes curas spinoso vellere fetas,
Quando subis maturo dura pericula fronte,
Impiger arma gerens, fremitus bellique cruenti
Pro patria, casus et pro virtutis amore
Omnigenos gestas, nec non horrescis et aestus
Ipse pati, caligo crepitat dum Sirius igni
Aut Boreas gelidis dum saevit in orbe pruinis.
Quas prius illius trucis ante exordia belli
Pertuleras, Scythicis turmis procul ense fugatis
Belligero a celsae Smolensis moenibus arcis,
Dum tetro respersa Borysthenis undula tabo
Atque virum innumero repleta cadavere rubrum
Litora cum gemitu volvebant uda cruorem,
Illo septembri, quo victricem retulisti
Fronte tua laurum, pessumdans agmina magni
Multa ducis Scythici, dives spoliis et opimis
Cum tot mancipiis belli vexilla ferendo
Ad tua Lithuanae praestantia moenia Vilnae.
O victor celebris patriae pater atque Polonae,
Vive diu vegetus, cum tot praestantibus orsis
Fatidicae transcendens omnia lustra Sibyllae
Pulveris Euboici numero[36] Pyliamque senectam.
Macte animo et virtutis amore opibusque beatis!
Egredere, ac diris vicina remotaque bellis
Arva situ vasto circumflua gurgitis alti,

Польскай краса, Казіміравай славы дастойная частка;
Ты заслужыў сабе гонар з пашанаю між іберыйцаў
І гарамантаў-качэўнікаў, перасягнуўшы пенаты
Феба з Аўрорай, таксама і воды бурлівай Дарыды,
Бо ў небяспецы вялікай, у грозным становішчы, мужна
Пад навальніцаю Марса, пад зоркай ліхою, якая
Ўвесь белы свет закруціла ў смяротнай віхуры, радзіму,
Што без грабца разгубілася ў водах бязмежнага мора,
Як карабель, што наблізіцца хутка да страшнай Малеі,
Ты, о прадбачлівы Тыфіс, прывёў у спакойную гавань.
Межы айчыны трымаеш ты моцна свяшчэннай дзясніцай,
Польскім народам кіруеш ва ўлонні ўцешнага міру,
А за народ свой гатоў ты панесці любыя пакуты,
Выпрабаванні, нібыта з руном залатым[25], і нядолю,
З поўнай адказнасцю ты на сябе небяспеку ўскладаеш,
Войскі збіраеш нястомна, вядзеш у крывавыя бітвы
На абарону айчыны, хоць часам з-за доблесці мужнай
Церпіш ліхія нягоды, хвалюешся моцна, трывогу
Чуеш, калі бурным полымем Сірыус дыхае моцна
Ці калі люты Барэй бушуе над снежнай прасторай.
Клопаты меў ты яшчэ й да пачатку вайны той суровай:
Скіфскія турмы[26] мячом ваяўнічым цябе адагналі
Прэч ад высокіх смаленскіх муроў, – і тады ў Барысфене
Афарбаваліся гноем страшэнным празрыстыя воды,
Поўныя трупаў забітых жаўнераў: на бераг вільготны
Хвалі кацілі чырвоную кроў са стагнаннем жахлівым.
Потым той верасень быў[27], што табе пераможныя лаўры
Шчодрай рукою прынёс: ты адолеў шматлікае войска
Скіфскага князя вялікага, многа ваеннай здабычы,
Многа варожых харугваў з палоннымі хутка даставіў
Ты да высокіх муроў тваёй велічнай Вільні Літоўскай[28].
О, пераможца славуты, айцец нашай польскай айчыны,
Доўга жыві, поўны сіл, сваёй славаю велічных дзеяў
Перасягнуўшы сівыя вякі старажытнай вяшчунні,
Мудрай эўбейскай Сібілы, таксама й Пілоскага старца.
Дзякуй табе за апеку, хвала твайму мужнаму сэрцу!
Выйдзі з суровай вайною да земляў далёкіх і блізкіх,
Што амываюцца водным бязмежжам глыбокага мора, –

Quae niger Indus arat, Nasamon quoque, nauticus horror,
Vel Medus, Macedo, Parthus Phariusque colonus,
Perdomita, subigens ditioni; cetera sponte
Palladiae ramos mittent adversus olivae
Regna tibi, pandentque suas nova moenia portas.
Threiciusque sinu applaudet tibi Bosporus arcto,
Per facilem tribuens Byzantia jugera Martem
Vincere, Turcaicis longum possessa ministris,
Ac propiore situ tibi Taurica serviet ora,
Quae fuit ante poloninis[37] subjecta tyrannis.
Et sic Augusto feliciter omnia rege
Vivent, armorum tonitru procul orbe recluso
Sarmatico, gladios tribuendo vomeri acutos
Thoracas simul et galeas, rubini[38] aduncas.
Optima pax erit, advenient Saturnia regna:
Nec terras gelidus boreas nec fervidus auster
Concutiet validis saevo cum frigore nimbis
Te duce, sed nostris splendescet clarior oris
Phoebus et aura solum zephyro florente replebit.
Vivas ergo, precor, vivas habiturus honores
Prosper et incolumis majori laude frequentes,
Quam mea Pierio tulit Aonis aegra sub antro,
Et tandem repetas rutilum sed serus Olympum.
Pontus et aura silet, fluitans jam litora puppis
Nostra tenet rebiem superando gurgitis atram.

ΦΣΙΠΓ

Чорны індус, назамон – пагроза на моры, парфянін
І македонец, яшчэ егіпцянін абходзяць там нівы;
Ты прывядзі іх да ўлады сваёй, а другія дзяржавы
Хай дасылаюць галіну аліўкі табе са спагадай[29],
Дзіўныя хай гарады для цябе адчыняюць вароты,
Плешча няхай у твой гонар фракійскі Басфор невычэрпны,
Каб авалодаць ты мог зямлёй візантыйскай, якую
Вельмі даўно святары захапілі з турэцкай дзяржавы.
Хай верна служыць табе і край недалёкі таўрыйскі,
Што падначалены быў уладарнікам польскім калісьці,
Хай жа шчасліва жывуць яны пры каралі найвышэйшым,
Хай не разносіцца болей у межах сармацкай краіны
Рэха суровай вайны, хай пакрытыя чорнаю ржою
Перакуюць на аралы мячы, і даспехі, і шлемы.
Мір усталюецца шчасны тады, век Сатурна[30] настане:
Аўстр спякотны, халодны Барэй больш не будуць ніколі
Трэсці зямлю тваю, княжа, ліхой навальніцай і сцюжай,
Феб найяснейшы заззяе над нашай шчаслівай краінай,
Толькі лагодным Зефірам напоўнена будзе паветра.
Будзь жа шчаслівы і доўга жыві, за цябе я малюся,
Каб атрымаў ты вялікую славу, якую прынесла
Да піэрыйскага гроту мая Аяніда слабая,
Ты ж дасягнеш, хоць у веку старым, залатога Алімпа.
…Мора і неба маўчаць, карабель наш у супрацьстаянні
Хвалям бурлівага мора цяпер берагоў дасягае.

КАНЕЦ

Joannis Visliciensis ode tricolos tetrastrophos
ad Serenissimum principem
Sigismundum Regem Poloniae etc.
super suum cum Scythis duellum victoriamque de eisdem octava Septembris, alias ipso die Nativitatis Mariae faustiter nactam sub anno salutiferae incarnationis Domini M.D.XIV.

Cur ode lyrico carmine scripta sit, lectori decastichon.

* * *

Convenit ut roseo cervicem comere serto,
Vernat Acidaliae dum rosa pulchra deae,
Atque referre melos hilari de pectore dulce,
Dum spirat placidum tempus et hora notum:
Sic etiam lyricos mihi convenit edere cantus,
Cum praestant laetos parta trophaea sonos.
Quare, si quis ades praesens ad carmina lector
Non pigeat lyricos perlegere, oro, meos,
Gaudia qui referent saevi dulcissima belli,
Quod cum Sithonio Sarmata gessit hero.
Ingens per arcton rumor in auribus
Boat sonoris carmina plausibus,
Ferens triumphi laeta clari
Gaudia multijugas ad oras,
Quibus caballis aureus igneis
Phoebus ministrat lumina candida
Surgens eois de fluentis
Dum volat hesperios in amnes.
Atque his, remotae qui juga doridos
Domant severis legibus, hic ubi
Thule profundo cincta ponto
Noctibus est tenebrosa magnis:
Canuntur illic haec nova gaudia,
Quae jam cruento est nacta Polonia
Bello, ducem vincens potentem
Te duce Sigisimunde dextro.
Quod est timori gentibus exteris,
Quod est honori militibus tuis,

Ода Яна Вісліцкага
да Найяснейшага Уладара Жыгімонта,
караля Польшчы і г. д.,
прысвечаная яго вайне са скіфамі і шчасліва атрыманай перамозе над імі 8 верасня, або ў самы дзень нараджэння /Панны/ Марыі ў год збавеннага ўцелаўлення Панскага 1514

Дзесяціradкоўе для чытача,
чаму ода напісана лірычным памерам

* * *

Так, як належыць вянок ускладаць на галовы ружовы
Ў час, як распусціцца квет Ацыдалійкі самой;
Так, як салодкая песня з грудзей вырываецца шчасна
Тою парой, калі ўсё дыхае цёплай вясной, –
Гэтак належыць ствараць мне лірычную светлую песню:
Поспех, здабыты ў вайне, кліча і радасны спеў.
Так што, чытач, калі звернеш увагу на гэтыя вершы,
Ведай: ад лірыкі тут брыдка не будзе табе;
Песня раскажа пра вынік шчаслівы вайны той суровай,
Дзе ваявалі сармат і сітанійскі[1] ваяр.
Гучыць бязмежнай славы нязмоўчны гімн,
Паўночны край напоўніў магутны спеў;
Трыумф усцешны абвяшчае,
Радасць па ўсёй зямлі разносіць
Для тых, каму святло залатога дня
Нясе з вышынь на конях агністых Феб:
Прамень праліўшы ад усходу,
Шпарка ляціць да заходніх межаў;
Для тых, што той далёкі паўночны край
Законам грозным моцна трымаюць там,
Дзе востраў Тэла сярод мора,
У атачэнні цёмнай ночы.
Там новай светлай радасці галасы,
Што Польшча ў жорсткай сечы перамагала
Тваёй дзясніцай, Жыгімонце,
Моцнага правадыра чужынцаў.
І гэта ўсім народам на вечны страх,
Тваім жа воям – гонар вялікі, што

Pauca manu plures cohortes
Qui Stygias pepulere ad undas.
Plangat gementi jam Scytha pectore,
Canat sonoro Sarmata gutture,
Figens tholis vexilla sacris
Scuta simul renitentia et[1] arma,
Natalis almae quae Mariae die
Pugil torosus sustulit hostibus,
Lithuana quos suos per orbes
Senserat, heu! regio molesta,
Necata quorum foeda cadavera,
Disjecta passim per loca plurima,
Habet feraces jam per agros
Per nemorum latebrasque caecas.
Beate tanti Martis honoribus
Sismunde, regni stemma virens sui,
Tribus decorus qui triumphis
Omnigenas renites per oras:
Primum tulisti de duce Mysio,
Fero secundum de Nomadum grege,
Qui saepe clam tuae solebant
Depopularier arva genti:
At nunc severa perdomiti tua
Dextra Polonos non violant agros,
Flammis et urbes non adurunt,
Sub juga sed tibi colla praestant:
Velut leoni capreolae truci,
Lupo bidentes vel tenerae fero,
Quas sors suis prius benigna
Faucibus eripuit cruentis.
Quo jam coruscas, tertius ordine
Adest triumphus sidere prospero,
In quo ducem victum potentem
Martiaco sequeris tumultu.
Bifrons serenos si tulerit dea
Flatus amoenis laeta favens labris,
Tropaea quae tibi ministrat
Lumine, cernis ut ipse, claro,

Малою сілай столькі войска[2]
Зрынулі ў цёмныя хвалі Стыкса.
Няхай цяпер заплача гаротны скіф:
Сармат узносіць свой пераможны кліч
І сам развесіць у святыні
Мноства харугваў, шчытоў і зброі,
Якую ў дзень Раства Багародзіцы
Ваяр нязломны выставіў ворагам.
Літоўскі край! О колькі болю
Вораг прынёс у твае ўладанні!
Цяпер жа трупы ворагаў мёртвых скрозь,
Па ўсіх мясцінах гэтай зямлі ляжаць:
На плодных нівах і палетках,
На мурагах і ў глухіх цяснінах.
О Жыгімонце, кветка сваёй зямлі,
Ты шчасны ў славе Марсавай гаспадар,
З трыма трыумфамі ў аздобе[3]
Ззяеш па ўсіх краінах свету.
Ты князя мызаў сам перамог найперш,
Пасля – намадаў дзікіх ліхую раць,
Якія часта рабавалі
Плодныя землі твайго народа.
Дзясніцай жа ўпакораныя тваёй,
Не нішчаць сёння польскіх палёў і ніў
І гарадоў агнём не паляць,
Шыі табе пад ярмо схіляюць,
Як быццам козы перад ліхім ільвом
Або ягняты перад ваўком, якіх
Шчаслівы лёс пакуль што вырваў
З іх ненажэрнай крывавай пашчы.
Цяпер настаў і трэці трыумф, якім
Пад зоркаю шчасліваю ззяеш ты
І пераможанага князя
Гоніш далей у віхуры Марса.
Калі багіня, глянь, двухаблічная[4]
Надасць натхнення з вуснаў прыгожых мне,
Табе ж прызначыўшы трафеі

Non hunc rapaces Cimmerii sinus,
Non hunc profundi stagna Borysthenis,
    Maeotis aut palus recondet
        Aut Tanais gelidi fluenta.
Solum Tonanti salvifico pios
Offer precatus, Cristiparae quoque,
    Cujus dies tibi triumphum
        Obtulit e Scythico duello,
Prosper potentes quo superas duces,
Quos docta vatum commemorat chelys,
    Laetis decori qui triumphis
        Temporibus nituere priscis,
Tollens vetustos Scipiadas duos
Martis cruenti bellica fulmina
    Augusti amoena vel tropaea
        Hannibalisque potentis arma,
Pyrrhum ferocem ac Dulichium ducem,
Tum Marte clarum nomine Julium,
    Qui primus orbis sceptra vasti
        Post Macedum tenuit superbum.
Tot bella vates prospera principum
Aut gesta regum candida fortium
    Tollant poli licet sub axem
        Perpetua referendo laude,
Furore quamvis non bene Delio
Sit plena nec non Aonidum sacris
    Vadis, tamen cantus refundit
        Musula nostra tuo decori,
Haec gesta cunctis bellica posteris
Tollens canoris alcaicis modis,
    Riphaea plebs quae nunc severo
        Marte nimis tenuata sentit;
Et post refundet, si dabit Atropos
Matura vati ducere stamina,
    Post terga vinctum dum reduces
        Vashil[2] ad indigenos penates,
Dum fronde flavam laurigera comam

Ў ясным святле, як бачыш, – значыць,
Драпежных цымрыйцаў далёкі край
Ці воды Барысфена глыбокага
І Мэатыйскае балота,
І Танаіс на схаваюць князя[5].
Ты Збаўцу Вышняму ўзнясі цяпер
Малітву чыстую й Багародзіцы:
Яна табе ў свой дзень прынесла
Гэты трыумф у вайне са скіфам.
Пераўзышоў ты славай валадароў,
Якіх успамінае паэт-вяшчун:
Яны ў стагоддзях пракаветных
Светлай аздобай трыумфаў ззяюць,
Ды нікнуць Сцыпіёны перад табой,
Што, бы маланкі Марса, былі ў вайне,
І Аўгуста ваенны подзвіг,
І Ганібала-героя бітвы,
Неўтаймаваны Пір, Дуліхіец-князь
І нават Юлій – Марсава слава – ён
Сусветам цэлым авалодаў
За Македонцам вялікім следам.
Хай вешчуны ўсе войны валадароў
І каралёў магутных подзвігі апяюць
Да ўсіх вышыняў паднябесных,
Вечную ім забяспечаць славу, –
А я, хоць мой Дэлоскі[6] слабы запал,
Ды Музачка мая заспявала ўсім
Пра поспех твой, хай не стае ёй
Чыстай вады Аянід свяшчэнных;
Алкейскім вершам песню складае, каб
Для ўсіх нашчадкаў подзвіг уславіць той:
Адчуў рыфейскі люд, як значна
Сёння здрабнеў ён ад кары Марса;
Калі сатчэ Атропа даўжэйшы век,
То і пазней працягне вяшчун спяваць,
Калі з рукамі за спіною
Ты Васіля[7] завядзеш дахаты,
Калі з вянком лаўровым на галаве

Cinctus subibis regia moenia,
Hac sorte candens inter omnes
Oceani dominos solique.
F I N I S

Ad Reverendissimum in Christo patrem et dominum

DOMINUM PETRUM TOMICZKI

Dei gratia Episcopum Premisliensem ac vice
Cancellarium regni Poloniae meritissimum
Joannis Visliciensis
Jambicum trimetrum Archilochicum
pro commendatione libellorum suorum Regiae majestati

Dejectus acris casibus Nemesis ferae
Trucibusque fatis ac iniquo siderum
Nutu, benigne Praesul et dignissime,
Fudi melos tristis molesto pectore:
Ut turtur orba sub nece vel olor sua,
Haud aliter et ego sub severo hoc tempore.
Nam vere non solum canit philomela vel
Palara vel merulus, sed et corvus croat:
Sic post amoeni hujus duelli tempora
Vates oloribus cantu licet pares,
Quos vasta nutrit et fovet Polonia,
Siluere nec prompsere candens hoc decus
Belli, quod ego labore Castalis meae
Prompsi, Polonis vatibus dispar licet,
Si non ad unguem rectam et ad amussim, tamen
Ut barbarum vatem decuit et Sarmatam.
Nec imputet mihi benignitas tua,
Parnasidum nam veles hoc primum fero
Munus decori patriae carae suae
Tibique, Pollio meus dignissime,
Tutela – fama est sic – virorum docilium.
Quem non ferox fortuna sed virtus sacra
Extollit in dies – det Atropos nisi

Ты ў горад каралеўскі ўвойдзеш сам
І гэткі ж лёс для ўсіх прызначыш
Уладароў акіяна й сушы.
КАНЕЦ

Да найпаважанейшага ў Хрысце айца і пана

Пана Пятра Таміцкага

з ласкі Божай біскупа Перамышльскага
і найшаноўнейшага віцэ-канцлера Каралеўства Польскага
Архілохавы ямбічны
трыметр Яна Вісліцкага
дзеля рэкамендацыі яго кніг Каралеўскай Вялікасці

Нападам Немезіды злой прыгнечаны,
З нядобрым лёсам, з зоркай неспрыяльнаю,
О, апякун спагадны, найшаноўнейшы,
З грудзей журботных песню выпускаю я,
Як перад смерцю горліца самотная
Ці лебедзь – так і я ў суровы гэты час.
Бо, сапраўды, не салавей адзін ці дрозд
Спяваць умеюць – крук таксама каркае.
Вось так, праз доўгі час пасля ліхой вайны
Паэты, што да лебедзяў падобныя, –
Іх песціць шчыра Польшча неаглядная, –
Маўчалі пра бліскучы ратны подзвіг той,
Што я апеў, натхнёны Касталійкаю,
Няхай ад польскіх вешчуноў адрозны я,
Недэталёва, недакладна, мо, спяваю тут, –
А так, як варварскі вяшчун і як сармат.
Не палічы за грэх мне, о вялебны пан,
Што я, вяліт[1], ад Пегасідаў першы дар
Нясу на гонар Бацькаўшчыне і табе,
О найшаноўнейшы і годны Пеліён,
Мужоў вучоных, кажуць, шчыры апякун.
Цябе ўзвышае не фартуна зманная,
А цнота… Мо, табе Атропа й не спрадзе

Niveo tibi prolixa fuso stamina) –
Et tollet in summum, ministra cui mea
Erit chelys, materteraque plausus dabit
Omni modo tibi tuaeque virtuti,
Tantum celebris qua nites. Pateat, precor,
Nec desit ille mos, misellis mos pius,
Quo fers querentium querelas et preces
Regi, meos etiam hoc modo libellulos
Feras suae laudi dicatos, et rudem
Vatem recommenda tuum, Praesul pie.

Elegia ad deiparam Virginem Mariam pro sedanda peste

Regia Jessaei veneranda propago parentis
Atque Palaestinae fama superba plagae,
Aspice de superis terrena incommoda regnis
Nec non Sarmatici tristia culta soli.
Affer opem miseris virgo benedicta Polonis,
Quos premit infecto pestis acerba noto.
Pestis echidnaeo crudeli tincta veneno,
Pestis funerea non satiata fame,
Atropon infernis truculentam misit ab antris,
Quae rumpit populi stamina, Virgo, tui.
Omnia pessumdat furibunda tui exta popelli,
Et necat omnigenis vivida membra malis.
Nec parcit glavis haec effera Parca puellis
Nec cuiquam iuveni parcit et illa seni.
Iam satis innumeris repletus manibus Orcus,
Undique feta tumet terra cadaveribus.
Pomifer auctumnus per tantum brumaque tempus
Iam satis in populo damna tulere tuo.
Temperies rediit post tristia veris amoeni
Et fert caeruleo gramina pulchra solo,
Mutavit natura vices iam cuncta renident,
Pulchrior et verno tempore Phoebus adest.
Post tantos casus, incommoda pestis amarae,

На белым калаўроце нітку доўгую,
Высока не ўзнясе, – ды служкай будзе ёй
Мая вяшчуння-ліра; матчына сястра[2]
Табе аддасць паклон і шчырай годнасці,
Якой ты ззяеш ясна… Дык прашу, няхай
Трывае ўсцешны для мізэрных звычай твой,
Што ты прашэнні сам заносіш каралю.
То занясі ж яму й мае ты кніжачкі
На славу каралю, рэкамендуй яму
Твайго паэта маладога, о патрон!

Элегія да Багародзіцы Панны Марыі з просьбаю пра ўтаймаванне чумы

О каралева, нашчадак шаноўнага роду Ісаі,
Ты ў Палясціне здаўна славай сваёю ўзрасла.
Глянь з паднябесных вышыняў на нашы ліхія нягоды
І на тужлівы прастор беднай Сармацкай зямлі.
О блаславёная Панна, падай дапамогу палякам,
Тым, якіх пляміць чума злосным заразным кляймом.
Ліха-чума набрыняла пачварнай атрутай Яхідны;
Ліха-чума нам на смерць у ненажэрстве сваім.
З нетраў падземных да нас пасылае ліхую Атропу,
Каб у народа твайго нітку жыцця абарваць.
Гіне няшчасны твой люд у раз'юшаным балі смяротным,
Ад усялякіх нягод многа сканала жывых.
Не, не шкадуе пачварная Парка ні гожых дзяўчынак,
Ані прывабных хлапцоў, ані сівенькіх дзядкоў.
Многія сотні цяпер перапоўнілі Оркус жахлівы,
Нівы, палеткі даюць трупаў багаты ўраджай.
Плодная восень і з ёю зімовае сцюжы часіна
Многа прынеслі пакут, стратаў народу твайму.
Ды пасля жалю ўзнавілася светлай вясны памяркоўнасць,
Шчыра прынесла зямлі покрыва свежай травы.
Свет пераменамі дыхае, радасна ззяе навокал,
І прыгажэе сам Феб гэтай вясновай парой.
Дык пасля гэткай нягоды, чумы ліхадзейнай, страшэннай

Mitior et nati sit precor ira tui.
Quam rubeis opali radiis viridesque smaragdi
Non placant Arabo Cytis et ipsa freto,
Solum cor hominis purum nec labe nigratum
Et tu sola magis flectere, Virgo, potes.
Ille preces meritas non temnit matris amandae
Nec negat optatis plurima dona tuis,
Sed quaecunque cupis, pacato fert tibi vultu,
Arridens votis quidlibet ipse facit.
Quem non mille chori sanctorum, Virgo, parentum
Atque prophetarum vox lacrimosa senum
Aethera transferiens erebi detraxit ab undis
Ob protoplastum talia passa nefas,
Sed tu sorde casens mali, pia Virgo, molesti
Necnon eximia virginitate nitens.
Quem prius antiqui vates et dicta Sibyllae
In gremio nasci praecinuere tuo,
Illapsum portasti utero gremioque sacrato,
Ubere lactasti Virgoque casta suo.
Ad quem magna facis maiora potens, precor, istam
Fac pellat rabiem de regione feram,
Atque salutarem fac nobis praestet ut auram
Et populo clemens sit, precor, ipse suo,
Aspera convertens in mitia fata severae
Pestis, Sarmaticum qua riget ecce solum[1].

Epigramma in invidum

Zoile cur spectas ridigo mea carmina vultu
Cur maculas digitis rite notata suis?
Hic nihil invenies, nuper licet ore latrasti
Nullius pretii carmina nostra fore.
Et si mendosi quicquam conspexeris, istud
Calcographos vitium non mea musa tulit.
Perlege correctas signato ex ordine mendas:
Sic tutum fiet carmen ubique meum.

Хай жа суцешыцца гнеў слаўнага Сына твайго.
Чырванню многіх апалаў і ззяннем зялёных смарагдаў
Цытыс[1] арабскі не змог сам улагодзіць яго.
Толькі бязгрэшнае сэрца і ты, міласэрная Панна,
Пераканаюць яго гнеў на спагаду змяніць.
Ён не адхіліць ніколі пакорлівай матчынай просьбы
І не адмовіць табе ў міласці шчодрай сваёй;
Разам з табой усміхнецца, малітвы прыхільна пачуўшы,
Што ты папросіш сама – тое табе ён і дасць.
Бо не шматтысячны збор айцоў найсвяцейшых, о Панна,
І не тужлівы харал многіх прарокаў сівых
Вывеў таго, хто пакуту прыняў за наш грэх першародны,
З нетраў Эрэбу і ўзнёс да паднябесных вышынь, –
Гэта ўсё ты, блаславёная, вечна бязгрэшная ў сэрцы
Панна, што ззяеш заўжды светлай дзявоцкасцю нам.
Той, пра каго гаварылі прарокі, вяшчуння Сібіла,
Што ён табой без граху мусіць народжаны быць,
Трапіў ва ўлонне бясшкодна, дзе ты яго, Панна, насіла,
Потым карміла сама чыстым сваім малаком.
Вось я прашу: ты, зрабіўшы так многа для сына, зрабі так,
Каб свой няўрымслівы гнеў ён ад радзімы адвёў,
Хай са здаровым паветрам Ён сам прынясе нам ратунак,
Стане спагадным няхай Ён да народа свайго.
Хай жа абернуцца лёсам шчаслівым суровыя церні
Гэтай чумы, ад якой стогне Сарматыя ўся[2].

ЭПІГРАМА НА ЗАЙЗДРОСНІКА

Што так сурова глядзіш ты на вершы мае, о Заіле,
Ганьбіш ізноў іх… Чаму? Тыцкаеш пальцам сваім…
Ты ў іх нічога не знойдзеш, хоць гэтак брахаў тут нядаўна:
Вершы благія, маўляў, дробненькі грош ім цана.
Можа, і ўбачыш ты тут пару хібаў – дык тое, клянуся,
Грэх выдаўцоў, а не мой. Муза ж мая – без заган.
Хочаш, сядзі й вывучай вунь памылак заўважаных шэраг –
Песня ж мая й надалей будзе ў бяспецы заўжды.

APPENDIX

Elegia Magistri Pauli Crosnensis Rutheni
ad Joannem Vislicium, Pieridum cultorem,
discipulum non poenitendum

Laetor Joannes, laetor carissime, nosse
Quod tibi sit sacras maxima cura deas,
Et quod amor celsos tibi sit conscendere colles
Labraque facundis sicca rigare vadis,
Hic ubi perpetuo virides florescere lauros
Cernis, et Aonii flumina laeta chori,
Et quod mellifluo rogites modulamine Musas,
Ut tirocinio dent bona flabra tuo.
Gratulor ingenio, quod me impulsore novenas
Ceperis ardenti pectore adire deas.
Bellerophontei tibi jam scaturire caballi
Incipit irriguis fons memorandus aquis,
Et Parnasiaco tibi jam revirescere monte
Gaudet daphnaeis Delphica silva comis,
Castalidesque tibi parili certamine divae
Virginea texunt laurea serta manu,
Ut tua Phoebaeis splendescant tempora ramis
Et gestes studii munera digna tui.
Jam tibi laurigerae referunt pia murmura silvae
Cirrhaeoque cadens nobilis unda jugo,
Ipseque plectripotens citharam Gryneus eburnam
Et tradit manibus plectra canora tuis,
Suggerit et pleno tibi dulcia carmina cornu
Copia et ingenio larga fluenta tuo.
Erga age jam coeptum, qua fert sacer impetus, urge
Et dedas studiis lora citata sacris,
Victor praecelso residens sub vertice Cirrhae,
Despiciens stolidi murmura vana gregis.
Nam tibi suppeditat sensus natura profundos
Mellitisque replet labra rotunda favis,
Qui modo Prutenae lusisti proelia gentis,

ДАДАТАК

Элегія магістра Паўла Кросненскага Русіна
да Яна Вісліцкага, аматара Піэрыдаў, вучня,
не вартага ўшчування

Вельмі я ўсцешаны, Ян, дарагі мой, дазнацца, што сёння
Вабяць найболей цябе справы свяшчэнных багінь[1];
Радасна бачу, што хочаш узняцца да самых вышыняў,
Каб з красамоўных крыніц вусны сухія паіць.
Бачыш цяпер, што заўжды распускаецца лаўр і што вечна
Спеў Аянійскіх багінь ладным харалам плыве.
Рад я, што просіш ты Муз сваім голасам, слодычы поўным,
Ветразям першым тваім вецер спрыяльны падаць.
Талент вітаю, які, як я раіў, задумаў у сэрцы
З гэткім запалам душы дзевяць багіняў спазнаць.
З вечнай крыніцы[2] каня славутага Белерафонта [3]
Светлы імкнецца струмень, воды прыносіць табе.
Вунь на Парнаскай гары зеляніна Дэльфійскай[4] дубровы
Лісцем дафнійскім[5] сваім шчасна красуецца зноў.
Ткуць для цябе Касталіды святыя ў спаборніцтве роўным
З лаўраў зялёных вянкі шчодрай дзявочай рукой.
Час неспрыяльны, ліхі хай заззяе галінкамі Феба,
Ты ж прынясі гэты дар, варты і годны цябе.
Пошум лаўровых лясоў да вушэй тваіх гожа імкнецца,
З высяў Цырэйскай гары чысты спадае струмень,
Слаўны музыка Грынейскі[6] дае табе шчыра кіфару
З косці слановай, а з ёй – гучныя плектры яшчэ;
Песні салодкія сыпле табе, быццам з рогу дастатку,
Хоча, каб талент твой плыў рэчышчам вольнай ракі.
Што ж, пачынай і ідзі, куды кліча святое натхненне,
Лейцы свабодна пусці творчым задумам сваім,
Седзячы, як пераможца, пад стромкай вяршыняю Цыры,
Можаш не слухаць зусім гвалт неразумных людзей.
Шчодра прырода цябе пачуццём напаўняе глыбокім,
Гожыя вусны твае поіць салодкім мядком;
Вось праспяваў ты нядаўна пра бітву з тым прускім народам –

Proelia Smyrnaeis emodulanda tubis.
Hoc age, ne minimas contemnens sedulo mendas,
Aspergas maculis maxima scripta nigris.
Ut turpe est modicis frontem foedare serenam
Naevis, sic parvis scripta notare notis.
Nec tibi dedecori sit syllaba mensa frequenter
In digitos decies et repetita tuos.
Et tu vaniloqui contemnas murmura vulgi,
Mendaces sacros quod boat ore viros.
Quod quoque magnificis animum seducere coeptis
Nititutr a studiis et revocare bonis.
Nugatur, nam sancta canunt documenta poetae
Et verum resonant musica scripta sophos,
Multijugoque tegunt speciosa poemata cultu,
Quo nunquam vulgus cernere possit iners;
Dogmata, vilescant ne forte patentia cuique,
Gaudent abstrusis occuluisse locis.
Gratius est certe magno sudore repertum,
Quodve imo clausit terra profundo specu.
Pervenit in lucem fulvum pretiosius aurum
Necnon e rubris eruta gemma vadis.
Post crassas nebulas, post densa tonitrua, tandem
Blandius aethereo promicat orbe jubar.
Quare age fatidicas, moneo, venerare sorores
Et corde implores numina magna pio.
Saepius et celsos consuescas scandere colles,
Quis recinunt castae carmina casta deae.
Et niveo studiis incumbas pectore veris,
Quis latitat veri clara figura sacri.
Sic tua laurigeris cingentur tempora sertis,
Dicerisque tui splendor honorque soli.
Cirrhaeaque feres messem de valle potentem,
Quae superat fulvi ditia dona Tagi.
Nec te proposito disterreat ulla benigno
Cura, sed incepta dispatiare via.
Nam licet accessus primus videatur acerbus,
Usu redduntur mollia cuncta suo.
Sic durum miro ferrum splendore nitescit,

Бітву, што вартай была гукаў смірнейскіх[7] саміх.
Пільна сачы, каб не зганьбіў праз хібы нязначныя раптам
Чорнымі плямамі ты велічных твораў сваіх:
Так, як радзімымі знакамі тварык прывабны псуецца,
Гэтак ад дробных заўваг твор будзе толькі марнець.
Гэта не ганьба зусім – размяркоўваць склады акуратна,
Хоць дзесяць пальцаў настаў, іх паўтараючы зноў.
Дый пагарджай балбатнёю тупога, нікчэмнага люду:
Ён самых мудрых людзей можа лгурамі празваць.
Як жа ён пнецца душу адцягнуць ад высокіх задумаў
Ды перашкодзіць хоць чым добрым намерам любым!
Марна сакочуць! Паэты свяшчэнныя шлюць нам парады,
Мудра іх творы для нас словам праўдзівым гучаць;
Лепшым паэмам яны надаюць адмысловыя шаты,
Праўда, тупым прастакам іх не разгледзець ніяк.
Думкі, адкрытыя іншым, так лёгка зняважыць любому!
Вось чаму любіць паэт твор свой таемна трымаць.
Тое прыемна найбольш, што здабыта вялікаю працай, –
Тое, што скрыла зямля ў нетрах бяздонных сваіх.
Перлы з Чырвонага мора і чыстае золата нават
Стануць каштоўней, калі будуць здабыты на свет.
Пройдуць грымотныя хмары, а з імі сплыве навальніца,
Неба заззяе ізноў ясным і чыстым святлом,
Так што прымайся хутчэй за служэнне тым сёстрам прарочым,
Бостваў вялікіх малі сэрцам і шчырай душой.
Смела ідзі, прывыкай на вяршыні высока ўздымацца –
Музы чароўныя там чыстыя песні пяюць.
Шчыра душой беззаганнай да творчасці вернай імкніся,
Тоящца, скрытыя ў ёй, вобразы праўды святой.
Час твой аздоблены будзе лаўровым вянком неўвядальным,
Горда цябе назавуць славаю роднай зямлі.
Добрае ўчыніш жніво ты ў плодных Цырыйскіх далінах,
І перавысіць яно жоўтага Тага[8] дары.
Слаўных задумаў тваіх хай турботы зусім не пужаюць,
Вернай дарогай сваёй смела ісці пачынай.
Часам пачатак здаецца надзвычай складаным і цяжкім,
З цягам работы, аднак, вернецца мілы спакой.
Цвёрдае гэтак жалеза дзівоснай прывабнасцю ззяе,

Argentique nitens cedit adusque decus.
Sic parva aridulas scintilla inflammat aristas,
Sic fuligo amplas concremat atra domos.
Sed tua ne tenui lassentur lumina nervo,
Scriptaque sint stomacho displicitura tuo,
Ultima jam nostris imponam verba camenis,
Atque addam musis dura lupata meis.
Sit tibi, qui summis me semper laudibus effers,
Gratia Pieriis non reticenda modis:
Te quoque, quem juvat altisono praedicere versu
Bella, poetarum stemmata ferre decet.
Nam qua me dignum censes, tibi gloria parta est:
Et nova Vislicii carmina pondus habent.
Accipias igitur vultu mea carmina laeto,
Carmina Sarmaticis rusticiora locis,
Carmina ab ingenio raptim deprompta tenello,
Atque simul calamo commodulata cito.

Pro recommendatione dissertissimi Phoebeae lyrae moderatoris Joannis Visliciensis ad invictissimum Sigismundum, Poloniae regem,

CARMEN Valentini Eckii Philiripolitani

Quis Trojae cineres, ithacum quis nosset Ulissem,
Ni Salaminiace viveret artis opus
Sive quis anguigenae nosset modo bella cohortis
Stacius excultum ni cecinisset opus
Dardanius caeca, princeps sub nocte jaceret
Ni foret andini buccina clara viri,
Sic tu Sarmatiae fueras, Rex magne, premendus,
Obstitit at vatis Musa verenda tui.
Quae canit altisona pomposos voce triumphos
De Prussis partos, de trucibusque Getis,
Quos nec tempus edax abolebit sive canini
Osorum[1] rictus vel truculenta lues
Immo perpetuum tua laus laudumque tonator
Vivent: nam gelida morte talia vacat.
Ergo tuo multum debes Rex inclite vati
Melliflua cecinit, qui tua gesta cheli.

Адшліфаванае, глянь, – так, быццам срэбра, блішчыць.
Гэтак маленькая іскра падпаліць сухія палеткі,
Мноства вялікіх дамоў спаліць у попел, ушчэнт.
Каб жа ж зусім не саслаблі, не страцілі сіл твае вочы,
Каб і напісаны твор не надакучыў табе,
Словы апошнія ўжо даручаю я нашым каменам,
Музам сваім нацягну лейцы тугія цяпер.
Хваліш мяне ты заўсёды – а сёння табе я складаю
Шчыра падзяку, прычым на піэрыйскі манер:
Ты ўпадабаў гучным вершам спяваць пра ваенную славу,
Годны за гэта цяпер ты паэтычных вянкоў.
Славу прыпісваеш мне – яе Вісліцкі варты не меней:
Новыя песні яго маюць, бясспрэчна, вагу.
Так што прымі мае песні з прыхільнай душою і сэрцам,
Песні, прасцейшыя, мо, як для Сармацкай зямлі.
Спешна здабыты былі тыя песні нядужым натхненнем,
Потым запісаны тут гэтым вось хуткім пяром.

ВЕРШ Валянціна Экія Філірыпалітанскага

для рэкамендацыі непераможнаму каралю Польшчы Жыгімонту вельмі вопытнага майстра Фебавай ліры Яна Вісліцкага

Хто б мог пра Трою пачуць, пра Уліса з Ітакі хто б ведаў,
Каб саламінскі вяшчун песняў сваіх не стварыў?
Хто б ведаў ратныя дзеі вайскоўцаў змяінага роду?
Добра, што Стацый апеў іх у паэме сваёй!
Дый правадыр сам дарданскі[1] ляжаў бы пад покрывам ночы,
Каб не пяснярка-труба мужа-андыйца[2] таго!
Гэтак, сармацкі кароль, мог бы ты ў забыцці апынуцца,
Ды запярэчыла ў тым Муза твайго вешчуна.
Гучна спявае яна, як разбіў ты і прусаў, і гетаў,
Голасам звонкім пяе пра перамогі твае.
Іх ні бязлітасны час, ні зайздроснікаў пашча ліхая,
Нават і пошасць-чума знішчыць не змогуць ніяк!
Слава твая хай жыве; хай жыве й той, хто піша пра славу:
Іх абміне назаўжды смерці халоднай павеў.
Ты, о магутны кароль, абавязаны многім паэту:
Славіць ён дзеі твае песняй салодкай сваёй.

DE PRAESENTI BELLO PRUTENICO

De bello Prussiae amicus amico

Lector mi! Copias illas Germanas, tanto studio Magistro Prussiae coactas, tantoque impetu, et contemptu sese in Polonos ferentes, ut potentissimi Regis invictas legiones saepius se difflare posse crederent, eo redactas vides, ut unis mille equitibus, qui ad eas premendas erant consulto praemissi, adeo continuis insultibus fractae sunt et attritae, ut non exspectato Regio exercitu, et projectis illis orsis suis magnificis, turpiter, et cum magno dispendio suo pedem referre sunt coactae. Quod vero invictissimus Rex proelium e vestigio commitendum recusaverit, cum omnium suorum arderent animi pietati et solertiae illius ascribito (Ut qui eos hostes, qui? Christiani sunt, quique postea in exigendo stipendio suo futuri essent inimicis suis); quum sibi graviores maluit levioribus pugnis sensim exturbare; quum praecipiti proelio fortunae, quae plurimum in bello dominatur, rem credere tantumque sanguinis Christiani profundi, etiam si perditum illos iri, certo sciret. Pietatem vero Regiam, mi lector, vel ex hoc cognosce, quod, recuperatis vi oppidis, quae ad hostes ut Germani ad Germanos defecerant, et parcitum est oppidanis omnibus, et praesidiis hostilibus viaticum et conductores, quo tuto abire possent, sunt dati, ad eumque modum toto isto bello nihil non actum est tractim, et clementer in hostem necessarium, quem reduci ad cor, non perdi Regia benignitas semper voluit. Porro licet Poloni dudum tantae existimationis ordinem subjugarunt, et nunc illum invicta manu asserunt, non tamen ob id, quae ipsorum est modestia, negant Germanos cum omni alia laude, tum ea quae bellica est, claros esse. Verum viderint illi vicissim, ne Polonos deinceps culices esse, ac turpe ab illis vinci putent, quorum victrices manus, non ipsi modo, sed etiam reliqui omnes vicini populi sunt saepius experti. Sed liber occineret paululum.

Пра сённяшнюю Прускую вайну

Сябар – сябру пра вайну Прусіі

Чытач мой! Паглядзі на гэтае германскае войска, якое з гэткай мэтанакіраванасцю сабралася да прускага магістра, якое з вялізным імпэтам і пагардаю неслася на палякаў, бо верыла, што не раз можа разагнаць непераможныя харугвы наймацнейшага караля! Цяпер, як бачыш, яно да такой ступені адкінута назад, што тысячай адных толькі коннікаў, якія загадзя былі накіраваныя, каб яго стрымліваць, яно разбіта і раскідана ў несупынных атаках. Так што, не чакаючы каралеўскага войска і адкінуўшы тыя свае ганарыстыя задумы, з ганьбаю і вялікімі стратамі для сябе яно вымушана было даваць дзёру. Што ж да таго, што непераможны кароль загадаў не ўступаць адразу ў бітву, хаця сэрцы ўсіх яго ваяроў палымнелі, то гэта трэба прыпісаць яго дабрачыннасці і разважнасці. Бо хто ж тыя, што выступілі супраць гэтых ворагаў, хто? Яны – хрысціяне, і застануцца імі для сваіх ворагаў нават пасля таго, як аддадуць ім належнае. А яшчэ таму, што кароль аддаў перавагу больш цяжкай вайне замест таго, каб паступова адбівацца ў лягчэйшых сутычках; таму што ўмеў даверыць справу ў імклівым наступе фартуне, якая шмат у чым кіруе вайной; нарэшце, таму, што разумеў, колькі ж праліваецца хрысціянскай крыві, нават калі б яны былі знішчаны.

Каралеўскую справядлівасць, мой чытач, спазнай яшчэ і па тым, што, калі ён адваяваў гарады, якія перайшлі да ворагаў як германскія – да германцаў, то аніводнаму месцічу не было ніякай шкоды, а варожаму войску былі дадзены сродкі на ўтрыманне і правадзнікі, каб яны маглі бяспечна сысці і, такім чынам, у цэлай гэтай вайне ўсё было зроблена прадумана і памяркоўна ў адносінах да непазбежнага ворага, якога каралеўская літасць заўсёды жадала зноў зрабіць прыхільным да сябе, а не знішчыць. Звыш таго, вядома, што палякі яшчэ раней падпарадкавалі сабе гэты ордэн з добрым імем, і цяпер абаранілі яго непераможнай рукою. Аднак жа яны, толькі з прычыны сваёй спагаднасці, не адмаўляюць, што германцы славутыя як у любых іншых адносінах, так і ў ваенных справах. Аднак і яны няхай, у сваю чаргу, убачаць, што палякі таксама не мошкі, і няхай яны падумаюць, наколькі ганебна быць пераможанымі тымі, пераможныя рукі якіх нярэдка адчувалі на сабе не толькі яны, але таксама ўсе суседнія народы. Аднак няхай кніга спаквaля заспявае.

Divo Sigismundo Poloniae Regi invicto

Quas tua non meruit, Rex invictissime, laudes
Haec pietas belli consiliumque tui?
Expertus quid opus, quae congrua tempora bello,
Quod duret vires sustineatque tuas
Mitius[1] insanumque volens tractare Nepotem
Et belli auctores ense ferire suo.
Cedere vitasti populo frendente cohortes
Cogere quas scires, ut tibi terga darent,
Ut Lapithum se more secet conjunctio prava
Plus coepti poenas deinde datura sui.
An tibi cui fuerant hominum tot milia castris
Difficile has acies perdere posse fuit?
Hectorea quas mille viri virtute fugarunt,
Insultu attritos nocte dieque suo,
Sed placuit pietate magis tibi vincere et arte,
Quam caede; orari principis officium
At nunci: "Germane! Crucem defende profanam!"
Et "Contemne armis, arma Polona, tuis!"
Hem tibi: magnificis tua verba minantia coeptis
Quo redeunt, montes quid peperere tui?
Milia qui centum voluisti vincere nostra,
Vis speculatorum[2], tam cito pressus abis?
I qua signatus, pro qua pugnare coisti
In magnam atque malam protinus ipse crucem.
Tractandus fueras melius pro talibus ausis
Regia at in praesens sit pietate satis.

In exercitum Germanum Polonos fugientem

Alterius incudis.
Quod deus esse solet ceptis adversus iniquis
Ex actis liquido temporis hujus habe.
Promissis fretus, Miles Germane, rapinis
Sarmaticum fueras ausus inire solum.
Serica sperabas, nigrae pretiosa Sabellae[1]
Vellera, quae Tyriis sunt decorata togis.

Боскаму Жыгімонту, непераможнаму каралю Польшчы

Мудрасць твая і ваенны твой план, о кароль неадольны,
Вартыя тут і цяпер самай высокай хвалы.
Вопытны ў справах вайны, здолеў ты падтрымаць сваё войска:
Час, адпаведны найбольш, выбраў для гэтай вайны.
Ты не імкнуўся зусім да напышлівых песняў Непота,
Проста хацеў пакараць тых, што вайну пачалі.
Ды не дазволіў кагортам[1] сысці, бо народ абураўся:
Ведаў, як вымусіць іх спіны табе паказаць.
Хай сябе знішчыць благая супольнасць, на звычай лапіфаў[2]:
Будзе за гэты напад ёй пакаранне пазней.
Маючы тысячы вояў у войску, ты мог бы, бясспрэчна,
Ворага лёгка разбіць. Хто ж запярэчыць у тым?
З мужнасцю Гектара воі твае іх харугвы прагналі,
Наступам мужным сваім білі іх ноччу і днём.
Ты ж пажадаў не забойствам – спагадай германцаў адолець,
Просьбы ціхмянай, мальбы не адцураўся ўладар!
Кажа: “Германец! Ты лепш барані гэты крыж зганьбаваны!”
Ды: “У вайну не ўступай, польскае войска, пакуль!”
Ганьба! Ці ж плён атрымаў ты ад словаў сваіх ганарыстых?
Што спарадзілі, скажы, горы-харугвы твае?
Войска аховы[3]! Цяпер вы разбіты, назад павярнулі.
Што ж вы хацелі ўчыніць? Нашых сто тысяч змагчы?
Крыжам адзначаны вы і за крыж пачыналі змагацца…
Самі ж і йдзіце на крыж – горкі, вялікі – цяпер.
Варта б за гэткі напад трохі лепей з табой абысціся![4]
Сёння ж здавольцеся вы ласкай адной караля.

На войска германцаў, што ўцякае ад палякаў

Перапрацаваны папярэдні [верш]

Тое, што Бог – супраціўнік нягодных задумаў, дазнайся
Вельмі выразна з падзей, што адбыліся ў наш час.
Хіжы германскі ваяр, ты чакаў абяцаных рабункаў
І да сармацкай зямлі з гэтаю мэтай прыйшоў.
Ты спадзяваўся здабыць тут шаўкі і каштоўную воўну –
Чорнай сабеянкі[1] дар, тогаў тырыйскіх[2] красу.

Sperabas gemmis, auratis torquibus armis,
Exuviis et equis, non sine laude, frui
Jamque velut victor partitus es oppida et agros,
Speque tumens, super his scripta superba dabas.
SIGISMUNDUS at haec Rex invictissimus apte
Cunctando, intrepido pectore cuncta tulit
Inprimisque deo, non ut dux vester ad artes
Conversus Magicas seque suosque dedit.
Nunquam deseruit justos, et recta petentes
Omnipotens, quem tu laedere saepe soles
Quem tu tot probris, per viscera, vulnera, mortem,
Perque sacra illius singula membra notas.
Solus hic ex nutu rerum moderatur habenas,
Et fiunt subito quae fieri illo jubet.
Ille piis oculis partes respexit ad aequas,
Et justas placida pertulit aure preces.
Terruit inflatas subita formidine gentes,
Et turpi praessit, corda superba, metu.
Nil vagus incessus, nil grande sonantia verba
Armaque profuerant, tela minaeque nihil.
Caesus es, es captus toties, et deinde repulsus
Victus et a parva, non sine clade manu.
Sic modo pro nigris, cutis est data nigra, Sobellis
Quam dedit inclemens fumus, et aura, tibi.
Proque auro et gemmis succurrit turpis egestas.
Ex hac Militia est quae nisi sola comes
Et quod aequo celeri Germana per oppida ferri
Sperabas, macer hinc vix pedes ire potes.
Exuviisque carens, pannosus, nudus inopsque
Absumptusque famae turpiter inde fugis
Et modo qui terras fueras partitus et urbes
Jam profugo nusquam stat tibi certa domus.
Pellere cum quondam coelesti sede Gigantes
Tentavere Jovem, quid retulere, liquet.
Tu quoque junxisti tumefactus Pelioni Ossam,
Sed subito fractus fulmine ad ima cadis.
Quis dare te jussit tam paucis terga Polonis,
Quis te Pruteno jussit abire solo?

Ты спадзяваўся, што ў славе здабудзеш даспехі і коней,
Перлаў, караляў чакаў, золата, зброі – ўсяго!
Быццам які пераможца, дзяліў гарады і ўсе землі,
Поўны надзеі, пісаў шмат ганарыстых лістоў.
Непераможны ж кароль Жыгімонт, памарудзіўшы мудра,
Сэрцам нязломным сваім гэта сцярпеў, і найперш
Шчыра да Бога звярнуўся, а ваш ваявода ў ахвяру
Сілам магічным сябе ды і ўсё войска прынёс.
Бог справядлівых і праведных не пакідае ніколі,
Ты ж проста ў звычай узвёў часта Яго абражаць,
Ты Яго Цела святое, смяротныя раны, пакуты,
Кожную частку і член сплямiў злачынствам сваім.
Згодна з прызваннем, адзін Ён кіруе падзеямі свету:
Зробіцца пэўна ў свой час тое, што Ён загадаў.
Позіркам высакародным зірнуў Ён на роўныя часткі,
Вухам прыхільным прыняў просьбы дастойных людзей.
Сполах раптоўна наслаў Ён на гэты народ ганарысты,
Сціснуўшы сэрцы яму страхам ганебным, ліхім.
Так што і наступ бяздумны, і ўзнёслыя словы, і пыха,
Вострыя дзіды, мячы, грошы – усё надарма!
Ты быў так часта разбіты і столькі разоў паланёны, –
Выгнаны ўрэшце зусім, войскам разбіты малым.
Чорную скуру табе падарыў замест чорных сабейцаў
Вогнішчаў ратных павеў, горкіх пажарышчаў дым.
Бачыш, галеча насустрач ідзе замест золата, перлаў,
Вернай сяброўкай табе будзе ў паходзе яна.
Ты па германскіх мястэчках хацела пранесціся конна?
Хоць бы цяпер ты, жабрак, здолеў пайсці пехатой!
Голы, нягеглы, няшчасны, адзеты ў рыззё, у нястачы,
Страціўшы славу сваю, з ганьбай бяжыш ты адсюль.
Толькі нядаўна дзяліў гарады і маёнткі, а сёння
Стаўся выгнаннікам ты. Дзе твой прытулак? Нідзе!
Так і гіганты аднойчы Юпітэра з вышняга трону
Скінуць хацелі, і што? Ясна, што з імі было.
Гэтак, пыхлівец, ты Осу злучыў з Пеліёнам. А сёння
Падаеш долу: удар грознай маланкі адчуў.
Хто загадаў табе кінуцца бегчы ад жменькі палякаў?
Хто загадаў адысці з Прускай краіны табе?

Esse deum credas, justa qui singula lance
Librat, et elatis cepta secunda negat.
I nunc et jacta te Gallos, teque Britannos,
Antequam tot Latios te superasse Duces.
Quae te Sarmaticas fugientem turpiter oras
Gloria? Quod sequitur te, fugitive, decus?
Nosce viros hic qui gelidam nascuntur ad Arcton,
A te contempti namque fuere prius.
Hi toties Moscos stravere Scytasque Getasque,
Cum quibus assidue Martia bella gerunt.
Teque procul tutum tranquilla per otia reddunt,
Contra hostes, prompti semper ad arma Crucis,
Quam modo, qui merito deberent, nemo tuetur,
Sint etiam astricti religione licet.
Immo Crucis nuper juncti sunt hostibus, illam
Quamvis veste gerunt, non tamen intus habent
Nunc igitur vindex scelerum deus extitit aequus,
Te propere in turpem compulit ire fugam.

Вер, гэта Бог, Ён усё мудра ўзважыць на шалях праўдзівых,
Планам напышлівым Ён ажыццявіцца не дасць.
Можаш ісці, выхваляцца, што ты і брытанцаў, і галаў,
Нават і рымлян саміх пераўзыходзіў раней!
Дзе ж твая слава, калі ты ўцякаеш ад межаў сармацкіх?
Што там за гонар цяпер суправаджае цябе?
Зведай народжаных тут, пад халоднай Палярнаю зоркай,
Моцных мужоў, ад якіх ты адцураўся раней.
Столькі разоў яны білі маскоўцаў, і скіфаў, і гетаў,
З імі і сёння яшчэ Марсавы войны вядуць.
Вось і цябе яны прэч адганяюць, каб жыць у спакоі,
Даць не збаяцца адпор ворагам злосным Крыжа.
Тыя, хто мусілі б вечна ахоўваць той Крыж, – занядбалі,
Хоць абавязкам святым звязаны ў веры сваёй!
Супраць варожых Крыжу аб'ядналіся, Крыж гэты носяць,
Толькі не ў душах сваіх, – звонку, на шатах адно!
Выступіў Бог справядлівы цяпер, пераследнік злачынцаў,
Ён і прымусіў цябе гэтак ганебна ўцякаць!

COMMENTARII AD TEXTUM LATINUM

Abbreviaturae

K. – sic in editione a B. Kruczkiewicz facta (1887).
Marg. – marginalia in editione Cracoviensi (1516).

Epigramma (p. 100)

1 K: vultu.
2 K: suis. M. Jezienicki hoc locum corruptum esse censuit et hoc modo eum legere proposuit: "Attamen Aoniis Sarmata potus aquis" [*Jezienicki 1888. Z.3, 139*].

Carmen exhortatorium Ioannis Visliciensis ad Musam M. Pauli Rutheni (p. 100)

1 K: Haemoniis.
2 Genetivus contra morem Latinorum a graeca voce chelys formatus [*Pauli 1887, 164*].
3 K: nuntia.
4 K: es.
5 B. Kruczkiewicz hoc loco Horatii influxionem annotavit, vide: Horati Epist. I. 19, 1 sqq.
6 M. Jezienicki hoc locum corruptum esse putans, hunc ordinem verborum hic esse censuit: "Hic venit e cyathi namque liquore furor" [*Jezienicki 1888. Z.3, 140*].
7 M. Jezienicki addit verbum "sicut" pro verbo "postquam" hic usum esse [*Jezienicki 1888. Z.3, 140*].
8 Scil. Terpsichore (vide v. 33) [*Jezienicki 1888. Z.3, 140*].
9 K: revirebit.
10 Hoc loco sequitur in editione "Bellum Prutenum" (Cracoviae, 1516) elegia Pauli Crosnensis, quam in Appendice proposui.

Venerabili ac egregio viro magistro Paulo de Crosna (p. 104)

1 K: hoc loco punctum est. Correxi secundum conjecturam a M. Jezienicki factam [*Jezienicki 1888. Z.3, 140*].
2 K: hoc loco comma est, opus cujus, mea opinione, non est.
3 aboleret = abolesceret [*Pauli 1887, 168*].
4 K: partim.
5 K: hoc loco punctum est. Correxi in comma secundum conjecturam a M. Jezienicki factam [*Jezienicki 1888. Z.3, 140*].

6 K: encomii.
7 K: quae.
8 K: aegis.
9 M. Jezienicki hoc locum corruptum esse censuit et hoc modo eum legere proposuit: «et, si eges (= cupis, vis) loco uti, adversus foret approbante illo satirico» [*Jezienicki 1888. Z.4, 196*]. Traduco tamen secundum B. Kruczkiewicz editionem (K).
10 B. Kruczkiewicz hoc loco Persii influxionem annotavit, vide.: Persii 5, 54.
11 Hoc loco sequitur in editione "Bellum Prutenum" (Cracoviae, 1516) carmen Valentini Eckii Philiripolitani, quod in Appendice proposui.

Argumenta libellorum Belli Pruteni (p. 108)

1 Tandem = deinde [*Pauli 1887, 170*].
2 B. Kruczkiewicz annotavit: «Cracum Gracchum poeta appellat ex illius temporis more» [*Pauli 1887, 170*].
3 Polonum = Polonorum [*Pauli 1887, 170*].
4 B. Kruczkiewicz censuit voce "Lituos" Joannem Visliciensem pro voce "Lituanis" uti [*Pauli 1887, 170*].
5 B. Kruczkiewicz annotavit: "*Altitonanta* formae "aera" instar formatus accusativus generis masculini est et Jovem ipsum designat" [*Pauli 1887, 171*].
6 K: punctum abest, ipsa posui.

Ode Tricolos tetrastrophos lectori (p. 108)

1 Musae [*Pauli 1887, 170*].
2 acri – Gen. sing.
3 K: comma post "relucens". Correxi secundum conjecturam a M.Jezienicki factam [*Jezienicki 1888. Z.4, 196*].

BELLI PRUTENI TRES LIBELLI
Libellus primus (p. 112)

1 K: resplendicat.
2 B. Kruczkiewicz sic hunc locum interpretari proposuit: «jugera plangentia funera = arva, quae mortuorum sepulcra deflere videntur» [*Pauli 1887, 173*]. M.Jezienicki autem duas versiones proposuit ad hunc locum intellegendum: 1) propter calorem arva (plantae) sub Nilo siccescunt (intereunt), deplangens perniciem suam (h.e. plangentia funera scil. sua = et plangunt, quia intereunt); 2) propter calorem arva siccescunt, deplangentia perniciem Nili (h.e. funera Nili = siccatio Nili) [vide: *Jezienicki 1888. Z.4, 197*].

[3] Marg.: “Hypallage”. In editione a B. Kruczkiewicz facta (K) pro eo loco est conjectura talis: “virtutibus refertis = virtutibus omni numero perfectis” [*Pauli 1887, 174*]. M. Jezienicki autem proposuit versum 28 sic interpretari: “Plura relinquendo virtutibus acta referta” [*Jezienicki 1888. Z.4, 198*].

[4] B. Kruczkiewicz proposuit conjecturam talem: “candida pelagi = candidae pelagi undae” [*Pauli 1887, 174*]. M. Jezienicki autem verbum “candida” tamquam verbum “sacra” in versu praecedenti cum verbo “stirps” jungere anteponuit [*Jezienicki 1888. Z.4, 198*].

[5] M. Jezienicki correxit errorem editionis Cracoviensis (1516) a B. Kruczkiewicz non conspectum et hoc modo textum legere proposuit: «Pro, inimica Tuis, quae Rex generose Polonis» [*Jezienicki 1888. Z.4, 198*].

[6] Marg.: “Apostrophe ad divum Stanislaum, patronum praecipuum Poloniae”

[7] M.Jezienicki suam conjecturam ad hunc et consequentem versum dedit: poeta «dum – donec» in sensu “tam diu – donec” utitur [*Jezienicki 1888. Z.4, 198*].

[8] Marg.: “Homoetheleuton”.

[9] Doridos = maris [*Pauli 1887, 176*].

[10] Conjectura a B. Kruczkiewicz proposita: «Junge: Quo sanguine diffuso Istula, vitreo pulcherrimus amne, rubuit, et per multos decembres parta scuta ducum galeasque virum sub D.a.v. putri foedabat aequora tabo» [*Pauli 1887, 176*]. M. Jezienicki autem sic verba jungere proposuit: “Legitimo sceptro moderaris ejus jugera, parta sanguine per multos decembres diffuso; quo (scil. Sanguine) Istula, vitreo amne pulcherrimus, rubuit. Qui (scil. Vistula) scuta ducum, galeasque virum sub Doridos alvum volvendo et aequora putri tabo foedabat” [*Jezienicki 1888. Z.4, 198*].

[11] Marg.: “Invocatio ad Deiparam Virginem Mariam”.

[12] M. Jezienicki annotavit poetam in pede primo proceleusmatico pro recte dactylo sive spondeo uti [*Jezienicki 1888. Z.4, 198*].

[13] Marg.: “Situs Poloniae”.

[14] B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide.: Verg. Aen. III, 530 sqq. [*Pauli 1887, 177*].

[15] Marg.: “Arva vicino limite Poloniae contigua”.

[16] K: Funduntur. M. Jezienicki influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Georg. III, 382 [*Jezienicki 1888. Z.4, 198*].

[17] Marg.: “Lech primus fundator Polonorum, cujus nomine Lechi te etiam apud exteros vocitant”.

[18] Marg.: “Situs regalis civitatis Cracoviae juxta saltus silvae Herciniae”.

[19] K: Perictionii. Perictionius – nomen adjectivum de sermone Graeco “ресйкфЯпнет” (vicini) factum. M. Jezienicki annotavit finem “ii” hujus verbi “per synizesin” legendum esse [*Jezienicki 1888. Z.4, 199*].

20 Marg.: “Tumulus Gracchi primi erectoris Cracoviae”.
21 Marg.: “Causa necis Vandae filiae Gracchi”.
22 Marg.: “Locus Vandae tumuli”.
23 M. Jezienicki hoc loco “Ac nunc” in “At nunc” corrigere proposuit, contextum similem in versu 375 libri secundi animadvertens [*Jezienicki 1888. Z.4, 199*].
24 Ac si = ac quasi [*Pauli 1887, 182*].
25 B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. I, 503 [*Pauli 1887, 182*].
26 Marg.: “Prothesios paralange”.
27 Marg.: “Persuasio Apollinis in origine regum Polonorum”.
28 K: praecelsa.
29 Deficeres = deficias [*Pauli 1887, 183*].
30 Marg.: “Apostrophe ad Sigismundum regem Poloniae”.

Libellus secundus (p. 128)

1 Marg.: Situs Lithuaniae, unde Jagello ortus est.
2 Signum hoc (:) ego (editor) posui.
3 K: saeptum.
4 K: additum “est”.
5 Marg.: hypallage.
6 Conjectura B. Kruczkiewicz: super = inter. M. Jezienicki autem conjecturam aliam proposuit: super = ad.
7 K: quis.
8 Texti divisio haec secundum conjecturam M. Jezienicki a me facta est. Omnes conjecturas a B.Kruczkiewicz pro versus 25 – 30 factas M. Jezienicki incommodas esse putat [*Jezienicki 1888. Z.4, 199*].
9 Marg.: Depulsio cruciferorum fratrum de Ptolemaidae Syriae.
10 K: incerti.
11 B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. III, v.56 sq. [*Pauli 1887, 188*].
12 Marg.: Expeditio cum auxiliis Barbigerorum fratrum adversus regem.
13 Marg.: Proceleusmaticus.
14 K: vires.
15 Marg.: Paragoge.
16 B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. I, 544 sq. [*Pauli 1887, 189*].
17 Marg.: Expeditio bellica rege cum fratre adversus cruciferos.
18 K: famatum.
19 Marg.: Rex pia pace capessenda ad cruciferos mittit legatos.
20 Marg.: Regi duos gladios cruentatos cruciferi dirigunt.

[21] K: tonat.
[22] Marg.: Chronographia congressus belli Prutenorum cum Polonis.
[23] K: insimul.
[24] Marg.: Congressus Nomadum ac Lithuanorum cum Prutenis.
[25] B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Bucol. II, 3 sq. [*Pauli 1887, 193*].
[26] K: tuensque.
[27] Marg.: Victoria Prutenorum de Tartaris ac Lithuanis.
[28] Marg.: Vitoldus cernens deficere suos hortatur regem ad bellum indignanter.
[29] Marg.: Rex Vitoldo ait.
[30] Marg.: Deprecatio regis ad Deum summum maximum.
[31] M. Jezienicki voces "super hostiles in Marte cohortes" cum verbo "vincere" jungere decere putat. Talis verborum compositio, M.Jezienicki opinione, linguae Polonae influxione (odnieść zwycięstwo nad kimś) explicata est [*Jezienicki 1888. Z.4, 200*].
[32] Marg.: Divus Stanislaus in summitate aëris regi personaliter apparuit.
[33] M. Jezienicki "suspendens" in "suspendes" supponere proposuit [*Jezienicki 1888. Z.4, 199*].
[34] Marg.: Ejusdem exhortatio ad pugnam.
[35] B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. I, v.402 sq. [*Pauli 1887, 195*].
[36] Marg.: Exhortatio regis ad suos milites.
[37] Marg.: Congressus Polonorum cum Prutenis.
[38] K: cadentium.
[39] B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. I, 90 [*Pauli 1887, 197*].
[40] Marg.: Certamen Vitoldi restaurata vi suorum.
[41] Marg.: Systole.
[42] B. Kruczkiewicz conjecturam talem fecit: "Per nimis vulnificata (i.e. vulneratis nimis abundantia) antra fugere (scil. hostes)" [*Pauli 1887, 197*]. M. Jezienicki "vulnificata" cum "membra" (versus 361) in sensu "vulnerati milites" quasi "pars pro toto" jungere proposuit: "membra militum = corpora militum = milites" [*Jezienicki 1888. Z.4, 201*].
[43] B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. X, 164 [*Pauli 1887, 188*].
[44] K: quae.
[45] Marg.: Sarcasmus.
[46] K: dominatur.
[47] K: nulla. M. Jezienicki hic verbum "multa" proposuit. "Multa discrimina gerere" sic interpretat: "multa discrimina (pericula) perferre, subire" [*Jezienicki 1888. Z.4, 201*].
[48] Marg.: Magister obtruncatur.

49 K: colla.
50 Marg.: Victoria Polonorum de Prutenis.
51 K: rogantium.
52 K: superbe.
53 Marg.: Systole.
54 Marg.: Apostrophe regi Sigismundo.
55 Marg.: Exaggeratio laudis regis Jagellonis.

Libellus tertius (p. 156)

1 Marg.: Peroratio Jovis ad Caelicolas.
2 Marg.: Laus Sigismundi regis.
3 Marg.: Juno affatur Jovem.
4 M. Jezienicki proposuit verbum "desuper" cum verbo "meditata" ex praecedenti versu jungere [*Jezienicki 1888. Z.4, 201*].
5 Marg.: Mars.
6 Marg.: Venus.
7 Marg.: Conjunx Jagelloni per Venerem significata comprimitur.
8 Marg.: Juppiter ad Mercurium.
9 Marg.: Ectasis.
10 Marg.: Venus vaticinatur futuros natos Jagelloni videlicet Casimirum et Ladislaum.
11 Marg.: Casimirus.
12 Marg.: Ladislaus.
13 Marg.: Jagello fatis divum concitatus nuptam poposcit.
14 Marg.: Hymenaeus cum nupta advehitur.
15 Marg.: Convivium celebratur.
16 M. Jezienicki proposuit "omnis" in "omnes" corrigere [*Jezienicki 1888. Z.4, 201*].
17 Marg.: Periphrasis noctis advenientis.
18 K: Usus est et nuptae. M. Jezienicki proposuit conjecturam suam: "Usus et est nuptae" [*Jezienicki 1888. Z.4, 201*].
19 Marg.: Commemoratio Ladislai regis Ungariae, qui per Hamuratem victus periit.
20 Marg.: Laus Casimi[ri] regis Polonorum hujus inclite stirpis divi p[ro]pagatoris.
21 B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. I, 8 [*Pauli 1887, 210*].
22 Marg.: Numerus prolis divi regis Casimiri.
23 Marg.: Joannes Albertus Rex.
24 Marg.: Rex Alexander. M. Jezienicki annotat compensationem dactyli sive spondei trochaeo in pede tertio esse. Pro conjectura proposuit sic verba transponere: "et vir virtute" [*Jezienicki 1888. Z.4, 201*].

[25] Marg.: Victoria ejusdem circa Cleczko arcem insignem Lithuanae de Tartaris habita.

[26] Marg.: Synderesis. B. Kruczkiewicz influxionem Vergilii hoc loco annotavit, vide: Verg. Aen. XII, 952 [*Pauli 1887, 212*].

[27] Marg.: Ladislaus Rex Ungarorum et Bohemorum.

[28] Marg.: Lodvicus puer Rex.

[29] Fredericus Cardinalis.

[30] Marg.: Divus Casimirus frater regum p[rae]titulatorum adolescens virtute castitatis fulgentissim[us]: qui Vilnae sepultus innumeris miraculis coruscat.

[31] Marg.: Astrophe ad divum Casimirum.

[32] K: tutare.

[33] K: effera.

[34] Marg.: Laus Sigismundi regis Poloniae famatissimi paternaeque aulae faustissimi moderatoris.

[35] M. Jezienicki annotat hexametrum hunc corruptum esse (nam quinque tantum pedes habet). Auxilio Vergilii (En.VI.795) hunc versum hoc modo correxit: “Indos atque vagos inter Garamantas et ultra” [*Jezienicki 1888. Z.4, 202*].

[36] M. Jezienicki “numero” in “numerum” correxit [*Jezienicki 1888. Z.4, 202*].

[37] K: Poloninis.

[38] K.: robigine. M. Jezienicki pro “robigine aduncas”, sicut B. Kruczkiewicz edidit, “robigini (scil. tribuendo) aduncas (scil. Thoraces et galeas)” legere vel “aduncas” in “adustas” supponens “robigine adustas” legere proposuit [*Jezienicki 1888. Z.4, 202*].

Ode tricolos tetrastrophos ad Sigismundum Regem (p. 172)

[1] M. Jezienicki declaravit sermones “renitentia et” in syllaba “ti’ et” atque in versu 27 verbum “Lithuana” per synizesin legere decere [*Jezienicki 1891. Z.3, 202*].

[2] K.: Vashilum.

Elegia ad deiparam Virginem Mariam (p. 180)

[1] Hoc loco in editione Cracoviensi “Errores imprimendo commissi sic ut infra paret castigati” sequuntur.

APPENDIX

Carmen Valentini Eckii Philiripolitani (p. 188)

1 Correxi pro “osurum” editionis Cracoviensis.

Divo Sigismundo Poloniae Regi invicto (p. 192)

1 Correxi pro “micius” edit. ex bibliotheca Ossol.

2 scil.: Christi.

In exercitum Germanum Polonos fugientem (p. 192)

1 Lapsus calami hoc loco esse videtur: pro “nigrae Sabellae” “nigrae Sabaeae” ponere decet (*conjectura a professore A. Cysyk facta*).

КАМЕНТАРЫІ ДА ПЕРАКЛАДУ

Заахвочвальны верш да Музы магістра Паўла з Кросна (с. 101)

1 …*славяць бясконца таго*… – г. зн. кентаўра Хірона.

2 …*гэтым вось “Прусам” маім*… – пад “Прусамі” трэба разумець паэму Яна Вісліцкага “Пруская вайна”.

3 …*песні дапіша яна*… – маецца на ўвазе Тэрпсіхора (гл. 33-і радок гэтага верша).

4 У першадруку пасля “Заахвочвальнага верша” надрукавана “Элегія магістра Паўла Кросненскага Яну Вісліцкаму”, якая змешчана ў дадатку гэтага выдання.

Прадмова “Шаноўнаму і славутаму мужу, магістру Кракаўскага універсітэта Паўлу Кросненскаму” (с. 106)

1 …*з апісаннем яе*… – г. зн. перамогі ў Грунвальдскай бітве.

2 …*я прысвяціў яе*.. – г. зн. паэму.

3 Энкомій – жанр антычнай паэзіі; хвалебная, гераічная песня ў гонар багоў або людзей.

4 У першадруку пасля прадмовы да Паўла з Кросна надрукаваны верш Валянціна Экія, які змешчаны ў дадатку гэтага выдання.

Аргументы кніг “Прускай вайны” (с. 109)

1 Аргументы – тут: кароткі змест, фабула.

2 …*Крака ўслаўляе*… – тут і паўсюдна ў паэме Вісліцкі называе Крака Гракхам у адпаведнасці з літаратурнай традыцыяй таго часу [гл.: ***Pauli 1887, 170***]. Гракхі – знакаміты патрыцыянскі род Старажытнага Рыма.

Ода чытачу (с. 109)

1 Паэтычны памер верша – алкеева страфа.

2 …*багіні свяшчэнныя*… – Музы.

Паэма “Пруская вайна” Кніга першая (с. 113)

1 У гэтым годзе паэма “Пруская вайна”, адпраўленая яшчэ раней Паўлу Кросненскаму для карэктуры, была аддадзена паэтам у друкарню, аднак толькі ў наступным 1616 г. яна была надрукавана ў Кракаве Янам Галерам і прадстаўлена чытачам.

2 … *мужнага продка*… – г. зн. караля Ягайлы-Уладзіслава.

3 … *о, патрон найяснейшы*… – маецца на ўвазе святы Станіслаў. Пра

тое, якім чынам ён дапамог войскам Ягайлы і Вітаўта, гл. у вершах 276–298 другой кнігі “Прускай вайны”.

4 *… вісяць у твой гонар штандары…* – 56 штандараў былі вывешаны блізу грабніцы Святога Станіслава ў касцёле Вавельскага замка або, як паведамляюць іншыя крыніцы, у больш вялікім касцёле Святога Станіслава [гл.: *Pauli 1887, 175*].

5 *… твайго санавітага бацькі…* – кароля Казіміра Ягайлавіча.

6 *… землі траякіх русінаў…* – у сярэднявечнай літаратуры было распаўсюджана ўяўленне пра “траістую” – Белую, Чорную і Чырвоную – Русь. Адпаведна, “траякія русіны” – жыхары гэтых зямель.

7 *… прастор Герцынійскага лесу…* – Б. Кручкевіч даводзіць, што так называецца ў цэлым горны ланцуг і лес, што распасціраўся з захаду на ўсход ад паўднёвай Германіі праз Чэхію, Польшчу, Вялікае княства Літоўскае аж да межаў Маскоўскай дзяржавы [гл.: *Pauli 1887, 179*]. Цікава, што “Герцынійскі лес” упамінае ў сваіх “Нататках пра Гальскую вайну” Гай Юлій Цэзар, адзначаючы, што грэцкім вучоным ён вядомы пад назваю Аркінскага. Далей Цэзар піша: “Герцынійскі лес цягнецца ў шырыню на дзевяць дзён шляху для добрага вандроўніка… Лес гэты пачынаецца на мяжы гельветаў, няметаў і раўрыкаў і цягнецца паралельна з ракою Данубіем (Дунаем) да краіны дакаў і анартаў; адсюль жа ён забірае налева, у бок ад ракі і пры сваёй вялізнай працягласці праходзіць праз землі многіх народаў” [*Casar. Comment. VI. 25*].

8 *Кракаў высока шануе адвечныя творы Платона* – З гэтых слоў можна зрабіць слушную выснову, што дыялогі Платона і яго філасофія былі ў ліку тых дысцыплін, якія вывучаліся ў Кракаўскім універсітэце ў канцы XV – пачатку XVI ст. Б. Кручкевіч прыгадвае той факт, што каля 1440 г. у Фларэнцыі Козіма Медзічы заснаваў славутую платонаўскую Акадэмію. Тым не менш менавіта прафесары Ягелонскага універсітэта аднымі з першых пачалі карыстацца лацінскімі перакладамі твораў Платона. Б. Кручкевіч абвяргае меркаванне аднаго з даследчыкаў “Прускай вайны”, які сцвярджаў, што з вышэйпрыведзеных слоў вынікае факт існавання ў Кракаве агульнадаступнай навучальнай установы, падобнай да платонаўскай Акадэміі [гл.: *Pauli 1887, 179*].

9 *…уладар, спадкаемец германскага роду…* – Б. Кручкевіч прыводзіць сведчанне з “Польскай гісторыі” Яна Длугаша (Франкфурт, 1711), што гэтым уладаром быў Рытагар Альманскі.

10 *Князевы ты аддзяляеш муры ад муроў каралеўскіх* – Муры Кракава (горада князя Крака) ад муроў Казімежы Вялікай (горада караля Казіміра) [гл.: *Pauli 1887, 181*].

11 *…Тумбы славутай…* – Б. Кручкевіч каменціруе гэтую назву наступным чынам: “Назваю ‘Tumba’ паэт пазначае Магілу, якая ў тыя часы на народнай латыні называлася ‘Claratumba’” [гл.: *Pauli 1887, 181*].

12 *…убачыць Халцыду…* – Гэтай назвай паэт пазначае Кумы, горад у Італіі, калонію жыхароў Халцыды, куды, згодна з антычнай міфалогіяй, уцёк Дэдал.

13 *…Хааспавы бераг…* – Хаасп – рака ў Сузіянскай зямлі, вядомая чыстай і смачнай вадой, якую персідскія цары звычайна пілі ў сваіх паходах, захоўваючы ў срэбных сасудах.

Кніга другая (с. 129)

1 *…масагеты суровыя…* – Хутчэй за ўсё, як даводзіць Б. Кручкевіч са спасылкай на трактат Энея Сільвія, пад масагетамі маюцца на ўвазе жамойты [гл.: *Pauli 1887, 184*].

2 *…мудрага князя…* – вялікага князя Ягайлу.

3 *…Конрада, што валадарыў у землях куяваў…* – Па ўсім відаць, што маецца на ўвазе Конрад Аляшніцкі, удзельны князь з ліку князёў Шлёнскіх. Аляшніца (Olesnica) – горад недалёка ад Вроцлава.

4 *Нашыя продкі звычайна тых ворагаў гетамі звалі* – Недастаткова ясна, чаму паэт лічыць, што ў старажытнасці прусаў называлі гетамі. Так, напрыклад, Мацей Мяхоўскі ў сваім творы “Tractatus de duabus Sarmatiis” (“Трактат пра дзве Сарматыі”; Кракаў, 1521) піша, што геты насялялі калісьці землі Еўрапейскай Сарматыі – тэрыторыі паміж Танаісам (Донам) і Віслай [гл.: *Подосинов 1995, 437*]. З гэтага пункту гледжання лагічней было б меркаваць, што геты жылі пераважна на тэрыторыі сучасных Украіны, Беларусі і Польшчы.

5 *…каб суняць той народ, што да рокашаў лютых імкнуўся…* – У 1409 г. з ініцыятывы вялікага князя Вітаўта ўспыхнула антыкрыжацкае народнае паўстанне ў Жамойці, у выніку чаго ўвесь гэты край быў вызвалены з-пад улады крыжакоў. Ягайла праявіў сваю зацікаўленасць у гэтай справе, што фактычна і паслужыла прычынай абвяшчэння вайны каралю Ягайлу магістрам Ульрыкам фон Юнгінгенам.

6 *Чутка крылатая тут даляцела да князя…* – Тут, хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе Конрад Мазавецкі.

7 *…прывяла іх да князя…* – Размова, верагодна, ізноў ідзе пра Конрада Аляшніцкага.

8 *…народы Габрыты…* – Б. Кручкевіч лічыць, што пад гэтай назвай маецца на ўвазе лясны масіў Цюрынгіі [гл.: *Pauli 1887, 189*]. М. Езяніцкі даводзіць, што Габрыта – гэта Чэхія [гл.: *Jezienicki 1888, 200*].

9 …(народы) *Густалістай Луны…* – даслоўна “Касматай Луны” (“*Lunae Comosae*”). Б. Кручкевіч каменціруе гэты выраз як незыдэнтыфіка-

ваны тапонім [гл.: *Pauli 1887, 189*]. М. Езяніцкі, аднак, сцвярджае, што азначэнне “*Luna silva*” (“Лунны лес”) адпавядае сённяшняму Манхартсбергу, горнаму ланцугу ў Аўстрыі. Слова “*comosa*”, на думку даследчыка, ужыта тут замест слова “*silva*” і адносіцца як да “*Lunae*”, так і да “*Gabritae*” [гл.: *Jezienicki 1888, 200*].

10 *Светлая біскупа здань…* – Маецца на ўвазе святы біскуп Станіслаў, які лічыцца нябесным апекуном Польшчы.

11 *Ну, а цяпер, Аянійкі, нябесныя слаўныя панны* – Гэты радок у першадруку памылкова змешчаны перад 347-м радком.

12 Б. Кручкевіч лічыць, што, хутчэй за ўсё, 438 – 441-ы радкі складзены паэтам на падставе нейкага народнага падання, бо імя таго чалавека, які забіў Ульрыка фон Юнгінгена, магістра крыжакоў, і пазбавіў яго зброі, невядомае, і можна сумнявацца ў тым, ці было яно вядома самому паэту [гл.: *Pauli 1887, 200*].

13 *…мазаікі гэткай аздобу…* – У дадзеным выпадку слова “мазаіка” (у арыгінале – *asarota*) паэт выкарыстоўвае для пазначэння рознага кшталту зброі, даспехаў і ўпрыгожванняў, захопленых у ворага, што былі вывешаны на сцяне храма разам з іншымі кляйнотамі.

14 *Туфы шурпатыя зверху над ім навісаюць…* – Шурпатымі туфамі, як лічыць Б. Кручкевіч, паэт называе порыстыя скалы, на якіх, напэўна, раслі дрэвы [гл.: *Pauli 1887, 202*].

15 *Так, як і дзікае племя валахаў… або як суровыя вельмі намады… як і Васіль…* – У 483–492-м радках паэт прыгадвае тры перамогі Жыгімонта I над валахамі (малдаванамі) у 1509, над татарамі – у 1512, над маскавітамі (пад Оршай) – у 1514 г. Гэты “траісты трыумф” узгадваецца Вісліцкім таксама ў “Одзе Жыгімонту”.

Кніга трэцяя (с. 157)

1 *Добрыя лёсы – у хуткай часіне, ліхія – здалёку* – Лёсы, пра якія паведаміў Юпітэр, былі ўжо вызначанымі і нязменнымі, і спрыяльныя (якія вызначалі нашчадкаў Ягайлы і яго славу) павінны былі здзейсніцца ў хуткім часе, нешчаслівыя (якія прадракалі смерць Уладзіслава, гл. в. 114) – у больш аддалены тэрмін.

2 *Тая мядзведзіца…* – У арыгінале – Парасійская Мядзведзіца (Ursa Parrhasis): сузор’е Вялікай Мядзведзіцы, якую называюць Парасійскай або Аркадскай ад Каліста, дачкі цара Аркадзіі Лікаона, якая, як кажуць, была пераўтворана ў мядзведзіцу і далучана да ліку сузор’яў.

3 *Хоць паспытаў ужо тройчы ў жыцці ён твой шлюб, Гіменэю* – Пасля смерці каралевы Ядзвігі ў 1399 г. Ягайла быў у шлюбе з Ганнай, дачкой Вільгельма, намесніка Цыленскага, унучкай Казіміра Вялікага, пасля – з Эльжбетай Граноўскай, дачкой Атона з Пільча, і, нарэшце, – з Соф’яй, з беларускага княжацкага роду Гальшанскіх.

[4] *…фесцэнінскія ўцехі…* – тут: любоўныя. “Фесцэнінскімі песнямі” антычныя аўтары называлі народныя сатырычныя вершы эратычнага зместу.

[5] *Бог з непахіснай хадою…* – старажытнарымскі бог вайны Марс.

[6] *Ён з каралеўскай аздобай адновіць і родны свой горад* – Гэтыя словы, як лічыць Б. Кручкевіч, адносяцца да 1508 г., калі Жыгімонт, запрасіўшы мастакоў і майстроў з Італіі, аднавіў і цудоўна аздобіў Кракаўскі каралеўскі замак [гл.: *Pauli 1887, 205*].

[7] *Імем адметным – Соф’яй – яе суайчыннікі клічуць* – Маецца на ўвазе Соф’я з роду беларускіх князёў Гальшанскіх, дачка князя Андрэя.

[8] *…каралеўства паўночнае пад Валапасам…* – Сузор’е Валапаса паблізу сузор’я Вялікай Мядзведзіцы таксама, як і апошняе, служыла паэтычным пазначэннем поўначы.

[9] *…дзевяць ён будзе таптаць пяцігоддзяў зямлю пад нагамі…* – Казімір, малодшы сын Ягайлы, уладарыў у Рэчы Паспалітай 45 год: з 1447 да 1492 г. Значыць, у гэтым месцы ідзе гаворка пра гады праўлення, а не жыцця.

[10] *…вартая вершаў паэта-андыйца* – г. зн. Вергілія, які нарадзіўся ў вёсцы Анды блізу Мантуі.

[11] *Ночы падоўжанай волата, Амфітрыёнава сына* – г. зн. ночы, калі Юпітэрам быў зачаты Геракл. Грамавержац з’явіўся да Алкмены, маці Геракла, у вобразе яе мужа Амфітрыёна. Згодна з міфам гэтая ноч была падоўжана па загадзе Юпітэра.

[12] *Люты тады Гамурат…* – Турэцкі хан Гамурат або Мурат II правіў у 1421–1451 гг.

[13] *…таго юнака…* – старэйшага сына Ягайлы, Уладзіслава, які, стаўшы ў 1440 г. каралём Венгрыі, у 1443–1444 гг. арганізаваў крыжовы паход супраць туркаў і здабыў перамогу, але ў наступнай бітве пад Варнай пацярпеў паражэнне і загінуў.

[14] *…кароль Казімір, што ўтаймоўваў у бітве суровай // Прусаў мяцежных…* – Кароль Казімір Ягайлавіч ваяваў з крыжакамі на працягу 14 год. Гэтая вайна скончылася заключэннем мірнага Торуньскага пагаднення ў 1466 г., згодна з якім многія землі Ордэна былі далучаны да Рэчы Паспалітай.

[15] *З жонкай аўстрыйскай сваёй нарадзіў сыноў знакамітых* – Кароль Казімір ажаніўся з Лізаветай, малодшай дачкой Альбрэхта II, імператара Германіі, аўстрыйскага князя, з якой меў шэсць сыноў і сем дачок.

[16] *…о, Багіня…* – Муза.

[17] *Не захацела, аднак, некаторым з іх славу падоўжыць // Бледная смерць…* – Б. Кручкевіч, спасылаючыся на трактат Мацея Мяхоўска-

га, паведамляе наступнае. З сямі дачок Казіміра старэйшая, Ядзвіга, была заручана з Баварскім князем Георгіем, другая, Соф'я, была жонкай Яна Мархіёна Брандэнбургскага, пятая, Ганна, жонкай Багуслава, князя Стоўпенскага і Шчэцінскага, шостая, Барбара, жонкай Георгія, князя Мішненскага, апошняя з іх, Лізавета, была жонкай князя Легніцкага. Тая ж Лізавета, якая нарадзілася трэцяй, памерла, не дасягнуўшы сталага ўзросту. Падобна ёй і чацвёртая дачка Лізавета памерла ў дзяцінстве [гл.: *Pauli 1887, 210*].

18 *…хаця пад нядобраю зоркай…* – Ян Альберт (Альбрэхт) валадарыў у 1492–1501 гг. Час яго праўлення быў адзначаны амаль аднымі нявшчасцямі. У першую чаргу гэта несправядлівы мір 1494 г. з маскоўскім царом Іванам III. Войска Яна Альберта было разбіта падчас малдаўскай кампаніі 1497 г. у лясах Букавіны. Перажыўшы глыбокае расчараванне, кароль пачаў рыхтавацца да вайны з крыжакамі, але памёр, так і не давёўшы справу да канца.

19 *…цвярдыня пад Клецкам* – Так паэт называе ўмацаваны лагер татараў каля Клецка. Усё татарскае войска, якое налічвала 15 ці болей тысяч вояў, было разбіта ўшчэнт блізу Клецка незадоўга да смерці караля ў 1506 г.

20 *…Уладзіслаў найшаноўнейшы…* – Уладзіслаў, сын караля Казіміра Ягайлавіча, правіў у Багеміі з 1471, у Венгрыі – з 1491 г.

21 *…сын яго слаўны, Людовік …* – Сын Уладзіслава Казіміравіча, Людовік II, успадкаеміў ад бацькі багемскае і венгерскае валадарства. Б. Кручкевіч паведамляе, што ён быў забіты ў 1526 г. туркамі ў бітве пад Мохачам [гл.: *Pauli 1887, 212*].

22 *Быў Фрэдэрык…* – Па звестках Б. Кручкевіча, апошні сын Казіміра Ягайлавіча, Фрэдэрык, быў кардыналам, архіепіскапам Гнёзненскім і епіскапам Кракаўскім [гл.: *Pauli 1887, 212*].

23 У 214–220-м радках распавядаецца пра Казіміра, другога сына Казіміра, які памёр ад сухотаў і быў пахаваны ў Вільні. Б. Кручкевіч са спасылкай на трактат Мацея Мяхоўскага паведамляе, што за сваё набожнае жыццё Казімір быў прызнаны святым цудатворцам. Памёр ён у 1484-м, далучаны да ліку святых у 1560 г. [гл.: *Pauli 1887, 212*]..

24 *Што з маскавітамі грознымі ў бітвах змагаецца лютых* – У гэтых радках паэт першы раз намякае на войны Жыгімонта I з Маскоўскай дзяржавай.

25 *…нібыта з руном залатым…* – Маецца на ўвазе залатое руно, на здабычу якога, згодна з антычным міфам, выправіліся арганаўты на чале з Ясонам.

26 *Скіфскія турмы…* – Так называе Ян Вісліцкі войска маскавітаў, якое 30 ліпеня 1514 г. захапіла Смаленск.

[27] *Потым той верасень быў…* – 8 верасня 1514 г. маскоўскае войска было разбіта пад Оршай; гэтую перамогу паэт апеў у сваёй одзе, прысвечанай каралю Жыгімонту.

[28] *Многа варожых харугваў з палоннымі хутка даставіў // Ты да высокіх муроў тваёй велічнай Вільні Літоўскай* – Здабыўшы перамогу пад Оршай, Жыгімонт I 22 верасня з трыумфам увайшоў у Вільню. Варожыя штандары, захопленыя ў бітве, кароль размясціў у Віленскім кафедральным саборы.

[29] *Хай дасылаюць галіну аліўкі…* – Галіна аліўкі ў антычнай культуры была сімвалам міру.

[30] *…век Сатурна настане* – г. зн. “залаты” век.

Ода да караля Жыгімонта (с. 173)

[1] *…і сітанійскі ваяр* – Сітанійскі – ад імя Сітона, міфічнага ўладара Херсанеса Фракійскага. Б. Кручкевіч мяркуе, што Ян Вісліцкі называе маскавітаў “сітанійцамі”, а не “скіфамі”, як гэта было прынята ў тагачаснай паэзіі, следам за Плініем Старшым, які карыстаецца тым жа эпітэтам у IV кнізе сваёй “Натуральнай гісторыі” [гл.: ***Pauli 1887, p.216***].

[2] *…столькі войска* – У бітве пад Оршай загінула, паводле розных гістарычных крыніц, ад 30 да 40 тысяч маскавітаў. У палон трапілі 10 маскоўскіх ваяводаў, 17 іншых военачальнікаў, 2 тысячы «дзяцей баярскіх» і больш за 2 тысячы воінаў.

[3] *З трыма трыумфамі ў аздобе* – Тры трыумфы, пра якія піша Ян Вісліцкі, – гэта тры ваенныя перамогі караля Жыгімонта Старога. Першая з іх была атрымана над князем валахаў Багданам у 1509 г. У гэтай бітве праславілася войска кароннага гетмана Мікалая Камянецкага. Другі трыумф – перамога аб’яднанага войска кароннага гетмана Камянецкага і літоўскага гетмана Канстанціна Іванавіча Астрожскага ў бітве з дваццацічатырохтысячным войскам татараў 28 красавіка 1512 г. пад Вішняўцом, у выніку якой 8 тысяч татар былі забіты, 10 тысяч узяты ў палон. Нарэшце, трэцім трыумфам Жыгімонта паэт лічыць перамогу пад Оршай войска гетмана Астрожскага над войскам маскоўскага князя Васілія Іванавіча.

[4] *…багіня… двухаблічная* – Б. Кручкевіч мяркуе, што гэта Луна, якую, праўда, часцей называлі не двухаблічнай, а двурогай (гл.: ***Kruczkiewicz 1887, 218***). М. Езяніцкі аспрэчвае гэтую думку, разумеючы пад “двухаблічнай багіняй” Мінерву, якая спалучала ў сабе дзве асноўныя функцыі (багіня мудрасці і вайны) (гл.: ***Jezienicki 1888. Z.3, 202***). Другая версія падаецца больш слушнай, паколькі далей ідзе гаворка якраз пра тое, чаго Ян Вісліцкі чакае ад “двухаблічнай багіні”: паэтычнага натхнення – для сябе і ваенных трафеяў – для караля.

5 …*князя* – маскоўскага князя Васілія Іванавіча.

6 …*Дэлоскі*… – апалонаўскі або паэтычны.

7 *Ты Васіля завядзеш дахаты* – Маецца на ўвазе Маскоўскі князь Васілій Іванавіч.

Верш да Пятра Таміцкага (с. 179)

1 Вяліт – лёгкаўзброены жаўнер, прызначаны для пазалінейных сутычак (застрэльшчык).

2 …*матчына сястра* – Б. Кручкевіч дапускае, што словам "*matertera*" ("сястра маці") паэт называе Музу, паколькі паводле міфалагічных уяўленняў і Паркі (ад якіх, як ад маці, залежыць жыццё людзей), і Музы лічыліся дочкамі Юпітэра. З іншага боку, вучоны лічыць верагодным, што гэтым словам паэт называе родную зямлю, айчыну, ужываючы пры гэтым некласічную форму "*tera*" ("зямля"), адзначаную рымскім граматыкам Маркам Варонам [*Pauli 1887, 221*]. Тым не менш М. Езяніцкі лічыць выраз "*matertera*" памылковым, які паўстаў на грунце перастаноўкі слоў "*ter atque quater*", і адпаведны радок вучоны прапануе чытаць наступным чынам: "*Erit chelys ter atque quater plausus dabit*" [*Jezienicki 1888. Z.3, 203*].

Элегія да Багародзіцы Панны Марыі (с. 181)

1 *Цытыс арабскі*… – востраў блізу Аравійскага паўвострава.

2 Пасля "Элегіі да Багародзіцы Панны Марыі" ў зборніку "Пруская вайна" змешчаны спіс памылак пад загалоўкам "Памылкі, дапушчаныя пры надрукаванні, выпраўленыя так, як відаць ніжэй" [*Bellum 1516, p.57 n.n.*].

ДАДАТАК
Элегія магістра Паўла Кросненскага Русіна да Яна Вісліцкага (с. 185)

1 …*свяшчэнных багінь* – г. зн. Музаў.

2 *З вечнай крыніцы*… – Маецца на ўвазе крыніца Гіпакрэна.

3 …*каня… Белерафонта* – г. зн. Пегаса.

4 …*Дэльфійскай дубровы*… – тут: апалонавай. Эпітэт "дэльфійскі" паходзіць ад назвы цэнтральнага свяцілішча Апалона – Дэльфаў.

5 *Лісцем дафнійскім* – г. зн. лаўровым (ад імя німфы Дафны, якая, уцякаючы ад Апалона, ператварылася ў лаўровы куст).

6 …*музыка Грынейскі* – Апалон. Эпітэт "Грынейскі" паходзіць ад назвы горада Грынія, у якім быў храм Апалона.

7 …*гукаў смірнейскіх* – тут: гамераўскіх.

8 Таг – рака ў Іспаніі.

Верш Валянціна Экія (с. 189)

1 …*правадыр дарданскі*… – Эней.

2 …*мужа-андыйца* – г. зн. Вергілія, аўтара славутага паэтычнага эпасу “Энеіда”.

Пра сённяшнюю Прускую вайну Боскаму Жыгімонту, непераможнаму каралю Польшчы (с. 193)

1 …*кагортам* – г. зн. варожаму (тэўтонскаму) войску.

2 *На звычай лапіфаў*… – алюзія на вядомую ў антычнай міфалогіі бітву кентаўраў з лапіфамі. З кентаўрамі атаясамліваюцца ў дадзеным выпадку тэўтонцы.

3 *Войска аховы* – Крыжакі называлі сябе метафарычна “Хрыстовым войскам” або “войскам ахоўнікаў Хрыста”.

4 *Варта б за гэткі напад трохі лепей з табой абысціся!* – іронія.

На войска германцаў, што ўцякае ад палякаў (с. 193)

1 *Чорнай сабеянкі дар*… – Каштоўнымі тканінамі і камянямі, згодна з антычнымі аўтарамі, былі багатыя рэгіёны Аравійскага паўвострава (*Arabia Felix*), дзе жылі цёмнаскурыя сабейцы.

2 …*тогаў тырыйскіх красу* – г. зн. тогаў жыхароў Тыра – прыморскага горада-дзяржавы ў Фінікіі (сучасны Сур у Ліване).

КАРОТКІ СЛОЎНІК

антычных і сярэднявечных намінацый[1]

Айнід – Мелеагр, сын Айнэя і Алтэі, удзельнік паходу арганаўтаў, які праславіўся поспехамі ў калідонскім паляванні.

Аквілон – бог паўночнага ветру ў рымскай міфалогіі.

Альба (у тэксце: ripae Albae – "берагі Альбы") – старажытная назва ракі Эльбы.

Аматунтка – Венера, багіня прыгажосці і кахання ў рымскай міфалогіі.

Анхізіяд – Эней, сын траянца Анхіза і Венеры, легендарны "родапачынальнік" рымскага народа; цэнтральны герой старажытнарымскага гераічнага эпасу. У "Энеідзе" Вергілія ён выяўляецца як яркае ўвасабленне лепшых маральных якасцяў: вернасць абавязку, прыстойнасць і любоў да дзяцей.

Архілох – старажытнагрэцкі паэт, стваральнік ямбічнага верша і жанру ямба – жартаўліва-з'едлівага верша, напісанага ямбічным памерам.

Арыён – у грэцкай міфалогіі пачварны волат-паляўнічы, які валодаў здольнасцю хадзіць па моры.

Атланта горы (colles Atlantis): Атлант – у грэцкай міфалогіі тытан. Паводле аднаго з міфаў, Персей пераўтварыў Атланта ў скалу, паказаўшы яму галаву Гаргоны; адсюль уяўленне пра Атланта – гару ў Афрыцы.

Атропа – адна з трох паркаў, якая ткала нітку жыцця.

Атыка (Attica) – вобласць Старажытнай Элады з галоўным горадам Афінамі – культурным і навуковым цэнтрам антычнага свету.

Аўгуст (23.09.63 да Р.Х. – 19.08.14) – першы імператар Старажытнага Рыма.

Аўліда (Aulis, idis) – партовы горад у Беотыі (вобласці Цэнтральнай Грэцыі), месца збору грэчаскага (данайскага) флоту перад паходам на Трою.

Аўстр – бог паўднёвага ветру ў грэцкай міфалогіі.

Ахат – адзін са спадарожнікаў *Энея*.

Ахіл – сын Пелея і Фетыды, адзін з найславуцейшых герояў Траянскай вайны, які нарадзіўся ў фесалійскім горадзе *Ларысе* (Larissa).

---

[1] Для тапонімаў, гідронімаў і этнонімаў указваецца лацінская форма.

Ацыдалійка – Венера, у рымскім пантэоне багіня кахання і прыгажосці; у Ацыдалійскай крыніцы купаліся тры Грацыі – дочкі Венеры.

Аяніды, Аянійкі – Музы, апякункі навук, мастацтваў і ўсёй творчай дзейнасці. У рымскі перыяд ушаноўваліся дзевяць Муз: Эрато – лірычнай паэзіі і эратычных вершаў, Эўтэрпа – лірычных вершаў, Каліопа – эпічнай паэзіі; Кліо – гісторыі; Мельпамена – трагедыі, Палігімнія – танца, музыкі; Тэрпсіхора – танца; Талія – камедыі, Уранія – астраноміі. Перыфрастычна Музы называліся Аянідамі, паколькі жылі на гары Гелікон у Аоніі (Беотыі), вобласці Цэнтральнай Грэцыі.

Бакх (Вакх, Бахус) – бог віна ў старажытных рымлян.

Барбіт – шматструнная ліра.

Барысфен (Borysthenis) – назва ракі Днепр у антычнай і сярэднявечнай лацінскай літаратуры.

Барэй – бог паўночнага ветру ў грэцкай міфалогіі.

Басфор (Bosporus)**: Фракійскі** (Threicius) – сучасны праліў Басфор;
Цымярыйскі (Cimmerius) – сучасны Керчанскі праліў.

Белерафонт – антычны герой, сын цара Глаўка. Існуе паданне пра тое, як Белерафонт хацеў трапіць на неба на крылатым кані Пегасе, аднак конь скінуў яго.

Бромій – маецца на ўвазе *Бакх*.

Бронт і Стэроп – цыклопы, што працавалі ў майстэрнях Вулкана, рымскага бога агню.

Ванда – легендарная польская каралева, дачка Крака.

Варна (Varna) – горад у Балгарыі, за Дунаем, паблізу ад якога адбылася бітва паміж войскамі 20-гадовага Уладзіслава Ягайлавіча, караля Рэчы Паспалітай і Венгрыі, і войскамі турэцкага султана Гамурата 20 лістапада 1444 г. У гэтай бітве кароль Уладзіслаў загінуў.

Верпы (ад “verpus” – абрэзаны) – габрэі.

Веспер – вячэрняя зорка.

Вістула (Vistula) – старажытная назва ракі Вісла. Гл. таксама *Істула*.

Віяд (Viadus) – старажытная назва ракі Одэр.

Вольскі (Volsci) – старажытнаіталійскае (окскае) племя, што насяляла поўдзень гістарычнай вобласці Лацый (цэнтральная частка Апенінскага паўвострава).

Вяледа – славутая старажытная прадказальніца з германскага племя бруктэраў.

Вясталкі – жрыцы старажытнарымскай багіні Весты, якія павінны былі захоўваць дзявоцтва на працягу 30 гадоў.

Гадэс (Gades) – сучасны іспанскі горад Кадзіс.

Гамурат (Мурат II) – турэцкі султан, правіў у 1421–1451 гг.; перамог караля Уладзіслава пад *Варнай*.

Ганібал (247/246 – 183 да Р.Х.) – сын Гамількара Баркі, знакаміты карфагенскі палкаводзец.

Гараманты (Garamantes) – старажытнае берберыйскае племя ўнутранай Лівіі.

Гдан (Gdanus) – Гданьск, буйны горад на поўначы Польшчы.

Гектар – сын Прыама і Гекубы, славуты герой Траянскай вайны.

Гелеспонт (Hellespontus) – сучасны праліў Дарданелы.

Геліканіды – Музы (гл. *Аяніды*), якія жылі на гары Гелікон.

Геліконская гара – абагульненая назва гор у Цэнтральнай Грэцыі, месца жыхарства Муз.

Гельветы (Helvetii) – старажытны кельцкі народ, тэрыторыя рассялення якога прыкладна адпавядае сучасным межам Швейцарыі.

Гем (Haemus) – горны ланцуг у паўночнай Македоніі і Фракіі (сёння – Балканы).

Геманійская зямля (ora Haemonia) – Фесалія, вобласць на паўночным усходзе Грэцыі.

Герцынійскі (Герцынскі) лес (nemus Hercinium) – лясісты горны ланцуг у Германіі, які цягнецца ад Рэйна да Карпат. Паводле рымскіх уяўленняў, яго працягласць вымяралася 60-дзённым пераходам. У пазнейшы час пад Герцынійскім лесам мелі на ўвазе Цюрынгскі лес і Рудныя горы.

Гіменей – старажытнагрэцкі бог шлюбу.

Гіпакрэна (гл. *Пегасіды*) – цудадзейная крыніца паэзіі.

Дарыда – дачка Акіяна, паэтычная метафара мора.

Дуліхіец – Уліс (Адысей), адзін з герояў Траянскай вайны; галоўны герой паэмы Гамера “Адысея”. Яго спадчынным уладаннем, згодна з паданнем, быў востраў Дуліхія.

Дэлос (Delos) – востраў у Эгейскім моры, дзе, паводле падання, Латона нарадзіла Апалона і Дыяну.

Дэцыі, Камілы, Фабіі – славутыя патрыцыянскія роды Старажытнага Рыма.

Жыгімонт Першы (1467 – 1548) – вялікі князь літоўскі і кароль Польшчы (1506 – 1548), сын Казіміра Ягайлавіча.

Заіл – грэчаскі аратар і сафіст (4 ст. да Р.Х.), які жорстка крытыкаваў Гамера. У лацінскай паэзіі эпохі Рэнесансу гэтае імя становіцца агульным найменнем зайздросніка і несправядлівага крытыка.

Зефір – бог заходняга ветру ў грэцкай міфалогіі.

Іберы (Hiberi) – насельніцтва старажытнай Іспаніі; **іберыйскі** – іспанскі.

Іліён (Ilium; Ilion) – другая назва *Троі*, паводле якой атрымала назву "Іліяда" Гамера.

Істр (Ister) – старажытная назва Дуная.

Істула (Istula) – старажытная назва Вісты. Гл. таксама *Вістула*.

Ітака – гл. *Уліс*.

Каліопа – адна з дзевяці Муз (гл. *Аяніды*).

Каміла – легендарная дачка цара вольскаў, забітая *Энеем*.

Камілы – гл. *Дэцыі*.

Касталійка, Касталіда – Муза (гл. *Аяніды*). Перыфрастычнае найменне Муз – "Касталійкі (Касталіды)" – паходзіць ад назвы Кастальскай крыніцы на гары Парнас, якая лічылася сімвалам паэзіі.

Кіпрыда – Венера.

Кір – персідскі цар.

Конрад Аляскіцкі – польскі ўдзельны князь, які восенню 1409 г. уступіў у саюз з крыжакамі.

Конрад Мазавецкі (1191–1247) – польскі ўдзельны князь, уладар Мазовіі і Куявіі. Пры актыўнай падтрымцы каталіцкай царквы вёў доўгую барацьбу за падначаленне земляў прусаў; у 1226 г. з мэтаю заваявання прусаў прызваў Тэўтонскі ордэн, перадаўшы нямецкім рыцарам вобласць Хелмна і ў якасці "лена" ўсе прускія землі на ўсход ад ніжняга цячэння Вісты.

Крак (Кракус) – адзін з першых міфічных уладароў Польшчы, які лічыцца заснавальнікам Кракава.

Ксант (Xanthus) – эпітэт ракі Скамандр у Траядзе, дзе разгортваліся асноўныя падзеі Траянскай вайны.

Куявія (arva Cujava) – гістарычная вобласць паўночна-заходняй Польшчы.

Лапіфы – у старагрэцкай міфалогіі шматлікае племя гігантаў, якія перамаглі ў вайне з кентаўрамі.

Леда – маці чароўнай Алены. Леда нарадзіла Алену ад Зеўса, які з'явіўся да яе ў вобразе лебедзя. Менавіта з-за Алены, выкрадзенай Парысам, пачалася Траянская вайна.

Лех – легендарны заснавальнік польскай дзяржавы, брат Чэха і Руса.

Леўкадзійскія воды (profundum Leucadium): Леўкадзія – востраў і горад блізу заходняга ўзбярэжжа Акарнаніі – заходняй прыбярэжнай вобласці Цэнтральнай Грэцыі.

Лікаонская Мядзведзіца – сузор'е Вялікай Мядзведзіцы.

Лікійская зямля, Лікія (ora Lycia) – вобласць у Малой Азіі.

Магамет (Мухамед; каля 570–632 гг.) – рэлігійны прапаведнік, які лічыцца заснавальнікам ісламу.

Мазовія (Masovia) – гістарычная назва часткі польскіх земляў у сярэднім цячэнні Віслы. Тэрыторыя Мазовіі ў асноўным адпавядае тэрыторыі сучаснага Варшаўскага ваяводства.

Македонец – Аляксандр III Македонскі (356–10.06.323 да Р.Х.), сын цара Філіпа II; адзін з вялікіх антычных палкаводцаў і заваёўнікаў; выхаванец Арыстоцеля.

Маласійскія псы – вельмі жорсткія і бязлітасныя, якіх бралі на паляванне ў антычныя часы.

Малея (Malea) – мыс у межах Лаконікі, небяспечны для караблёў.

Марцэл – прадстаўнік плябейскага адгалінавання патрыцыянскага роду Клаўдзіяў. Тут, хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе Марцэл Клаўдзій. У 213–212 гг. да Р.Х. ён камандаваў арміяй, якая захапіла Сіракузы; у 207 г. загінуў у бітве з Ганібалам.

Масагеты (Massagetae) – у антычнасці так называлі ваяўнічае плямя, якое качавала паміж Каспійскім і Аральскім морамі.

Меатыйскае балота (Maeotis palus) – Азоўскае мора.

Мемфіс (Memphis) – сталіца старажытнага Егіпта.

Менетыяд – Патрокл, сябар *Ахіла*, удзельнік Траянскай вайны.

Мінерва (у грэцкай міфалогіі – Афіна) – старажытнарымская багіня, апякунка мастацтваў, рамёстваў, а таксама багіня вайны і мудрасці.

Мінос – у грэцкай міфалогіі магутны, справядлівы цар Крыта, сын Зеўса і Еўропы. Загадаў Дзедалу пабудаваць лабірынт для Мінатаўра.

Мызы (Mysi) – так у сярэднявечнай літаратуры называлі румынаў і малдаван.

Назамоны (Nasamones) – старажытныя жыхары Лівіі.

Намады (Nomades) – антычная назва качэўных плямёнаў. У сярэднявечнай лацінскай літаратуры так называлі татараў.

Непот Карнелій (каля 100 г. – пасля 32 г. да Р.Х.) – рымскі пісьменнік, гісторык, аўтар шматлікіх біяграфій выдатных дзяржаўных і ваенных дзеячаў.

Оркус – адна з назваў падземнага каралеўства.

Оса (Ossa) – гара ў паўночна-ўсходняй Фесаліі, радзіма кентаўра Хірона; разам з Алімпам і *Пеліёнам* утварае горны ланцуг, што аддзяляе фесалійскую даліну ад Эгейскага мора.

Палада – грэчаскі эпітэт *Мінервы*.

Палінодыя – паўтор старой песні або проста паэтычны твор.

Панонская краіна (Pannonicum regnum) – рэгіён у басейне сярэдняга цячэння Дуная і яго правых прытокаў Дравы і Савы, тэрытарыяльна большай часткай супадае з сучаснай Венгрыяй.

Парма – невялікі круглы шчыт.

Парфяне (Part(h)i) – старажытнае сцяпное племя, якое жыло на поўдзень ад Каспійскага мора.

Патрон – абаронца, заступнік, мецэнат.

Пегасіды – Музы (гл. *Аяніды*). Перыфрастычнае найменне "Пегасіды" звязана з уяўленнем пра крыніцу Гіпакрэну на гары Гелікон, якая ўтварылася ад удару капытом крылатага каня Пегаса. Разам з Касталійскай крыніцай Гіпакрэна была сімвалам паэзіі.

Пеласгі (Pelasgi) – грэкі.

Пелід – маецца на ўвазе *Ахіл*.

Пеліён (Pelion) – гара на востраве Магнэзія (цяпер Петрас).

Пергам (Pergamum; Pergamus) – старажытны горад у Малой Азіі, сталіца Пергамскага царства; тут – паэтычная лакалізацыя *Троі*.

Пілоскі старац – гамераўскі Нестар, самы старшы ўдзельнік Траянскай вайны. Ён здабыў сабе славу красамоўствам і мудрасцю.

Пір (319–272 да Р.Х.) – валадар Эпіра, старажытнай вобласці Міжземнамор'я. Атрымаў шэраг ваенных перамог над рымлянамі, аднак ганебную вядомасць набыла яго перамога пры Аускуле ў 279 г., калі ён страціў амаль усё сваё войска ("Пірава перамога").

Піэрый – паэт; **піэрыйскі** – паэтычны.

Плектр – палачка, з дапамогай якой гралі на кіфары.

Понт Эўксінскі (pelagus Euxinus) – антычная назва Чорнага мора.

Прыам – легендарны цар Троі.

Прэнестынская багіня – Фартуна, багіня лёсу.

Пталемаіда (Ptolemais, idis) – назва шэрага гарадоў у Егіпце і Малой Азіі.

Пунійцы (Poeni) – жыхары Карфагена – буйнейшага горада-дзяржавы ў антычным Міжземнамор'і, з якім Рым доўгі час вёў войны.

Ростра – нос карабля.

Рыфейскі (Riphaeus) – паўночны; **Рыфейскімі гарамі** (Riphaei montes) на сярэднявечных картах Усходняй Еўропы звычайна называлі Уральскія горы.

Рэтэйскі – траянскі.

Саблоз (Sablosus) – незыдэнтыфікаваны тапонім; магчыма, рака Заблоцце, левы прыток Днястра.

Сарматы (Sarmati) – старажытнае племя іранскага паходжання, якое качавала на ўсход ад Дона. Пазней яны распаўсюдзіліся далей на захад да нізін Дуная. Паводле адной з тэорый этнагенезу, сарматы перамяшаліся са славянамі, у выніку чаго ў еўрапейскай традыцыі (прынамсі, літаратурнай) сарматамі сталі называць жыхароў Цэнтральнай і часткова Усходняй Еўропы. Згодна з гэтай традыцыяй, у XV–XVI стст. сарматамі называлі сябе падданыя Ягелонаў.

Сарматыя (Sarmatia) – назва розных частак Еўразіі. Адрознівалі Еўрапейскую і Азіяцкую Сарматыю. Еўрапейская Сарматыя ахоплівала тэрыторыю сучаснай Цэнтральнай і часткова Усходняй Еўропы. У XVI ст. гэтая назва трывала замацавалася за дзяржавай Ягелонаў.

Сафо (нарадз. каля 650 г. да Р.Х.) – славутая старажытнагрэцкая паэтэса, якая нібыта кінулася ў мора са скалы з-за няшчаснага кахання.

Свебы (Suebi) – вялікая група заходнегерманскіх народаў, плямёны якіх з I ст. да Р.Х. распаўсюдзіліся ад Паўночнай і Паўднёвай Германіі да Цэнтральнага Дуная.

Сібіла – вяшчуння; з ліку старажытнарымскіх сібіл найбольш славутай была Кумская (**Эўбейская**), якая, паводле падання, дажыла да неверагодна старога ўзросту.

Сідон (Sidon) – партовы горад на Міжземным моры. У гэтым горадзе нарадзілася Дзідона, міфічная карфагенская царыца, якая закахалася ў *Энея*.

Сірыус – зорка ў сузор'і Вялікага Пса.

Скамандр (Scamander) – рака ў Траядзе (цяпер Мендэрэсу).

Скіфы (Scythae) – зборная назва плямёнаў, што жылі ў старажытныя часы ў Прычарнамор'і, на Доне, Дняпры і Дунаі. У XVI ст. у лацінамоўнай літаратуры скіфамі называлі жыхароў Маскоўскай дзяржавы. Сама гэтая дзяржава адпаведна называлася **Скіфія** (Scythia).

Стацый Публій Папіній (каля 40–96 г.) – старажытнарымскі паэт і педагог. Праславіўся сваім эпасам “Фіваіда” ў 12 кнігах, дзе апісваецца вядомы паход “семярых супраць Фіваў”.

Стрымон (Strymon) – рака на тэрыторыі сучаснай Балгарыі.

Стыгійскія воды, Стыкс – рака ў падземным каралеўстве памерлых.

Стэнтар – адзін з удзельнікаў Траянскай вайны, які адрозніваўся магутным голасам.

Сцыпіёны – вядомы патрыцыянскі род у Старажытным Рыме. Найбольшую вядомасць у гісторыі атрымалі два Сцыпіёны: 1) Публій Карнэлій Сцыпіён (235–183 гг. да Р.Х.), герой 2-й Пунічнай вайны; за ўдалую высадку войска ў Афрыцы атрымаў мянушку Афрыканскі Старшы; 2) Публій Карнэлій Сцыпіён Эміліян (185–129 гг. да Р.Х.), праславіўся сваімі ваеннымі подзвігамі пры Підне, у Іспаніі і Афрыцы. Менавіта пад яго камандаваннем быў разбураны Карфаген, за што ён атрымаў мянушку Афрыканскі Малодшы.

Тамірыс – царыца скіфскага племя масагетаў, якая перамагла персідскага цара Кіра.

Танаіс (Tanais) – назва ракі Дон у антычнай і сярэднявечнай літаратуры.

Таўрыйскі край (Taurica ora) – Крым.

Троя (Ілiён) – старажытны горад на паўночным захадзе Малой Азіі. У вершах антычных паэтаў апяваецца дзесяцігадовая аблога і захоп Троі грэкамі, які адбыўся каля 1200 г. да Р.Х.

Тула (Thule) – напаўлегендарная астраўная краіна на крайняй поўначы Еўропы.

Турма – назва коннага атрада з 30 або 40 вершнікаў у рымскім войску.

Тызіфона – адна з трох фурый, рымскіх багінь помсты.

Тымбрэец – маецца на ўвазе *Апалон*. У гістарычнай вобласці Тымбра, на рацэ Тымбрыі, у антычныя часы знаходзілася свяцілішча Апалона.

Тырынфіец – Геркулес (Геракл), сын Зеўса і Алкмены, антычны герой, які праславіўся дванаццаццю подзвігамі.

Тыфіс – легендарны стырнавы арганаўтаў, удзельнікаў пахода ў Калхіду на караблі “Арго” за залатым руном.

Тыяра – грэцкая назва знака свецкай або царкоўнай улады (кароны, дыядэмы або іншага галаўнога ўбору адпаведнай семантыкі).

Тэгеец – Меркурый, бог гандлю ў рымскай міфалогіі, веснік Алімпійскіх багоў.

Тэнарыйская гарачка – вар'яцтва, часцей за ўсё – ад кахання.

Тэспіяды – Музы (гл. *Аяніды*). Перыфрастычнае найменне "Тэспіяды" паходзіць ад назвы горада Тэспій, які знаходзіўся на гары Гелікон і славіўся культам Муз.

Тэрпсіхора – адна з дзевяці Муз (гл. *Аяніды*).

Тэўтонцы (Teutoni) – старажытныя плямёны, відаць, германскага паходжання, якія першапачаткова насялялі раён ніжняга цячэння Эльбы і паўвостраў Ютландыю. Пазней слова "тэўтоны" ўжывалася для пазначэння германцаў наогул і рыцараў Тэўтонскага ордэна ў прыватнасці.

Уліс (Адысей) – у грэцкай міфалогіі храбры і дасціпны герой, цар Ітакі, сын Лаэрта і Антыклеі.

Фабіі – гл. *Дэцыі*.

Фартуна – старажытнарымская багіня шчасця, шчаслівага лёсу і шанцу.

Фацыда (Phocis, idis) – вобласць у сярэдняй Грэцыі, дзе знаходзіліся горы Парнас і Гелікон – месца знаходжання муз.

Фаэтон – у грэцкай міфалогіі сын бога сонца Геліоса, які згарэў, няўмела кіруючы бацькавай вогненнай каляснiцай. Пазней гэтае імя атаясамлівалася з самім богам сонца.

Феб – другое імя Апалона, бога сонечнага святла, гармоніі, духоўнай дзейнасці і мастацтваў.

Фівы (Thebae) – буйнейшы горад Беотыі (вобласці Цэнтральнай Грэцыі), месца, звязанае са шматлікімі грэцкімі легендамі і міфалагічнымі паданнямі.

Філірыд – кентаўр Хірон, сын Кронаса і Філіры, выхавацель Ахіла і Патрокла.

Фінікійцы (Phoenices) – сямітамоўнае насельніцтва сірыйскага ўзбярэжжа, якое пазней рассялілася па ўсім Міжземнамор'і.

Флегетонт – вогненная рака ў падземным каралеўстве.

Фрыгія (Phrygia) – гістарычная вобласць у цэнтральнай частцы Малой Азіі.

Фрызы (Frisii) – племя на марскім узбярэжжы паміж Рэйнам і Амізіяй.

Фрэдэрык (Фрыдрых) II Гогенштаўфен (1194 – 1250) – імператар "Свяшчэннай Рымскай імперыі" ў 1212 – 1250 гг.

Цыклады (Cyclades) – група астравоў у Эгейскім моры.

Цымба – род лодкі, чоўна.

Цымбрыйцы, цымбры (Cimbri) – германскае племя, што жыло ў Ютландыі.

Цымярыйскі Басфор – гл. *Басфор*.

Цымярыйцы (Cimmerii) – жыхары Крыма.

Цынтыец – Апалон (гл. *Феб*).

Цыра (Cirrha) – прыстань Дэльфаў у заліве Крыса (Фацыда); метанімічнае пазначэнне дэльфійскага аракула.

Цэрэра – багіня земляробства ў старажытнарымскай міфалогіі.

Эліза – Дзідона, гл. *Сідон*.

Эней – у антычнай міфалогіі сын траянца Анхіза і Афрадыты. Лічыцца міфічным родапачынальнікам рымлян.

Эол – бог вятроў.

Эпідаўрыйская навука – медыцына; Эпідаўр – партовы горад у Старажытнай Грэцыі, славуты размешчаным паблізу свяцілішчам Асклепія, да якога здалёк прыходзілі хворыя з надзеяй на ацаленне.

Эрэб – адна з назваў падземнага каралеўства.

Эўбейская сібіла – гл. *Сібіла*.

Эўменіды – другая назва эрыній, якія лічыліся багінямі помсты.

Этон – адзін з коней бога сонца Геліоса.

Этэокл – сын фіванскага цара Эдыпа, удзельнік паходу “сямі супраць Фіваў”.

Эўр – бог усходняга ветру ў грэцкай міфалогіі.

Эякід фесалійскі – маецца на ўвазе *Ахіл*, які быў унукам Эяка, сына Зеўса і Эгіны.

Югер – мера зямельнай плошчы = 2519 кв. м.

Юлій – Гай Юлій Цэзар (13.07.100–15.03.44 да Р.Х.), вялікі рымскі палітычны дзеяч і палкаводзец; атрымаў шэраг славутых перамог як над сваімі палітычнымі праціўнікамі, так і над знешнімі ворагамі Рыма.

Спіс скарочаных назваў твораў Яна Вісліцкага:

Bellum I – Belli Pruteni tres libelli. Libellus I

Bellum II – Belli Pruteni tres libelli. Libellus II

Bellum III – Belli Pruteni tres libelli. Libellus III

Carmen exhort. – Carmen exhortatorium Ioannis Vislisiensis ad Musam M. Pauli Rutheni…

Elegia Magistri – Elegia Magistri Pauli Crosnensis Rutheni ad Joannem Vislicium, Pieridum cultorem, discipulum non poenitendum (vide in appendice)

Carmen Valentini – Pro recommendatione… Joannis Visliciensis… carmen Valentini Eckii Philiripolitani (vide in appendice)

Argumenta – Argumenta libellorum Belli Pruteni

Ode lectori – Ode tricolos tetrastrophos lectori

Ode – Joannis Visliciensis ode tricolos tetrastrophos ad Serenissimum principem Sigismundum … super suum cum Scythis duellum victoriamque de eisdem

Ad Tomiczki – Ad Reverendissimum in Christo patrem et dominum, dominum Petrum Tomiczki, Dei gratia Episcopum Premisliensem ac vice Cancellarium regni Poloniae meritissimum Joannis Visliciensis jambicum trimetrum Archilichicum

Elegia – Elegia ad deiparam Virginem Mariam pro sedanda peste

Epigramma – Epigramma in invidum

Divo – Divo Sigismundo Poloniae Regi invicto (“De praesenti bello Prutenico”)

In exercitum – In exercitum Germanum Polonos fugientem (“De praesenti bello Prutenico”)

БІБЛІЯГРАФІЯ

Тэксты:

Bellum 1516 [Visliciensis Joannis] Bellum Prutenum. Cracoviae, 1516.

Carmen 1523 Carmen Nicolai Hussoviani de statura feritate ac venatione bisontis. Cracoviae, 1523.

De praesenti De praesenti bello Prutenico [S.l., s.a.]

Pauli 1887 Pauli Crosnensis Rutheni atque Joannis Visliciensis carmina edidit… Dr. Bronislavus Kruczkiewicz. Cracoviae, 1887. S.163-224.

Radvanus 1588 [Radvanus Joannis] Radivilias sive De vita et rebus praeclarissime gestis, immortalis memoriae, illustrissimi principis Nicolai Radivili… libri quattuor Joannis Radvani… Vilnae, 1588.

Даследаванні:

Axer 1998 Axer J. Latein als Sprache der Adelsnation in der polnisch-litauischen Konföderation (16. Bis 18. Jahrhundert). Eine These // Latein und Nationalsprachen in der Renaissance. Wiesbaden, 1998. S.131-135.

Barycz 1935 Barycz H. Historja uniwersytetu Jagiellońskiego w epoce humanizmu. Kraków, 1935.

Bieńkowski 1891 Bieńkowski P. [rec.] Wpływ klasycznych poetów rzymskich na Jana z Wiślicy i ślady ich w jego utworach napisał Dr. Michał Jezienicki (Osobne odbicie z XIV Tomu Rozpr. i spraw. Wydz. filologicznego AU w Krakowie), s.30, 8^0 // Kwartalnik historyczny. R.V. We Lwowie, 1891. S.129-132.

Biskup 1991 Biskup Marjan. “Wojna Pruska” czyli wojna Polski z zakonem krzyżackim z lat 1519 – 1521 u źrudeł sekularyzacji Prus Krzyżackich. Część II. Olsztyn, 1991.

Brandowski 1886 Brandowski A. (rec.) Dr. Bronisław Kruczkiewicz, docent Uniwersytetu Krakowskiego. O Pawle z Krosna i Janie z Wiślicy // Warta. N 611. S.5399-5401; N 613. S.5414-5416.

Brükner 1958 Brükner A. Dzieje kultury polskiej. T.I: Od czasów przedhistorycznych do r. 1506. Warszawa, 1958.

Ćwikliński 1922 Ćwikliński L. O bitwie grunwaldskiej // Dziennik poznański. R.64. 16.07.1922. № 159.

Dzieje 1978 Dzieje Polski / Pod red. J.Topolskiego. Warszawa, 1978.

F.M.S. 1867 F.M.S. (Sobieszczański) Wiślicy (Jan z) // Encyclopedyja powszechna. T.27. Warszawa, 1867. S.210.

Hahn 1910 Hahn W. Grunwald w poezyi polskiej: Szkic literacki. Kraków, 1910.

Janociana 1776 Janociana sive Clarorum atque illustrium Poloniae auctorum mecenatumque memoriae miscellae. Varsaviae et Lipsiae; Vol. I. A.R.S. MDCCLXXVI (1776); Vol.II. A.R.S. MDCCLXXIX (1779).

Jezienicki 1888 Jezienicki M. Uwagi krytyczne nad utworami łacińskimi Pawła z Krosna i jana z Wiślicy wydanymi przez prof. Dr. B.Kruczkiewicza // Muzeum. R.IV. We Lwowie, 1888. Z.1. S.44-51; Z.2. S.82-88; Z.3. S.135-140; Z.4. S.196-204.

Jezienicki 1891 Jezienicki M. Wpływ klasycznych poetów rzymskich na Jana z Wiślicy i ślady ich w jego utworach // Rozprawy i sprawozdania z posiedzeń wydziału filologicznego Akademii Umiejętności. T.XIV. 1891. S.133-162.

Kondratowicz 1875 Kondratowicz L. Historya literatury polskiej. Warszawa, 1875. T.I.

Kruczkiewicz. De Joannis 1887 Kruczkiewicz B. De Joannis Visliciensis vita atque scriptis // Pauli Crosnensis Rutheni atque Joannis Visliciensis carmina edidit… Dr. Bronislavus Kruczkiewicz. Cracoviae, 1887. S.XXXVIII – XLVI.

Kruczkiewicz. De Pauli 1887 Kruczkiewicz B. De Pauli Crosnensis vita atque scriptis // Pauli Crosnensis Rutheni atque Joannis Visliciensis carmina edidit… Dr. Bronislavus Kruczkiewicz. Cracoviae, 1887. S.XVI – XXXVIII.

Kruczkiewicz 1885 Kruczkiewicz B. O Pawle z Krosna i Janie z Wiślicy // Rozprawy i sprawozdania z posiedzeń wydziału filologicznego Akademii Umiejętności. T.XII. 1885. (odbitka).

Kruczkiewicz 1892 Kruczkiewicz Br. (rec) Jezienicki M.: Wpływ klasycznych poetów rzymskich na Jana z Wiślicy i ślady ich w jego utworach. Osobne odbicie z XIV tomu Rozpraw wydziału filologicznego AU w Krakowie 1890, s.30, 8^0 // Kwartalnik historyczny. R.VI. We Lwowie, 1892. S. 366–368.

Łempicki 1952 Łempicki S. Renesans i humanizm w Polsce / Materiały do dziejów. Kraków, 1952.

Maciejowski 1852 Maciejowski W.A. Piśmiennictwo polskie od czasów najdawniejszych aż do r. 1830. T.II. Warszawa, 1852.

Mecherzyński 1880 Mecherzyński K. Jana z Wiślicy "Wojna Pruska" // Rozprawy i sprawozdania z posiedzeń wydziału filologicznego Akademii Umiejętności. T.VIII. W Krakowie, 1880. S.274-295.

Nadolski 1956 Nadolski B. Poezja polsko-łacińska w dobie Odrodzenia // Odrodzenie w Polsce. T.IV. Warszawa, 1956.

Nowak-Dłużewski 1966 Nowak-Dłużewski J. Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. Czasy Zygmuntowskie. Warszawa, 1966.

Oderborn 1582 [Oderborn Paulus] De russorum religione, ritibus nuptiarum, funerum, victu, vestitu etc. et de Tartarorum religione ac moribus vera et luculenta narratio. S.l., 1582.

Pauli 1887 Pauli Crosnensis Rutheni atque Joannis Visliciensis carmina edidit… Dr. Bronislavus Kruczkiewicz. Cracoviae, 1887.

Pilat 1909 Pilat R. Historya poezyi polskiey w. XVI i w trzech pierwszych dziesiątkach lat w. XVII (1500 – 1632). Rozwój poezji łacińskiej w pierwszej połowie XVI w. Rej – Kochanowski. Lwów-Warszawa, 1909.

Poczet 1993 Poczet królów i książąt polskich. Warszawa, 1993.

Sinko 1935 Sinko T. Poezja nowołacińska w Polsce // Dzieje literatury pięknej w Polsce. Cz.1. Kraków, 1935. S.73-145.

Słownik 1999 Słownik literatury staropolskiej / Pod red. T.Michałowskiej. Wrocław etc., 1999.

Smereka 1932 Smereka J. Jan z Wiślicy (wstęp) // Jan z Wislicy. Wojna Pruska. Lwów, 1932. S.9-37.

Smereka 1931 Smereka J. Najstarsi polscy poeci łacińscy w dobie humanizmu // Przegląd humanistyczny. 1931. R.VI. Z.I-II. S.47-100.

Topolska 1984 Topolska M. B. Czytelnik i książka w Wielkim Księstwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. Wrocław, 1984.

Ulčinaite 1995 Ulčinaite Eugenija. Literatura neołacińska jako świadectwo litewskiej świadomości państwowej i narodowej // Łacina w Polsce: Zeszyty naukowe pod red. J.Axera. Z.1-2: Między Slavia Latina i Slavia Orthodoxa. Warszawa, 1995. S. 27-43.

Wiszniewski 1844 Wiszniewski M. Historya literatury polskiej. T.VI. W Krakowie, 1844.

Witkowski 1891 Witkowski S. Jan z Wiślicy, jego życie i pisma // Przewodnik naukowy i literacki. 1891. T.XIX. S.29-44, 173-184, 277-286, 365-372, 440-449.

Ziomek 1999 Ziomek J. Literatura Odrodzenia / Dzieje literatury polskiej / Pod red. J.Ziomka. Warszawa, 1999.

Ziomek 2002 Ziomek J. Renesans. Warszawa, 2002.

Баткин 1984 Баткин Л.М. Странности ренессансной идеи „подражания" древним: „Imitatio" или „inventio"? // Античность в культуре и искусстве последующих веков / Материалы научной конференции 1982. М., 1984. С.72-107.

Гаспаров 1986 Гаспаров М.Л. Стихотворные размеры Катулла // Катулл Гай Валерий. Книга стихотворений / Отв.ред.М.Л.Гаспаров. М., 1986. С.291-296.

Голенищев-Кутузов 1963 Голенищев-Кутузов И.Н. Гуманизм у восточных славян (Украина и Белоруссия). М., 1963.

Голенищев-Кутузов 1965 Голенищев-Кутузов И. Н. Итальянское возрождение и славянские литературы XV – XVI веков. М., 1965.

Дарашкевіч 1975 Дарашкевіч В.І. Мастацкі помнік Грунвальду // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1975. № 3. С.55-59.

Дворецкий 1976 Дворецкий И.Х. Латинско-русский словарь. Около 50 000 слов. Изд. 2-е. М., 1976.

Дорошкевич 1979 Дорошкевич В.И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI века. Мн., 1979.

Дуров 1993 Дуров В.С. Поэт золотой середины: Жизнь и творчество Горация // Гораций. Собрание сочинений. СПб., 1993. С.5-20.

Жлутка 1989 Жлутка А. Антычныя традыцыі ў літаратуры Рэнесансу і Асветніцтва на Беларусі (некаторыя аспекты) // Спадчына Скарыны: Зборнік матэрыялаў першых Скарынаўскіх чытанняў (1986) / Укл. А.І.Мальдзіс. Мн., 1989. С.239–247.

Жлутка 1993 Жлутка А. Лацінская літаратура як феномен беларускай культуры // Спадчына. 1993. № 2. С.13-21.

Кавалёў 2003 Кавалёў С. Дзяржаўна-палітычная самасвядомасць паэтаў Беларусі эпохі Рэнесансу // Acta Albaruthenica. 2003. № 3. С.3-7.

Кавалёў 1990 Кавалёў С.В. Традыцыі Я.Вісліцкага і М.Гусоўскага ў гераіка-эпічнай паэзіі Беларусі і Літвы канца XVI стагоддзя // Вестник БГУ. Сер.4. 1990. № 1. С.3-10.

Кароткі 1991 Кароткі У. Беларускія прадмовы і пасляслоўі другой палавіны XVI – першай палавіны XVII ст. // Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / Уклад. У.Кароткі. Мн., 1991. С.6-22.

Кароткі 1997 Кароткі У. Пісаў пра мінуўшчыну, думаў пра будучыню… // Маладосць. 1997. № 12. С.89-93.

Кароткі 1999 Ян Вісліцкі: паміж Ягелонамі і Рурыкавічамі // Славянскія літаратуры ў сусветным кантэксце. У 2-х ч. Ч.2. С.79-81.

Кароткі 2001 Кароткі У.Г. Дзяржаўная і дынастычная гісторыя ў «Прускай вайне» Яна Вісліцкага // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе. Проблемы теоретической и исторической поэтики / Мат-лы междунар. научн. конф.: В 2-х ч. Ч.2. Гродно, 2001. С.260-264.

Кароткі 2004 Кароткі У.Г. «Песня пра зубра» – помнік элітарнай пісьмовай культуры Беларусі // Літаратура і мастацтва. 2004. 27 жніўня.

Летописец 1980 Летописец Великих Князей Литовских // Полное собрание русских летописей. М., 1980. Т.35. С.61-67.

Лосев 2001 Лосев А.Ф. Античная литература / Под ред. проф. А.А.Тахо-Годи. М.; Мн., 2001.

Падокшын 2003 Падокшын С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. Мн., 2003.

Парэцкі, Прэнская 1973 Парэцкі Я.І., Прэнская Ю.І. Паэма Яна Вісліцкага «Пруская вайна» // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн., 1973. С.161-164.

Парэцкі 1991 Парэцкі Я. Ян Вісліцкі. Мн., 1991.

Подосинов 1995 Подосинов А.В. Lingua Latina. Хрестоматия латинских текстов. Ч.IV. Кн.1. М., 1995.

Прадмовы 1991 Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / Уклад. У.Кароткі. Мн., 1991.

Прыгодзіч 2003 Прыгодзіч М. Дзе хвалі ціхаплыннай Вісліцы…: З лексікі гаворкі вёскі Лышча // Роднае слова. 2003. № 1. С.35-39.

Саверчанка 1998 Саверчанка І. Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998.

Сагановіч 2002 Сагановіч Г. Грунвальд у беларускай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны агляд. Т.9. 2002. Снежань. С.152–168.

Сагановіч 2001 Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мн., 2001.

Скарына 1990 Скарына Францыск. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мн., 1990.

Хроника 1975 Хроника Быховца // Полное собрание русских летописей. Т.32. М., 1975. С.128-173.

Цисык 1995 Цисык А.З. Античные реминисценции во введении к поэме Я.Вислицкого «Прусская война» // Славянские литературы в контексте мировой. Мн., 1995. С.186-189.

Энцыклапедыя. Т. 1. 1993 Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1. Мн., 1993.

Яновіч 2002 Яновіч М. Ян Вісліцкі: Ля вытокаў эпічнага жанру // Народная воля. 2002. 19 ліпеня.

ЗМЕСТ

Ад укладальніцы 5

Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая. Творчасць Яна Вісліцкага
і лацінамоўная пісьмовая культура эпохі Рэнесансу на Беларусі 7

BELLUM PRUTENUM (арыгінальны тэкст) 99

BELLUM PRUTENUM (ПРУСКАЯ ВАЙНА)

Carmen exhortatorium Ioannis Visliciensis ad Musam M. Pauli Rutheni
laudibus eiusdem refertum ad condendum epigramma in libellos
de Pruteno bello conscriptos 100

Заахвочвальны верш Яна Вісліцкага да Музы магістра
Паўла Русіна, поўны яго ўсхваленняў, да складання
эпіграмы ў кнігі, напісаныя пра Прускую вайну 101

Venerabili ac egregio viro magistro Paulo de Crosna
studii Cracoviensis, collegiato poëtae praeceptorique
dignissimo Ioannes Visliciensis salutem ac felicitatem 104

Шаноўнаму і славутаму мужу, магістру Кракаўскага
універсітэта Паўлу Кросненскаму, сябру паэтычнай суполкі
і паважанаму настаўніку, Ян Вісліцкі (жадае) здароўя і шчасця 106

Argumenta libellorum Belli Pruteni 108

Аргументы кніг “Прускай вайны” 109

Ode Tricolos tetrastrophos lectori 108

Ода [, напісаная алкеевай страфой,] чытачу 109

Belli Pruteni tres libelli (“Пруская вайна” у трох кнігах) 112

/Libellus primus/ 112

/Кніга першая/ 113

Incipit libellus secindus 128

Пачынаецца кніга другая 129

Incipit libellus tertius 156

Пачынаецца кніга трэцяя 157

Joannis Visliciensis ode tricolos tetrastrophos ad Serenissimum principem Sigismundum Regem Poloniae etc. super suum cum Scythis duellum victoriamque de eisdem octava Septembris, alias ipso die Nativitatis Mariae faustiter nactam sub anno salutiferae incarnationis Domini M.D.XIV 172

Ода Яна Вісліцкага да Найяснейшага Уладара Жыгімонта, караля Польшчы і г. д., прысвечаная яго вайне са скіфамі і шчасліва атрыманай перамозе над імі 8 верасня, або ў самы дзень нараджэння /Панны/ Марыі ў год збавеннага ўцелаўлення Панскага 1514 173

Ad Reverendissimum in Christo patrem et dominum Dominum Petrum Tomiczki Dei gratia Episcopum Premisliensem ac vice Cancellarium regni Poloniae meritissimum Joannis Visliciensis Jambicum trimetrum Archilochicum pro commendatione libellorum suorum Regiae majestati 178

Да найпаважанейшага ў Хрысце айца і пана Пана Пятра Таміцкага з ласкі Божай біскупа Перамышльскага і найшаноўнейшага віцэ-канцлера Каралеўства Польскага архілохавы ямбічны трыметр Яна Вісліцкага дзеля рэкамендацыі яго кніг Каралеўскай Вялікасці 179

Elegia ad deiparam Virginem Mariam pro sedanda peste 180

Элегія да Багародзіцы Панны Марыі з просьбаю пра ўтаймаванне чумы 181

Epigramma in invidum 182

Эпіграма на зайздросніка 183

APPENDIX (ДАДАТАК)

Elegia Magistri Pauli Crosnensis Rutheni ad Joannem Vislicium, Pieridum cultorem, discipulum non poenitendum 184

Элегія магістра Паўла Кросненскага Русіна да Яна Вісліцкага, аматара Піэрыдаў, вучня, не вартага ўшчування 185

Pro recommendatione dissertissimi Phoebeae lyrae moderatoris Joannis Visliciensis ad invictissimum Sigismundum, Poloniae regem, carmen Valentini Eckii Philiripolitani 188

Верш Валянціна Экія Філірыпалітанскага для рэкамендацыі
непераможнаму каралю Польшчы Жыгімонту вельмі вопытнага
майстра Фебавай ліры Яна Вісліцкага 189

DE PRAESENTI BELLO PRUTENICO
(ПРА СЁННЯШНЮЮ ПРУСКУЮ ВАЙНУ)

De bello Prussiae amicus amico 190

Сябар – сябру пра вайну Прусіі 191

Divo Sigismundo Poloniae Regi invicto 192

Боскаму Жыгімонту, непераможнаму каралю Польшчы 193

In exercitum Germanum Polonos fugientem 192

На войска германцаў, што ўцякае ад палякаў 193

Commentarii ad textum Latinum 198

Каментарыі да перакладу 206

Кароткі слоўнік антычных і сярэднявечных намінацый 215

Спіс скарочаных назваў твораў Яна Вісліцкага 225

Бібліяграфія 226

Навуковае выданне

Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum.
Ян Вісліцкі. Пруская вайна

На лацінскай і беларускай мовах
Укладанне, пераклад, каментарыі
Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай

Рэдактар *А.А. Сычоў*
Карэктар *А.В. Савіцкая*
Камп'ютарная вёрстка *А.Э. Малевіч*

Падпісана да друку 26.09.2005 г. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Гарнітура «Таймс».
Ум. друк. арк. 15,6. Тыраж 200 экз. Заказ № .

ЗАТ «Прапілеі»
ЛВ № 02330/0131567 ад 30.04.2004 г.
220013, г. Мінск, вул. Усходняя, д. 32, корп. 1